В. П. Жураўлёў

# На шляху духоўнага самасцвярджэння



АКАДЭМІЯ НАВУК БЕЛАРУСІ
ОРДЭНА ДРУЖБЫ НАРОДАЎ ІНСТЫТУТ ЛІТАРАТУРЫ
ІМЯ ЯНКІ КУПАЛЫ

**В. П. Жураўлёў**

# На шляху духоўнага самасцвярджэння

МІНСК
«НАВУКА І ТЭХНІКА»
1995

ББК 83.3(4 Беи)6
Ж 91
УДК 882.6.09+882.09

Рэдактар
доктар філалагічных навук У. В. ГНІЛАМЁДАЎ

Рэцэнзенты:
доктар філалагічных навук А. С. Яскевіч,
кандыдат філалагічных навук І. С. Шпакоўскі

**Жураўлёў В. П.**
Ж 91 На шляху духоўнага самасцвярджэння.— Мн.: Навука і тэхніка, 1995.— 160 с.
ISBN 5-343-01382-1.

На матэрыяле беларускай і рускай прозы і паэзіі 20—30-х гадоў, аналізуючы творы Я. Коласа, Я. Купалы, К. Чорнага, А. Твардоўскага, Я. Замяціна, А. Платонава і іншых, аўтар раскрывае глыбінныя сувязі і ўзаемадзеянні, якія існуюць паміж духоўна-маральнай арыентацыяй пісьменніка і мастацкай праўдай яго твораў.
Разлічана на выкладчыкаў, даследчыкаў, студэнтаў, усіх, каго цікавіць наша гісторыя.

**Ж $\frac{8820600000-003}{М 316(03)-95}$ 58—94**

**ББК 83.3(4 Беи)6+83.3(2 Рос-Рус)6**

ISBN 5-343-01382-1.

© В. П. Жураўлёў, 1995

## УВОДЗІНЫ

Класіку нашай літаратуры К. Чорнаму дужа імпанавалі словы: «Чалавек — гэта цэлы свет». І словы гэтыя паводле свайго сэнсавага значэння быццам бы знаходзяцца ў межах аксіяматычнай ісціны. Але таленавіты пісьменнік і тонкі псіхолаг добра разумеў, што гэта не зусім так. Настройваючы ўласную мастацкую думку на параўнальна-аналітычную суадноснасць і зблiжанасць з перадавой літаратурнай традыцыяй, К. Чорны імкнуўся пераканаць і чытача, і сваіх калег-пісьменнікаў у тым, што нейкай абсалютнай, вычарпальнай закончанасці ў раскрыцці рухомай і зменлівай чалавечай псіхалогіі ніколі быць не можа і што ў няспынным і зменлівым руху душы чалавека трэба шукаць адбітак найважнейшых грамадскіх працэсаў і заканамернасцей у самым шырокім і размаітым спектры іх праяў. У такім напрамку ён стымуляваў і развіццё роднай літаратуры, звязваючы з гэтым яе вялікія і плённыя ідэйна-эстэтычныя заваёвы. І надзеі яго не былі марнымі.

Ужо ў першае паслякастрычніцкае дзесяцігоддзе, якое з'яўляецца адметнай, фенаменальнай старонкай у развіцці беларускай літаратуры, мастацкае слова дасягнула сур'ёзных стылёва-жанравых і чалавеказнаўчых вышынь. Закладваўся трывалы падмурак для далейшага эстэтычнага пошуку. Даводзіцца толькі здзіўляцца таму, як маладая наша літаратура, акрыленая глыбокай верай у магчымасць здзяйснення доўгачаканай векавой мары беларускага народа — нацыянальнага адраджэння, расшырэння нацыянальных і сацыяльных правоў і свабод чалавека, змагла зрабіць такі паскораны і якасны ўзлёт, з зайздроснай шчодрасцю вылучаючы з свайго асяроддзя сапраўдных летапісцаў і даследчыкаў жыцця — таго, што мінула, і таго, што прыйшло пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі.

У некаторых публіцыстычных працах кастрычніцкія падзеі імянуюць сёння як пераварот, задуманы і спраектаваны вузкім колам людзей. Не будзем з ходу адмятаць і адмаўляць такое меркаванне. Заўважым толькі, што тут яшчэ павінна вельмі сур'ёзна папрацаваць аналітычнае, скіраванае на бесстароннасць і аб'ектыўнасць ацэнак удумлівае навуковае слова грамадазнаўцаў.

Але бясспрэчным застаецца той факт, што нашы маладыя пісьменнікі, паэты, празаікі, драматургі — К. Чорны, М. Зарэцкі, Л. Калюга, А. Мрый, К. Крапіва, М. Чарот, П. Галавач, Б. Мікуліч, В. Каваль, С. Баранавых і інш.— у пераважнай большасці шчыра і з непадробленай радасцю віталі кастрычніцкія падзеі і, відаць, тэрміналагічныя тонкасці паняццяў — рэвалюцыя гэта ці рэвалюцыйны пераварот — займалі іх тады менш за ўсё. У гэтым вітанні кастрычніцкіх падзей яны шмат у чым працягвалі ў сваёй творчасці гуманістычную і рэвалюцыйна-дэмакратычную традыцыю нашых старэйшых пісьменнікаў — Я. Коласа, Я. Купалы, Цёткі, З. Бядулі, хоць нярэдка ўступалі з імі ў палеміку, не ўсё ў іх творчасці і творчай праграме прымалі і разумелі.

Мы былі б сёння няўдзячнымі і не дужа праніклівымі людзьмі, калі б раптам нехта з нас, настройваючыся на палемічна-пошукавы энтузіязм сучаснасці (а можа, і на кан'юнктурна-зменлівыя яе палітычныя павевы), пажадаў бы кінуць папрок Купалу ці Коласу за іх прынцыповую і паслядоўную прыхільнасць да рэвалюцыйна-дэмакратычных ідэалаў і жаданне пераўтварыць і перарабіць на аснове гэтых ідэалаў жыццё.

Зрэшты, рэвалюцыя і эвалюцыя — гэта ўзаемазвязаны і ўзаемазалежны працэс развіцця любога грамадства. Калі мы ўважліва будзем перачытваць і пераасэнсоўваць творы Купалы і Коласа, то ўбачым, што закон такой дыялектыкі глыбока і арганічна пранізвае ўсю іх эстэтычную сістэму. Рэвалюцыйныя працэсы ўяўляліся ім у асноўным як натуральны вынік, у пэўным сэнсе падагульненне і падсумоўванне працэсаў эвалюцыйных, а ўдзел чалавека ў перабудове і пераўтварэнні рэчаіснасці яны самым цесным і непасрэдным чынам звязвалі з яго ўнутранай падрыхтаванасцю да такой перабудовы жыцця, з яго рэальнымі і патэнцыяльнымі магчымасцямі духоўна, маральна, інтэлектуальна **перабудоўваць самога сябе**.

Прынцыпова і па-мастацку грунтоўна, з шырокім эпічным разгарненнем пастаўлена гэта пытанне ў кола-

саўскай трылогіі «На ростанях» (1921—1954). Галоўны герой твора Лабановіч — настаўнік, і ў той жа час ён нястомны, руплівы і стаpанны вучань, для якога навука самапазнання і самаўдасканалення з'яўляецца выключна важным і сур'ёзным прадметам жыцця. Як мы ведаем, крытыка доўгі час не вельмі шанавала героя ў першую чаргу іменна за такія яго захапленні, называла іх дарэмнай тратай часу, энергіі, самакапаннем, далёкімі ад практычных інтарэсаў рэальнага жыцця абстрактнымі парываннямі і г. д. Але мела рацыю тут не гэта аднамерна-сацыялагічная крытыка, а праніклівая і мудрая мастацкая думка аўтара, які разумеў, што самыя прыгожыя і велічныя перспектыўныя планы краіны, не забяспечаныя належным маральна-духоўным і інтэлектуальным патэнцыялам асобы, могуць увайсці ў складаны, глыбокі і драматычны канфлікт з законамі ісціны, праўды, здаровага сэнсу і гуманізму.

Беларуская літаратура 20-х гадоў узнаўляе вельмі багатыя і разнастайныя формы ўзаемадзеянняў чалавека з мікра- і макраабставінамі. Даволі шырокай з'яўляецца ў ёй, у прыватнасці, і тая плынь, што аддавала бясспрэчную дамінантную перавагу ў духоўна-маральным станаўленні чалавека абставінам, сацыяльнаму асяроддзю. Творчасць найбольш вопытных і таленавітых нашых майстроў слова судакраналася з гэтай плынню толькі часткова і нярэдка палемічным пафасам. Галоўным дэтэрмінантам у фармаванні чалавека ў іх разуменні быў сам чалавек. «Вялікімі пакутамі духу здабываў ён сам праз сябе сістэму сваіх духовых паводзін на свеце...» [1] — так гаворыць К. Чорны пра цэнтральнага героя рамана «Сястра» Вацю Браніслаўца. У такіх сваіх памкненнях Ваця Браніславец зыходзіць з таго, што «ўсякі закон творыцца намі самімі. І намі ж можа быць пераступлены» [2].

Дзе ж, аднак, тыя гарантыі і сілы, якія ўтрымліваюць чалавека ў межах высокіх духоўна-маральных прынцыпаў і ні пры якіх абставінах не дазваляюць яму **пераступіць** законы праўды і справядлівасці? Над гэтым пытаннем беларуская літаратура 20-х гадоў (і не толькі беларуская) задумвалася досыць сур'ёзна. Аднак сур'ёзнасць пастаноўкі пытання ў многім усё-такі залежыць ад імкнення і ўмення даць на яго адказ, хоць, зрэшты, не-

---

[1] Чорны К. Зб. тв.: У 8 т. Мн., 1973. Т. 3. С. 93.
[2] Там жа. С. 43.

малой сілай і самакаштоўнасцю валодае ў мастацкім творы і таленавітая пастаноўка актуальнага і праблемнага пытання.

Ставячы такія пытанні і спрабуючы адказаць на іх, некаторыя пісьменнікі лічылі, што чалавек з поспехам абмінае ўсе перашкоды і падводныя рыфы жыцця, калі ён самкнецца з калектывам і пэўным чынам нават растворыцца ў ім, бо асобны, просты чалавек быццам бы мала што сам па сабе значыць і мала што можа ў рэалізацыі маштабных задум:

Единица — вздор,
        единица — ноль,
Один —
        даже если очень важный —
не подымет
        простое
        пятивершковое бревно,
тем более
        дом пятиэтажный. [3]

Падобныя меркаванні (а яны ў свой час былі даволі распаўсюджанымі) у пэўным сэнсе вызвалялі чалавека ад празмернай патрабавальнасці да сябе, ад духоўнага напружвання і ў рэшце рэшт ад самакрытычнага погляду на самога сябе.

Ды гэта нібыта чалавеку і не дужа патрэбна, бо галоўнай яго задачай з'яўляецца непасрэдна практычная дзейнасць. Знаходзіліся нават тэарэтыкі, якія спрабавалі даказваць, што духоўнасць і свядомасць у высокаразвітых формах на пэўны перыяд павінны сцішыць, паслабіць ці наогул прыпыніць сваю ролю і функцыю, каб не перашкаджаць практычнай дзейнасці, аднаўленчым і перабудовачным працэсам жыцця. Адзін з такіх актыўных «тэарэтыкаў» 20-х гадоў М. Устралаў, абгрунтоўваючы правамернасць рэпрэсій супраць «непакорлівай і непаслухмянай» інтэлігенцыі, пісаў, што «мозг краіны не павінен перашкаджаць аднаўленчаму працэсу», ён «павінен устрымацца ад выканання сваёй непасрэднай функцыі — думкі...» [4]

На жаль, не зусім пажаданым і плённым лічыў падчас захапленне чалавека сваім самаўдасканаленнем нават М. Горкі. «Вы паглядзіце,— пісаў ён у газеце «Новая

---

[3] Маяковский В. Полн. собр. соч.: В 13 т. М., 1957. Т. 6. С. 266.
[4] Вопросы философии. 1990. № 9. С. 59.

жизнь» у 1917 г.,— нідзе ж не займаюцца так многа і настойліва пытаннямі і спрэчкамі, клопатамі аб асабістым «самаўдасканаленні», як займаюцца гэтай, відавочна бясплённай, справай у нас» [5]. На гэтай аснове Горкі сур'ёзна разыходзіўся з Талстым і Дастаеўскім. Падобныя яго меркаванні, як, дарэчы, і вобразы-метафары У. Маякоўскага аб бясспрэчным прыярытэце калектыўнай думкі і калектыўнай волі над думкай і воляй асобы, былі не такімі ўжо малазначнымі і бяскрыўднымі з'явамі ў дачыненні да развіцця мастацкага працэсу нацыянальных літаратур, бо названыя аўтары, не без дапамогі паслужлівай крытыкі і афіцыйнай падтрымкі ўлад, станавіліся своеасаблівымі маякамі-ўзорамі і непахіснымі аўтарытэтамі-заканадаўцамі ў літаратуры і літаратурнай тэорыі.

Усё гэта адгукнулася і пакінула свой след. Аднак у літаратуры, як можна заўважыць, узраслалі трывога і непакой у сувязі з тым, што пэўныя групы людзей і сапраўды гатовы былі шчыра паверыць у абсалютную, бясспрэчную і беспамылковую настаўніцкую ўладу адміністрацыйна-каманднага калектыву над сваім індывідуальным «я», а некаторыя іншыя імітавалі такую добраахвотную гатоўнасць зліцца з калектывам і падпарадкавацца яго волі, настройваючыся на кан'юнктурныя хвалі часу і кіруючыся чыста кар'ерысцкімі меркаваннямі.

Вялікую небяспеку такой грамадскай з'явы адным з першых адчуў і таленавіта адлюстраваў у рамане «Мы» (1920) Я. Замяцін. Многія героі гэтага твора быццам бы ганарацца тым, што поўнасцю перадаверылі сваё «я» абагульнена-калектыўнаму «мы» і што жыццё кожнага з іх паасобку да самых патаемных драбніц праходзіць «навідавоку» ў іншых. Аднак такі іх гонар і такое іх эмацыянальна-стыхійнае захапленне сваім абсалютным падпарадкаваннем калектыву часта тояць для іх жа саміх і для грамадства вельмі сур'ёзную небяспеку, а можа, нават і трагедыю. Бо чалавек, які добраахвотна перадавярае сваё індывідуальнае «я» грамадзе, калектыву, натуральна, звужае поле сваёй духоўна-інтэлектуальнай дзейнасці. «Дарагія мае,— звяртаецца да лёгка падатлівых на заклік чужой волі людзей трывожна-насцярожваючы аўтарскі голас,— мне шкада вас — вы не здольны па-фі-

---

[5] Горький М. Несвоевременные мысли и рассуждения о революции и культуре: 1917—1918 гг. М., 1990. С. 40.

ласофску матэматычна мысліць»[6]. І такая няздольнасць, як можна зразумець, шмат у чым з'яўляецца падагульняючым вынікам іх індывідуальнай духоўнай размагнічанасці і працяглага, крывадушна-двухсэнсоўнага дыялогу з жыццём.

У асэнсаванні гэтых пытанняў у беларускай літаратуры 20-х гадоў пачэсная і важная роля належыць арыгінальнаму наватарскаму раману А. Мрыя «Запіскі Самсона Самасуя» (1929). Перад тым, як разглядаць яго грунтоўна, скажам пра гэты твор зусім коратка. Пісьменнік вельмі добра паказаў, што працяглы і мэтанакіраваны двухсэнсоўна-крывадушны дыялог чалавека з рэчаіснасцю не праходзіць непрыкметна, бязбольна, а няўхільна вядзе яго ў багну жыццёвага абсурду. Пісьменнік хоча сказаць такому чалавеку: ты вельмі і вельмі глыбока памыляешся, калі разлічваеш, што сёння, зыходзячы з патрэб кан'юнктуры, будзеш хлусіць, прыкідвацца, крывадушнічаць і ўсяляк дэманстраваць сваё поўнае зліццё з чужой воляй і чужой думкай, а заўтра проста і лёгка зможаш перабудавацца, перафарбавацца і стаць зусім іншым — сумленным, праўдзівым і прынцыповым чалавекам-грамадзянінам. Не, ты можаш ператварыцца ў такім разе ў зусім безаблічную істоту і стаць жаданай знаходкай, лёгка кіруемай, падатлівай сілай для любой таталітарна-каманднай волі.

Мастацкія творы накшталт рамана А. Мрыя «Запіскі Самсона Самасуя», дзе ўсімі сваімі фарбамі пераліваюцца гумар і тонкая, вострая, з глыбокім філасофска-аналітычным падтэкстам сатыра, доўгі час наша крытыка недаацэньвала, а ў горшым выпадку лічыла іх паклёпам на новае жыццё, новага чалавека, праявай «цынізму бязвер'я» і г. д. Сёння настаў час іх пераасэнсаваць і паказаць, што ў гэтых творах пульсуе глыбока зацікаўленая грамадзянская думка і жыве, гаворачы словамі В. Каваленкі, няўтольная «прага духоўнасці», выяўляецца імкненне пісьменніка з'арыентаваць чалавека на шлях духоўнага самасцвярджэння і духоўнай самарэалізацыі.

Пэўныя аспекты гэтай праблемы мы паспрабуем закрануць і раскрыць у нашай працы.

---

[6] Замятин Е. Мы. М., 1989. С. 275.

# ДЫЯЛОГ ПАМІЖ «Я» І «МЫ» Ў ПРАЦЭСЕ ПОШУКУ ІСЦІНЫ

Відаць, самыя вялікія памылкі і самыя балючыя расчараванні спасцігаюць нас тады, калі ў пошуках ісціны, у вырашэнні складаных пытанняў жыцця мы наўмысна ці міжвольна імкнёмся спрасціць сам шлях пошуку, як мага хутчэй спяшаемся правесці прамую лінію там, дзе лепей было б пайсці кружной дарогай.

Вядома, самая кароткая адлегласць паміж нейкімі двума пунктамі — прамая лінія. Гэту агульнавядомую думку чалавек, натуральна, спрабаваў трансфармаваць і дастасаваць да сваёй жыццёвай дзейнасці як метадалагічны арыенцір і важны прынцып пазнання. І чым глыбей пранікаў ён у саму сутнасць аптымальных рашэнняў, тым большае права ён меў называцца майстрам сваёй справы. Незалежна ад таго, асэнсоўваў ён нейкую складаную грамадскую, філасофскую, духоўную, мастацкую праблему ці быў заняты пабудовай, стварэннем рэчы з пэўным і выразным практычным прызначэннем.

Але зноў-такі нам варта быць у дадзеным выпадку вельмі ўважлівымі, каб само паняцце аптымальнасці напоўніць максімальна глыбокім сэнсам, не спрасціць і не звузіць яго ў адносінах да метадалогіі, спосабаў і сродкаў пазнання і асэнсавання жыцця ва ўсёй яго багатай і шматколернай разнастайнасці. Натуральна, што чым складанейшая жыццёвая з'ява, тым больш тонкага пазнавальна-метадалагічнага інструментарыя яна патрабуе. Бо і ў самой рэальнасці такая з'ява знаходзіцца ў больш складанай прычынна-выніковай сістэме ўзаемадачыненняў. Гэта датычыцца і праблемы маральна-духоўных каштоўнасцей — праблемы складанай, тонкай і надзвычай далікатнай у сваіх жыццёвых і мастацкіх выявах.

Далёка не заўсёды, аднак, гэта ўлічвалася. І тады недаацэнка або спрашчэнне маральна-духоўнай дамінанты

часта абарочвалася вялікімі бедамі і нават трагедыямі для грамадскай гісторыі, яе культурнага, навуковага і сацыяльна-эканамічнага прагрэсу. Многія ўчарашнія, ды і сённяшнія, набалелыя і нявырашаныя праблемы, у тым ліку і эканамічныя, цесна звязаны з нявырашанасцю іх у маральна-духоўнай сферы. Па-свойму цікавую, палемічна-завостраную думку на гэты конт выказвае былы рэдактар замежнага літаратурна-публіцыстычнага часопіса «Кантынент» Ул. Максімаў: «...Мяне не запрашала тэлебачанне пагаварыць пра Пушкіна і пра класіку наогул. Але, пачаўшы з Пушкіна, закончылі тым не менш эканомікай. Пры гэтым па маёй «віне»: я дазволіў сабе заявіць, што эканоміка непасрэдна залежыць ад Пушкіна. Я, зразумела, меў на ўвазе Пушкіна як персаніфікацыю нацыянальнай культуры. Культура выхоўвае ў чалавека паняцце пра Дабро і Зло, задае яму этычныя і эстэтычныя крытэрыі. Чалавек, пазбаўлены гэтых паняццяў і гэтых крытэрыяў,— дрэнны працаўнік і ніякай здаровай эканомікі стварыць не здольны» [1]. Такое меркаванне ўсё часцей і часцей выказваюць вучоныя, пісьменнікі, філосафы, гісторыкі, палітыкі, хоць яно, гэта меркаванне, яшчэ ў многіх сваіх праявах павінна знайсці вельмі сур'ёзнае абгрунтаванне, каб з абагульнена-канстатацыйнай сферы перайсці ў стан неабвержнай і перакананай для шырокага кола грамадства думкі.

Магчыма, што тады і кіраўніцтва нашай краіны праікнецца больш глыбокім усведамленнем таго, што астаткавы прынцып пры размеркаванні агульнага фонду грашовых рэсурсаў зусім непрымальны ў якасці стымулу для паспяховага і паўнакроўнага развіцця культуры, якая хоць і не з'яўляецца заканадаўча-падагульняючай інстанцыяй «у выпрацоўцы» нейкіх гатовых маральна-духоўных рашэнняў, роля яе ў фарміраванні новых поглядаў, новых настрояў, новага чалавека застаецца, бясспрэчна, важнай, сур'ёзнай і ўплывовай.

Такую сваю ролю ў грамадскім жыцці ніколі не адмаўляла і мастацкая літаратура. Асэнсоўваючы жыццё, раскрываючы чалавечыя характары, выяўляючы ўнутраныя спружыны рэчаіснасці, яна ўздзейнічала разам з тым і на складванне духоўна-маральнай атмасферы грамадства.

Вядома, гэты ўплыў, як правіла, набывае тут склада-

---

[1] Лит. газ. 1992. 5 авг.

ную форму прамых, адкрытых і апасродкаваных, падтэкставых, індывідуальна афарбаваных ліній. Бо, зрэшты, у кожным выпадку сацыяльна-гістарычны, маральна-этычны, культурны, палітычны, эканамічны і г. д. малюнак рэчаіснасці самым сур'ёзным чынам абумоўлены і прадвызначаны планам, выбарам і арыентацыяй чалавека як асобнай адзінкі, так або інакш звязанай са сваёй народна-нацыянальнай супольнасцю.

Гэтая супольнасць, безумоўна, даволі актыўна фармуе таксама і сацыяльна-псіхалагічны тып асобы. Дакладней кажучы, уплывае на яе інтэлектуальнае і духоўна-маральнае фармаванне і ўвесь спектр грамадскага жыцця — бытавога і быційнага, бягучых яго праяў, хуткаплыннай, зменлівай сучаснасці і багатага гістарычнага вопыту народа. Канешне, сіла ўплыву на чалавека мікра- і макраабставін знаходзіцца ў вельмі тонкай, складанай і шматграннай залежнасці ад таго, наколькі сам чалавек падрыхтаваны ці ў рэшце рэшт унутрана скіраваны настройвацца на гістарычны вопыт і адгукацца на трывожныя і праблемныя заклікі сучаснасці.

Ад гэтага ў вялікай ступені залежыць не толькі працэс фармавання і складвання характару чалавека, але і працэс развіцця, арганізацыі, складвання і ўтварэння грамадскіх структур жыцця. У малюнках і танальнасцях сацыяльнага, палітычнага, эканамічнага і культурнага спектра рэчаіснасці заўсёды прысутнічае рэальны «ўдзел» валявой, маральнай і інтэлектуальнай энергіі чалавека як часткі агульнай народнай сілы.

У нейкіх выпадках асобны чалавек можа не пагаджацца з тымі шырока распаўсюджанымі ўяўленнямі пра ход падзей, якія навокал яго разгортваюцца і якія нібыта складваюцца ў пэўную і ўстойлівую сістэму грамадскіх тэндэнцый. Але гэта яшчэ не азначае, што такія тэндэнцыі выяўляюць унутраны закон рэчаіснасці. І якраз нязгода аднаго асобнага чалавека можа ўвасабляць у сабе той вельмі важны індывідуальны нюанс думкі і пачуцця, якія больш дакладна, чым нейкая маштабная ў вонкавых прыкметах, напорная сіла, адлюстроўваюць сутнасныя асновы духоўнасці і больш аптымальна скіраваны на вызначэнне галоўных арыенціраў і законаў жыцця.

Ніколі не аспрэчвалася, здаецца, думка пра ролю асобы ў гістарычным працэсе, пра яе ўплыў на складванне і фармаванне тых або іншых грамадскіх інстытутаў і наогул сістэмы і мадэлі грамадства. Вядома, на гэта склад-

ванне грамадскіх форм і структур уплывае безліч іншых фактараў, не выключаючы і збегу спрыяльных ці неспрыяльных акалічнасцей. Бальзак, напрыклад, называў выпадак вялікім раманістам свету, маючы на ўвазе ў першую чаргу літаратурны аспект жыцця. У іншых сферах рэчаіснасці роля выпадку не менш значная.

Трэба, відаць, глыбей асэнсоўваць нам пры вырашэнні такіх пытанняў і ролю геаграфічнага фактару, прыродна-кліматычных умоў і цэлы шэраг іншых момантаў, якія на пэўных этапах развіцця нашай гісторыі (і асабліва культаўскіх яе часоў) колькі-небудзь сур'ёзна пад увагу не браліся ці проста адхіляліся і недаацэньваліся.

Аднак роля асобы ў вызначэнні і руху, і форм, і накірункаў жыцця заўжды застаецца важнай. Ісціна гэта, здаецца, агульнавядомая, аксіяматычная. Ніхто яе катэгарычна не абвяргаў учора, ніхто не аспрэчвае яе і сёння. Але гэта зусім не азначае, што тут няма пытанняў. Ёсць — і нямала! Нярэдка бывае, што ў межах быццам бы прывычных, агульнавядомых паняццяў, палажэнняў, катэгорый, прынцыпаў мы назіраем шмат тэарэтычнай, метадалагічнай і ўсякай іншай блытаніны і мешаніны. Так і тут. Ніхто катэгарычна, здаецца, не адмаўляў і не адмаўляе таго, што чалавек — гэта цэлы свет і што гэты свет уваходзіць састаўною часткаю ў агульную мадэль духоўнага і інтэлектуальнага свету іншых людзей, а гэта значыць і ўсяго чалавецтва. Аднак гэта нібыта і агульнавядомая, аксіяматычная ісціна нярэдка ўспрымаецца і трактуецца па-рознаму. Для адных паняцце адметнасці духоўнага свету чалавека азначае яго непаўторнасць, незаменнасць, а адсюль і небходнасць беражлівых, ашчадных адносін да кожнай чалавечай асобы. У разуменні іншых назіраецца нешта супрацьлеглае, хоць у агітацыйна-прапагандысцкім лексіконе іх вуснага і друкаванага слова такую супрацьлегласць і не заўсёды лёгка бывае выявіць.

Сталін неаднаразова, напрыклад, гаварыў пра тое, што чалавек, просты чалавек — самая важная каштоўнасць савецкага грамадства. Вялікі дыктатар, відаць, проста не можа не быць вялікім акцёрам на палітычнай сцэне жыцця. На шматлікіх партрэтах і фатаграфіях мы бачылі яго самыя разнастайныя маскі — мудрасці, задуменнасці, непахіснасці і найбольш распаўсюджаную з іх — маску турботы і заклапочанасці пра чалавека. Мільённымі тыражамі штампавалася фатаграфія Сталіна з

дзяўчынкай Мамлакат на ягоных руках. Багата пахвальных слоў пачуў з яго вуснаў рабочы, селянін, інтэлігент. Але гэта зноў-такі была дэкарацыя на вялікай сцэне асабістых палітычных планаў дыктатара, які простаму чалавеку ў гістарычным працэсе адводзіў падпарадкавальную вышэйшай інстанцыі ўладыкі-правадыра ролю вінціка-статыста, паслухмянага выканаўцы загадаў зверху.

Сказаная ім быццам бы між іншым фраза пра тое, што незаменных няма і быць не можа, якраз і адлюстроўвала яго, калі льга так сказаць, «канцэптуальны» погляд на чалавека. І гэты антыгуманістычны позірк стаў не толькі краевугольным каменем яго антынавуковай тэорыі класавай барацьбы. Ён пакінуў свой злавесна-трагічны адбітак ва ўсіх сферах нашага жыцця, у тым ліку і ў мастацкай літаратуры.

Пытанні гуманізму, праблемы павагі і ўвагі да чалавека ў савецкай літаратуры быццам бы ніколі не адсоўваліся на задні план. У пэўным сэнсе так яно і было. Аднак пытанне можна прама на апошні план не адсоўваць і можна нават выяўляць да яго знешне-дэкларацыйную зацікаўленасць і ў той жа час заставацца ў галоўным, сутнасным дачыненні да яго абыякавым, індыферэнтным наглядальнікам ці крывадушным, тэндэнцыйна-двухсэнсоўным інтэрпрэтатарам.

Нешта падобнае назіралася даволі працяглы час у падыходах да пастаноўкі і асэнсавання праблемы гуманізму, пытанняў маральна-духоўных каштоўнасцей. І выяўлялася гэта ў самых розных формах, хоць усё ў рэшце рэшт зводзілася да адной мэты: закамуфліраваць сутнасць самога паняцця альбо звузіць і спрасціць яго сэнсавае значэнне. Вельмі звыклым і ледзь не абавязковым станавілася, напрыклад, ужыванне пэўнага эпітэта перад словам «гуманізм»: рэвалюцыйны, актыўны, сацыялістычны, пасіўны, абстрактны... Як быццам бы ў іншым выпадку, «безэпітэтным» яго вызначэнні, гэта слова-паняцце несла ў сабе малазразумелую і небяспечную для свядомасці чытача функцыю.

Канешне, можна было б на ўсю гэту сістэму эпітэтаў і не звяртаць асаблівай увагі, калі б тут не праглядвалася вельмі сур'ёзная з'ява, якая істотным чынам закранала важныя асновы мастацкай літаратуры і ў шэрагу выпадкаў негатыўна ўплывала на яе развіццё. Самім ужо падкрэсліваннем паняцця «гуманізм» такім вось шляхам, імкненнем вылучыць і выявіць у ім той або ін-

шы элемент пасіўнасці або актыўнасці, рэвалюцыйнасці ці сацыялістычнасці нярэдка ставілася недвухсэнсоўная задача падкрэсліць і вылучыць у дадзеным выпадку першараднае значэнне класавага фактару ў літаратуры і прыглушыць значэнне агульначалавечых каштоўнасцей, у сістэме якіх, паміж іншым, і паняцце гуманізму ўспрымаецца і трактуецца як даволі суверэнная і незалежная ад класавых, расавых, нацыянальных, сацыяльных ці якіх-небудзь іншых прычын праява глыбокіх і міласэрных, брацкіх адносін да чалавека.

Прыхільнікі класавага разумення гуманізму далёка не заўсёды ішлі ў адкрыты наступ на агульналюдскія маральна-духоўныя прыярытэты, хоць хапала тут і простаімілінейных вульгарных сацыёлагаў. Найчасцей жа роля гэтых прыярытэтаў, якія складаюць і сутнасную аснову высокіх маральных і гуманістычных прынцыпаў, звужалася, змяншалася або проста замоўчвалася. «Этыка,— справядліва заўважае І. Дзядкоў,— вельмі доўга для многіх была «лішнім цяжарам». Элементарная мараль выцяснялася з грамадскай сферы як перашкода вышэйшым палітычным планам» [2].

На першы погляд можа здацца дзіўным: як гэта этыка і мараль могуць чыніць перашкоду вышэйшым, стратэгічным і палітычным меркаванням? Аднак гэты парадокс быў, на жаль, з'яваю рэальнай. Тыя «многія», каго тут мае на ўвазе І. Дзядкоў, у большасці выпадкаў, відаць, зусім не па наіўнасці і непаразуменні стаялі на такім вось хісткім грунце. Гэтага вымагаў ад іх афіцыйны курс дзяржаўнай палітыкі, і найбольш падатлівыя да яго ўплываў мусілі былі праводзіць яго ў жыццё. Мараль і этыка ў высокагуманістычных духоўных сваіх праявах такую палітыку не задавальнялі, а ў шэрагу выпадкаў былі для яе рашуча і катэгарычна непрымальнымі.

Ды і пра якое супадзенне інтарэсаў палітыкі і маралі магла ісці размова, калі бязлітасна вынішчалася найбольш падрыхтаваная і прыстасаваная да земляробчай працы частка сялянства. Аб якой міласэрнасці, аб якіх братэрскіх пачуццях аднаго чалавека да іншага магла весціся гаворка, калі ў краіне нібыта з нечуванай сілай нарастала хваля класавай барацьбы і варожых вылазак супраць сацыялістычнага ладу. Каб задаволіць апетыты жахлівага, ненажэрнага ГУЛАГа, яго галоўным будаў-

---

[2] Коммунист. 1990. № 6. С. 122.

нікам патрэбны былі, як мы цяпер ведаем, мільёны і мільёны чалавечых ахвяр, патрэбна была няспынная праца гэтага страшнага канвеера, што глытаў і бязлітасна перамолваў у лагерны пыл чалавечыя жыцці.

Усе прагрэсіўныя духоўна-гуманістычныя тэорыі і канцэпцыі, якія ў галоўнай сваёй сутнасці былі скіраваны на цесную ўзаемасувязь з агульналюдскімі асновамі маралі, такія падыходы да пытанняў «выхавання» і «перавыхавання» чалавека, безумоўна, не прымалі. Бо для сапраўднага, без усякіх эпітэтаў гуманізму важным і нават надзвычай важным з'яўляецца самы маленькі нюанс, калі гэта датычыцца вырашэння жыццёвага лёсу чалавека. І для мастацкай літаратуры, якая імкнулася праўдзіва і аб'ектыўна раскрыць грамадскія супярэчнасці, глыбока ўвабраць у сябе трывогі, клопаты і боль людзей, гэты прынцып таксама быў адным з найважнейшых.

Для Дастаеўскага, як вядома, грамадскі прагрэс не мог быць апраўданы ніякімі сваімі дабротамі і дасягненнямі, калі дзеля яго пабудовы патрэбна была хоць бы адна-адзіная слязінка дзіцяці. У гэтым шырока вядомым метафарычна-вобразным выказванні думка пэўным чынам узбуйняецца і завастраецца. Але тут ёсць глыбокая логіка і далёкі план. Вялікі мастак слова сілаю свайго прароцкага розуму быццам наяве бачыў той дысгарманічны малюнак грамадскага развіцця краіны, якая ў імя перамогі сусветнай рэвалюцыі і ў імя шэрагу іншых, як цяпер стала зразумелым, ілюзорных і нязбытных глабальных ідэй пачала зніжаць планку гуманістычных адносін да чалавека, даводзячы яе на некаторых этапах да небяспечна жахлівай, драматычнай і трагічнай рысы.

Дзеля ўзнаўлення літаратурна-гістарычнай праўды сёння трэба на ўвесь голас гаварыць і аб тым, што ў гэтым працэсе зніжэння агульнай шкалы духоўнасці і гуманістычнасці даволі чынны ўдзел брала і літаратура. Такая з'ява фармавалася і звужанай, тэндэнцыйнай інтэрпрэтацыяй складаных жыццёвых канфліктаў, і нежаданнем (ці няўменнем) раскрыць дыялектыку класавага і агульначалавечага ў грамадскім жыцці, і лёгка падатлівым, даверлівым водгукам пісьменніцкага слова на лозунгі і заклікі афіцыйнай (нярэдка ілжывай і дагматычнай) думкі і г. д.

Безумоўна, ідучы такім шляхам, некаторыя пісьменнікі маглі заставацца суб'ектыўна шчырымі ў сваіх ацэнках і меркаваннях. Ім магло здавацца, што якраз не

агульначалавечыя, а класавыя прынцыпы былі і павінны заставацца ва ўсіх адносінах непахіснай і вядучай сілай у фармаванні і вызначэнні маральна-духоўных асноў асобы і грамадства. Яны маглі думаць, поўнасцю пакладаючыся на Сталіна і яго верных саратнікаў, што класавая барацьба ў сацыялістычным грамадстве і сапраўды з кожным годам будзе нарастаць, а таму быццам бы зусім натуральнымі з'яўляюцца яе самыя разнастайныя праявы нават у межах адной, звязанай цеснымі крэўнымі вузамі сям'і. Але ж мастацкая праўда ад гэтага не павялічвала сваю вагу.

Трэба меркаваць, іменна на такую «шчырую» эмацыянальную хвалю настройваўся Э. Самуйлёнак, пішучы сваю п'есу «Пагібель воўка» (1939). Усё тут скрозь, ад пачатку і да канца пранізана ідэяй класавай барацьбы, якая да таго ж падаецца ў памылковым, антыгуманным, скажоным святле. Гераіня гэтай п'есы студэнтка Насця вельмі лёгка і проста давяраецца людскім чуткам пра тое, што яе бацька вораг народа, і парывае з ім усякую сувязь. Нават садзейнічае яго арышту: «Прэч! Ты не бацька мне! Забойца, воўк!» [3] Такія рэзкія, жорсткія і вельмі небяспечныя па тым часе словы студэнтка Насця кідае па адрасе самага блізкага і роднага чалавека — бацькі. Ужо адно гэта сур'ёзна насцярожвае і выклікае патрэбу-жаданне аўтарскага каментарыя, аўтарскай ацэнкі. Аднак такую без перабольшання высокага напалу канфліктную сітуацыю Самуйлёнак пакідае ў якасці голага канстатацыйнага факта. Ды і не вельмі імкнецца тут пісьменніцкая думка да аналізу. У прынцыпе аўтар не мае намеру аспрэчваць «антыбацькоўскую» і антымаральную пазіцыю сваёй гераіні і, відаць, цалкам пагаджаецца з ёю.

Прыходзіцца толькі пашкадаваць, што пісьменнік на перакрыжаванні такой складанай драматычнай калізіі не дазволіў сабе хоць крышку задумацца, усумніцца, растрывожыць уласнае сэрца і хоць бы слабым намёкам выявіць сваю нязгоду з падобнымі хуткімі і катэгарычнымі рашэннямі некаторых дзяцей залічваць у стан «ворагаў народа» ўласных бацькоў.

Можна дапусціць, што малады аўтар выяўляў салідарнасць з гераіняй не толькі пад уплывам таго Вялікага Страху, які несла ў сабе сталінска-берыеўская рэп-

---

[3] Самуйлёнак Э. Зб. тв.: У 2 т. Мн., 1952. Т. 1. С. 444.

рэсіўная машына. Хоць і гэты момант нельга не ўлічваць. П'еса ж «Пагібель воўка» стваралася якраз у такі час. І аўтар мог аддаваць тут даніну кан'юнктуры. А мог дзесьці нават і шчыра верыць, што класавая барацьба ў пабудове сацыялістычнага грамадства з кожным годам мусіць пашыраць свае абсягі і адначасова з гэтым павялічваць рады адкрытых непрыхільнікаў і нядобразычліўцаў савецкай улады.

Гісторыку літаратуры, крытыку, літаратуразнаўцу такія моманты пажадана ўлічваць. Бо зусім не адно і тое ж: застаецца чалавек у сваіх памылках суб'ектыўна шчырым ці памылковыя (з пункту гледжання агульных законаў суб'ектыўнасці і бесстароннасці) яго дзеянні з'яўляюцца ўсвядомленай формай канфармізму, камуфляжу і дастасавання да абставін. Любымі спосабамі і любой цаной.

Мы і сёння сустракаемся з шэрагам выпадкаў, калі паслядоўныя, актыўныя і досыць жорсткія будаўнікі так званай таталітарна-каманднай сістэмы імкнуцца выдаваць сябе за актыўных, шчырых і паслядоўных прыхільнікаў перабудовы. Але не кожнаму з іх адразу ж хочацца паверыць. Трэба, відаць, пакласці такому чалавеку нейкія вельмі важкія аргументы ў падмурак свайго азарэння, пакаяння, каб можна было сказаць, што ён, гэты чалавек, не на жарт адступіўся ад ранейшых прынцыпаў і паспрабаваў развітацца з самім сабою ранейшым. Бо рэзкія, крутыя перамены духоўна-светапоглядных арыентацый — звычайна шлях цяжкі, складаны, пакутлівы. У іншым жа выпадку, калі чалавек з незвычайнай лёгкасцю змяняе свае ідэалагічныя, творчыя, нацыянальныя, сацыяльныя пазіцыі і прынцыпы, ёсць сур'ёзная падстава думаць, што ён з вядомай пароды тых людзей, якіх добра раскрыў у сваёй п'есе «Тутэйшыя» Я. Купала. Такія людзі, як персанаж гэтага твора Мікіта Зносак, гатовы і скакаць пад любую дудку, і выкарыстаць любыя спосабы, дастасоўваючыся да зменлівага ходу падзей і абставін.

Аднак існуюць жа традыцыйныя і ў пэўным сэнсе непарушныя літаратурныя законы, якія дыктуюць аўтару свае ўмовы. І не пайсці насустрач ім азначае абмінуць нешта вельмі істотнае і важнае ў раскрыцці жыццёвых з'яў, абставін і характараў. Так, ставячы сваіх герояў перад неабходнасцю складанага духоўна-маральнага выбару і ўнутрана настройваючыся не ўхіляцца ад цяжкас-

цей на гэтым шляху, пісьменнік не можа, не мае права, калі ён па-сапраўднаму заклапочаны праўдзівым раскрыццём характараў, абысціся без паглыбленага псіхалагічнага аналізу і проста абмінуць тыя канфліктныя калізіі і перашкоды, якія ў падобных выпадках з'яўляюцца натуральнымі спадарожнікамі жыцця. І вось тут мы сустракаемся падчас з дзіўнымі і ў пэўным сэнсе парадаксальнымі з'явамі. Канфлікты, у сферу якіх пастаўлены героі, па прыродзе сваёй, здаецца, неардынарныя, складаныя, а выхады з іх, як у той жа п'есе Э. Самуйлёнка «Пагібель воўка», прапаноўваюцца аблегчаныя, спрошчаныя.

Прычын тут некалькі. І недастатковасць творчага вопыту, і недахоп прафесійнай культуры, і слабасць таленту. Але былі перыяды (і даволі працяглыя) у нашай літаратурнай гісторыі, калі напорыста і катэгарычна дыктавала пісьменніку сваю волю і яшчэ адна сіла — сіла ідэалагічнага націску, якая ў дэкларацыйных сваіх заявах клікала да высокай мастацкасці, да адлюстравання канфліктных і супярэчлівых з'яў жыцця, нібыта дужа шкадавала, што нам не стае талентаў накшталт Гогаля і Салтыкова-Шчадрына, а на справе ўсякую набліжанасць мастацкага слова да заглыбленага аналізу, да сур'ёзнай і ўзважанай крытыкі падуладных каманднa-адміністрацыйнай сістэме звенняў жыцця гэта сістэма сустракала ў штыкі.

Добра вядомы сённяшняму чытачу лёс выдатнага майстра сатырычнага малюнка М. Зошчанкі. Шмат у чым менавіта востракрытычны і сатырычны погляд на з'явы, якія афіцыйныя колы не хацелі бачыць у такой завостранай, падчас крыху і акарыкатуранай праўдзівасці, быў і галоўнай прычынай прымусовага адхілення пісьменніка ад актыўнага ўдзелу ў літаратурным жыцці. А нашаму яркаму і таленавітаму аўтару «Запісак Самсона Самасуя» Андрэю Мрыю ў першую чаргу, безумоўна, за такое смелае сатырычнае слова давялося паплаціцца жыццём, нягледзячы на пісьмо-маленне аўтара аб сваёй невінаватасці, пісьмо-прашэнне «да друга працоўных» Сталіна па справядлівасці ва ўсім разабрацца і «звярнуць увагу» на яго справу. Нават тады, калі, здавалася б, у краіне пасля смерці Сталіна і такой досыць прыкметнай для свайго часу палітычнай падзеі, як XX з'езд КПСС, на нейкі момант падзьмулі свежыя вятры, аб'ектыўна-праўдзіваму, а тым болей крытычнаму слову яшчэ шмат ра-

зоў суджана было трапляць у непрыемны для яго тэмпературны рэжым палітычных замаразкаў.

Доўгі час пад моцным крытычным абстрэлам была, напрыклад, аповесць В. Быкава «Мёртвым не баліць». Пасля выхаду ў свет у часопісным варыянце ёй шмат давялося чакаць, каб быць рэабілітаванай і трапіць у Збор твораў аўтара. Жорсткі прэсінг просталінейнай і зневажальнай крытыкі адчуў на сабе і А. Кулакоўскі, які шчыра паверыў у пацяпленне грамадскай атмасферы і, глыбока зацікаўлены паляпшэннем жыцця селяніна, калгасніка, паспрабаваў адкрытымі і сумленнымі вачыма зірнуць на гэту бадай што ці не самую галоўную, самую складаную і цяжка вырашальную праблему.

У сваёй аповесці «Дабрасельцы» (1958) на глыбока абагульнены аналіз сітуацыі ў тагачаснай вёсцы аўтар не выходзіць. Ды і талент яго быў скіраваны тут у некалькі іншым кірунку. Аднак пісьменніку ўдалося звярнуць чытацкую ўвагу на саму канкрэтыку жыцця. І ў непадмалёванай яго існасці даволі выразна акрэсліць характары герояў, адны з якіх лічылі сябе беззаганнымі камандзірамі рэгіянальнага значэння ў выпрацоўцы розных планаў і рашэнняў па ўздыме сельскай гаспадаркі, а іншыя мусілі ім падпарадкоўвацца, слухацца іх, хоць такая пакорлівая паслухмянасць у шэрагу выпадкаў была толькі вонкавай праявай працоўнай дысцыплінаванасці і таму малаэфектыўнай у духоўна-маральным і ў матэрыяльна-эканамічным плане.

А. Кулакоўскі раскрываецца ў аповесці «Дабрасельцы» і як таленавіты майстар змястоўнай і ёмістай, глыбокай на падтэкст сацыяльна-псіхалагічнай дэталі. Многія чытачы гэтага твора, безумоўна, і самі былі ўнутрана падрыхтаваны паглыбіць і разгарнуць падтэкставую аснову аповесці, бо нават і не дужа багаты вясковы вопыт чалавека, калі ён больш ці менш сур'ёзна задумваўся над жыццём і здольны быў ставіць перад сабою пытанні, мусіў навесці яго на адпаведныя асацыяцыі, нагадаць яму і падказаць, што аптымістычны тон шматлікіх афіцыйных рэляцый аб няўхільным уздыме сельскай гаспадаркі далёка не адпавядае сапраўднаму і шмат у чым драматычнаму становішчу вёскі, пакутным і няспраўджаным надзеям на лепшае жыццё яе жыхара і працаўніка.

Гэта, аднак, адразу ж выклікала адпаведную рэакцыю крытыкаў, якія ніколі ў вёсцы не жылі, вясковага жыцця не ведалі, але лічылі сябе вялікімі знаўцамі-універсаламі

ва ўсіх сферах жыцця. Незайздросную ролю крытыка-прапрацоўшчыка ўзяў тут на сябе Я. Герцовіч. Ды і не ўпершыню ён браўся за такія брудныя справы. Гэты крытык у нашай літаратуры даволі паслядоўна працягваў з адпаведнай папраўкай на час бэндаўска-кучараўскія традыцыі і заўсёды быў напагатове, каб стрымаць, стрыножыць і збэсціць мастацкае слова, калі яно выяўляла недвухсэнсоўную схільнасць збочваць з афіцыйнага курсу.

І аповесць А. Кулакоўскага «Дабрасельцы» ўяўляецца яму творам наскрозь фальшывым, дзе быццам бы «чорнымі фарбамі» (так называўся артыкул Я. Герцовіча) абмалёвана наша амаль бесканфліктная, светла-ружовая рэчаіснасць: «Аб аўтарскіх намерах адно скажу: хацеў гэтага пісьменнік ці не хацеў, а твор ён напісаў заганны. Аповесць «Дабрасельцы» ганіць і прыніжае савецкіх людзей, скажае праўду аб нашай рэчаіснасці. Пісьменнік не здолеў убачыць і паказаць той праўды жыцця, якая характэрна для калгаснай вёскі, і таму твор яго аказаўся наскрозь фальшывым, тым крывым люстрам, праз якое нельга ўбачыць падзей у сапраўдным іх праламленні, а толькі ў скажоным, перакручаным» [4].

Вядома, такая крытыка не магла не ўплываць на зніжэнне ўзроўню праўдзівасці і духоўна-гуманістычнага пафасу літаратуры. А некалькімі дзесяцігоддзямі раней падобнае слова ў крытыцы здольна было ў адно імгненне раструшчыць і паламаць пісьменніцкае жыццё, ператварыць яго ў суцэльную катаргу або проста ў лагерны пыл. Сёння мы шмат пра гэта ведаем, але далёка не ўсё.

Зразумела, узвальваць увесь цяжар адказнасці за нізкую шкалу маралі і духоўнасці ў грамадстве на літаратуру, мастацтва і навуку аб літаратуры і мастацтве было б несправядліва. Хоць можна пачуць і супрацьлеглыя меркаванні. Духоўны, маральны, культурны патэнцыял грамадства фармуе ўвесь уклад жыцця, усе яго палітычныя, эканамічныя, сацыяльныя структуры, бытавыя і быційныя фактары.

Аднак не будзем безуважнымі і да літаратурна-мастацкіх уздзеянняў, хоць вымярэнням і вызначэнням яны паддаюцца не проста. Ёсць падстава думаць, што раман «Кавалер Залатой Зоркі» С. П. Бабаеўскага, выдадзены мільённымі тыражамі, па-свойму прыгожа і рамантыза-

---

[4] Літ. і мастацтва. 1958. 21 чэрв.

вана экранізаваны і ўдастоены самай высокай па тым часе афіцыйнай адзнакі — Сталінскай прэміі, быў не такой ужо бяскрыўднай з'явай, як магло на першы погляд здавацца. Сваім творам пісьменнік закалыхваў грамадскую свядомасць і маладога, малавопытнага чалавека мог увесці ў зман, настроіць яго паверыць у тое, што, маўляў, толькі навокал яго па нейкай выпадковасці, недарэчнасці ці збегу неспрыяльных абставін адбываюцца негатыўныя працэсы ў калгасным жыцці, а ад'едзь крышку далей — і ўсё там адпавядае высокім і высакародным духоўна-маральным, культурным і эканамічным прынцыпам, нормам і стандартам.

Відаць, паўплывалі і не маглі негатыўна не паўплываць на духоўны і маральны стан літаратуры і некаторыя выказванні М. Горкага, які падчас залішне паспешліва скіроўвае свае публіцыстычныя словы на падтрымку далёка не гуманістычных інтарэсаў сталінска-берыеўскай палітыкі. Не хацелася б верыць, але ж гэта факт, што іменна М. Горкі ў 1930 г. піша артыкул «Калі вораг не здаецца,— яго знішчаюць», дзе выказвае думкі якраз у духу сталінскага разумення тэорыі класавай барацьбы ва ўмовах пабудовы сацыялістычнага грамадства. Яму здаецца, што рэальныя класавыя супярэчнасці ў краіне ў пачатку трыццатых гадоў давалі «нам поўнае права лічыць сябе ўсё яшчэ ў стане грамадзянскай вайны. Адсюль вынікае **натуральны** (выдзелена мною.— *В. Ж.*) вывад: калі вораг не здаецца,— яго знішчаюць» [5].

Тое, што Горкаму ўяўляецца з'явай натуральнай, на самай справе было падзеяй антыгуманнай, далёка не адэкватнай такому паняццю і пабудаванаму на аснове яго памылковаму вываду.

Нешта падобнае заўважаем мы і ў яго артыкуле «Гуманістам», таксама пазначаным 1930 г. На гэты раз ён катэгарычна не пагаджаецца з членамі «Інтэрнацыянальнага саюза пісьменнікаў-дэмакратаў» — маладым тады прафесарам Альбертам Эйнштэйнам і вядомым нямецкім пісьменнікам Генрыхам Манам, якія, паводле слоў М. Горкага, разам з многімі іншымі гуманістамі нядаўна падпісалі пратэст нямецкай «Лігі абароны правоў чалавека» супраць смяротнай кары сарака васьмі «злачынцаў», арганізатараў «харчовага голаду ў Саюзе Саветаў». І ў дадзеным выпадку вывад пісьменніка бескамп-

---

[5] Горький М. Собр. соч.: В 30 т. М., 1953. Т. 25. С. 228.

рамісны і гучыць як суровы пракурорскі прысуд: «Арганізатары харчовага голаду, выклікаўшы справядлівы гнеў працоўнага народа, супраць якога яны скіравалі сваю подлую змову, былі пакараны смерцю па адзінадушным патрабаванні рабочых. Я лічу гэта пакаранне цалкам законным. Гэта — суд народа...» [6]

Безумоўна, народную волю, якая вымушана выносіць суровы прысуд за тыя ці іншыя злачынствы, як і той народны суд, што ратуе і абараняе невінаватага, мы ў прынцыпе маем права лічыць справядлівай і аўтарытэтнай грамадскай сілай. Ды і наогул народнае меркаванне, народнае слова, народная думка — ухвала гэта або ганьба — спрадвечна лічыцца вышэйшым паказчыкам аб'ектыўнасці. Але тут трэба зрабіць вельмі сур'ёзную агаворку і важнае ўдакладненне. Далёка не ўсякі раз словы «народны», «народнае», «народныя» і г. д., якія ўжываюцца як ацэначныя эпітэты і якія нярэдка маюць выключнае значэнне ў вырашэнні лёсу чалавека, заключалі ў сабе і на самай справе шырокамаштабны, аб'ектыўны і непрадузяты народны погляд, народную ацэнку.

Не так проста, дарэчы, і вызначыць тую меру ацэначнасці, якую можна было б з поўным правам назваць народнай. У шэрагу выпадкаў такую цяжкасць вызначэння народнага погляду, народнай ацэнкі той або іншай з'явы, таго або іншага жыццёвага факта часта не ў лепшых мэтах выкарыстоўвалі і выкарыстоўваюць розныя нядобрасумленныя палітыкі. Свае антынародныя і зламысныя намеры ім заўсёды было выгадна праводзіць у жыццё пад дэмагагічным сцягам самаадданай і самаахвярнай барацьбы **за народныя** інтарэсы. І таму ўсімі праўдамі і няпраўдамі яны імкнуліся дастасаваць аўтарытэт народнага погляду, народнай ацэнкі, народнага прызнання або непрызнання да сваіх амбіцыйных і карыслівых планаў, а дзеля гэтага звычайна трэба было ў аснову сваіх дзеянняў у закадзіраванай, закамуфляванай форме пакласці падманныя ідэі, сродкі і прынцыпы, якія б дапамагалі стварыць у нечым блізкае да праўды вонкавае ўражанне народнай падтрымкі іх палітычных захадаў.

І, на жаль, часта гэта многім удавалася. Гітлеру ўдалося абдурыць і павесці за сабою вялікія масы немцаў, прымусіўшы многіх з іх паверыць, што яны прадстаўнікі самай вышэйшай расы, пасланай самім Богам кіраваць і

---

[6] Горький М. Собр. соч. Т. 25. С. 235.

камандаваць ніжэйшымі расамі і ў першую чаргу славянскімі народамі. Умеў гэты прэтэндэнт на сусветнае панаванне, як вядома, паказаць сябе і ў арэоле ўсенароднай ухвалы і масавай народнай падтрымкі. Шмат у чым неперасўзыдзеным майстрам такіх тэатралізаваных (і не толькі тэатралізаваных) акцый быў і наш уласны дыктатар — Іосіф Джугашвілі, жудасная і крывавая рэпрэсіўная машына якога змагла доўгі час безадказна працаваць і перамолваць мільёны і мільёны чалавечых жыццяў пад акампанемент вясёленькай музыкі, бравурных маршаў і пад бурныя апладысменты ўдзельнікаў шматлюдных сходаў і мітынгаў. Як паведамлялі звычайна ў такіх выпадках газеты, усё гэта адбывалася пры поўнай падтрымцы і ўсеагульным адабрэнні шырокіх народных мас.

Крытэрый народнай ацэнкі ў кожнай справе важны і, можна сказаць, мае рашаючае значэнне. Але ў адно і тое ж паняцце часта ўкладваецца зусім розны ці не адзін і той жа маральны сэнс. У аснове такіх з'яў звычайна палягаюць прычыны таксама самыя розныя, хоць яны і вылучаюцца ў дзве выразна акрэсленыя падгрупы — прычыны суб'ектыўнага і аб'ектыўнага характару. Ды і самі спосабы, прыёмы і метады скажэння і дэфармацый славазлучэння «народная ацэнка» таксама бываюць самымі разнастайнымі.

А найбольш непажаданым і найбольш небяспечным спосабам такой дэфармацыі трэба, відаць, прызнаць такі, калі ў інтэрпрэтацыі слоў «народная ацэнка» колькасны фактар «падаўляе» важныя сутнасныя і якасныя моманты з'явы, гвалтоўна пераключае думку ў сферу суб'ектыўна-тэндэнцыйнага жадання і такім чынам трансфармуе яе ў неаспрэчныя, катэгарычныя і безапеляцыйныя вывады.

Падобныя вывады і меркаванні неслі ў сабе асаблівую небяспеку, калі яны выказваліся людзьмі, якія займалі ў грамадскім працэсе неардынарнае месца. Калі б, напрыклад, нехта іншы, звычайны, радавы чалавек, а не Сталін выказаў тую, у навуковых адносінах бязглуздую і адначасова страшную ў сваёй практычнай сутнасці думку аб нарастанні класавай барацьбы па меры развіцця і разгортвання ў краіне сацыялістычных форм жыцця, то гэта палажэнне пры ўсёй яго памылковасці і бессэнсоўнасці вялікай шкоды, трэба меркаваць, не прынесла б. Але ўлічваючы, што выказана яно было чалавекам, які ў гра-

мадска-адміністрацыйнай іерархіі займаў першае месца і быў нецярпімы да ўсякіх праяў іншадумства, палажэнне гэта і станавілася важнай асновай многіх тэорый, а дакладней кажучы, ілжэтэорый, глыбока і разбуральна закрануўшы ўсе без выключэння сферы духоўнага і літаратурнага жыцця.

Не магла адмоўна не паўплываць на зніжэнне эстэтычнага ўзроўню літаратуры і дэгуманізацыю мастацкай думкі грамадская падтрымка гэтых палажэнняў Сталіна такімі пісьменнікамі, як Горкі, бо аўтарытэт яго ў той час, трэба сказаць, быў немалы. І калі Горкі, той самы Горкі, што напісаў шэраг неблагіх і таленавітых мастацкіх твораў, а ў часы рэвалюцыі і грамадзянскай вайны актыўна, смела выступаў у абарону прынцыпаў гуманізму, грамадзянскіх правоў чалавека і шмат добрага і карыснага зрабіў для паляпшэння незвычайна складанага і цяжкага становішча многіх прадстаўнікоў інтэлігенцыі, раптам у пачатку 30-х гадоў адзін за адным піша і публікуе ў цэнтральных партыйных органах друку — газетах «Правда» і «Известия» — артыкулы ў падтрымку афіцыйнага палітычнага курсу, то зноў-такі многім чытачам і пісьменнікам, якія раней давяралі горкаўскаму аўтарытэту, прыслухоўваліся да яго голасу, магло здацца, што і ў дадзеным выпадку ён б'е трывогу, папярэджвае аб наступе на заваёвы сацыялізму нейкіх цёмных і злых сіл і што мы і сапраўды «маем падставу лічыць сябе ўсё яшчэ ў стане грамадзянскай вайны».

А з гэтага вынікае, што адны групы людзей могуць і быццам бы маюць права навязваць сваю волю іншым групам. А калі нехта дазваляў сабе ў такі час крытычным позіркам глянуць на рэчаіснасць, усумніцца ў канцэптуальных палажэннях «тэорыі» класавай барацьбы, а тым болей выявіць сваю нават асцярожную нязгоду з афіцыйным поглядам, дык было ўжо нібыта зусім дастаткова, каб залічыць гэтага чалавека ў стан ворагаў народа.

Вялікая драма і трагедыя нашай паслякастрычніцкай гісторыі заключаецца, аднак, у тым, што па меры ўмацавання сталінскага культу асобы і з'яўлення розных замаскаваных пад праўду ілжэдоказаў аб паглыбленні класавай барацьбы яшчэ мацней пачынаў раскручвацца махавік рэпрэсіўнай машыны, якая патрабавала ўсё новых і новых чалавечых ахвяр. Жыццё чалавека пад час кульмінацыйнага разгулу сталінска-берыеўскай апрычні-

ны назусім выпадала з арбіты высокіх гуманістычных каштоўнасцей.

Наіўнаму чалавеку (а на наіўных і даверлівых людзей у першую чаргу ўсе гэтыя навукападобныя пастулаты і былі разлічаны) магло здацца, што пры ўсёй жорсткасці тут быццам бы ёсць і здаровае зерне ісціны, бо над інтарэсам аднаго, інтарэсам асобы беражліва і заклапочана ўзвышаецца агульнаграмадскі, агульнанародны, агульнадзяржаўны, агульнапартыйны інтарэс. Менавіта на гэту хвалю ўспрымання рэчаіснасці настройвае свайго чытача У. Маякоўскі:

Единица!
Кому она нужна?!
Голос единицы
тоньше писка.
Кто ее услышит?—
Разве жена!
И то
если не на базаре,
а близко.
Партия —
это
единый ураган,
Из голосов спрессованный
тихих и тонких.
От него
лопаются
укрепления врага,
как в канонаду
от пушек
перепонки.
Плохо человеку,
когда он один,
Горе одному,
один не воин —
Каждый дюжий
ему господин,
И даже слабые,
если двое. [7]

Як бачым, Маякоўскі досыць катэгарычны і недвухсэнсоўны ў апафеозным услаўленні сілы калектыву і яўна заніжана падкрэсленай ацэнцы сілы кожнага чалавека паасобку.

Мастацкая думка верша, вядома, далёка не заўсёды паддаецца перакладу на мову строга лагізаванай празаічнай сістэмы. Такі пераклад найчасцей зніжае нейкія важныя пачуццёва-сэнсавыя моманты гэтай думкі і зву-

[7] Маяковский В. Полн. собр. соч. Т. 6. С. 256—266.

жае іх асацыятыўна-вобразны лад. Аднак такі эксперымент падчас бывае і неабходны, каб, гаворачы вядомымі словамі пушкінскага героя, «поверить алгеброй гармонию» і такім чынам яшчэ лепей пераканацца ў тым, наколькі гэта гармонія трывалая, змястоўная і ўнутрана цэласная. Разглядаючы той урывак з паэмы «Уладзімір Ільіч Ленін», на які толькі што спасалаліся, і дапаўняючы гэты разгляд крытэрыем неадназначнага, неапалагетычнага падыходу да ацэнкі вуснай народнай творчасці, мы можам глыбей заўважыць неапраўдана рэзкае і ў чымсьці нават няправамерна аднабаковае супрацьпастаўленне духоўна-фізічных магчымасцей асобы і магчымасцей калектыву.

Адзін у полі не воін ці, як гаворыць Маякоўскі, «адзін не воін» — гэта сапраўды метафарычны выраз з вуснай народнай творчасці, трансфармаваны, дарэчы, у многіх і многіх прыказках, прымаўках, казках, паданнях, песнях. Не будзем аспрэчваць яго сэнс. Але нельга, як паказвае жыццё, і абсалютызаваць закладзеную ў гэтым выразе думку. Бо і **адзін** у няпростых варунках мірнага жыцця, як і на полі бою, часта бывае воінам. Ды яшчэ якім!

У гэтай сувязі нельга прызнаць як нейкую неабвержную думку Маякоўскага аб тым, што нават слабыя, калі іх двое, заўсёды і нязменна здольны выступіць у дачыненні да аднаго як **уладарная і непераможная сіла**. Гэта не вельмі дакладна і ў плане чыста фізічнага супрацьпастаўлення сілы аднаго і сілы двух або некалькіх чалавек. У той жа народнай творчасці, дзе і сапраўды ў многіх і многіх выпадках паказваецца і ўслаўляецца перавага знітаванай адзінствам і згодай калектыўнай сілы ў параўнанні з нейкай магутнай індывідуальнай сілай, разам з тым не з'яўляецца выключэннем і ўслаўленне фізічнай моцы асілкаў, якім даводзілася ўступаць у бойку з ахоўнікамі каштоўных скарбаў, а нярэдка нават з вялікім войскам і дзякуючы сваёй незвычайнай фізічнай сіле і вывучцы, а ў дадатак яшчэ і хітрасці, кемлівасці, розуму перамагаць іх.

Тое, што ў інтэрпрэтацыі традыцыйных фальклорных паняццяў мы маглі б назваць сёння духоўна-маральнымі і інтэлектуальнымі магчымасцямі чалавека, народная творчасць увогуле ставіць на першае месца перад усімі астатнімі, таксама важнымі і значнымі характарыстычнымі рысамі чалавека. Абагаўляецца, услаўляецца і

ўзвышаецца найперш усё-такі ў казках, песнях, паданнях не фізічная сіла, а дабрыня, розум, мудрасць ці тая ў рэшце рэшт наіўная, як у Іванкі-дурачка, безаглядная смеласць і нестандартнасць мыслення, што з'яўляецца ў выніку важным матывам поспеху ў выкананні пэўнай, найчасцей няпростай справы, у разгадванні шмат у чым таямнічай з'явы і г. д. Вось чаму, шукаючы саюзніка і дарадчыка ў асобе безыменнага і шматгалосага калектыўнага аўтара народных твораў, гэты момант трэба абавязкова ўлічваць і ні ў якім разе не спяшацца абагульняць, а тым болей штучна падганяць вывады пад звужана-аднамерную сістэму сваіх суб'ектыўных планаў. Бо тэндэнцыйнасць, якая ў тых або іншых формах не можа не спадарожнічаць самаму аб'ектыўнаму погляду ў літаратуры і мастацтве, пад уплывам паспешлівага, не падуладнага кантролю строгай аналітычнай думкі меркавання можа перарастаць у схематычныя формы суб'ектывізму.

Не пазбегнула гэтага праліку і мастацкая думка У. Маякоўскага ў паэме «Уладзімір Ільіч Ленін». Маючы абсалютнае і поўнае права вылучыць буйным, завостраным планам ідэю, якую ён лічыць галоўнай, вузлавой, дамінантнай, пісьменнік у той жа час у імя праўдзівасці і аб'ектыўнасці мастацкага малюнка не павінен быў змяншаць ролю і значэнне сілы, якая з фармаваннем і развіццём гэтай ідэі звязана самым цесным і непасрэдным чынам. Гэты жыццёвы і літаратурны закон паэт часта парушае. І асабліва прыкметна парушае яго там, дзе ў параўнанні з неабдымнай сілай, магутнасцю і веліччу партыі роля і сіла аднаго чалавека ў грамадска-гістарычным працэсе паказваецца мізэрнай, малазначнай. А іншы раз асобны чалавек пры такім супрацьпастаўленні выступае наогул у нейкай паблажліва-іранічнай або нават насмешліва-пагардлівай, зневажальнай аўтарскай характарыстыцы. Як бы паміж іншым паэт можа сказаць, што «единица — ноль», «единица — вздор», «голос единицы тоньше писка», які можа пачуць хіба толькі жонка, ды і то «если не на базаре, а близко». У. Маякоўскі падчас нібыта забывае, што моц любой дзеяздольнай і творчай грамады, у тым ліку і ўсякай мудрай, дальнабачнай партыі, выяўляецца не толькі ў адзінстве і сцэментаванасці яе радоў, але і ў тым, наколькі адметны і яркі ў духоўных адносінах кожны чалавек, што ўваходзіць у яе склад, і наколькі гэты чалавек, уваходзя-

чы ў пэўны калектыў, захоўвае за сабою права заставацца і быць тут шмат у чым самастойнай, суверэннай, актыўна-творчай і незалежнай індывідуальнасцю.

У Маякоўскага ж, чалавека ўвогуле не вельмі схільнага падпарадкоўвацца чужой волі і здольнага пастаяць за свой уласны гонар і духоўны суверэнітэт, як гэта не можа падацца некалькі дзіўным і парадаксальным, падобны прынцып у мастацкіх творах савецкага часу далёка не заўсёды вытрымліваецца. Найбольшую цікавасць і найбольшую каштоўнасць для аўтара мае той, у каго заўжды і нязменна прысутнічае імкненне «каплей литься с массами».

Не выключана магчымасць, што менавіта такі погляд паэта на падпарадкавальную ролю асобы ў яе ўзаемадачыненнях і ўзаемасувязях з калектывам, партыяй найбольш і «кранyў» Сталіна, калі ён падшукваў словы і эпітэты для той шырокавядомай фармуліроўкі, дзе У. Маякоўскі характарызуецца як «лепшы, таленавіцейшы паэт нашай, савецкай эпохі». Чалавек, які выяўляе безагаворачную ўнутраную гатоўнасць «каплей литься с массами», безумоўна, ужо наўперад шмат у чым адмаўляецца ад свайго індывідуальнага «я» і пакладаецца на волю, розум і дасведчанасць іншых. А гэта якраз і трэба было Сталіну: тады прасцей было маніпуляваць і асобным чалавекам, і масамі.

Гэта вельмі імпанавала будаўнікам і праектантам таталітарнага рэжыму яшчэ і таму, што давала ім магчымасць «падыгрываць» эмацыянальна-рамантычнаму імкненню людзей, многія з якіх, належным чынам «апрацаваныя» ўльтрарэвалюцыйнымі тэорыямі, па-сапраўднаму шчыра верылі, што чалавек, поўнасцю даверыўшыся калектыву і зліўшыся з ім, за больш кароткі тэрмін і больш лёгкім, простым і безбалесным спосабам зможа вырашыць усе свае складаныя сацыяльна-эканамічныя і нават духоўна-асабістыя, інтымныя праблемы і пытанні.

Падобныя тэорыі і падобнае, гаворачы словамі вядомага філосафа А. Цыпко, «супрацьпастаўленне грамадскага інтарэсу — асабістаму, будучага — сучаснасці і мінуламу, агульначалавечай маралі — класавай прынеслі людзям шмат бедаў, няшчасцяў, драматычным і трагічным бокам закранулі літаральна ўсе сферы жыцця нашай краіны» [8]. Аднак наступу такіх тэорый і такіх мерка-

[8] Наука и жизнь. 1988. № 11. С. 55.

ванняў, якія ў імя агульных калектыўных інтарэсаў, у імя «ачышчальнай» класавай барацьбы і заваёў далёкай светлай будучыні згодны былі праігнараваць надзённыя інтарэсы нейкага аднаго чалавека, было і супрацьдзеянне. І хоць больш ці менш смелыя і сумленныя яго праявы жорстка перапыняліся, знаходзіліся людзі, якія адважваліся гаварыць праўду і выступаць у абарону суверэнных **грамадзянскіх** правоў асобы, даказваючы, што толькі з духоўна развітой асобай мы можам звязваць свае планы і надзеі на цывілізаваныя, гуманістычныя формы развіцця грамадства і шчаслівае жыццё.

Так, на рубяжы 30-х гадоў, калі культ Сталіна набіраў сваю злавесную сілу, а пад сцягам ілжэнавуковых тэарэтычных высноў абвастрэння і нарастання класавай барацьбы адпаведныя органы распачыналі сваю страшэнную «працу» па вышуку так званых ворагаў народа, з даволі рэзкім пратэстам супраць нястрымнага свавольства высокіх дзяржаўных інстанцый у адносінах да асобы, з прачулым словам у абарону яе чалавечай годнасці і самакаштоўнасці выступае сусветна вядомы вучоны-фізіёлаг І. П. Паўлаў. На паседжанні, прысвечаным стогадоваму юбілею з дня нараджэння І. М. Сечанава, таксама буйнога і сусветна вядомага вучонага-фізіёлага, ён сказаў такія вельмі смелыя і ў пэўным сэнсе прароцкія словы: «Мы жывём пад пануючым уплывам жорсткага прынцыпу: дзяржава, улада — усё, асоба абываценя — нішто... Без Іванаў Міхайлавічаў Сечанавых з іх пачуццём годнасці і доўгу ўсякая дзяржава асуджана на пагібель знутры, нягледзячы ні на якія Днепрабуды і Волхаўбуды» [9].

І. П. Паўлаў, як бачым, ставіць побач асобу буйнога, сусветна вядомага вучонага і асобу звычайнага чалавека, ці, як ён гаворыць, абываценя, бо для яго ў дадзеным выпадку важна падкрэсліць думку пра тое, што і буйны вучоны, і звычайны чалавек здольны забяспечыць усебаковы і надзейны росквіт грамадства, краіны і дзяржавы толькі тады, калі сама дзяржава будзе спрыяць іх духоўнаму развіццю і не будзе скоўваць іх індывідуальнай творчай свабоды. І ён вельмі непакоіцца, каб адзінай і універсальнай мерай сацыяльна-эканамічнага і культурнага ўздыму краіны не сталі раптам Днепрабуды, Волхаўбуды і г. д. Для І. П. Паўлава ўсё гэта, трэба мерка-

---

[9] Советская культура. 1989. 14 янв.

ваць, не другарадныя, але і не першараднага, не самага галоўнага значэння моманты. Галоўным цэнтрам яго ўвагі з'яўляецца асоба, якая і ў абставінах націску на яе жорсткіх нівеліруючых сіл захоўвае сваё індывідуальнае духоўнае рэнаме.

І. П. Паўлаў, з'яўляючыся прадстаўніком старой класічнай школы рускіх вучоных, дзе ў кожнай яе галіне моцна выяўляла сябе ліберальна-дэмакратычная, талерантная плынь думкі, даволі смела падтрымлівае гэту тэндэнцыю і ў небяспечны, неспрыяльны для яе час. Гэта быў перыяд, калі з навуковай гісторыі фактычна былі ўжо выкраслены імёны так званых філосафаў-ідэалістаў — М. Бярдзяева, У. Салаўёва, С. Булгакава, Г. Флароўскага, Г. Фядотава, Б. Вышаслаўцава і інш. А менавіта ў іх працах праблема духоўнасці чалавечай асобы і праблема свабоды чалавека займала дамінуючае месца.

М. Бярдзяеў, напрыклад, у шэрагу сваіх прац і ў такой капітальнай з іх, як «Руская ідэя: Асноўныя праблемы рускай думкі XIX стагоддзя і пачатку XX стагоддзя», імкнецца шырокім позіркам акінуць усе грамадскія пласты і плыні, звязаныя з фармаваннем і развіццём рускай душы і мнагастайных яе грамадска-псіхалагічных праяў у розныя перыяды гісторыі і пад уплывам розных акалічнасцей. Ён, як можна заўважыць, знаходзячы багаты спектр разнастайнасці гэтых грамадска-псіхалагічных прыкмет, у кожным выпадку спрабуе адшукаць аб'ектыўныя прычыны, якія садзейнічалі ўмацаванню «абшчынных», калектывісцкіх тэндэнцый у народнай свядомасці або, наадварот, спрыялі імкненню чалавека да індывідуальнай самазаглыбленасці і духоўнага самаўдасканалення. Аўтар лічыць не вельмі пажаданым супрацьпастаўляць гэтыя тэндэнцыі па лініі іх якасных вызначэнняў. Але бясспрэчным для яго застаецца той факт, што толькі пры існаванні моцнай і дзейснай народнай плыні, у якой працуе «абвостраная свядомасць асобы» [10] у сваіх супрацьдзеяннях уплыву **«безасабовага калектыву»** (выдзелена мною.— *В. Ж.*), і складваюцца найбольш спрыяльныя ўмовы як для прагрэсу грамадства, так і для духоўнага росту асобы.

Боязь таго, каб даверлівы чалавек раптам не падпаў пад уладу «безасабовага калектыву» і не страціў сваю

---

[10] О России и русской философской культуре: Философы русского послеоктябрьского зарубежья. М., 1990. С. 45.

індывідуальнасць, вельмі хвалявала і перадавых рускіх пісьменнікаў. Падчас слова іх у вырашэнні і пастаноўцы гэтага пытання набывала рэзкі і вострапалемічны характар, што найчасцей сведчыла пра іх неабыякавасць да такой важнай жыццёвай, грамадскай праблемы. Ф. М. Дастаеўскі, напрыклад, вельмі непакоіўся, каб рускі чалавек, грамадска-пабытавае жыццё якога шмат у чым было заснавана на абшчынных пачатках, залішне не перадаверыўся новаспечаным рэвалюцыянерам, для якіх іншы раз ідэя рэвалюцыі і перабудовы сацыяльна-палітычнага ладу краіны набывала абстрактны, самамэтны характар і не вельмі ўлічвала рэальныя патрэбы жывога чалавека і ўнутраную духоўную падрыхтаванасць шырокіх народных мас да такой карэннай грамадскай перабудовы.

У рамане «Бесы» ён якраз і ўступае ў вострую палеміку з тымі людзьмі, якія імкнуліся, нягледзячы ні на што, не столькі паглыбляць і расшыраць гарызонты народнай свядомасці, колькі ўзбаламучваць яе, падштурхоўваць на няпэўныя авантурныя ўчынкі і пад камуфляжам прыгожых слоў і ружовых абяцанняў неўпрыкмет адсоўваць на задні план «боскае» і вялікае ў чалавеку, прапаноўваючы яму танныя заменнікі лёгкіх рашэнняў і апаганьваючы яго душу і свядомасць д'ябальскай сілай бессардэчнай стыхіі, антыгуманнасці і разбурэння.

Варта было б, як гэта бачыцца з гістарычнай дыстанцыі часу, уважліва прыслухацца да таго, што казала нам прарочае слова геніяльнага пісьменніка. Бо яно рушыла ці ў рэшце рэшт грунтоўна падрывала аднамерныя канцэпцыі і тэорыі тых, хто самаўпэўнена імкнуўся прапанаваць народу свае «настаўніцкія» і «правадырскія» паслугі, далёка не заўсёды валодаючы настаўніцкім і правадырскім талентам і мысленнем. Таму не даспадобы быў гэты твор Ф. М. Дастаеўскага таталітарным уладам і ў нашай краіне, дзе сталінска-берыеўскі рэжым сілком, валюнтарысцкім шляхам навязваў шмат у чым блытаныя і заганныя ідэі пабудовы сацыялізму і быў бескампрамісна жорсткім і нецярпімым да якіх бы там ні было праяў іншадумства.

Не вельмі прыхільна, а нярэдка даволі рэзка (прыблізна за тое ж самае) крытыкаваўся і другі геній рускай літаратуры — Л. М. Талстой. Як вядома, Ленін асабліва крытычна быў настроены да той часткі яго мастацкай і публіцыстычнай спадчыны, дзе талстоўская думка ўсяляк

супрацiўляецца паспешлiваму ўцягванню чалавека ў рэвалюцыйна-перабудовачны працэс. Ленiну здавалася, што як мастак Л. М. Талстой вялiкi, а як палiтыку i iнтэрпрэтатару рэвалюцыйна-гiстарычных падзей жыцця яму шмат чаго бракуе. Ды i, калi гаварыць шчыра, чытаючы вядомыя ленiнскiя артыкулы пра Л. Талстога, мы ўвесь час адчуваем недвухсэнсоўнасць iмкнення Ленiна сказаць больш прама i адкрыта аб тым, што Л. Талстой, беручыся за распрацоўку грамадска-палiтычных пытанняў, займаецца не зусiм сваёю справай.

А вось М. Горкi, па гарачых слядах падзей выступiўшы ў друку з раманам «Мацi», быў адзначаны Ленiным самай высокай пахвалой, хоць гэты горкаўскi твор навiзною i яркасцю мастакоўскай палiтры не вызначаецца. Але Ленiна цiкавiла тут iншае, а менавiта тое, што iмпанавала яму як палiтыку, няўхiльна арыентаванаму ў сваёй практычнай дзейнасцi на падпарадкаванне iнтарэсаў асобы iнтарэсам рэвалюцыйнай тэорыi, дзе пануючай сiлай пераважна i заўсёды выступае калектыўная воля. У параўнаннi з талстоўскай канцэпцыяй рэвалюцыi, дзе найгалоўнейшай перадумовай усякай сур'ёзнай перабудовы грамадства з'яўляецца кардынальная духоўная перабудова чалавека, у горкаўскiм разуменнi грамадская перабудова ў першую чаргу ўсё-такi звязана з перабудовай абставiн, хоць, вядома, i тут ставiцца i ў шэрагу выпадкаў цiкава i таленавiта раскрываецца ўзаемазвязаны працэс памiж характарамi i абставiнамi. Але галоўная энергiя думкi, якая фармуе i рухае сюжэт твора, выяўляе ўсё ж сваю безальтэрнатыўную i бескампрамiсную скiраванасць на рэвалюцыйнае пераўтварэнне сацыяльна-палiтычнай сiстэмы жыцця.

У прынцыпе рэвалюцыянерам зусiм правамерна назваць i Л. М. Талстога, бо i ён як пiсьменнiк i грамадскi дзеяч усяго сябе аддаваў таму, каб жыццё чалавека станавiлася лепшым. I тое, што Ленiн, палемiзуючы i шмат у чым не пагаджаючыся з Талстым, мусiў усё-такi назваць яго творчасць люстрам рускай рэвалюцыi, адпавядала сапраўднасцi i не было ўсяго толькi фiгуральным метафарычным выразам. Бо паляпшэнне сацыяльнага, эканамiчнага, матэрыяльнага становiшча Л. М. Талстой самым цесным i самым непасрэдным чынам узаемазвязвае ўсё-такi з праблемай духоўнага развiцця чалавека i яго духоўнага самаўдасканалення, надаючы гэтаму апошняму моманту значэнне той найважнейшай i самай га-

лоўнай сілы, якая гарманізуе і гуманізуе жыццё наогул. А апрача ўсяго, стрымлівае злыя сілы і не дазваляе ім вырвацца на пярэдні план і гвалтоўна прадыктаваць сваю антыгуманную волю ўсім нязгодным з імі думкам, дзеянням, тэорыям і г. д.

Паслухаем хоць бы вось такое яго развважанне, якое на доўгі час запомнілася І. Буніну: «Для таго каб становішча людзей стала лепшым, трэба, каб самі людзі сталі лепшымі. Гэта такі ж труізм, як тое, што для таго, каб нагрэўся сасуд вады, трэба каб усе каплі яе нагрэліся. Для таго ж, каб людзі станавіліся лепшымі, трэба, каб яны ўсё больш і больш звярталі ўвагу на сябе, на сваё ўнутранае жыццё. Знешняя ж, грамадская дзейнасць, асабліва грамадская барацьба, заўсёды адцягваюць увагу людзей, зніжаюць узровень грамадскай маралі, зніжэнне ж узроўню грамадскай маралі робіць тое, што самыя разбэшчаныя (амаральныя) часткі грамадства ўсё больш і больш выступаюць на паверхню, і ўсталёўваецца амаральны грамадскі погляд, які дазваляе і нават падбадзёрвае злачынствы. І ўстанаўліваецца заганнае кола: выклікаеныя грамадскай барацьбой горшыя часці грамадства з запалам аддаюцца адпаведнай іх узроўню грамадскай дзейнасці, а гэта дзейнасць прыцягвае да сябе яшчэ горшыя элементы грамадства» [11].

Сапраўды, ёсць тут над чым сур'ёзна задумацца. І сёння талстоўская думка не страціла сваёй актуальнасці. Ды і, трэба меркаваць, ніколі не страціць. Бо ні адно грамадства, здаецца, яшчэ не здолела дасягнуць высокацывілізаваных форм у сваім развіцці і закласці трывалы падмурак для далейшага руху, адсоўваючы на задні план маральна-духоўныя прынцыпы.

Закранаючы нават нейкім ускосным чынам маральна-этычныя праблемы, крытыкі, літаратуразнаўцы, філосафы, псіхолагі вельмі часта спасылаліся на вядомае выказванне пра тое, што быццё вызначае свядомасць чалавека. Праўда, не заўсёды гэта шмат у чым і справядлівая думка ў працах нашых вучоных-грамадазнаўцаў атрымлівала глыбокае асэнсаванне ў дачыненні да распрацоўкі іншых прама ці апасродкавана звязаных з ёю пытанняў. Некаторыя з іх вельмі ўжо настойліва імкнуліся даказаць, што толькі сацыяльны статус бедняка

---

[11] Бунин И. А. Собр. соч.: В 9 т. М., 1967. Т. 9. С. 128.

вызначае (ледзь не механічна) высокую ступень яго духоўнасці.

Менавіта гэты момант як вызначальны крытэрый быў пакладзены ў аснову славутых анкет аб сацыяльна-класавым паходжанні чалавека. Цікавасць такой анкеты доўгі час зусім нельга было, скажам, задаволіць нашым **агульным** прызнаннем пра сваё сялянскае паходжанне. Трэба было яшчэ дакладна і недвухсэнсоўна сказаць: з беднякоў ты, сераднякоў альбо кулакоў? І хоць далёка не заўсёды проста было правесці жорсткую дэмаркацыйную лінію паміж гэтымі паняццямі, становішча пабуджала і абавязвала многіх і многіх шукаць яе, гэтую лінію, часам усякімі праўдамі і няпраўдамі падшукваючы аргументы, каб трапіць у графу найбольш надзейных, паважаных і палітычна прывілеяваных — незаможных, а лепей за ўсё — беднякоў. Бо гэта дазваляла чалавеку з бясспрэчна большай верагоднасцю быць прынятым на вучобу, давала больш шансаў уладкавацца на службу і заняць начальніцкую, кіруючую пасаду, гарантавала яму (хоць і не вельмі цвёрда) пэўнае кола грамадзянскіх свабод і правоў і г. д.

Канешне, мы не павінны сёння пад знакам усёабдымнага крытычнага пераасэнсавання агулам адмаўляць нашу гісторыю і асабліва тое першае паслякастрычніцкае дзесяцігоддзе, якое даволі-такі прыкметна, нягледзячы на ўсе складаныя і драматычныя перыпетыі гэтага часу, абудзіла творчыя і духоўныя сілы шырокіх народных мас. Шкада толькі, што таталітарныя ўлады бязлітасна падразалі крылы тым яе маладым сілам, якія якраз і неслі ў сабе квінтэсенцыю высокай народнай свядомасці, народнага духу і народнай маралі. Але факт застаецца фактам: многім фундаментальным асновам нашага жыцця ў паслякастрычніцкі час вялікую шкоду нанесла палітыка так званага падбору і расстаноўкі кадраў па прынцыпе сацыяльна-класавага паходжання і сацыяльна-эканамічнага становішча чалавека ў папярэднія, дакастрычніцкія часы. Бо быць бедняком-рабочым альбо бедняком-селянінам яшчэ не азначае быць вялікім патрыётам, вялікім гуманістам, вялікім інтэрнацыяналістам і г. д. І вядомы лозунг-эпіграф, лозунг-заклік «Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!», што ў нядаўнія часы красаваўся на першых палосах нашых газет, быў усё-такі вельмі звужаны ў сваёй агульнай арыентацыі чалавека на выхад яго да пошуку праўды, ісціны, справядлівасці і высокіх

маральных каштоўнасцей. Бо па-за ўвагай застаюцца тут важныя і дзейсныя гістарычныя сілы, для якіх таксама не чужыя пачуцці салідарнасці, інтэрнацыяналізму і брацкай узаемадапамогі. У гэтай сувязі цікава, відаць, будзе спаслацца і на такое меркаванне, заснаванае на вывучэнні псіхалогіі заможных амерыканцаў: «Ветлівасць падчас здаецца маніякальнай — на погляд чалавека, што зусім нядаўна знаходзіўся ў разлютаваных маскоўскіх чэргах. Дабрабыт робіць чалавека больш мяккім і, як ні дзіўна прагучыць гэта, больш салідарным з іншымі людзьмі. Да таго ж заможнасць, вызваліўшы чалавека ад цяжкіх паўсядзённых клопатаў, дазваляе яму аддацца інтарэсам больш узвышаным...» [12]

Канешне, гэта меркаванне чалавека, які на шматфарбнае і шматстайнае жыццё вялікай краіны паспеў паглядзець у межах свайго кароткатэрміновага знаходжання там. У такім разе могуць быць і перабольшанні, і пераацэнка, і недаацэнка пэўных момантаў. Але чалавек збоку мае і свае перавагі, бо, як вядома, падчас заўважае ў новай сітуацыі і нешта такое, што таму, каму ўсё гэта прымільгалася і пачало здавацца пастаяннай і штодзённай нормай, заўважыць бывае цяжка. Праявы гэтай псіхалагічнай раскаванасці і абыходлівасці як нейкі абагульнена-тыпалагічны малюнак у паводзінах заможнага чалавека, не абцяжаранага ў такой ступені, як абцяжараны на сённяшні дзень наш чалавек побытавымі клопатамі і універсальным дэфіцытам, менавіта і ўдалося падмеціць аўтару артыкула «Развітанне з ілюзіяй» Аляксандру Васінскаму.

Не выключана магчымасць, і нават зусім верагодна, што журналіст нешта перабольшвае ў жыцці чужым і недаацэньвае ў нашым. А магчыма,— гэта таксама не выключаецца, у дадзеным выпадку мае месца і проста палемічная рэакцыя таго, каму доўгі час з усіх ідэалагічных «амбонаў» нагадвалі пра тое, што толькі бедны ці ў рэшце рэшт небагаты чалавек па-сапраўднаму і можа быць чалавекам добразычлівым, маральным, міласэрным і наогул духоўна багатым. Досыць мэтанакіравана выпрацоўваўся і ў пэўнай ступені, трэба сказаць, выпрацаваўся своеасаблівы стэрэатып: калі ты багаты, то пра высокую мараль і высокую духоўнасць ніякай сур'ёзнай гаворкі быць не можа. Такі погляд быў памыл-

---

[12] Известия. 1991. 3 июля.

ковым і больш таго, у шэрагу выпадкаў шкодным. З'яўляючыся ў той або іншай ступені метадалагічным арыенцірам, падобны погляд часта прыносіў, напрыклад, у літаратуру штучнасць, зададзенасць і суб'ектыўную аднабаковасць у раскрыцці характараў і канфліктаў. Многія творы нашай літаратуры на лініях асэнсавання і раскрыцця канфліктаў і наогул узаемадачыненняў паміж багатымі і беднымі звужалі свае ідэйныя гарызонты, паслаблялі сваю мастацкую сілу.

Дастаткова прыгадаць хоць бы творы на тэму калектывізацыі. Толькі зрэдчас можна было сустрэць твор на гэту тэму, дзе заможны селянін, ці, паводле вядомага класавага вызначэння, кулак, быў носьбітам станоўчых якасцей характару. Такі паказ багатага вяскоўца супярэчыў бы вядомаму сталінскаму патрабаванню ліквідацыі кулацтва як класа. І пісьменнікі, баючыся трапіць пад рэпрэсіўны ўдар, нярэдка насуперак сваёй творчай волі вымушаны былі будаваць штучны стэрэатып пра добрых, міласэрных, працалюбівых і высокамаральных сялян-беднякоў і іх сквапных, бессардэчных крывасмокаў-эксплуататараў — багацеяў, кулакоў.

І гэты штучны стэрэатып, збудаваны папярэднікамі, здаваўся з'яваю настолькі звыклаю і неаспрэчнаю, што на яе парушэнне нялёгка ішлі і наступнікі. Прычым нават тады, калі ўжо, здавалася, прэсінг вялікага страху і небяспекі за ўласнае жыццё прыкметна зменшыў сваю ўладу над творчаю асобаю пісьменніка.

Так, напрыклад, у трылогіі М. П. Лобана «Шэметы» (1961—1981) і рамане А. Д. Чарнышэвіча «Засценак Малінаўка» (1961—1964), як гэта справядліва прызнана нашай крытыкай, таленавіта выяўляе сябе новы погляд і на падзеі дакастрычніцкага вясковага жыцця, і на тыя складаныя, драматычныя падзеі, якія звязаны з калектывізацыяй аднаасобніцкай беларускай вёскі. Гэтыя творы, нягледзячы на багатую і плённую мастацкую традыцыю ў асвятленні вясковай тэмы і надзвычай складанага яе аспекту — калектывізацыі, упершыню вызначаліся, апроч усяго, і новым узроўнем гуманістычнасці ў дачыненні да чалавека-працаўніка.

Мастацкае слова пісьменнікаў тут больш цярплівае, больш асцярожнае і памяркоўнае ў вызначэннях характару і псіхалогіі чалавека, чым, напрыклад, слова М. Шолахава ў рамане «Узнятая цаліна» або, скажам, слова К. Чорнага ў аповесці «Лявон Бушмар», дзе аўтар хут-

чэй за ўсё насуперак уласнай волі — ёсць для такога меркавання адпаведныя факты ў творы — «аддае даніну» часу, яўна завастраючы, завышаючы, падчас нават гіпербалізуючы негатыўныя рысы ў характары галоўнага героя аповесці Лявона Бушмара. Не хочацца даць веры таму, што К. Чорны, аўтар псіхалагічна тонкіх раманаў «Сястра» і «Зямля», яркіх апавяданняў, дзе заглыблена раскрываецца ўнутраны свет чалавека і ў якіх з выключнай, зайздроснай, рэалістычнай дакладнасцю паказваюцца навакольныя абставіны, раптам пачаў «збівацца з тропу» і не заўважаць важнейшыя спружыны рэчаіснасці.

Не, ён вымушаны быў гэта рабіць пад уздзеяннем акалічнасцей, жывы і разнаіты рух якіх тагачасныя лідэры нашай краіны імкнуліся ўціснуць у вузкую схему тэорыі класавай барацьбы, у межах якой бядняк, пралетарый у параўнанні з багацеем мусіў (за рэдкім выключэннем), бадай, заўсёды заставацца на вышэйшай духоўна-маральнай ступені. Ну а тых, хто такую меру ацэнкі лічыў недасканалай, афіцыйныя ўлады «пераконвалі» шляхам прымусовага і проста рэпрэсіўнага навязвання ім сваёй волі. І гэты факт, безумоўна, трэба ўлічваць, калі ў творах таленавітых пісьменнікаў мы часта знаходзім парушэнне законаў жыццёвай праўды.

Так што не будзем сёння спяшацца іх крытыкаваць, а паспрабуем глыбей, улічваючы канкрэтна-гістарычную, грамадска-літаратурную сітуацыю, разабрацца ў складаным і спрадвечным пытанні двух дыялектычна ўзаемазалежных велічынь — чалавека і абставін, звязваючы яго не толькі з фармаваннем і развіццём характару літаратурнага героя, але і з рухам, станам, эвалюцыяй характару самога пісьменніка. І тады мы павінны будзем прызнаць, што герою, як і пісьменніку, перамагчы абставіны іншы раз бывае проста не пад сілу.

У такім разе пад жорсткім націскам вонкавай сілы асяроддзя, добра разумеючы і адчуваючы рэальнае разгортванне жыццёвых канфліктаў, ён падчас вымушаны паказваць у сваіх творах рэальнасць падмалёваную, падфарбаваную, а іншы раз і проста бесканфліктную, ружова-бязвоблачную. Гэту з'яву, вядома, не можа ў поўнай меры апраўдаць у творчасці пісьменніка ніякі аргумент. Але нельга не зразумець і таго, што ў межах добра вядомай таталітарнай улады свабодны творчы пошук ісціны быў заняткам непажаданым і выключна небяспечным, бо гэта магло прывесці да адмаўлення нейкіх важ-

ных для гэтага рэжыму пастулатаў, дактрын, прынцыпаў, тэорый і наогул да непрадбачаных вынікаў.

Таленавітыя, сумленныя пісьменнікі, аднак, і ў такіх умовах кожны па-свойму шукалі спосабы і прыкладалі намаганні, каб мастацкае слова пэўным чынам захоўвала і ў неспрыяльных абставінах сувязь з жыццёваю асновай — рэальнымі фактамі, канфліктамі, характарамі і г. д. У шэрагу выпадкаў (хай сабе і з яўнымі эстэтычнымі выдаткамі) ім гэта ўдавалася.

Жывыя праявы сацыяльна-псіхалагічнай рэальнасці, якія мы знаходзім, напрыклад, у такіх творах, як «Лявон Бушмар», «Люба Лук'янская» і «Зямля» К. Чорнага, «Канец дружбы» К. Крапівы, «Адшчапенец» Я. Коласа, «Вязьмо» М. Зарэцкага, «Запіскі Самсона Самасуя» А. Мрыя і інш., даюць нам сёння магчымасць па-новаму іх перачытваць, знаходзіць у іх другую, глыбейшую і больш змястоўную сюжэтную лінію, што раней пад уплывам пэўных грамадскіх абставін і пад уздзеяннем нарматыўных патрабаванняў літаратурнай тэорыі (у прыватнасці, тэорыі і метадалогіі сацыялістычнага рэалізму) мы часта адсоўвалі на задні план, давалі звужаную і памылковую трактоўку характарам, якія неслі ў сабе прыхаваную, завуаляваную падтэкстам аўтарскую думку аб нежаданні здаровага народнага сэнсу і здаровай народнай маралі механічна, бяздумна падпарадкоўвацца адцягненым, адарваным ад жыцця тэорыям, не дужа разумным і не вельмі схільным улічваць маральныя духоўныя набыткі вякоў, агульначалавечыя каштоўнасці.

У гэтай сувязі, напрыклад, своеасаблівым адкрыццём для шырокага масавага чытача, ды і для шэрагу прафесіяналаў, крытыкаў і літаратуразнаўцаў, з'явіўся артыкул М. Мушынскага «Ці быў Міхал Тварыцкі ворагам народа?» І, здаецца, яму ўдалося пераканальна даказаць, што ніякім ворагам народа і савецкай улады Міхал Тварыцкі не быў і што яго жонка Зося, беручы на веру прасталінейнасць асобных палажэнняў сталінскай тэорыі класавай барацьбы, не такі ўжо і станоўчы, а дакладней кажучы, зусім не станоўчы герой, як гэта доўгі час прынята было лічыць. Пад гэтым кутом гледжання ў пазітыўным ацэначным ключы разглядаецца і такі яе крок, як прамы і недвухсэнсоўны палітычны данос на ўласнага мужа.

Не кожнаму пісьменніку, аднак, удавалася закласці ў свой твор мастацкую праграму, якую ў пэўных умовах

магчыма было расчытаць у значна больш аб'ёмным і глыбокім плане ўзаемадзеяння мастацкай думкі, мастацкага малюнка з рэчаіснасцю, чым гэта нярэдка прапаноўвалася вульгарна-сацыялагічнай крытыкай. У шмат разоў цяжэй, напрыклад, было закласці такую поліфанічную сэнсавую праграму паэту-лірыку, бо ў самім жанры лірыкі мастацкае слова звычайна больш і часцей імкнецца выявіць сябе ў формах адкрытай спавядальнасці, чым слова спакойнай і ўраўнаважанай рэалістычнай манеры. Усё гэта, трэба меркаваць, павялічвала ўнутраныя пакуты і ўскладняла творчы шлях усякага сапраўднага паэта, які разумеў і адчуваў, што жыццё ў сваім развіцці значна складаней, чым недвухсэнсоўна і прасталінейна настройвалі яго ўспрымаць розныя ружова-аптымістычныя тэорыі, у той жа час скіраваныя на падаўленне ўнутранай, духоўнай ініцыятывы асобы і яе творчай самастойнасці.

Мы ведаем, напрыклад, што Я. Купалу трэба было, каб неяк «улагодзіць» таталітарны сталінскі рэжым ці ў рэшце рэшт стварыць ілюзію лаяльнасці да яго кіраўнікоў, у чымсьці адмовіцца ад самога сябе, папярэдне зрабіўшы замах на ўласнае жыццё. Відаць, многія таямніцы пісьменніцкай душы ў поўнай меры ўзнавіць і рэканструяваць не пад сілу нават самаму тонкаму крытыку-псіхолагу. Калі ж, аднак, гэта можна было б зрабіць, то ў праявах мажорнай танальнасці многіх яго вершаў часоў сталіншчыны мы ўбачылі б, відавочна, прысутнасць той унутранай несвабоды і самакантрольнай сілы, якая, змагаючыся з самою сабой і імкнучыся абысці паўстаўшую на яе шляху смяртэльную пастку-перашкоду, вымушана была ўсё ж пэўным чынам імітаваць сваю згоду з сілаю жорсткага і бязлітаснага вонкавага прымусу.

Цяжка ўявіць, што Купала, першакласны, бліскучы літаратар, глыбокі знаўца душы чалавека і народнага жыцця, чалавек, які прайшоў праз буры трох рэвалюцый і акумуляваў у сабе такі багаты грамадскі вопыт, раптам стаў настолькі блізарукім і наіўным, што не ўбачыў і не зразумеў, куды мы ідзём, хто нас вядзе і якімі метадамі карыстаюцца ўсе тыя, хто, прыкрываючыся імем народа, учыняў нечуваныя па сваім размаху і жорсткасці антынародныя акцыі, прымушаў працоўны люд знясільваць сябе ў бесперапынных і малаэфектыўных эксперыментах і выпрабаваннях.

Як нам здаецца, штучна не скіроўваючы Купалу на шлях нейкай празмерна наіўнай даверлівасці і шчырых, суб'ектыўных заблуджэнняў наконт таго, хто ёсць хто і што ёсць што ў нашым драматычным і трагічным жыцці 30-х гадоў, ёсць падстава дапусціць, што Купала ішоў (мусіў ісці) на пэўны **тактычны кампраміс** са сваім вельмі неспрыяльным для творчай працы часам, каб перачакаць злую навалу і проста ўратавацца. І калі гэта так, то не будзем да яго залішне і сурова патрабавальнымі. Не будзем спяшацца рабіць вывад аб тым, што ва ўслаўленні Сталіна, яго саратнікаў і іх дзейнасці Я. Купала быў суб'ектыўна шчырым.

Сапраўды, многага пра той трагічны і страшны час мы яшчэ не ведаем. Але можна здагадвацца ўсё ж, што не толькі пра антынародную дзейнасць сталінскіх служак у літаратуры і па-за літаратурай з горыччу і скрухай у сэрцы думаў Я. Купала, загнаны амаль у безвыходную, тупіковую сітуацыю і вымушаны шукаць паратунку ў спробах самагубства. Не вельмі добрыя думкі былі ў яго ў гэты час, напэўна, і пра таго, хто стаяў на чале ўсёй вялікай краіны і паспеў ужо надзяліць сябе неабмежаваным правам мудрага знаўцы ісціны ў апошняй інстанцыі. Як мы сказалі, дэталёва ўзнавіць і ва ўсіх падрабязнасцях рэканструяваць кардыяграму псіхалагічнага стану Купалы гэтага часу, відаць, немагчыма. Але зноў-такі правамерна, на наш погляд, зрабіць дапушчэнне, што Купала, у асобных сваіх творах услаўляючы Сталіна і сталіншчыну, мог бы, відаць, сказаць пра ўсё гэта словамі паэта Дзяржавіна, які, хоць і знаходзіўся ў прывілеяваным становішчы, усё ж добра ведаў пакуты і цяжкасці адоранай, таленавітай і свабодалюбівай асобы, калі яе прама ці ўскосна вымушалі (менавіта вымушалі, а не прасілі ці натхнялі) спяваць песні-оды, няўхільна падпарадкоўваючыся націску чужой волі:

Поймали птичку голосисту
И ну сжимать ее рукой.
Пищит бедняжка вместо свисту,
А ей велят: пой, птичка, пой!

Паэтычную купалаўскую музу сціскалі не толькі рукамі, як тую галасістую птушку з верша Дзяржавіна, але і вярыгамі-ланцугамі. І нам, крытыкам і літаратуразнаўцам, безумоўна, трэба імкнуцца да таго, каб па магчымасці дакладна адчуць і зразумець глыбінны, унутраны

сэнс мастацкага слова паэта і ў праявах яго натуральнага, нязмушанага выяўлення, і ў праявах уздзеяння на яго неспрыяльнай і жорсткай валявой сілы. Такі падыход дапаможа нам многае праясніць у творчай і жыццёвай біяграфіі не толькі аднаго Я. Купалы і будзе садзейнічаць агульнаму паглыбленню аб'ектыўнасці нашых вывадаў і ацэнак у літаратуры.

Справа ў тым, што ва ўспрыманні звычайнага, сярэдняга (ды нярэдка і не звычайнага, і не сярэдняга) чытача ў канчатковым выніку гэтыя лініі суб'ектыўна шчырай арыентацыі на падпарадкаванне чужой волі і падпарадкаванне вымушанае, часова-кампраміснае сыходзяцца ў адным пункце і зліваюцца ў сваёй сэнсавай сутнасці. А гэта непажадана. І тут не абысціся без належнага літаратуразнаўчага аналізу. Інакш можа атрымаць распаўсюджанне звужана-побытавая абагульненасць меркаваннняў, калі на адну дошку ставяцца зусім розныя пісьменнікі і розныя літаратурныя з'явы і ацэньваюцца аднымі і тымі ж стандартнымі спосабамі.

Можна, напрыклад, іншы раз пачуць, што ў стварэнні літаратурных міфаў, схем і стэрэатыпаў пра абвастрэнне класавай барацьбы ў краіне, пра «бездакорнае» кіраўніцтва дзяржавай «вялікім і геніяльным» Сталіным чынны ўдзел прымалі Я. Купала і П. Броўка, Я. Колас і К. Чорны, Э. Самуйлёнак, П. Галавач і г. д. У пэўнай ступені такая думка быццам бы ў чымсьці і справядлівая. Але толькі часткова. У ацэначнай абагульненасці падобнага меркавання трэба абавязкова паспрабаваць вылучыць нюансавую адметнасць. І яе можна, прыклаўшы адпаведныя намаганні, на поўную сілу выкарыстаўшы магчымасці сістэмнага і параўнальнага аналізу, знайсці. Бо ў творчасці таленавітага і мужнага пісьменніка ідэя-вобраз, нягледзячы на неспрыяльныя абставіны для творчай працы, так ці інакш выявіць сябе ў нейкай праўдзівай, шматзначнай дэталі, праўдзівым малюнку ці ў нейкіх іншых праявах «нежадання» бяздумна, паслухмяна і слепа ісці за некім і механічна прымаць на веру сказанае, зробленае і прапанаванае іншымі.

Менавіта такая з'ява і мае месца ў шэрагу твораў К. Чорнага, Я. Коласа, М. Зарэцкага, Я. Купалы і іншых пісьменнікаў, якія, нягледзячы на таталітарны націск жорсткага кантролю і жорсткіх указанняў на іх мастацкае слова, усё ж і ў гэтых умовах шукалі і нярэдка знаходзілі ўдалыя мастацкія хады і сюжэтныя павароты,

скіраваныя на шматмернае ўспрыманне эстэтычнай рэчаіснасці. Гэту шматмернасць ідэі і мастацкага вобраза крытыка часта проста не хацела ці не здольна была заўважаць. А завастраючы ўвагу на нейкіх вонкавых момантах сюжэта, яна пакідала ўбаку і вузлавы сэнсавы нерв аўтарскай ідэі.

І сапраўды, крытык, якога знешнія абставіны прымушалі паслухмяна настройвацца на бачанне жыцця ў ракурсе афіцыйных тэорый-прадпісанняў і які ўнутрана быў схільны без усякага супраціўлення ісці насустрач такому «ўнушэнню», і ў мастацкім творы таксама шукаў сугучныя свайму разуменню жыцця пацвярджэнні, абмінаючы і абыходзячы тое, што гэтаму настрою, жаданню і разуменню не адпавядала і супярэчыла.

Славутую паэму А. Твардоўскага «Краіна Муравія» (1936), якая да таго ж з'яўлялася творам хрэстаматыйным, вывучалі і даследавалі, здавалася б, досыць уважліва. Многае тут і на самай справе раскрыта на ўзроўні глыбокай аргументацыі і тонкага назіральнага густу. Але нешта вельмі істотнае заставалася па-за межамі аналітычна зацікаўленай літаратуразнаўчай увагі. І не толькі таму, вядома, што сённяшняя крытыка валодае прыкметна вышэйшым інтэлектуальна-метадалагічным патэнцыялам. Сам час унёс многія важныя карэктывы ў нашу свядомасць.

Тут важна падкрэсліць, што сённяшняя грамадская атмасфера пры ўсёй зменлівасці яе тэмпературнага рэжыму якраз і спрыяе «прыкмячаць» і буйным планам вылучаць ідэйна-эстэтычныя грані твора, якія некалькі раней, калі б іх нехта нават і заўважыў і вылучыў, маглі б здацца малазначнымі. Гэта, апрача ўсяго, магло б быць ацэнена нядрэмнымі ахоўнікамі чысціні тэорыі сацыялістычнага рэалізму як праява адвольнай трактоўкі аўтарскай задумы, цалкам скіраванай быццам бы на непахіснае прызнанне правамернасці і мудрасці сталінскага плана суцэльнай калектывізацыі.

На першы погляд сюжэт паэмы такое меркаванне не адхіляе і нават актыўна падтрымлівае сваім вонкавым пафасам. Гэта знешняя сюжэтная лінія з асаблівай відавочнасцю і адкрытасцю выяўляе сябе ў самым фінале твора. Галоўны герой паэмы Мікіта Маргунок пасля доўгіх і пакутных вандровак у пошуку адказу на балючыя і складаныя пытанні нібыта змог пераканацца, што трэба спыняць гэта сваё падарожжа, вяртацца дадому і

безадкладна ўступаць у калгас. З аднаго боку, ён быццам бы і задаволены, што паездзіў, павандраваў і на ўласныя вочы пабачыў жыццё, а з другога боку, дзесьці і вінавацiць сябе, і шкадуе, што змарнаваў столькі каштоўнага часу, калі іншыя маглі зарабіць шмат працадзён:

Зато мне все теперь видней
На тыщи верст кругом.
Одно вот — уйму трудодней
Проездил я с конем...[13]

Гэтыя думкі-прызнанні героя былі па-свойму досыць выйгрышным і прыдатным матэрыялам для крытыкаў у іх доказах, што Мікіта Маргунок становіцца бясспрэчным прыхільнікам новага калгаснага ладу жыцця. І прыхільнікам быццам бы прынцыповым, паслядоўным і аўтарытэтным, бо ён шмат чаго пабачыў, шмат разважаў, думаў, параўноўваў... Ён нібыта сем разоў прымерваў, каб адзін раз адрэзаць.

Не будзем пакідаць усё гэта па-за ўвагай і мы. Аднак паралельна з гэтым трэба звярнуць больш пільную ўвагу і на падтэкст твора. А ў дадзеным выпадку такая неабходнасць вымагаецца асабліва, бо і сам паэт, як можна меркаваць, прыкладаў максімум намаганняў, каб нейкім чынам адвесці ад сябе рэпрэсіўную руку афіцыйнай улады, што паспела ўжо выгнаць з наседжаных мясцін і раскідаць па белым свеце ўсю яго сям'ю. І ў той жа час ён, безумоўна, імкнуўся застацца сумленным чалавекам, грамадзянінам і мастаком.

Знаходзячыся, можна сказаць, паміж Сцылай і Харыбдай, яму гэта ўдалося. І паспрыялі тут аўтару, як нам здаецца, два (апрача шчаслівага збегу акалічнасцей) важныя фактары. Можа здацца некалькі дзіўным, але шчырым змагаром за сталінскую ідэю суцэльнай калектывізацыі «дапамагла» зрабіць А. Т. Твардоўскага тая самая крытыка, якая, наўмысна ці міжвольна абмінаючы многія істотныя для разумення сэнсу твора глыбіні падтэксту, ніколі не забывала завастрыць увагу на тым завяршальным сюжэтным вузле, дзе галоўны герой наважваецца стаць калгаснікам і быццам бы выказвае шкадобу пра марна страчаны час. На наш погляд, такая форма сюжэтнага фіналу і паводле аўтарскай заду-

---

[13] Твардовский А. Собр. соч.: В 4 т. М., 1959. Т. 1. С. 365.

мы павінна была выканаць і з поспехам выканала ролю амартызатара і своеасаблівай «прынады», якая ў кожным выпадку з'яўлялася важнай казырнай картай для тых крытыкаў, што лёгка ішлі насустрач запатрабаванням афіцыйнай думкі альбо, разумеючы ход падзей, мусілі крывадушнічаць, прыкідвацца, штучна падпарадкоўваючыся такім чынам няўмольнаму і жорсткаму націску абставін.

Гэты яркі і таленавіты твор, трэба меркаваць, на доўгі час застанецца ў актыве чытацкага інтарэсу і літаратурнай гісторыі, бо падводная плынь яго і наогул мастацка-вобразны малюнак больш размаітыя і разнастайныя, чым магло здавацца, калі названая паэма А. Твардоўскага разглядалася толькі ў строгіх межах размовы пра калектывізацыю. Думка аўтара працуе на значна больш шырокіх аналітычных і праблематычных кругазваротах. І сацыяльна-эканамічны аспект праблемы, якая прымацавана да пэўнага і канкрэтнага гістарычнага часу, набывае глыбокае абагульняючае значэнне ў асноўным дзякуючы таму, што бягучы момант гісторыі разгортваецца тут пад моцным эстэтычным уплывам і кантролем законаў здаровага сэнсу і агульначалавечых каштоўнасцей. А галоўная сутнасць гэтых законаў і прынцыпаў у паэме А. Твардоўскага «Краіна Муравія» — гэта не проста роздум чалавека пра тое, уступаць яму ў калгас ці пачакаць, а яго роздум-змаганне за **права свабоднага духоўнага і жыццёвага выбару**. Без якой бы там ні было папярэдняй дамоўленасці і ўзгодненасці з самім чалавекам Мікіту Маргунку фактычна прапануюць і нават загадваюць стаць пад штандары чужой волі. А ён упарціцца, па-свойму нават бунтуе і насуперак патрабавальнай чужой волі («И надо всей страной — рука, зовущая вперед...» [14]) рашаецца на працяглую вандроўку, каб самому ва ўсім, што турбуе і хвалюе яго, пераканацца і разабрацца.

Пайсці, адважыцца на такі крок вымагала ад чалавека, апрача ўсяго іншага, і немалой смеласці. Бо ведаў Мікіта Маргунок, што тая дзяржаўная рука, «зовущая» селяніна да новых калектыўных форм гаспадарання, не толькі пачціва і міласціва клікала яго паверыць гэтым новым ідэям і падтрымаць іх, але і штурхала, біла па галаве, бесцырымонна загадвала яму прыняць хутка і

[14] Твардовский А. Т. Собр. соч. Т. 1. С. 300.

без асабліва працяглага роздуму гэтыя амаль не звязаныя з ранейшай сялянскай традыцыяй, ранейшым сялянскім вопытам правілы і нормы жыцця. У іншым выпадку ў дзеянне ўступалі суровыя і строгія рэпрэсіўныя меры.

Пад час сваіх вандраванняў герой паэмы сустракаецца, напрыклад, з сваім аднавяскоўцам, у мінулым заможным і гаспадарлівым селянінам, які ўцёк, як ён кажа, **адтуль...** На пытанне Маргунка: «Што ж там і як?»— адказвае:

> Да так. Хороший край
> В лесу, в снегу стоит барак,
> Ложись и помирай...[15]

Гэтыя словы былога заможнага суседа, а ў тагачасным класавым вызначэнні — кулака прыкметна ўсхвалявалі і нават устрывожылі героя паэмы. Яму здалося крыху дзіўным і незразумелым, што там, адкуль Ілля Кузьміч спрабуе ўцячы, чалавек і яго працалюбства не маюць ніякай каштоўнасці. Аднак цікава вось што. Мікіта Маргунок і пасля гэтай трывожнай і не вельмі прыемнай для яго навіны працягвае вандроўку і на зваротны шлях свайго каня не паварочвае.

Як нам здаецца, А. Твардоўскі ў гэтым і ў шэрагу іншых выпадкаў палемічна завастрае сваю думку на тым моманце, што селянін далёка не такі ўжо баязлівы, **нерашучы і хісткі** па сваім характары чалавек, як гэта спрабавалі паказаць розныя тэарэтыкі, у тым ліку і многія тэарэтыкі-марксісты, заўжды і ва ўсім аддаючы перавагу рабочаму класу, пралетарыяту.

Такога погляду цвёрда трымаліся і некаторыя пісьменнікі, аўтарытэт якіх, здавалася б, быў бясспрэчным. Аднак зусім бясспрэчных аўтарытэтаў, якія выказвалі б адны толькі бясспрэчныя ісціны, відаць, ніколі не было і не бывае. І вельмі шкада, што мы пра гэта часта забываем або, паддаючыся «апрацоўцы» нашай свядомасці рознымі спосабамі фальсіфікацый і формуламі-клішэ ідэалагічных стэрэатыпаў, пачыналі пакрысе ўспрымаць спрэчнае як бясспрэчнае і браць на веру тое, што вымагае крытычнага і featureрознабаковага падыходу.

Мы доўгія і доўгія гады, напрыклад, такім амаль ва ўсіх адносінах бясспрэчным, бездакорным і бязгрэшным

---

[15] Твардовский А. Т. Собр. соч. Т. 1. С. 302.

аўтарытэтам у літаратурнай тэорыі і мастацкай практыцы лічылі М. Горкага. А калі дзе і адважваліся яго злёгку пакрытыкаваць, дык хіба толькі там і тады, дзе і калі ён разыходзіўся з Леніным, не ва ўсім пагаджаючыся, у прыватнасці, з ім у пытаннях жорсткага абыходжання новай улады з інтэлігенцыяй у перыяд грамадзянскай вайны і ў першыя гады пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі. Зрэдку дазвалялі мы сабе пакрытыкаваць вялікага пралетарскага пісьменніка і за яго рэлігійна-хрысціянскія захапленні, што найбольш поўна адлюстравалася ў такім творы, як «Споведзь».

Але з дыстанцыі часу і ведання новых фактаў, новай інфармацыі пра ранейшыя з'явы многае тут бачыцца паіншаму. І нярэдка крута і рэзка ў бок аб'ектыўнасці мяняюцца нашы ацэнкі горкаўскіх твораў і яго тэорыі. Тое, што ішло пад знакам негатыву, падчас (і, можа, нават некалькі нечакана для тых, хто прывык думаць і мысліць застылымі догмамі-стэрэатыпамі) набывае сваю выразна станоўчую сутнасць, а тое, што здавалася бясспрэчным пазітыўным фактам у яго творчасці, паварочваецца прыкметна зніжанай мастацкай альбо тэарэтычнай функцыяй.

Сёння, у прыватнасці, было б яўным анахранізмам крытыкаваць Горкага за яго захапленне рэлігійна-хрысціянскімі праблемамі і зневажальна трактаваць гэта як богашукальніцтва і богабудаўніцтва. На самай жа справе тут, як нам уяўляецца, мастацка-публіцыстычная і тэарэтычная думка пісьменніка шукала і апрабоўвала спосабы больш глыбокага пранікнення ў сферу агульначалавечай праблематыкі. Магчыма, што Горкі ў гэты час якраз і адчуваў тую небяспеку, што сацыяльна-класавы падыход, калі ён стане ў літаратуры пануючым пазнавальна-адлюстравальным метадалагічным прыёмам, не прынясе ёй плёну. І вельмі шкада, што партыйныя колы і партыйная прэса, з якімі М. Горкі быў досыць цесна звязаны, не падтрымалі яго ў гэтых філасофска-эстэтычных пошуках, а сам ён не праявіў належнай волі, каб не пагадзіцца з не дужа кваліфікаванымі і не вельмі кампетэнтнымі парадамі.

Добрая тэндэнцыя акрэслівалася ў яго творах і тады, калі ён даволі смела і настойліва дзейнічаў у абарону інтэлігенцыі ў перыяд грамадзянскай вайны і ў першыя паслякастрычніцкія гады. Тут выяўлялася і гуманістычная канцэпцыя пісьменніка, не згоднага мірыцца з пры-

ніжэннем чалавека і чалавечай годнасці, а таксама яго разуменне, што без інтэлігенцыі, без яе падтрымкі духоўнае абнаўленне, дынамічны навуковы прагрэс грамадства немагчымы. І зноў-такі прыходзіцца пашкадаваць, што ў далейшым пісьменнік не заўсёды цвёрда стаяў на гэтых гуманістычных і дэмакратычных пазіцыях.

З другога ж боку, тым, каму прыйдзецца сёння займацца вывучэннем і даследаваннем творчасці М. Горкага, безумоўна, давядзецца ўнесці сур'ёзныя карэктывы ў цэлы шэраг пытанняў, звязаных з так званай тэорыяй сацыялістычнага рэалізму, агульныя контуры якога М. Горкі спрабаваў накрэсліць і падмацаваць у сваёй мастацкай практыцы. Нам, відаць, давядзецца сур'ёзна ўсумніцца і ў аб'ектыўнасці тых характарыстык, якія М. Горкі даваў селяніну, а заадно рашуча абвергнуць і многія трактоўкі і тлумачэнні крытыкаў, што пакорліва ішлі ўслед за пісьменнікам і не адважваліся яго суб'ектыўны погляд на чалавека бескампрамісна выверыць жыццём і суаднесці літаратурны вобраз і мастацкі канфлікт з прататыпамі жывых, нявыдуманых людзей і аб'ектыўнымі жыццёвымі канфліктамі.

Тады варта было б шчыра і недвухсэнсоўна сказаць, што ў сваім апавяданні «Чалкаш» (1895) М. Горкі, здабываючы «з факта сэнс», парушае і праўду факта, і праўду сэнсу. Трэба было б заўважыць і сказаць, што пісьменнік сур'ёзна памыляецца, навязваючы свой погляд, сваё ўяўленне аб селяніну як чалавеку недалёкім, духоўна абмежаваным, скнарлівым і азлобленым, гатовым амаль без дай прычыны забіць «высакароднага», «далікатнага», з шырокім размахам душы чалавека — прафесіянальнага зладзюгу Чалкаша.

А ў якасці аднаго з важкіх аргументаў таго, што Горкі тут памыляецца і што гэта, як і многія іншыя яго меркаванні пра селяніна, было абумоўлена недастатковым веданнем рэальнага жыцця сялянства і прыблізным веданнем яго псіхалогіі, можна было б выкарыстаць такія словы І. Буніна: «Горкі, той самы Горкі, што на маіх вачах, на працягу дваццаці год, літаральна ні разу, ні аднаго дня не быў у вёсцы, не быў нават у павятовым горадзе, калі выключыць адзін месяц у Арзамасе, і нават пасля васьмігадовага знаходжання на Капры кроку не зрабіў, вярнуўшыся ў Расію, далей Масквы, а ўсё піша і піша на гераічны лад пра рускі народ, здзіўляючы (ушибая) крытыка і чытача сваёй наігранай унушаль-

насцю, сваім літаратурным басам, сваёй «маляўнічасцю» (Южное слово. 1919. № 88) [16].

Вядома, не ва ўсім тут можна пагадзіцца і з І. Буніным. Ды палемічна-публіцыстычнае слова, відаць, і разлічана на тое, каб прыцягнуць увагу апанентаў, выклікаць іх на далейшую спрэчку-размову і падштурхнуць на пошукі новых, дадатковых аргументаў з мэтаю падтрымаць, дапоўніць, паглыбіць, удакладніць ці абвергнуць, прызнаць няслушнай, памылковай выказаную думку. Але многае ў меркаванні Буніна здаецца бясспрэчным і мае значэнне аксіяматычнай ісціны. І ў першую чаргу гэта тое, што ў пісьменніцкай працы жыццёвы вопыт — набытак нічым незаменны і яго нельга кампенсаваць ні талентам, ні прафесійным майстэрствам.

Нас, праўда, змалку, са школьнай парты прывучалі думаць, што ў М. Горкага гэты вопыт жыцця быў нейкім універсальным. Сапраўды, многія бакі рэчаіснасці ён ведаў добра. Не абдзяліў Бог пісьменніка і талентам. Ён стаяў на даволі высокай ступені прафесіянальнай культуры. Але прыслухаемся зноў да слоў І. Буніна пра тое, што М. Горкі на працягу цэлых дваццаці гадоў «ні аднаго дня не быў у вёсцы», працягваючы разам з тым пісаць пра рускі народ «на гераічны лад».

Крытыка досыць сур'ёзная, і яе нельга пакінуць па-за ўвагай, асэнсоўваючы горкаўскія погляды на сялянства, праблематыку сялянскага жыцця і псіхалогію чалавека-селяніна. З выказвання І. Буніна вынікае, што менавіта недастаткова грунтоўнае, а часам і проста павярхоўнае веданне М. Горкім рэальнага жыцця селяніна і сялянскай псіхалогіі абумоўлівала і залішне генералізавала ў яго творах тэндэнцыю празмернай «маляўнічасці», фальшывага пафасу, літаратуршчыны і штучных паваротаў складаных канфліктаў сялянскага жыцця «на гераічны лад» і далёка не на карысць мастацкай праўдзе.

Канешне, такі «маляўнічы» паварот сюжэтаў у многіх горкаўскіх творах на пафасны, гераіка-рамантычны і рамантызаваны лад у нечым тлумачыцца і своеасаблівасцю творчай індывідуальнасці пісьменніка, адметнасцю яго стылёвай манеры, якая ў шэрагу момантаў, настройваючыся на аб'ектыўную прыроду факта і больш ці менш глыбокае веданне яго непадмалёванай сутнасці, знаходзіла шляхі да ўвасаблення ў яркіх і праўдзівых малюн-

[16] Лит. газ. 1991. 19 сент.

ках. Бо рамантычны падыход да паказу рэчаіснасці зусім не азначае, што пісьменнік мае нейкае асобае права на адвольную дэфармацыю рэчаіснасці і чалавечых характараў. А вось там, дзе аўтар імкнецца «з факта здабыць сэнс», дастаткова не ведаючы сутнасных, нюансавых асноў гэтага факта, сур'ёзнай гаворкі звычайна ў яго не атрымліваецца. У такіх выпадках і мастацкая думка нярэдка звужала свае даследчыцкія гарызонты і паслабляла сваю адлюстравальную сілу. А іншы раз і проста сур'ёзна разыходзілася з рэаліямі сапраўднага жыцця. Іменна на гэта і звяртае ўвагу І. Бунін, гаворачы пра тую саманадзейную і не вельмі перспектыўную ў рускай літаратуры тэндэнцыю, схільную пераключаць у сваёй трактоўцы складаныя і няпростыя тэмы народнага сялянскага жыцця на бестурботна-аптымістычны і гераічна-рамантызаваны лад.

Мы ўжо адзначалі, што М. Горкі даволі часта, гаворачы словамі І. Буніна, не толькі трапляў у палон празмернай і штучнай ідэалагізацыі і рамантызацыі народнага жыцця, але неаднойчы падсцерагала яго і небяспека, як у тым жа апавяданні «Чалкаш», паказваць селяніна ў зніжана негатыўным плане. І гэта пазіцыя была не такой ужо бяскрыўднай, бо яна звычайна прэтэндавала на шырока абагульненыя вывады і падчас выяўляла саманадзейнае імкненне падаваць шматфарбную з'яву псіхалогіі чалавека ў аднамерных паняццях і формах катэгарычнай трактоўкі.

М. Горкі, відаць, значна больш, чым хто-небудзь іншы з яго калег па працы, ужывае ў сваіх літаратурна-крытычных і публіцыстычных артыкулах такі выраз, як «ідыятызм вясковага жыцця», адпаведным чынам падкрэсліваючы сваё стаўленне да гэтага жыцця і яго разуменне і веданне. І. Бунін меў, напэўна, усё-такі рацыю, калі празмерную эмацыянальнасць і «маляўнічасць» стылю, штучна-гераізаваны лад сюжэтнага руху і развіцця характараў у творах некаторых рускіх пісьменнікаў на тэму народнага жыцця, у тым ліку і ў творах М. Горкага, звязваў з недастатковым веданнем гэтага жыцця. А калі быць больш дакладным, дык варта сказаць, што няведанне або недастаткова глыбокае веданне той жыццёвай, фактычнай асновы, на якую абапіраецца сюжэтная матэрыя твора, даволі лёгка схіляе аўтара як да пазітыўных, так і да негатыўных ацэнак. А гэта значыць вядзе яго да парушэння праўды.

Вядома, што менавіта багаты жыццёвы вопыт, добрае веданне фактычна-тэматычнай асновы працы, якую пісьменнік задумвае і плануе ўвасобіць у формах той або іншай мастацкай структуры, у вельмі і вельмі многіх выпадках удакладнялі і аўтарскія задумы, і планы, хоць падчас пісьменнікам здавалася, што сюжэтны рух твора і развіццё характараў грунтоўна і ўсебакова ўзважаны і прадуманы. Менавіта логіка жыцця (але жыццё ў такім разе трэба было глыбока ведаць) і яго законы неаднаразова падказвалі А. Пушкіну, М. Гогалю, І. Тургеневу, А. Талстому, Я. Коласу, К. Чорнаму і іншым пісьменнікам неабходнасць уносіць сур'ёзныя, кардынальныя, паводле свайго сэнсавага значэння, карэктывы пад час ужо напісання твора і непасрэднай працы над увасабленнем задумы.

Нам уяўляецца, у прыватнасці, што, глыбока ведаючы сапраўднае, з усімі яго радасцямі, клопатамі і цяжкасцямі жыццё селяніна, ведаючы так, як ведалі яго Я. Купала, Я. Колас, М. Гарэцкі, К. Чорны, І. Бунін, Г. Успенскі, С. Ясенін, напэўна, паасцярогся б тады У. Маякоўскі на забіхвацкі лад вясёленькай прыпеўкі пісаць пра сялянскае жыццё як пра нейкі рай, эдэм, дзе селянін злёгку папрацуе дый пяе-весяліцца, «землю попашет — попишет стихи»...

Пры ўмове ўнутранай заглыбленасці ў сялянскі побыт, нават пры адпаведнай настроенасці на падтрымку нейкага групавога альбо партыйнага інтарэсу ўстрымаўся б, напэўна, і М. Горкі ад такога спрошчанага і, трэба сказаць, зняважлівага і абразлівага выказвання: «Калі мужык з сваёй пшаніцай знікне, гараджанін навучыцца яе рабіць у лабараторыі. Творчая праца — рэвалюцыйная, праца збіральніка — кансерватыўная» [17]. Так суцяшаў М. Горкі вядомага крытыка А. Варонскага, які выказваў непакой з прычыны голаду ў многіх вёсках і катастрафічнага пагаршэння там жыцця.

Не менш дзіўная і таксама зняважлівая пазіцыя М. Горкага ў адносінах да сялянства знаходзіць месца і ў такіх ягоных словах, выказаных у 1921 г. у гутарцы з карэспандэнтам газеты «Дэйлі ньюс» у Петраградзе: «...На будучае я гляджу змрочна. Насельніцтва нашай краіны я падзяляю на дзве супрацьлеглыя групы: гарад-

---

[17] Горький и советская печать. Архив А. М. Горького. М., 1965. Т. 10. С. 31—32.

ское і сялянскае. Яны адрозніваюцца адзін ад другога не толькі па месцы жыхарства і культурным узроўні, але і па інтарэсах, па гістарычных успамінах і псіхалогіі... У вёсцы нашай моцныя анархічныя тэндэнцыі, яна, па прыродзе сваёй, антыдзяржаўная. Яна не прымае і не прызнае **ніякай дзяржаўнай улады і асабліва жорстка брыкаецца** (выдзелена мною.— *В. Ж.*), калі робіцца самы нязначны замах на яе ўласнасць... У будучым я прадбачу стыхійнае сутыкненне з вёскай, у выніку якога пацерпім мы...» [18] На думку М. Горкага, новае жыццё пасапраўднаму будаваць можна будзе толькі з тым пісьменным, разумным і бадзёрым пакаленнем людзей, якія прыйдуць на змену зусім несімпатычнаму і нецікаваму пакаленню старой вёскі.

Мяркуючы па артыкуле «Аб рускім сялянстве», напісаным неўзабаве пасля выезду ў 1922 г. на доўгія гады за мяжу, М. Горкі не вельмі шкадаваў бы, каб гэта пакаленне хутчэй сышло з гістарычнай арэны і проста перамерла: «Вымруць напаўдзікія, неразумныя людзі, цяжкія людзі рускіх сёлаў і вёсак — усе тыя, амаль страшныя людзі.., і месца іх зойме новае племя пісьменных, разумных, бадзёрых людзей» [19].

Паводле слоў доктара гістарычных навук, прафесара Сарбоны (Францыя) М. Я. Гелера, такое выказванне М. Горкага ўяўляецца як «найбольш бязлітаснае асуджэнне рускага народа, калі-небудзь напісанае рускім пісьменнікам» [20]. Можа, у гэтым меркаванні замежнага філосафа ёсць і перабольшанне, але, відаць, не дужа вялікае.

Мастацкая і грамадская думка, якая была звязана з народным жыццём крэўнымі ўнутранымі сувязямі, з такімі звужанымі і зняважлівымі ацэнкамі селяніна змірыцца, вядома, не магла. У гэтым кірунку, як нам здаецца, палемічна працуе мастацкая думка ў раманах «Зямля» К. Чорнага, «Вязьмо» М. Зарэцкага, у аповесці Я. Коласа «Адшчапенец», паэме А. Твардоўскага «Краіна Муравія» і інш. Не, гаварыць пра нейкі прамы і непасрэдны палемічны дыялог з Горкім рэальных і відавочных падстаў тут няма. І з Маякоўскім таксама. Аднак палеміка з **новай тэндэнцыяй**, якая часта абапірала-

---

[18] Цыт. па газеце: Последние новости. 1921. 29 сент.
[19] Горький М. О русском крестьянстве. Берлин, 1922. С. 43—44.
[20] Вопросы философии. 1990. № 9. С. 63.

ся і настройвалася на аўтарытэт Горкага і Маякоўскага і якая ў шэрагу выпадкаў парывала, паслабляла і скіроўвала на бакавы шлях ранейшыя мастацкія сувязі з дэмакратычнай і гуманістычнай літаратурнай тэндэнцыяй, у эстэтычна-вобразнай сістэме гэтых твораў адчуваецца.

Занадта ўжо багата ў паслякастрычніцкі час з'явілася «дабрадзеяў-настаўнікаў», многія з якіх, не маючы належнай духоўна-маральнай і інтэлектуальнай падрыхтаванасці, сталі бясплатна і сілком прапаноўваць працоўнаму чалавеку і асабліва селяніну свае «настаўніцкія» паслугі. Сялянства і ў гэтым сэнсе многімі такімі настаўнікамі было абрана як вельмі зручны аб'ект для самых разнастайных і нярэдка авантурных, не забяспечаных аналітычнымі прагнозамі эксперыментаў. Зноў прыгадаем словы М. Горкага: «напаўдзікія, неразумныя людзі, цяжкія людзі рускіх сёлаў і вёсак». А калі сяляне такія ўжо духоўна і маральна заняпалыя людзі, то іх, ідучы ўслед за падобнай логікай, трэба падцягваць да належнага культурнага ўзроўню, вучыць і перавучваць, падказваць і ўказваць, як ім жыць, калі і ў які час араць і сеяць і г. д.

І раілі, і падказвалі, вучылі і перавучвалі,— на жаль, вельмі часта дзейнічалі тут і насуперак здароваму сэнсу, і насуперак вякамі выверавым прынцыпам народнай маралі. Ды і якому новаму, цывілізаванаму гаспадаранню на зямлі мог навучыць селяніна герой вядомай шолахаўскай «Узнятай цаліны» (1932—1960) Нагульнаў, які літаральна на ўсе падзеі жыцця і нават на свае сардэчныя, інтымныя справы глядзіць праз люстра сусветнай рэвалюцыі і лічыць яе набліжэнне найпершай і найгалоўнейшай жыццёвай мэтай.

Альбо другі герой гэтага ж твора — Сямён Давыдаў, прадстаўнік той шырока разрэкламаванай рабочай кагорты стотысячнікаў, што таксама былі накіраваны ў вёску ў якасці настаўнікаў-арганізатараў. Сямён Давыдаў шмат у чым, відаць, і сапраўды цікавы і сумленны чалавек. Але такія арганізатары, як гэта добра паказана і ў рамане, даволі слаба былі падкаваны прафесійна, не ведалі спецыфікі і адметнасці сялянскай працы, сялянскага жыцця. Таму часта і трапляе ён у смешныя сітуацыі. І ратуе яго ад злосных і з'едлівых насмешак з боку данскіх казакоў хіба толькі тое, што герой шчыры ў сваіх імкненнях спазнаць унутраныя спружыны незвычайнага для яго чужога ўкладу жыцця і побыту, хоць дзесьці і

разумее і адчувае, што «схапіць» усё гэта і ўсвядоміць за кароткі камандзіровачны час знаходжання ў казацкай станіцы фактычна немагчыма. Менавіта гэтымі сваімі чалавечымі якасцямі ён і прываблівае чытача. І ў дадзеным выпадку можна нейкім чынам зразумець тую крытыку і тых крытыкаў, якія, прыкметна завышаючы ролю такіх людзей у агульным працэсе грамадскай перабудовы, усё ж імкнуліся і да пэўнай аб'ектыўнасці ў выяўленні і ацэначным вызначэнні іх пазітыўных чалавечых якасцей.

Аднак падчас сама думка, што селяніна быццам бы абавязкова трэба вучыць, настаўляць і строга кантраляваць, каб раптам ён не збіўся, не збочыў з правільнай дарогі і залішне не падпаў пад уплыў «прыватнаўласніцкага» інтарэсу, у творчасці некаторых пісьменнікаў трансфармавалася ў самыя разнастайныя формы голай і схематычнай тэндэнцыйнасці.

Сёння, шчыра кажучы, неяк і смешна і балюча чытаць паэму С. Шчыпачова «Паўлік Марозаў» (1950), дзе самым сур'ёзным чынам даказваецца, што вучань пачатковай школы, піянер невялікай уральскай вёскі Герасімаўка Паўлік Марозаў значна глыбей разумее хаду грамадскіх падзей, чым яго не дужа дасведчаныя аднавяскоўцы, якія не вельмі спяшаюцца прызнаць заклікі да калектыўных форм жыцця бясспрэчным і мудрым дзяржаўным рашэннем. Ну а раз яму часта становіцца «многое в жизни яснее», чым дарослым, шматвопытным дзядзькам і цёткам, калі яму пасля кароткага выступлення райкомаўскага чыноўніка Зіміна на вясковым сходзе «становіцца» «видна не только Герасимовка», «но и вся страна», дык аўтар лічыць зусім натуральным, што гэты жвавы хлапчук, апрача ўсяго, можа ўзяць на сябе «настаўніцкую» ролю. На яго думку, у дадзеным канкрэтным выпадку яйка можа і мае права вучыць курыцу, хоць гэта і супярэчыць агульнапрынятым законам народнай мудрасці і маралі. Прычым мае права не толькі вучыць, але і правучыць. Нават роднага бацьку.

Менавіта пад такім кутом погляду і прачытвае паэму С. Шчыпачова адзін з крытыкаў, прозвішча якога ў напісанай ім прадмове да аднаго са зборнікаў паэта чамусьці не называецца: «У 1950 г. Сцяпан Шчыпачоў стварае новы выдатны твор — паэму «Паўлік Марозаў», за якую ў 1951 г. у другі раз быў удастоены Сталінскай прэміі. Гэты твор з'яўляецца вялікім укладам у савецкую паэзію.

У паэме намаляваны мужны вобраз уральскага піянера Паўліка Марозава, які дапамагае сельскім камуністам у агітацыйнай працы і ў правядзенні хлебанарыхтовак. Калі Паўлік Марозаў даведаўся, што кулакі хаваюць хлеб, а яго бацька іх пакрывае і як старшыня сельсавета дае ім фальшывыя даведкі, паведамляе аб гэтым у райком партыі... Гераізм Паўліка Марозава — выхаванца савецкай школы і піянерскай арганізацыі — з'яўляецца прыкладам для высакароднага перайманьня»[21].

І вось у такіх умовах, калі селяніна спрабавалі вучыць нават піянеры, натуральна паўставала пытанне: а хто ж такі сам гэты «вучань»? Сапраўды ён не можа жыць без павучання-падказкі або гэта мана, з якою ніякім чынам нельга пагадзіцца? Хутчэй за ўсё, відаць, апошняе, бо літаратура на так званую тэму калектывізацыі, дзе вось гэта «настаўніцкая» тэндэнцыя «выхавання і перавыхавання» селяніна захоплівае вельмі шырокае кола пісьменніцкіх інтарэсаў, у многіх выпадках ішла насуперак аб'ектыўным законам жыцця.

Разам з тым ідэйна-праблематычная лінія ў літаратуры, што адстойвала права вяскоўца і селяніна на самастойнае дзеянне і бараніла яго ад розных самазваных настаўнікаў, як паказаў час, найбольш поўна і дакладна адлюстроўвала і саму грамадскую з'яву — калектывізацыю і найбольш дакладна настройвалася на праўдзівае раскрыццё ўнутранага свету чалавека, непрадузяты паказ грамадскай і грамадзянскай сутнасці яго характару. І гэта рыса ў характары героя звычайна выяўляецца ў спакойнай псіхалагічнай танальнасці, без асаблівага падкрэслівання і падказвання з боку аўтара пра станоўчае і менш прывабнае ў дзеяннях, учынках, роздумах і перажываннях чалавека. Аднак у таленавітым творы беспамылкова ўгадваюцца сімпатыі і антыпатыі героя, яго глыбінныя і самыя галоўныя, запаветныя жыццёвыя мары і інтарэсы. Гэта мы заўважым і ў лепшых творах пра вёску на крутым, пераломным этапе яе развіцця, калі селянін быў пастаўлены перад надзвычай складаным і фактычна безальтэрнатыўным выбарам.

У лепшых творах пра вёску кожны таленавіты пісьменнік шукаў, вядома, **свайго** селяніна і ў межах абагульняючай сілы літаратурных законаў па-свойму імкнуўся яго паказаць. Але пры ўсёй разнастайнасці імк-

---

[21] У кн.: Щипачёв С. Поэмы. Мн., 1954. С. 53—54.

ненняў і настрояў сваіх герояў звычайна не прамінаў зававастрыць чытацкую ўвагу на тым, што ёсць у натуры селяніна,— калі ён не нейкі там п'яніца, гультай і абібок,— такая адзнака, такая рыса, якую можна назваць яго нязменнай глыбокай, сталай і вечнай любоўю. Гэта любоўадданасць, любоў-прыхільнасць да зямлі-карміцелькі і ўсіх астатніх, арганічна далучаных да яе атрыбутаў. І нават не проста любоў-адданасць, любоў-прыхільнасць, а любоў-**замілаванасць** і любоў-паэзія. Таму зусім невыпадкова, што ўраўнаважаны, негаваркі, заглыблены ў самога сябе селянін нярэдка станавіўся паэтам у душы і выяўляў выключную здольнасць-талент «перапрацоўваць» і пераўтвараць у сваіх думах-перажываннях звычайную, побытавую плынь рэчаіснасці ў паэтычныя, запамінальна яркія, лірычныя карціны.

Відаць, толькі чалавек, які не проста добра ўсведамляе, але і нейкім унутраным, тонкім і далікатным інструментарыем сваёй душы адчувае, што страта каня для селяніна азначае вялікую бяду, страту надзей на дабрабыт і радасць сям'і, і можа ўзняцца ў сваіх трывогах і клопатах да сапраўды глыбокага, сардэчнага і шчырага перажывання. Іменна ў такім стане, калі перажыванні і роздумы чалавека набываюць формы і малюнкі пранікнёнага паэтычнага гучання, мы бачым героя паэмы А. Твардоўскага Мікіту Маргунка, у якога пад час яго вандровак укралі каня:

А что касается меня,
Возьмите то в расчет —
Поскольку я лишен коня,—
Ни взад мне, ни вперед...

Осиротил меня злодей,
Под самый корень ссек,
А конь был — нет таких коней!
Не конь, а человек.

Бывало, корочку из рук,
Как со стола, возьмет.
В ночном — чуть что — затихнет вдруг,
Как спросит: кто идет?

Прилечь на землю не могу.
Ни сна, ни дрёмы мне.
Вот будто ходит по лугу,
Ступает в стороне.

Как будто слышу стук копыт.
Вздыхает конь живой.

Трава росяная скрипит,
И пахнет той травой...[22]

З такою без перабольшання сардэчнай любоўю можа думаць і гаварыць хіба толькі замілаваная да свайго дзіцяці маці. І ў гэтым выявіўся вялікі і мудры талент самога А. Твардоўскага, які хацеў сказаць сваім чытачам, што ў падобных роздумах і перажываннях героя пра каня, узаранае поле, маладую рунь на полі, сенакос, малацьбу і г. д. знаходзіць адбітак традыцыя і прывычка, якія сталі арганічнай часткай генетычнага складу характару селяніна. Але разам з тым — і праява нечага больш важкага, значнага і сур'ёзнага. Такое аўтарскае меркаванне было і сур'ёзным напамінкам-папярэджаннем кожнаму, хто хацеў бы гаварыць з селянінам мовою прымусу і дыктату пра балючае і далікатнае для яго пытанне. Застаючыся майстрам высокай паэтычнай культуры і аддаючы перавагу падтэксту і вобразнаму малюнку перад адкрытым публіцыстычным словам, паэт, аднак, таленавіта настройвае мастацкае слова і на заклікальна-публіцыстычны лад, нагадваючы пра вялікую непажаданасць паспешлівых і неасцярожных крокаў у вырашэнні складанай зямельнай праблемы.

На жаль, тая дзяржаўная рука, «зовущая вперед» (хоць гэта «славутае», ружова-аптымістычнае і бадзёрае слова «ўперад» было не такім ужо выразным і пэўным у сэнсе вызначэння канкрэтнай мэты і канкрэтных сродкаў яе рэалізацыі), з'яўлялася, апрача ўсяго, і жорстка бязлітаснай да кожнага, хто хацеў і прыкладаў адпаведныя захады тлумачыць нежаданне селяніна развітацца з прыватным укладам жыцця не толькі яго замацаванымі на працягу вякоў прывычкамі. Стаць на такі пункт погляду азначала б правамернасць і лагічнасць самой пастаноўкі пытання пра абагульненне індывідуальных сялянскіх гаспадарак у складаным кантэксце шматварыянтных, неаднамерных і неадназначных **альтэрнатыўных рашэнняў.**

А праектантам і тэарэтыкам гэтых новых структур жыцця не цярпелася, яны хацелі прымусіць селяніна калектывізавацца як мага найхутчэй. І ніякай альтэрнатыўнасці яны не дапускалі, як не дапускалі і зніжэння саміх тэмпаў калектывізацыі. А той вядомы сталінскі артыкул «Галавакружэнне ад поспехаў», які нібыта за-

[22] Твардовский А. Собр. соч. Т. 1. С. 333.

кліканы быў унесці элемент развагі ў сам ход падзей, на самай справе быў напісаны зусім з іншай мэтай — некалькі стрымаць небяспечныя праявы народнага незадавальнення і закамуфліраваць сапраўдныя намеры разбуральнікаў старой вёскі і яе спрадвечных традыцый, маральных і гаспадарчых асноў. Пішучы гэты артыкул, Сталін, відаць, добра памятаў і пра кранштацкі мяцеж, і пра так званую антонаўшчыну — вялікае, працяглае і кровапралітнае паўстанне сялян на Тамбоўшчыне пад кіраўніцтвам Антонава, і шэраг іншых узброеных выступленняў сялянства супраць ушчамлення іх чалавечых правоў і эканамічных інтарэсаў. Гэты сталінскі артыкул — самы звычайны дэмагагічны ход хітрага і жорсткага палітыка, які меней за ўсё клапаціўся пра дабрабыт працоўнага чалавека і абарону яго чалавечай годнасці.

Ды і тэмпаў калектывізацыі пасля з'яўлення названага артыкула ў друку, як цяпер стала вядома, ніхто не зніжаў і не збіраўся зніжаць. Шыфр гаспадара-дыктатара разгаданы быў выканаўцамі ягоных загадаў беспамылкова, і яны па-ранейшаму працягвалі «гнаць» вал, працэнты, спрабуючы пераканаць селяніна і найчасцей з крыкліва-агітацыйным пафасам даказаць, што трымае яго ў палоне прыватнаўласніцкіх інтарэсаў галоўным чынам **прывычка і толькі прывычка.** Дастаткова, маўляў, пераадолець яе сілавое прыцягненне — і ўсё пойдзе-паедзе як па маслу, а жыццё селяніна вельмі і вельмі хутка пасля развітання з такімі «дрэннымі», залішне глыбокімі і моцнымі індывідуалістычнымі прывычкамі стане радасным, прыгожым, заможным, культурным і адухоўленым.

Безумоўна, не кожнаму пісьменніку, які браўся за тэму калектывізацыі, пад сілу было глыбока адчуць і зразумець, што селяніна чакаюць на гэтым шляху ў будучым даволі сціплыя эпізадычныя радасці і вялікія няшчасці, беды і трагедыі. Але была, на наша шчасце, у літаратуры і іншая, пазнавальна-даследчыцкая, аналітычная плынь, якая, арыентуючыся на аб'ектыўны стан рэчаў і цвярозы погляд самога селяніна на жыццё, адлюстроўвала і паказвала, што акрамя прывычкі існуюць больш значныя, больш сур'ёзныя і важкія прычыны-стымулы, якія дыктуюць селяніну свае законы паводзін, думак, перажыванняў і настройваюць яго не вельмі спяшацца абагульняць свой гаспадарчы набытак і безагаворачна прызнаць калектыўны лад жыцця ў параўнанні з

яго ранейшым жыццём больш дасканалай, вышэйшай формай.

Нягледзячы на заклікі і запэўніванні, што ўсё будзе добра і нават выдатна, калі вёска прызнае і актыўна падтрымае саму ідэю суцэльнай калектывізацыі, сялянства на такую агітацыю і такія заклікі ў пераважнай большасці адгукалася вельмі стрымана, а ў многіх выпадках рашуча выказвала сваю нязгоду. І невыпадкова. Селянін адчуў, што ва ўсіх гэтых ружова-аптымістычных праграмах-тэорыях пра заможнае, шчаслівае і бесклапотнае жыццё ў калгасным калектыве выразна праглядваецца замах на яго індывідуальную **свабоду і незалежнасць**.

Гэта добра адчувае і герой паэмы А. Твардоўскага «Краіна Муравія». Можа, такая думка патрабуе для яго яшчэ і сур'ёзных удакладненняў (таму і адпраўляецца ён у доўгатэрміновае падарожжа), але і ў пачатку свайго вандравання ён увогуле добра ўсведамляе, што без уласнай зямлі і ўласнай гаспадаркі не можа быць для чалавека і належнай свабоды, здольнай забяспечыць яму **шырокае права свабоднага жыццёвага выбару.** А менавіта з правам на такі свабодны жыццёвы выбар ён звязвае і сваю ўнутраную раўнавагу, магчымасць надаць свайму існаванню і сваёй працы разумны і асэнсаваны характар.

Пры вытлумачэнні сялянскай псіхалогіі і раскрыцці характару вяскоўца, не кажучы ўжо пра так званага кулака, эпітэтам індывідуаліста, залішне выразнага прыхільніка прыватнай уласнасці, даволі часта «ўзнагароджваўся» серадняк, а падчас нават і бядняк. І эпітэт гэты, як правіла, нёс у сабе падкрэслена адмоўны сэнс. А. Твардоўскі ў паэме «Краіна Муравія» імкнецца вывесці чытача з палону такіх стэрэатыпаў і наводзіць яго на шырокаабагульняючую думку пра тое, што заснаваны на здаровым грунце логікі і маралі сялянскі практыцызм, прагматызм і нават індывідуалізм уяўляў не такую ўжо заганную і негатыўную з'яву, як гэта здавалася таму, хто быў апанаваны шчырым або не вельмі шчырым імкненнем аднамерна звязаць у перспектыве ўмацаванне і развіццё прагрэсіўных культурна-эканамічных і духоўных заваёў у грамадстве галоўным чынам з калектыўнымі формамі і спосабамі гаспадарання. Мы ўжо гаварылі, што нярэдка і знакамітыя, вядомыя пісьменнікі дапускалі ў дачыненні да селяніна **ўшчувальна-паблажлівы,** па-

вучальны, настаўніцкі тон і негатыўна-абразлівыя прыёмы яго характарыстыкі. Галоўнай жа прычынай, а дакладней, зачэпкай такога стаўлення да вяскоўца, як і ў большасці выпадкаў, з'яўлялася нібыта яго несімпатычная натура індывідуаліста.

А. Твардоўскі такія погляды на селяніна лічыць памылковымі і, трэба меркаваць, шкоднымі. Не вельмі катэгарыруючы сваю думку і не дужа націскаючы на адкрытыя формы палемікі (несПрыяльны быў для гэтага момант), ён у той жа час глыбока пераканальны і грунтоўны ў сваёй абароне селяніна, на якога камусьці вельмі ўжо хочацца глядзець як на чалавека, у характары і псіхалогіі якога ўзмоцненыя прыкметы эгаізму і індывідуалізму. Галоўны герой паэмы «Краіна Муравія» Мікіта Маргунок сапраўды ў шэрагу выпадкаў з павышанай увагай думае пра ўласную гаспадарку і зусім не спяшаецца падпарадкоўвацца закліку чужога, нават пагрозлівага і патрабавальнага, дзяржаўнага голасу і безаглядна, сем разоў не прымераўшы, не падумаўшы, належным чынам не ўзважыўшы і не прааналізаваўшы, хутчэй весці свайго каня ў калгасную канюшню. Ды і зыходзячы з логікі звычайнага здаровага сэнсу, ён і не павінен быў гэта рабіць. Бо адчуваў і, правамерна відаць будзе сказаць, разумеў, што, застаючыся самім сабой у сваіх асноўных памкненнях і жаданнях, ён не прычыняў зла нікому. Тым болей што ўсе найбольш глыбінныя і запаветныя яго жаданні зыходзіліся ў адным і самым галоўным фокусе — у працы.

Абараняючы, аднак, героя-селяніна ад нецярплівай напорнай сілы тых, што клікалі яго ў досыць няпэўнае заўтра, і тых, што нярэдка абразліва і несправядліва ставіліся да яго як да непапраўнага індывідуаліста і эгаіста, А. Твардоўскі па-майстэрску тонка і далікатна звяртае ўвагу на тое, што сацыяльна-псіхалагічны спектр сялянскай душы значна шырэй і ў вузенькую схему тэндэнцыйных і прадузятых уяўленняў не ўкладваецца. І так званы індывідуалізм селяніна, паводле аўтарскіх меркаванняў, зусім не абавязкова павінен быць звернуты на выяўленне ў негатыўных формах намераў і дзеянняў, не адэкватных і не сугучных высокім намерам і мэтам грамадскага прагрэсу.

«Індывідуалізм» Мікіты Маргунка, як можна заўважыць, даволі чуйна настройваецца на такую кантактнасць з іншымі людзьмі і акаляючым асяроддзем, якая

пэўным чынам здольна ўзбагачаць (духоўна і матэрыяльна) і самога носьбіта «індывідуалізму», і сацыяльнае асяроддзе. А ў гэтым выпадку адзнака негатыўнага сэнсу з паняццяў «індывідуалізм», «эгаізм» цалкам або часткова знімаецца. Відаць, нешта падобнае меў на ўвазе М. Г. Чарнышэўскі, зацікаўлена ўзнімаючы ў сваіх літаратурна-публіцыстычных працах (асабліва на раннім этапе) пытанне аб праявах «разумнага эгаізму» ў характары і паводзінах чалавека як той важнай, з пазітыўным сэнсавым адценнем сацыяльна-псіхалагічнай рысы, што дапамагае яму заставацца самім сабою і не быць духоўна знівеліраваным нейкай не дужа згаворлівай, не вельмі разумнай, але цярплівай і валявой сілай.

Менавіта такой не дужа мудрай і цярплівай гуманістычнай сіле, гаворачы словамі М. Чарнышэўскага, і супрацьпастаўляе свой здаровы сэнс, свой, калі можна так сказаць, разумны эгаізм герой паэмы А. Твардоўскага Мікіта Маргунок, хоць адначасова з гэтым ён даволі самакрытычны і адкрыты для таго, каб прыслухоўвацца да слушнай думкі збоку. Ён нават схільны лічыць, што ў маладыя гады недаацэньваў гэты момант, а таму:

Глядит, проходят тридцать лет,
Ума большого тоже нет,
А был бы ум, так по уму —
Богатство было бы ему.

Глядит, и скоро — сорок лет,
Богатства нет, зажитка нет.
Чтоб хлебу на год вволю быть,
За сало салу заходить,

Чтоб быть с Бугровым запросто,
Всего того опричь:
«Здоров, Никита Федорыч...—
Здоров, Илья Кузьмич!» [23]

Мікіта Маргунок, як бачым, ні на кога не крыўдуе і не наракае, што не змог стаць багатым і заможным чалавекам, дажыўшы да саракагадовага ўзросту. Наракаюць, скардзяцца, крыўдуюць і крыўдзяцца звычайна ў падобных выпадках людзі слабавольныя, духоўна малаактыўныя і ленаватыя. Прычын, якія перашкодзілі Мікіту Маргунку трапіць у лік багатых і заможных, было, канешне, некалькі. Напэўна, герой гэта ведае і ўлічвае.

---

[23] Твардовский А. Собр. соч. Т. 1. С. 288.

Аднак найперш ён усё-такі **шукае прычыну ў самім сабе** і, грунтоўна паразважаўшы, прыходзіць да высновы, што варта яму было б быць бліжэй да свайго аднавяскоўца — багатага і заможнага селяніна Іллі Кузьміча Бугрова.

На цяперашні розум больш вопытнага і спрактыкаванага чалавека ён, як уяўляецца Мікіту, такога зручнага моманту нізашто не прапусціў бы. Герой не супраць быў бы ў такім разе крыху пакрасавацца і вымусіць сваіх суседзяў крыху пазайздросціць яму. Але калі б давялося яму раптам сустрэцца за гасцінным сталом адзін на адзін з Бугровым, галоўная мэта яго ўсё роўна заставалася б іншай:

А угостить,— так дым трубой,
Что хочешь ешь и пей!
Чтоб рядом он сидел с тобой
На лавке на твоей,

Чтоб толковать о том, о сём,
Зажмурясь песни петь,
Под ручку чтоб, да с ним вдвоем
Пойти хлеба смотреть... [24]

Самым галоўным у намеры Мікіты Маргунка пасябраваць з Бугровым якраз, відаць, і з'яўляецца яго надзея пераняць у апошняга нейкую важную тайну-загадку хлебаробскай навукі. Ён не супраць быў бы пасядзець з ім за гасцінным застоллем, выпіць чарку, паспяваць і пагаварыць «о том, о сём», але гэта толькі прадмова, уступ да асноўнага дзеяння-плана — «пойти хлеба смотреть...» І практычны сялянскі розум настройваецца тут не на хвалю нейкай адарванай ад жыцця сузіральнасці — Мікіта Маргунок у глыбіні душы разлічвае, што разумнымі парадамі-заўвагамі яго заможны сусед паспрыяў бы і яму стаць больш удачлівым, спрытнейшым і багацейшым.

А. Твардоўскі, аднак, падкрэслівае, што галоўны герой паэмы, нават і прызнаўшы ў гаспадарскіх справах бясспрэчнае першынство вясковага багацея Бугрова і сваё жаданне шмат чаму ў яго павучыцца, усё роўна застаецца на цвёрдых пазіцыях абароны сваёй чалавечай самастойнасці і свайго індывідуальнага права прымаць у канчатковым выніку рашэнні без прынукі і працаваць над здзяйсненнем гэтых рашэнняў таксама без прымусу. Не

[24] Твардовский А. Т. Собр. соч. Т. 1. С. 288.

выпадкова, што адразу ж пасля таго, як Мікіта Маргунок з такой павагай і пашанай гаварыў і думаў пра Бугрова (пры гэтым думаў і гаварыў не іначай як з абавязковым дадаткам да прозвішча двух вельмі пачцівых слоў — «Ілля Кузьміч»), ён гаворыць і пра перавагу свабоднага, нікім не навязанага чалавеку волевыяўлення і дзеяння на ўласным кавалку зямлі:

И никого не спрашивай,
Себя лишь уважай.
Косить пошел — покашивай.
Поехал — поезжай.

И все твое перед тобой,
Ходи себе, поплевывай.
Колодец твой, и ельник твой
И шишки все еловые.

Весь год — и летом и зимой
Ныряют утки в озере.
И никакой, ни боже мой,—
Коммунии, колхозии...[25]

Вельмі спакуслівымі былі такія думкі-перажыванні героя для вульгарна-сацыялагічнай, аднамерна-тэндэнцыйнай, схематычнай і суб'ектывісцкай крытыкі, якая імкнулася выкарыстаць падобныя факты ў сваіх фальсіфікацыйных мэтах і кваліфікаваць іх як негатыўную грамадскую і сацыяльна-псіхалагічную з'яву, што быццам бы недвухсэнсоўна паказвае на індывідуалістычны склад натуры селяніна і панаванне ў яго душы і свядомасці прыватнаўласніцкіх інстынктаў і інтарэсаў.

Аўтарская думка мае тут, аднак, больш глыбокі, канцэптуальна-філасофскі і палемічны характар. Некаторым тэарэтыкам сацыялізму, у прыватнасці Троцкаму і Сталіну, здавалася, што тэмп прадукцыйнасці і эфектыўнасці працы можна значна павялічыць за кошт падначалення волі кожнага асобнага індывідуума жорсткай волі адміністрацыйна-каманднага чыноўніцкага апарату дзяржавы. Трэба было валодаць незвычайнай грамадзянскай мужнасцю, каб такую тэарэтычную пабудову прызнаць хісткай і памылковай.

Праўда, трэба заўважыць, што палеміка выяўляецца тут у даволі замаскаваных і тонкіх формах падтэксту, які ў шэрагу выпадкаў нібыта спецыяльна (ды так яно, на-

---

[25] Твардовский А. Т. Собр. соч. Т. 1. С. 289.

пэўна, і ёсць) затушоўваецца, прыглушаецца адкрытай вонкавай плынню сюжэта, дзе паэт часта быццам бы выказвае згоду з курсам афіцыйнай палітыкі, якая бескампрамісна дыктавала селяніну свае неальтэрнатыўныя ўмовы. Не выключана, што гэта дапамагло выратавацца і паэту, і паэме. А можа, тут адыграў сваю ролю і проста шчаслівы выпадак. Аднак бясспрэчным з'яўляецца тое, што А. Твардоўскі разам з сваім героем вельмі балюча перажываў тую вялікую драму-трагедыю, калі, належным чынам не параіўшыся з самім селянінам (з селянінам-гаспадаром, з селянінам-працаўніком), пачыналі крышыць і ламаць яго векавечны ўклад жыцця. Ён перажываў і непакоіўся, бо не быў упэўнены, што на шляху вузкіх, цесных і абмежаваных магчымасцей для індывідуальнага самавыяўлення селяніна магчыма будзе зрабіць яго жыццё шчаслівым і заможным, а працу—радаснай, творчай, жаданай. І як першакласны паэт, выдатна разумеючы спецыфіку творчай працы, і як сын працавітага селяніна-каваля са Смаленшчыны, добра знаёмы з механікай рухаючых сіл сялянскага інтарэсу, А. Твардоўскі мог дзесяткі і сотні разоў назіраць, што позна легчы і рана ўстаць, зберагчы капейчыну і сэканоміць на самым неабходным прымушае селяніна не толькі прагматычная, практычна-матэрыяльная ідэя забяспечыць сваю сям'ю і сябе кавалкам хлеба надзённага, але і ідэя ўнутранай самарэалізацыі і ўвасаблення ў жыццё самастойна выпрацаваных задум і планаў.

Не выключана, што ў падобных паваротах сюжэта мастацкая думка ў паэме «выказвала» сваю нязгоду з тымі, хто, аддаючы лаўры першынства ў духоўна-філасофскіх пошуках і змаганні за сваё ўласнае «я» інтэлігенту, рабочаму, не супраць быў адлучыць ад сферы «высокіх матэрый» селяніна.

Для героя ідэя-думка заставацца самастойным і незалежным чалавекам мае выключна важнае, прынцыповае значэнне. І для самога Твардоўскага, як відаць, таксама. Ён, безумоўна, асцерагаўся таго, каб не трапіць пад колы рэпрэсіўнай дзяржаўнай машыны, якая не дужа далікатнічала ў выбары сродкаў, пракладваючы і ўтрамбоўваючы шлях да суцэльнай калектывізацыі. Трэба меркаваць, што і гэтай прычынай, а не толькі пашырэннем праблематычна-мастацкага дыяпазону твора можна растлумачыць імкненне сюжэтнага дзеяння паэмы ўвайсці ў сферу падтэксту, недагаворанасці.

Аднак нельга не звярнуць увагу на адметнасць і спецыфічнасць формы падтэксту ў паэме «Краіна Муравія» і асабліва там, дзе аўтар распачынае гутарку пра адвечнае права чалавека на свабодны жыццёвы выбар. Жаданне паэта абараніць бедака-селяніна ад наступу на яго індывідуальную волю чужой, празмерна самаўпэўненай і не вельмі кваліфікаванай сілы-волі перарастае ў глыбокі і пакутны душэўны боль. І тады энергія падтэксту ўжо не можа ўтрымацца ў традыцыйных межах недагаворанасці, выходзіць на паверхню сюжэта адкрытым палемічным тэкстам альбо досыць празрыстай і зразумелай алегорыяй-іншасказаннем. Мужная і бясстрашная сіла грамадзянскасці становіцца тут вышэй перасцярогі і страху за ўласнае жыццё.

Аўтару, як можна здагадвацца, і падчас напісання паэмы і раней даводзілася неаднойчы чуць стэрэатыпна-дэкларацыйную газетную фразу, дзе слова «прывычка» пры вытлумачэнні нежадання селяніна проста і лёгка расставацца з аднаасобніцкім укладам жыцця ў многіх выпадках абазначала ледзь не самую галоўную прычыну-перашкоду на шляху самой ідэі калектывізацыі. Выяўляючы сваю нязгоду з падобным спрашчэннем характару селяніна і нялёгкага, клопатнага сялянскага жыцця, ён спачатку быццам бы між іншым і неўпрыкмет кідае нам для роздуму ўвасобленыя ці то ў форме песенькі, ці то ў форме частушкі-дыялогу такія вось словы:

— Отчего ты, божья птичка,
Хлебных зерен не клюешь?
Отчего ты, невеличка,
Звонких песен не поешь?

Отвечает эта птичка:
— Жить я в клетке не хочу,
Отворите мне темницу,
Я на волю полечу. [26]

Праз нейкі момант гэты матыў волі і свабоды паўтараецца ў паэме зноў і зноў. І ў дачыненні да сялянскіх імкненняў быць вольным і незалежным на сваёй зямлі гэта жаданне, як падкрэслівае аўтар, з'яўляючыся арганічнай спадчынна-псіхалагічнай рысай сялянскай натуры, у значнай ступені яго прывычкай, абумоўліваецца і яшчэ адной выключна важнай сілай. Вось, напрыклад,

[26] Твардовский А. Т. Собр. соч. Т. 1. С. 281.

мы чуем гаворку сялян (пэўным чынам да яе далучаецца і аўтарскі голас), дзе быццам дамінуе роля прывычкі:

— Верно.
— Правильно.
— Привычка...
Вот прохожий баял тож:
Отчего ты, дескать, птичка,
Хлебных зерен не клюешь?
В том как раз и заковычка —
От природы людям зло,
Отвечает будто птичка:
Жить, мол, в клетке тяжело... [27]

Аўтар тут, як відаць, таксама пагаджаецца з думкай, што прырода і прывычка для самаадчування чалавека, як і для той птушкі, што знаходзіцца ў клетцы, не такі ўжо і малазначны фактар. І гэта думка паэта не толькі канстатуе ў прынцыпе агульнавядомую з'яву. Птушка і воля — з'явы ў пэўнай ступені сінанімічныя, і сэнсавае значэнне гэтай сінанімічнасці чалавек засвойвае з маленства. А. Т. Твардоўскаму важна было не канстатаваць у прынцыпе агульнавядомую думку, а настроіць яе на дыскусійны лад і нязгоду з тымі, хто адвечныя, запраграмаваныя самой прыродай у характары чалавека, селяніна імкненні да волі намагаўся скіраваць у рэчышча абмежаванай свабоды яго індывідуальнага выбару.

Для такой палемікі ў аўтара ёсць і яшчэ адзін надзвычай важны аргумент, які ў шэрагу выпадкаў тэарэтыкі і прапагандысты хуткай і суцэльнай калектывізацыі не ўлічвалі. Яны не бралі пад увагу, што ва ўспрыманні селяніна самі словы і паняцці зямля — воля — свабодная, узгодненая з глыбокім і разумным сэнсам непрыняволеная праца злучаны ў цесную дыялектычную ўзаемасувязь. Гэту дыялектыку нельга было не ўлічваць, бо яе, як вынікае з тэксту і падтэксту паэмы, улічваў сам селянін. Асноватворныя законы і прынцыпы гэтай дыялектыкі ўваходзілі найважнейшым, састаўным элементам у яго жыццёвую праграму, у яго светапогляд і самым сур'ёзным чынам адбіваліся ў яго характары і паводзінах.

Уласны кавалак зямлі для героя паэмы Я. Коласа «Новая зямля» Міхала, як і для героя паэмы А. Твардоўскага «Краіна Муравія» Мікіты Маргунка,— бадай што адзін з самых важных гарантаў свабоды, волі, унут-

---

[27] Твардовский А. Т. Собр. соч. Т. 1. С. 281.

ранай незалежнасці і найважнейшая перадумова творчай, радаснай, **мэтазгоднай** і **асэнсаванай** працы, звычайна няпростай, нялёгкай і ў многіх выпадках нават дужа цяжкай, але па-свойму ўсё роўна прыемнай і жаданай.

Я. Колас і А. Твардоўскі заклікаюць сваіх чытачоў глыбей пранікнуць у сутнасць самога паняцця — **асэнсаваная, мэтазгодная праца** і дапамагаюць яму пераадолець механічныя адносіны да слоў, здавалася б, звыклых, не новых. І заклік гэты своеасаблівы. Звыклыя словы ў мастацкім кантэксце твора выходзяць у сферу глыбокай асацыятыўнасці думкі і ўбіраюць у сябе шмат у чым усё яшчэ не разгаданы змест і сэнс найважнейшай жыццёвай праблемы. Аўтары хочуць, каб мы зразумелі, што асэнсаваная праца — гэта найперш такая дзейнасць, у канчатковых выніках якой абавязкова ўвасоблена энергія (вялікая або малая) чалавечай духоўнасці, чалавечага розуму і роздуму, індывідуальных планаў, намераў чалавека і ўвогуле яго інтэлектуальна-духоўнай адметнасці і індывідуальнасці.

Такая праца, паводле меркаванняў Я. Коласа і А. Твардоўскага, можа быць, апрача ўсяго, і па-сапраўднаму эфектыўнай у непасрэдна-практычным, матэрыяльным яе вымярэнні. Гэта добра разумеюць, асабліва не тэарэтызуючы і найчасцей абапіраючыся ў сваіх меркаваннях на грунт уласнага вопыту, народнай мудрасці і здаровага сялянскага сэнсу, і іх героі.

Пры гэтым больш за ўсё яны звычайна асцерагаюцца таго, каб раптам не трапіць у такое становішча, пры якім звужаны і абмежаваны магчымасці індывідуальнага выбару, свабоднага роздуму пра спосабы, сродкі і метады рэалізацыі той працы, якую, зрэшты, яны ж самі і павінны выконваць. І ўжо не проста асцерагаюцца, а па-сапраўднаму баяцца апынуцца яны ў сітуацыі, калі магчымасць індывідуальнага выбару, індывідуальнага абдумвання справы, за якую ім самім належыць узяцца і давесці да ладу, зусім выключаецца. Яны лічаць (і небеспадстаўна), што калі на **тваю волю, на твае жаданні і інтарэсы жорсткім прымусам накладваецца іншая воля, то ўсе твае намаганні вельмі лёгка могуць патрапіць у жыццёвае рэчышча нечага ненатуральнага, несапраўднага, падманлівага і нават абсурднага.**

Ці не гэта перш за ўсё непакоіць, напрыклад, герояў коласаўскай «Новай зямлі»? Яны не абдзелены кавалкам хлеба. На святочны дзень ці на выпадак сустрэчы

жаданых гасцей знойдуцца ў іх для пачастунку і добрыя сялянскія прысмакі — і чарка, і скварка. Гэта ў свой час, як мы ведаем, вельмі палохала вульгарна-сацыялагічных крытыкаў накшталт А. Кучара і Л. Бэндэ (і не толькі іх), якія прыкладалі шмат нядобрасумленных захадаў, каб адсунуць у сваіх ацэнках «Новую зямлю» на ўзбочыну літаратурнага жыцця. Бо залішне многа ў ёй нібыта дробнабуржуазнага кулацкага элемента, залішне выразныя ў гаспадарчым жыцці яе герояў прыкметы заможнасці і г. д.

Але самі героі думаюць пра сябе і сваё жыццё іначай, хоць заўважаць гэта вульгарна-сацыялагічная крытыка не жадала ды і, нашпігаваная рознымі догмамі і ідэалагічнымі стэрэатыпамі, была проста няздольна бачыць жыццёвую рэальнасць у межах аб'ектыўных законаў яе руху і стану. Бядуюць Міхал і Антось галоўным чынам якраз таму і з-за таго, што «жыць пад панскай воляй» ці, кажучы іначай, быць прыняволенымі, паводле іх уяўленняў, азначае жыць «у... пекле», бо той іх дастатак і тая іх даволі-такі сціплая заможнасць, здабытая нялёгкай і клопатнай працай, у любы момант могуць быць разбураны і ператвораны ў нішто. Вось, напрыклад, адно з шматлікіх разважанняў Міхала, які мае кавалак хлеба і да хлеба, але, жывучы пад уціскам не вельмі добразычлівай і памяркоўнай волі пана-ляснічага, зусім не ўпэўнены, што гэтая воля ў адзін дзень не перакрэсліць усе яго планы, мары, надзеі, не ператворыць усе яго старанні і намаганні ў нішто:

Ды як тут жыць? Няма ахвоты,
І марны ўсе твае турботы.
Жывеш, ліпіш, як на калу ты,
І ногі й рукі ўдзеты ў путы.
А подзьме вецер, і ўсё бухне,
І ўсё стараннe твае рухне! [28]

Ну а калі чужая воля, што скіроўвае чалавека на нейкія дзеянні і працу, заключае ў сабе адкрыта жорсткі, антыгуманны характар, то элементы бяссэнсіцы і **абсурду** ва ўзаемадачыненнях чалавека з ягонай працай становяцца яшчэ больш адчувальнымі і страшнымі па сваёй разбуральнай духоўную прыроду сіле. І тут мы дазволім сабе прывесці вельмі характэрны эпізод з паэмы А. Твардоўскага «Краіна Муравія». Тым больш што

---

[28] Колас Я. Зб. тв.: У 12 т. Мн., 1962. Т. 6. С. 29.

ён амаль не трапляў у поле зроку аналітычнай крытыкі, а калі і трапляў, то пераважна з той толькі мэтай, каб лішні раз падкрэсліць варожую настроенасць кулака-міраеда да савецкай улады.

А сутнасць вось у чым. Мікіта Маргунок у час вандравання па краіне сустракае свайго заможнага суседа Іллю Кузьміча, з якім вельмі марыў пасябраваць і які цяпер шукае ратунку, выпадкова вырваўшыся на волю з паўночных гулагаўскіх казематаў. Паміж былымі суседзямі-аднавяскоўцамі адбываецца ў час гэтага кароткага спаткання размова, якая і сваім адкрытым тэкстам, і глыбінным шматзначным падтэкстам заслугоўвае таго, каб спыніцца на ёй больш падрабязна. Мікіта Маргунок, відаць, з меркаванняў самай звычайнай чалавечай цікаўнасці імкнецца скіраваць апавяданне Іллі Кузьміча пра лагернае жыццё-быццё ў напрамку як мага большай адкрытасці. Падчас ён крыху хітрыць, прыкідваецца прасцячком-нязнайкам і быццам бы здзіўляецца, што **там**, адкуль ідзе-ўцякае Ілля Кузьміч, які да самазабыцця любіў працу і ўмеў працаваць, чамусьці не змог прыцярпецца і не здолеў знайсці ў працы калі ўжо не вялікую асалоду, то хоць бы якое-небудзь кароткатэрміновае задавальненне.

А магчыма, Мікіта Маргунок і сапраўды быў залішне наіўным і верыў, што ад **любой** злыбяды і гора трэба ратавацца ў працы і можна «вылечыцца» працай. Так звычайна ў жыцці і бывае, калі яно, паварочваючыся да сумленнага, працавітага і мужнага чалавека вострымі вугламі, складанымі экстрэмальнымі сітуацыямі і драматычна-трагедыйнымі гранямі, усё ж не парушае ў сваім няспынным руху нейкія вузлавыя, адвечныя маральна-этычныя і гуманістычныя каштоўнасці, асноўныя прынцыпы народнай маралі і народных уяўленняў пра дабро і зло. У гулагаўскіх жа лагерах, дзе знаходзіўся Ілля Кузьміч, гэтыя высокія духоўна-маральныя каштоўнасці і прынцыпы былі поўнасцю закрэслены, адрынуты і растаптаны. А субяседнік Іллі Кузьміча гэта, напэўна, не зусім усведамляе. Ды і не мог ён у поўнай меры адчуць, зразумець і ўсвядоміць боль і пакуты нядаўняга зэка, бо на такую ступень адчування, перажывання і разумення мог узняцца толькі чалавек, які пабыў у «перавыхаваўчым пекле».

Аднак паслухаем лепей саміх герояў — і таго, хто ў **любым** становішчы быццам бы ўсё яшчэ схільны лічыць

працу найлепшым лекавым сродкам душы, і таго, хто вельмі любіў працаваць раней, быў прыкладным заможным гаспадаром, не страціў гэтых якасцей і пабыўшы на гулагаўскіх «курсах паравыхавання», але прыйшоў пасля ўсяго гэтага да цвёрдага пераканання, што не ўсякая праца — лекар і не ўсякія працоўныя намаганні — крыніца асалоды:

А вот откуда ж ты теперь,
Илья Кузьмич, бредешь?..
— Бреду *оттуда*...
— Что ж там? Как?
— Да так. Хороший край.
В лесу, в снегу стоит барак,
Ложись и помирай...

— Так, так, Илья Кузьмич...
А все ж —
Тут злость своя нужна:
Что скажут — делай, дескать, врешь,—
Работа не страшна...

— Нет, брат, спасибо за совет,
Не страшен был бы труд,
Да **смысла нет** (выдзелена мною.— *В. Ж.*).
— А ты начни!
— Да мочи нет...
— А ты тяни!
— Да руки не берут. [29]

Давайце глыбей удумаемся, чаму ж усё-такі Ілля Кузьміч вельмі катэгарычны ў адмаўленні форм той працы, якую яму давялося выконваць у лагеры. У паэтычным урыўку з паэмы «Краіна Муравія», які мы толькі што працытавалі, А. Твардоўскі, трэба меркаваць, зусім не выпадкова выдзяляе курсівам слова «оттуда». Расшыфроўваючы яго значэнне, чытач, безумоўна, павінен быў звярнуць больш пільную ўвагу і на далейшы ход няпростай для абодвух суседзяў-аднавяскоўцаў размовы, знайсці і вылучыць у ёй нейкі стрыжнявы момант.

Уважлівы, удумлівы чытач, трэба меркаваць, гэты важны момант і вылучаў, і знаходзіў. Ды толькі крытыка доўгі час заўважаць яго па вядомых прычынах не хацела і не адважвалася сказаць, што герой паэмы Твардоўскага «Краіна Муравія» Ілля Кузьміч, якога вельмі проста і лёгка залічылі ў кулакі, а таму не дужа і прыслухоўва-

[29] Твардовский А. Т. Собр. соч. Т. 1. С. 302.

лісяда логікі яго доказаў і аргументаў, на самай справе выказвае тут думку, што імпануе, як можна зразумець, і самому аўтару.

Твардоўскага, безумоўна, не трэба было пераконваць у **бессэнсоўнасці** працы, калі перад чалавекам закрываецца ці звужаецца магчымасць укласці ў саму працу энергію зацікаўленага індывідуальнага роздуму і энергію ўласнай душы. Гэта меркаванне мы, відаць, маглі б прыняць у дачыненні да асобы таленавітага і ў высокай меры сумленнага паэта на веру, хоць аўтар паэмы «Краіна Муравія» ніколі не лічыў падобны прынцып у падыходзе да вытлумачэння з'яў, па прыродзе сваёй няпростых і складаных, колькі-небудзь апраўданым. І ў дадзеным выпадку, ставячы меру асэнсаванасці і мэтазгоднасці працы ва ўзаемазалежнасць ад меры рэальнай свабоды выбару (сродкаў, метадаў, форм, спосабаў) у адносінах чалавека да гэтай працы, А. Твардоўскі выявіў выключна тонкае майстэрства ў сістэме аргументацыі таго, што толькі свабодны чалавек можа быць творцам (у тым ліку і творцам-земляробам) і што ўсялякія абмежаванні на гэтым шляху непазбежна вядуць да парушэння праўды, алагізму і абсурднасці ў жыцці.

Такой думкі трымаецца тут, як можна здагадвацца, і галоўны герой паэмы Мікіта Маргунок, хоць часам і прыкідваецца наіўным прасцячком і нязнайкам. Бо, гаворачы свайму суседу Іллю Кузьмічу, які ўжо зведаў смак лагернага пайка, пра быццам бы перамаганосную сілу **ўсякай сумленнай** працы ў **любых**, нават вельмі неспрыяльных абставінах, ён, напэўна, усё ж у глыбіні душы і сам згодзен з тым, што абставіны ў адносінах да чалавека бываюць іншы раз настолькі абсурднымі і жорсткімі, што амаль цалкам закрэсліваюць і сэнс яго працы. Калі б з такім меркаваннем герой прынцыпова не пагаджаўся, то не трэба было б тады яму, відаць, такі працяглы час вандраваць у пошуках праўды-маткі. Калі б ён глыбока верыў, што ў любых абставінах чалавек, мабілізуючы ўсе свае намаганні, здольны надаць працы высокі сэнс, то, відаць, без асаблівых хістанняў, па першым закліку агітатара ён уступіў бы ў калгас і, **не звяртаючы** ні на што, цярпеў бы і працаваў.

Але ж ён шукае нейкай іншай, вышэйшай праўды, як шукаюць яе, скажам, героі коласаўскай «Новай зямлі» Міхал і Антось, таксама гатовыя ў імя здзяйснення сваёй галоўнай мэты пацярпець, загадаць сабе быць ураўнава-

жана-спакойнымі і памяркоўна-кампраміснымі ў адносінах да неспрыяльнай сілы абставін. Але гэта — іх толькі часовая жыццёвая праграма, тактыка. У перспектыве ж яны спадзяюцца «здабыць зямлю, прыдбаць свой кут, каб з панскіх выпутацца пут».

Шлях герояў да гэтай мэты, як мы ведаем, цяжкі і складаны. Няма і цвёрдай упэўненасці, што яны дойдуць да гэтай жаданай рысы і што наогул дайсці да яе зможа кожны, хто пажадае. Фінал паэмы «Новая зямля» да сённяшняга дня застаецца адной з самых складаных падтэкставых ліній яе сюжэта. Але важна звярнуць увагу на такі вельмі важны момант.

Коласаўскія героі ўсё-такі **самі**, без пабочнага прымусу і дыктату робяць свой выбар і імкнуцца да здзяйснення пастаўленай задачы. Калі ў Міхалавай хаце ставіцца ці абмяркоўваецца пытанне аб набыцці зямлі і спосабах вырашэння гэтай праблемы, то нават дзеці не застаюцца безуважнымі і абыякавымі. Усе ў гэты момант — самыя ўважлівыя слухачы і ў той жа час патэнцыяльна зацікаўленыя ўдзельнікі размовы, гатовыя ўступіць у дыялог і выказаць сваё меркаванне:

І бацька ў вольныя часіны
Расказваў дома ўсе навіны
І чуткі ўсе наконт зямелькі.
Так і цяпер, у час нядзелькі,
Аддаўся бацька светлым марам
І вёў размову з такім жарам,
Што бацьку ў хаце ўсе дазвання
Як бы ксяндза таго казанне,
Так шчыра слухалі, маўчалі,
Што й нос абцерці забывалі. [30]

Такая ўвага Міхалавай сям'і да найважнейшай і найгалоўнейшай для ўсіх іх задумы зусім не азначае, як мы ведаем, абсалютнай і поўнай гарантыі пазбегнуць ілюзій, памылак і заблуджэнняў у яе рэалізацыі. Гэта ўжо іншая размова. У сваёй працы «Якуб Колас і паэтыка беларускага рамана» мы пісалі пра тое, што трагічны фінал твора як адна з вельмі сур'ёзных праяў ілюзорных памкненняў галоўнага героя паэмы «Новая зямля» на шляху да запаветнай мэты адлюстроўвае, заключае ў сабе яго яшчэ недастаткова глыбокую ўнутраную падрыхтаванасць узаемазвязваць свой побытавы, хай сабе і

[30] Колас Я. Зб. тв. Т. 6. С. 26.

надзвычай важны, у нейкай меры нават ключавы інтарэс у межах сям'і з агульнаграмадскімі, нацыянальнымі і вечнымі праблемамі быцця.

Але ў той жа час з многімі імкненнямі і парываннямі сваіх герояў аўтар салідарызуецца, паэтызуе і ўзвышае іх як імкненні і парыванні высокага духоўнага і жыццёвага сэнсу. Для яго застаецца бясспрэчным фактам, аксіяматычнай ісцінай, у прыватнасці, тое, што справа чалавека, у тым ліку і сялянская праца-справа, набывае глыбока мэтазгодны, высакародны і разумны характар толькі тады, калі гэта справа і праца нясуць у сабе думкі, пачуцці і перажыванні іх выканаўцаў, а самі выканаўцы пры ўсіх магчымых і часта неспрыяльных на іх волевыяўленне ўплывах, пры ўсёй шматстайнасці ўздзеянняў на іх волю, планы і жаданні заканамерных, выпадковых і суб'ектыўна-тэндэнцыйных грамадскіх сіл, у прынцыповай, стратэгічнай арыентацыі на тую або іншую жыццёвую праблему і яе вырашэнне застаюцца **свабоднымі** ў сваім выбары.

Рэальныя і аб'ектыўныя, адпаведныя самой праўдзе межы і магчымасці свабоды і намагаецца раскрыць для сябе галоўны герой паэмы А. Твардоўскага Мікіта Маргунок, не дужа, відаць, давяраючы аптымізму афіцыйных паведамленняў аб паспяховым ходзе калектывізацыі і аб перавагах калектыўных, калгасных форм гаспадарання на зямлі. Падыходзячы да гэтага пытання з некалькі іншага боку, ствараючы ў паэме натуральную сітуацыю, дзе нядаўні гулагаўскі вязень, нібыта на споведзі, адкрываецца душою перад іншым чалавекам, А. Твардоўскі знайшоў па-мастацку ўдалы прыём, каб падкрэсліць тое, што ўлада ўціску і несвабоды над чалавекам выяўляецца падчас у такіх жорсткіх і антыгуманных праявах, што самыя шчырыя намаганні і памкненні чалавека хоць бы нейкім чынам, хоць бы часткова рэалізаваць сябе ў справе траціць усякі разумны сэнс. А бессэнсоўная праца, зразумела, не можа ні радаваць чалавека, ні духоўна ўзвышаць яго.

Для свайго часу гэта думка А. Твардоўскага пра бессэнсоўнасць і абсурднасць паднявольнай працы была выключна смелым грамадзянскім актам. Бо нараджаецца і фармуецца яна ў героя не пад уплывам нейкіх выпадковых акалічнасцей, не пад уздзеяннем фактаў старога буржуазнага ладу, адкрытага для любой крытыкі, а пад уплывам і ўздзеяннем фактаў і з'яў новай савецкай рэ-

чаіснасці, якая нібыта поўнасцю вызваліла чалавека ад прыгнёту, дала яму поўную свабоду і разбіла ўсе ланцугі, што стрымлівалі і абмяжоўвалі яго індывідуальную актыўнасць.

Праўда, у непрыхаванай падтэкстам форме гэту думку выказвае той, хто быў прылічаны да кулакоў, і звяртаць колькі-небудзь сур'ёзную ўвагу на яго крытыку і незадаволенасць быццам бы і не варта было. Тут нібыта ўсё проста і зразумела: якой, маўляў, пахвалы і падтрымкі магла чакаць савецкая ўлада ад так званага кулака-міраеда? Але ж і галоўны герой паэмы, якога аўтар у вонкавых праявах сюжэта нібыта вядзе і схіляе да непрымусовага, добраахвотнага дзеяння — да прызнання неабходнасці ўступлення ў калгас, таксама застаецца пры вялікім сумненні і ў вялікім роздуме-трывозе. У калгас ён наважваецца ўступіць, але воля яго ў гэтым рашэнні, як можна меркаваць, у многім застаецца ўсё-такі прыняволенай, сціснутай знешнімі абставінамі. Яму, папросту кажучы, няма ўжо куды дзявацца. Мікіта Маргунок і ў самым фінале твора ўсё яшчэ ў глыбіні сваёй душы настроены шукаць праўду. Іначай і нельга вытлумачыць яго зварот да сустрэчнага старога багамола з такою просьбаю-запытаннем:

— Так, говоришь, в колхоз, отец?—
Вдруг молвил Моргунок.

Бывалы чалавек, адказваючы на гэта пытанне, здаецца, не вельмі прыспешвае Маргунка ісці насуперак уласнай волі:

По мне — верней;
Тебе — видней:
По воле действуй по своей... [31]

Аднак канчатковае рашэнне ў героя, відаць, было ўжо, нягледзячы на трывогі і сумненні, прынята крыху раней, бо выйшлі ўжо «все сроки» вандраванняў:

— Нет, что уж думать,— говорит
Печально Моргунок.—
Все сроки вышли. Конь подбит...
Не пустят на порог.
Объехал, скажут, полстраны,
К готовому пришел... [32]

---

[31] Твардовский А. Т. Собр. соч. Т. 1. С. 362.
[32] Там жа.

А самай галоўнай прычынай, што канчаткова замкнула кола досыць працяглых вандровак героя і вымусіла яго насуперак уласнай волі пайсці насустрач трывожнаму жыццёваму лёсу, з'явілася, напэўна, узбагачанае сустрэчамі з многімі людзьмі адчуванне-ўсведамленне пра аб'ектыўную немагчымасць знайсці праўду ў яе высокагуманістычным «абліччы» і спагадліва-клопатных адносінах да чалавека пры абставінах, калі несправядлівасць учыняла свой страшны баль, а агульначалавечыя каштоўнасці ў імя класавых інтарэсаў бескампрамісна адсоўваліся на задні план. Як лічыць аўтар, міласэрнасць, спагада, гуманнасць, Бог у душах і сэрцах простых людзей па-ранейшаму жылі і ў гэты час, а ў душах і сэрцах галоўных архітэктараў новага жыцця і вяршыцеляў людскіх лёсаў месца ім, на жаль, не знайшлося:

— Что ж бог, его не то чтоб нет,
Да не у власти он...[33]

Шматкроп'е тут для ўдумлівага чытача, безумоўна, было даволі зразумелай, хоць да канца і не разгорнутай аўтарскай думкай-метафарай, якая разам з думкай герояў паэмы выходзіла на пазнанне жыцця ў драматычна трагедыйных яго паваротах. Можна нават сказаць, што гэта было прадчуваннем вялікай бяды-трагедыі, выкліканай найперш навязваннем чалавеку чужой волі, якая часта ўступала ў глыбокі дысананс з яго ўласнай воляй і вымушала яго такім чынам ісці супраць ісціны. Бо ісці насуперак уласнай волі азначае для чалавека ў кожны момант быць гатовым паставіць сваё «я» на службу няпраўдзе.

Мудрыя, праніклівыя людзі добра разумелі гэта ўжо ў далёкія старажытныя часы, нават у перыяд рабства, калі прыняволенасць значнай часткі народа ўзаконьвалася і апраўдвалася ўсім дзяржаўным і канстытуцыйным укладам тагачаснага жыцця. Аднак філасофская і мастацкая думка ў многіх выпадках і тады ўжо часта палемізавала і не пагаджалася з афіцыйнай дзяржаўнай думкай, і нярэдка гэту дзіўную, цікавую і ў чымсьці загадкавую з'яву мы знаходзім і заўважаем у асобе аднаго і таго ж чалавека.

Вядома, напрыклад, што рымскі імператар і военачальнік Марк Аўрэлій (121 г. н. э.) не вызначаўся асаб-

[33] Твардовский А. Т. Собр. соч. Т. 1. С. 361.

лівай паблажлівасцю і далікатнасцю ў адносінах да сваіх падначаленых, кіруючыся бягучымі інтарэсамі імперыі. І ў той жа час ён пэўным чынам адмаўляў сябе самога ў такой сваёй духоўна-інтэлектуальнай сутнасці, калі выступаў як удумлівы філосаф-мысліцель. У яго вядомай класічнай працы «Роздумы» («Размышления») своеасаблівай думкай-крэда з'яўляецца ўзвышэнне чалавека, здольнага ўсведамляць, што «супраць волі пазбаўляецца ісціны ўсякая душа» [34]. «Пражыць непрыняволена», без націску чужой волі азначала для яго пражыць і ў найбольшай набліжанасці да ісціны і ў найбольш акрэсленай гарманічнай суладнасці з ёй. Дзеля такой вялікай мэты не трэба, на яго погляд, шкадаваць сіл, і варта быць гатовым усё вытрываць і выцерпець, «калі б нават звяры раздзіралі вось гэту наросшую навокал цябе мешаніну» [35]. Ён пераконваў чалавека ў перавагах такой жыццёвай пазіцыі, якая давала б яму сілы не аглядвацца баязліва **«на чужое вядучае»** (выдзелена мною.— *В. Ж.*), а дазваляла настройвацца **на вядучае** ўласнай душы. Марку Аўрэлію сімпатычныя людзі, якія разумеюць, што самая шчырая і разумная парада, самая мудрая і неардынарная думка, пачутая або пачэрпнутая з кніг, дзейсна і пазітыўна ўплываюць на фармаванне характару чалавека толькі тады, калі сам чалавек свабодна, нязмушана, без якога б там ні было націску на яго волю выбірае з такіх парад і думак нешта вельмі блізкае, сугучнае і адпаведнае яго ўласнай душы і свядомасці. «Памятай, — гаворыць ён,— што і змяніцца, і ўзяць прыклад з таго, хто цябе папраўляе, належыць толькі **свабоднаму.** Бо твая справа здзяйсняецца паводле тваіх жа імкненняў, меркаванняў ды і паводле твайго ж розуму» [36].

Гэта думка-ідэя, якая была выказана амаль дзве тысячы гадоў таму назад, справядлівая для кожнага гістарычнага часу, хоць трактаваць яе спрабавалі па-рознаму і нярэдка, як мы ведаем, паварочвалі яе не на пошукі і глыбейшае пазнанне ісціны, а на разыходжанне з ёю.

Менавіта гэта якраз вельмі хвалявала, непакоіла і трывожыла А. Твардоўскага падчас стварэння паэмы «Краіна Муравія». Ён прадчуваў рэальную пагрозу наступу на краіну і чалавека грубых і жорсткіх антыгуман-

---

[34] Марк Аврелий. Размышления. Л., 1985. С. 43.
[35] Там жа. С. 42.
[36] Там жа. С. 44.

ных сіл, якія пад выглядам змагання за агульналюдскія планетарныя інтарэсы прызнаюць зусім дапушчальнай нормай не прымаць пад увагу індывідуальны інтарэс асобы. І гэта прынесла нам незлічоныя страты, вялікія беды, якія вельмі балюча адчуваюцца і цяпер, па-рознаму выяўляючыся літаральна ва ўсіх сферах жыцця — у нашым тэхнічным адставанні, у запушчанасці сельскай гаспадаркі, у катастрафічных парушэннях прыроднай гармоніі і г. д. Усё гэта нібыта з'явы чыста практычнага значэння. Але ж у негатыўных праявах кожнай з іх мы знойдзем адну, па сутнасці, вузлавую прычыну — адбітак недастатковай духоўнай самарэалізацыі асобы, якую многія гады схілялі, настройвалі і вымушалі растварыць свой індывідуальны інтарэс у інтарэсе калектыўным ці без асаблівага ўнутранага самааналізу падпарадкавацца нейкай вышэйшай волі, якая звычайна выступала, вучыла і павучала асобу ад імя «беспамылковай» у сваіх рашэннях, планах, дзеяннях партыі.

Калі б такая камандная сіла раптам была пастаўлена перад жорсткай неабходнасцю матываваць свае ўчынкі, апраўдаць свае дзеянні, скіраваныя, скажам, на падпарадкаванне інтарэсаў асобы інтарэсам калектыўнай волі, то аргументы гэта сіла на першы погляд магла б знайсці без асаблівых цяжкасцей. Пра моц і непераможнасць калектыўнай сілы і непажаданасць парушаць яе гарманічны рытм і зладжаную хаду багата прыкладаў дае фальклор. Такія прыклады кожны можа прыгадаць і з сваёй жыццёвай практыкі. У самых розных сюжэтных варыянтах гэта ідэя ўзвышэння або нават рамантызацыі і гераізацыі калектыўнай сілы, да якой асобны чалавек імкнецца далучыцца добраахвотна, без знешняга прымусу або звяртаецца да яе за дапамогай у цяжкі ці крытычны момант, знаходзіць адлюстраванне і ў мастацкай літаратуры.

Прытым найбольш шырокае сюжэтна-тэматычнае поле такой ідэі ў літаратурным працэсе мы заўважаем звычайна тады, калі абставіны вымагалі асаблівай згуртаванасці і калектыўных намаганняў.

Такая з'ява ў даволі выразных малюнках знаходзіць, напрыклад, адлюстраванне ў беларускай дакастрычніцкай літаратуры ў перыяд найбольшага ўздыму рэвалюцыйных хваляў у грамадскім жыцці. Заклік да народа згуртавацца і паўстаць «дружнай грамадою» ў абарону сваіх нацыянальных і сацыяльных правоў яскрава гучыць

у творах Я. Купалы, Я. Коласа, Цёткі. У некаторых з іх (галоўным чынам у вершах акрэслена публіцыстычнага характару) ідэя калектыўнай волі з'яўляецца дамінуючай мастацкай сілай, якая вызначае сюжэтна-кампазіцыйныя і моўна-стылявыя асаблівасці твора. Аднак гэта праява публіцыстычнасці, калі калектыўная воля, калектыўны голас, агульна-масавы інтарэс і імкнуцца і спрабуюць пераканаць асобнага чалавека ў неабходнасці стаць на пэўны момант часцінкай масавай сілы і масавых намаганняў, ні ў Коласа, ні ў Купалы, ні ў Цёткі ніколі не пераходзіць у формы дыктату і навязвання чалавеку жорсткага і катэгарычнага безальтэрнатыўнага рашэння.

Гэта тэндэнцыя, досыць адчувальна выяўляючы сваю адметнасць, як мы сказалі, у творах публіцыстычнай арыентацыі, з яшчэ большай пэўнасцю, выразнасцю і маштабнасцю раскрываецца ў эпічным жанры прозы. І яркім прыкладам тут могуць быць творы Я. Коласа, які і ў распрацоўцы пытання аб узаемасувязях асобы і калектыву, «я» і «мы» шмат у чым можа быць названы наватарам-першапраходцам. А той сэнсавы «код», які аўтар закладваў у самыя першыя свае творы, спрабуючы раскрыць складаную, узаемазалежную сацыяльна-псіхалагічную сувязь асобы і калектыву, мастацкая думка беларускай літаратуры ў найбольш сумленных і таленавітых кірунках свайго развіцця намагалася «расчытаць» на наступных этапах. Яна імкнулася зразумець асноўную сутнасць гэтай эстэтычнай кодавай праграмы і зрабіць такое веданне актыўнай часткай пазнання жыцця чалавека.

Ёсць тут што «расчытваць» і сённяшняму даследчыку літаратуры. Далёка не вычарпана мастацкая энергія твораў Я. Коласа і ў вытлумачэнні такіх заўсёды актуальных і важных праблем, як чалавек і калектыў, чалавек і грамадства, чалавек і гісторыя і г. д.

Ці не пра гэта, напрыклад, яго кароценькае і на першы погляд даволі бытавое па вонкавых сюжэтна-тэматычных прыкметах апавяданне «Выбары старшыні» (1906). Напісана яно якраз у той час, калі коласаўскае слова, як мы адзначалі, у вершах заклікальна-публіцыстычнага ладу пэўным чынам падкрэслівала і вылучала на пярэдні план значэнне і ролю грамады, калектыўнай волі і агульных намаганняў у пераўтваральна-рэвалюцыйных працэсах жыцця. Гэта ідэя знаходзіцца ў цэнтры сюжэтнага лейтматыву і апавядання «Выбары старшыні».

Але ёсць тут вельмі важны мастацкі нюанс, які публіцыстычная форма верша асабліва не завастрала і не вылучала ні ў адкрытым яго выяўленні, ні ў падтэкставым гучанні. Я. Колас у гэтым, здавалася б, жартоўна-побытавым апавяданні імкнецца паставіць складанае сацыяльна-псіхалагічнае пытанне і перадаць нам сваю глыбокую занепакоенасць у сувязі з дзіўнымі паводзінамі грамады і яе эмацыянальна-паспешлівым рашэннем станоўча прагаласаваць за выбранне валасным старшынёй чалавека, які, мяркуючы па ўсім, такога гонару і такой падтрымкі не заслугоўваў.

Зрэшты, гэта меркаванне аўтар не катэгарыруе. І няма падстаў лічыць, што ён цалкам і поўнасцю падтрымлівае таго, «з чорнаю барадою» селяніна Піліпа, які «ўбег... у воласць», стукнуў дзвярыма і крыкнуў:

— Грамада! Ужо выбралі? Апанаса Кветку? Каб вам дошкі сабралі! Каго вы выбралі? Яшчэ мала выпіў у вас крыві? [37]

Не зважаючы на знаходжанне ў воласці «высокага начальства», што прысутнічала на цырыманіяле выбараў, Піліп даволі рашуча выказвае сваю антыпатыю і да земскага, і да толькі што выбранага пры яго адсутнасці старшыні:

— Ціха!— кажуць.— Тут жа земскі!

— А што мне ён? Але вы абармоты! Ты старшынька? Сто рублёў прапіў? Каму трэба — падсунуў? Зноў кроў будзеш піць? [38]

Піліп, напэўна, чалавек не з палахлівых. Але не трэба, відаць, дужа перабольшваць яго смеласць і колькі-небудзь рэзка супрацьпастаўляць грамадзе, якую ён асуджае. Гэтыя зневажальна-асуджальныя словы Піліп выказвае, будучы на добрым падпітку: «Піліпа ў воласці не было, як выбіралі старшыню,— выпіваў з сябрам» [39]. Трэба меркаваць, што не вельмі высокае ў яго і пачуццё грамадзянскай адказнасці. Ёсць і адпаведныя падставы думаць так. Герой хутчэй за ўсё ведаў, што ў воласці ідуць выбары валаснога старшыні. У межах вёскі такія падзеі не маглі застацца для некага таямніцаю. Але Піліп на сход своечасова не з'явіўся, быў, як мы ўжо заўважылі, заняты выпіўкаю «з сябрам».

---

[37] Колас Я. Зб. тв. Т. 4. С. 10.
[38] Там жа.
[39] Там жа.

Аднак аўтар усё роўна не абыякавы да свайго героя і пэўным чынам нават сімпатызуе яму. Бо Піліп, хоць духоўна і не вельмі ўзвышаецца над грамадою аднавяскоўцаў, нейкімі прыкметамі характару ўсё ж адрозніваецца. І вылучаецца менавіта тымі рысамі, якіх грамадзе не стае. У яго мы заўважаем, хай сабе яшчэ і не ў выразна акрэсленых формах, праяву нежадання слепа і механічна падпарадкоўвацца чужой волі. А гэта азначае, што пры адпаведных умовах гэты чалавек можа стаць больш актыўным і мэтанакіраваным шукальнікам ісціны. Кажучы іншымі словамі, пісьменнік не абыякавы да героя, даволі пэўны ў сваіх пазітыўных да яго адносінах, бо і сам герой не зусім абыякавы да таго, што адбываецца навокал. Падчас Піліп можа на нейкі момант аддаць перавагу выпіўцы з сябрам перад нечым больш важным і значным. Усё гэта, безумоўна, яго не ўпрыгожвае і не ўзвышае. Але не варта абмінаць і тое, што ўзнімае над абыдзёншчынай, а менавіта: дзесьці ў глыбінях яго душы наспявае пратэст супраць дыктату над яго свядомасцю і воляю волі іншых. Вось гэта рыса ў характары чалавека Я. Коласу галоўным чынам і імпануе, таму што пісьменнік звязвае з ёю магчымасць больш рэальнага набліжэння да ісціны і справядлівасці.

Для Коласа як мастака і грамадзяніна самымі непрымальнымі і па-свойму небяспечнымі праявамі ў характары асобнага чалавека ці ў абагульненым характары калектыву, грамады з'яўляліся іх духоўны нейтралітэт, абыякавасць да таго, што адбываецца навокал, іх добраахвотная, пакорлівая гатоўнасць прызнаваць над сабою вялікую або малую ўладу некага іншага і такім чынам вызваляць сябе ад клопатнага і нялёгкага занятку самастойна думаць, разважаць, дзейнічаць. З гэтымі сіламі духоўнай абыякавасці і духоўнага нейтралітэту Я. Колас палемізаваў на працягу ўсёй сваёй творчасці, скіроўваючы мастацкую думку на самыя розныя праблемна-тэматычныя і стылёва-жанравыя лініі і арыентуючы чалавека на **крытычны** падыход да самых, здавалася б, бясспрэчных і аўтарытэтных рашэнняў.

# ВІДУШЧАЯ СІЛА СУМНЕННЯ

Само паняцце **«крытычны падыход»** у вызначэнні і выяўленні духоўных магчымасцей чалавека звычайна прама ці ўскосна ўзаемазвязваецца ў разуменні Я. Коласа з паняццямі, якія скіраваны на вызначэнне гуманістычнай сілы характару героя. У асобных творах пісьменніка найбольш вылучаецца ў падыходзе да паказу чалавека рацыянальна-аналітычная рыса яго інтэлекту, у некаторых іншых, наадварот, дамінуе тэндэнцыя, закліканая павесці чытача ў свет чалавечых эмоцый, у сферу магчымасцей чалавечай душы выходзіць на спачувальна-гуманістычны кантакт і дыялог з іншым чалавекам. Аднак пра больш ці менш ізаляванае мастацкае існаванне гэтых паняццяў, трансфармаваных у характары коласаўскіх герояў, і асабліва герояў з выразна пазітыўным знакам эстэтычнай ацэнкі, можна гаварыць хіба толькі ўмоўна.

Героі, арыентаваныя на такія прынцыпы асэнсавання жыцця, як правіла, знаходзяцца на пярэднім плане пісьменніцкай увагі ва ўсіх найбольш значных яго творах. І не выпадкова. Аўтар перакананы, што ў першую чаргу менавіта з такімі людзьмі мы правамерна звязваем надзеі на пошукі ісціны і спасціжэнне яе важнай, глыбіннай сутнасці. А выйсці на такую глыбіню няпроста, бо шлях да яе, апрача ўсяго, ускладняецца рознымі інструкцыямі, указаннямі, прадпісаннямі і г. д., што часта прэтэндуюць на ролю бясспрэчнай думкі-аксіёмы, якую чалавеку нібыта без усякіх хістанняў і сумненняў трэба прызнаць, прыняць на веру і не траціць марна сіл, каб нешта ўдакладніць, скарэкціраваць, паправіць.

Цікавай і па-філасофску глыбокай у гэтым сэнсе з'яўляецца, напрыклад, ідэя алегарычнай навелы пра промень-неслух у паэме Я. Коласа «Сымон-музыка»

(1911—1924). Можна сказаць, ні адзін даследчык, які займаўся вывучэннем коласаўскага твора, не абмінаў увагай гэты момант. Неаднаразова выказвалі сваё меркаванне і мы. Але дыялог крытыкаў і чытачоў з аўтарам гэтай глыбокай сімваліка-алегарычнай навелы, што арганічна ўваходзіць у сюжэтны лад паэмы «Сымон-музыка» і наогул з'яўляецца яе важным канцэптуальна-метадалагічным звяном, яшчэ, як нам здаецца, далёка не закончаны.

Звернем увагу на адну такую грань паэмы. У свой час Д. Бугаёў у кнізе артыкулаў «Чалавечнасць» у даволі рэзкай і палемічнай форме выказваў нязгоду з тым тлумачэннем, якое даваў коласаўскай алегорыі В. Каваленка. Яму здавалася, што крытык, назваўшы промень-неслух «сімвалам гордай непакорлівасці, гераічнага самаахвяравання сабой у імя высокіх мэт»[1], насуперак аб'ектыўным намерам пісьменніка ўбачыў у гэтым «свавольстве» «бескарыслівае служэнне дабру і прыгажосці жыцця». Учынак промня-неслуха Д. Бугаёў больш схільны асудзіць. Узвышанага і гераічнага ў яго дзеянні крытык не знаходзіць.

Аднак ісціна, як мы ўжо раней гаварылі, знаходзіцца тут дзесьці пасярэдзіне. Можа, і сапраўды ў гераізме промня-неслуха выяўляецца нешта спрэчнае. Бо ён усётакі парушыў самога «сонца прыказанне», не выканаў важны, сур'ёзны і глыбока гуманістычны загад: дасягнуць зямлі і «знішчыць цьмы там панаванне». Аднак ужо зусім неправамерна, як гэта прапануе Д. Бугаёў, асуджаць яго. Парушыў жа промень-неслух прыказанне сонца, адстаў свавольна ад сям'і і збочыў з намечанага курсу пад уплывам вельмі істотнай і важнай прычыны. Тая няшчасная хмарка, што нечакана і непрадбачана сустрэлася на шляху промня, таксама мела патрэбу ў неадкладнай дапамозе:

Яна ад холаду дрыжала
І нікла ў жудаснай муці.
Праменю сонца шкода стала
Прыгожай хмаркі, што ўмаляла
Ей косы сонцам заплясці.
І ён спыніўся
І скланіўся
Перад няшчасцем хмаркі божай.

---

[1] Бугаёў Д. Чалавечнасць: Літаратурная крытыка. Мн., 1984. С. 264.

Яна — адна, навокал — жуд,
Пякельны холад, мрок і мут.
І кінуў промень блеск свой гожа,
Нібы стварыў ён з ёю цуд.
Заззяла хмарка так прыгожа,
Што хто не бачыў яе тут,
Звясці вачэй з яе не можа.
Ён з ёю дзеліць падарожжа,
Але завуць яго на суд.
За што? За тое,
Што святое
Парушыў сонца прыказанне... [2]

Падчас, відаць, усё-такі нялёгка і няпроста бывае прыняць канчатковае рашэнне, калі чалавек, атрымаўшы пэўны і цвёрды загад дапамагчы многім, на шляху да гэтай высокай мэты нечакана сустракаецца ўсяго толькі з адным нейкім бедаком, нешчаслiўцам, што таксама мае вельмі вострую і неадкладную патрэбу ў дапамозе. Дык як тут быць? Ці нельга ў дадзеным выпадку дапусціць, што Я. Колас, выкарыстоўваючы сімволіка-алегарычны спосаб інтэрпрэтацыі факта, імкнуўся ўцягнуць чытача ў арбіту глыбокага і напружанага філасофскага роздуму, больш спрабаваў ісці яму насустрач з пастаноўкай складанага і тонкага пытання аб маральна-этычным выбары, чым з гатовымі і катэгарычнымі адказамі. Ці не было ў вырашэнні падобных пытанняў нечага праблематычна-дыскусійнага і для самога аўтара?

Пісьменнік, трэба меркаваць, адчуваў пэўную неабходнасць удакладніць і скарэкціраваць асобныя моманты ўзнятай ім праблемы, разлічваючы на дзейсную дапамогу калектыўнага розуму. Аднак на такую інтэлектуальную і духоўную працу ён арыентуе чытача звычайна толькі тады, калі аўтарская думка і сама ўжо сур'ёзна папрацавала ў межах вызначанай тэмы, выразна акрэсліла галоўныя крытэрыі ацэнак і асноўныя лініі сюжэтнага руху.

Гэту арыентацыю аўтарскага намеру мы адчуваем і ў дадзеным выпадку, хоць у падтэкставай думцы твора, «загадкавасць» якой узмацняецца яшчэ і сімволіка-алегарычнай абагульненасцю мастацкага малюнка, відаць, заўсёды будзе заставацца пэўны элемент па-свойму закадзіраванага і «таямнічага» сэнсу.

Разлічваць на абсалютную, поўную і вычарпальную расшыфроўку сімволіка-алегарычных сістэм у мастацкім

[2] Колас Я. Зб. тв.: У 12 т. Мн., 1962. Т. 6. С. 324—325.

творы ў іх дачыненнях да канкрэтных рэалій жыцця, мо-
жа, і не трэба. У многім гэта абумоўлена законамі мастацтва і адметнаю прыродаю мастацкага вобраза. Ну хто, напрыклад, можа ўзяць на сябе смеласць сказаць, што ён да канца, з абсалютнай і вычарпальнай паўнатой раскрыў, расшыфраваў «Іліяду» і «Адысею» Гамера або «Дон-Кіхот» Сервантэса? Кожнае новае пакаленне шукае і знаходзіць у іх новы і дадатковы сэнс. Як нам уяўляецца, гэты новы і дадатковы глыбінны сэнс, шмат у чым увасоблены ў сімваліка-алегарычных формах, яшчэ доўгія і доўгія гады будуць шукаць і чытачы выдатнай коласаўскай паэмы «Сымон-музыка», суадносячы канкрэтна-гістарычны, грамадзянскі інтарэс аўтара з сваімі надзённымі побытавымі і быційнымі жыццёвымі клопатамі.

Аднак у таленавітым мастацкім творы і ў глыбока закадзіраванай сімваліка-алегарычнай сістэме пранікліва чытач звычайна знойдзе ці ў рэшце рэшт адчуе наяўнасць той сілы і той вузлавой яе дамінанты, якая настройвае сімвал і алегорыю на дыялог з рэальным жыццём і на паглыбленае вырашэнне і асэнсаванне яго складаных праблем. Іменна складаных і няпростых (гэта трэба падкрэсліць), бо ў іншым выпадку сімваліка-алегарычныя і фальклорна-міфалагічныя мастацкія формы і прыёмы могуць ператварыцца ў вонкавую прыкмету штучнай ускладнёнасці і не вельмі абавязковы, дэкаратыўны кампанент твора.

У творах Коласа такіх з'яў мы не знойдзем. І той канкрэтны сімваліка-алегарычны эпізод у паэме «Сымон-музыка», дзе промень-неслух рашаецца, трапіўшы ў экстрэмальную сітуацыю маральнага выбару, не выканаць загад сонца, таксама звязаны з вырашэннем надзвычай складанай і ва ўсе часы актуальнай праблемы — праблемы гуманізму. У межах гэтай складанай і шматграннай праблемы Я. Колас дае нам магчымасць сур'ёзна паразважаць, паспрачацца і ў дыскусійным плане паставіць самыя розныя пытанні.

Аднак правамерна, як нам здаецца, больш засяроджаную ўвагу звярнуць і на такі вось момант. Паказваючы (хай сабе і пункцірна) складанасць узаемадачыненняў уладара-сонца і яго «падначаленага» промня, аўтар хацеў, відаць, нагадаць нам пра тое, што няпростая, шматслойная праблема гуманізму з асаблівай выразнасцю і непадмаляванай рэзкасцю раскрывае сваю няпростасць, складанасць, нестандартнасць і альтэрнатыўнасць

менавіта тады, калі яна пераходзіць са сферы тэорыі ў сферу **канкрэтных, непасрэдна, практычных рашэнняў.** І асабліва рашэнняў і дзеянняў маштабнага, глабальнага плана. У такія моманты, як можна меркаваць, уважліва прачытваючы коласаўскую паэму, клопаты, трывогі і беды нейкага аднаго чалавека далёка не заўсёды прымаюцца пад увагу і падчас адсоўваюцца на задні план. А гэта азначае, што свядома ці міжвольна тут могуць парушацца асноватворныя прынцыпы праўды і гуманізму. І «парушальнікамі» бываюць не толькі заўзятыя зладзеі, прайдзісветы, маральна сапсаваныя і духоўна ўшчэрбныя людзі. Шчырыя гуманістычныя парыванні промня-неслуха і яго чыстасардэчнае жаданне дапамагчы абяздоленай хмарцы не здолела ці не захацела зразумець нават само сонца, якое таксама ставіць у аснову сваіх дзеянняў велічную і глабальную ідэю — знішчыць панаванне цьмы на ўсёй зямлі і ашчасліваць такім чынам увесь народ.

Сваім падтэкстам коласаўская думка ў згаданай сімволіка-алегарычнай навеле менш за ўсё звернута ў план катэгарычнага супрацьпастаўлення дзеючых асоб — сонца і промня-неслуха — па лініі вызначэння іх большай ці меншай вінаватасці, большай ці меншай дасведчанасці ў вырашэнні і асэнсаванні праблемы гуманізму, большай ці меншай значнасці тых намераў і дзеянняў, якія звязаны з імем сонца і з імем промня-неслуха. У плане такіх рэзкіх супрацьпастаўленняў падобныя пытанні і праблемы вырашэнню наогул не паддаюцца. Бо адзін і другі бок можа прывесці тут сур'ёзныя аргументы ў карысць сваіх намераў і планаў.

Я. Колас гэта ўлічвае. І добра разумее, што інтарэсы большасці і меншасці, інтарэсы дзяржавы і асобы далёка не заўсёды супадаюць і што гэтыя інтарэсы часта набываюць непрымірымы і канфрантацыйны характар. Аднак пісьменнік ставіў мэту не канстатаваць такі факт як аксіяматычную, агульнавядомую ісціну, а ўцягнуць чытача ў арбіту сур'ёзнага і засяроджанага філасофскага роздуму пра ролю, месца і духоўныя магчымасці асобы, калі яна трапляе пад уплыў (далёка не заўсёды дружалюбны і гуманістычны) глабальных і маштабных дзяржаўных інтарэсаў.

Гэта коласаўская думка, знаходзячы сваё глыбокае філасофска-мастацкае ўвасабленне ў паэме «Сымон-музыка», мае, на наш погляд, своеасаблівае і цікавае дачы-

ненне да пушкінскай традыцыі, разгортваючы яе на арыгінальнай і наватарскай дыялагічнай аснове. Так, напрыклад, герой паэмы А. Пушкіна «Медны коннік» (1833) Яўгені і сімваліка-алегарычны персанаж коласаўскай паэмы «Сымон-музыка» промень-неслух у пэўнай ступені пастаўлены ў аднолькавыя ўмовы, якія вымушаюць іх выказаць і выявіць свае адносіны і, у прыватнасці, сваё стаўленне да той вышэйшай і аўтарытэтнай волі і сілы, што быццам бы ўжо наўперад, без якіх бы там ні было разваг і хістанняў абавязвае ўсіх звычайных і смяротных людзей паслухмяна падпарадкоўвацца ёй і быць паслухмянымі выканаўцамі ўсіх яе загадаў.

Пушкін часта сам, ад уласнага імя, не хаваючыся за спіну лірычнага героя, настройвае чытача паэмы «Медны коннік» пранікнуцца думкай пра веліч гістарычнай місіі, спраў і дзеянняў Пятра І, па волі якога ў дрыгвяністых і неабжытых месцах быў пабудаваны вялікі і прыгожы горад з важным дзяржаўна-стратэгічным прызначэннем. Ды і цяжка назваць іначай як песняй-ухвалай, гімнам-апафеозам вядомыя словы паэта:

Люблю тебя, Петра творенье,
Люблю твой строгий, стройный вид,
Невы державное теченье,
Береговой ее гранит,
Твоих оград узор чугунный,
Твоих задумчивых ночей
Прозрачный сумрак, блеск безлунный,
Когда я в комнате моей
Пишу, читаю без лампады,
И ясны спящие громады
Пустынных улиц, и светла
Адмиралтейская игла... [3]

Стэрэаскапічны позірк паэта адлюстроўвае, аднак, гэту з'яву і выяўляе ацэначныя адносіны да яе і з іншага боку. З боку простага, звычайнага чалавека, які «живет в Коломне, где-то служит», марыць пра шлюб з такой жа простай і звычайнай дзяўчынай, пра дабрабыт «смиренный и простой». Але мары яго, як вядома, раптоўна перакрэсліваюцца стыхійным бедствам, і Яўгені ўвесь свой гнеў за няспраўджаныя надзеі пераносіць на Пятра І. Бо менавіта па яго ж царскай волі «под морем город основался», дзе ў адно імгненне герой стаў адзінокім і няшчасным.

[3] Пушкин А. С. Полн. собр. соч.: В 10 т. М., 1957. Т. 4. С. 381.

Пушкін спачувае гэтаму чалавеку, блізка да сэрца ўспрымае яго жыццёвую драму. Ён дае зразумець, што пры ўсёй сваёй асцярожнасці і лагоднасці характару Яўгені не такі ўжо і баязлівы чалавек. Бо трэба было валодаць смеласцю і нават мужнасцю, каб у адносінах да таго дзяржаўнага імператарскага выбару, што прызнаваўся афіцыйнай і не толькі афіцыйнай думкай як бясспрэчная і блаславёная самім небам ісціна, выказаць у даволі рэзкай і гнеўнай форме ўласнае меркаванне.

Такая бунтоўная рэакцыя яго душы вельмі хутка, праўда, змяняецца страхам і, пэўным чынам выявіўшы сваю нязгоду з царскаю воляю, з воляю «державца полумира», ён, нібыта спахапіўшыся, што і статуя меднага конніка можа тут жа, на месцы ўчыніць над ім страшны суд, «стремглав бежать пустился». Аднак мастацкая думка твора ўжо «запрацавала» і як сур'ёзнае праблемнае пытанне: а ці да канца ўзважаны і прадуманы ўсё-такі тыя велічныя і, здавалася б, бясспрэчныя намеры і планы цара-рэфарматара, калі дзесьці ўбаку застаюцца людзі, жыццёвы лёс якіх гэтыя планы абмінаюць, закрэсліваюць і якія не вельмі спадзяюцца, што высокая воля імператара будзе ў дачыненні да іх гуманнай і міласэрнай, калі яны раптам паспрабуюць у чымсьці засумнявацца і сказаць нешта ў абарону саміх сябе? Ды так яно і сталася. Не паспеў Яўгені яшчэ выказаць усіх сваіх крыўд і расказаць пра ўсё набалелае, як яго апанавалі нядобрыя прадчуванні. І не беспрычынна. Кумір на бронзавым кані адразу ж, не палічыўшы нават патрэбным даслухаць да канца гэтую горкую споведзь душы, наўскач пагнаўся за сваім падданым, не такім ужо, здавалася б, і небяспечным для царскай улады крытыкам, каб жорстка яго пакараць.

Даследчыкі літаратуры сістэматычна звярталі ўвагу менавіта на гэты бок пушкінскай паэмы «Медны коннік»: на несупадзенне глабальных дзяржаўных планаў і інтарэсаў звычайнага, простага і сціплага ў сваіх жыццёвых памкненнях і сваім разуменні шчасця чалавека як на лейтматыўную ідэйна-эстэтычную асаблівасць твора. Гэта думка і сапраўды з'яўляецца сюжэтна-праблематычнай дамінантай пушкінскай паэмы. Аднак паэта, як відаць, не менш цікавіць тут і праблема развіцця грамадства ў межах высокіх маральна-гуманістычных прынцыпаў, дзе гістарычны дзяржаўны інтарэс, пракламаваны аўтарытэтнай, можа, нават і геніяльнай асобай, не паві-

нен пагарджаць інтарэсам, поглядам, ацэнкай звычайнага, простага, радавога чалавека.

У дадзеным выпадку Пушкін не сцвярджае, што гэты просты і звычайны чалавек — галоўная рухаючая сіла гісторыі. Такі погляд знойдзе адбітак у іншых яго творах («Барыс Гадуноў», «Капітанская дачка» і інш.). У «Медным конніку» аўтара цікавіць іншы аспект гэтай праблемы, хоць некаторыя важныя яе грані ўжо праглядваюцца. І тут, каб глыбей зразумець аўтарскую думку, варта звярнуць пільную ўвагу на мастацкія дэталі. Тады мы лепей адчуем, што паэт, спачуваючы свайму герою, побытавыя інтарэсы якога рэформы Пятра І не дужа ўлічвалі, разам з тым апасродкаваным шляхам наводзіць чытача на думку, што і сам гэты чалавек, на нейкі момант асмеліўшыся на бунтоўны пратэст, духоўна таксама яшчэ не вельмі гатовы да таго, каб расшырыць гарызонты ісціны ў самім пытанні: наколькі і як могуць і павінны ўсё ж з карысцю для абодвух бакоў узаемазвязвацца інтарэсы асобы і дзяржавы?

Пушкіну, можна здагадвацца, імпануе, што яго Яўгені хоць на нейкае кароткае імгненне спрабуе стаць грамадскім чалавекам. Аднак гэтая яго рыса выяўляецца ў занадта ўжо хуткацечных, імпульсіўных формах. І самае галоўнае — у праявах такога індывідуальнага выбару, які, паводле меркаванняў аўтара, не можа прывесці да станоўчых вынікаў у пошуку ісціны і садзейнічаць гарманізаванаму развіццю грамадскай гісторыі. Бо ў сваім сімволіка-алегарычным дыялогу з Пятром І Яўгені — амаль суцэльнае ўвасабленне злосці, нянавісці і стыхійнай бунтоўнай сілы:

Кругом подножия кумира
Безумец бедный обошел
И взоры дикие навел
На лик державца полумира.
Стеснилась грудь его. Чело
К решетке хладной прилегло,
Глаза подернулись туманом,
По сердцу пламень пробежал,
Вскипела кровь. Он мрачен стал
Пред горделивым истуканом
И зубы стиснув, пальцы сжав,
Как обуянный силой черной,
«Добро, строитель чудотворный!—
Шепнул он, злобно задрожав,—
Ужо тебе!..» [4]

---

[4] Пушкин А. С. Полн. собр. соч. Т. 4. С. 286.

Пушкіна, як вядома, вельмі непакоіла магчымая небяспека таго, каб такі злосны, «обуянный силой черной человек», які ў цяжкую для яго часіну можа выклікаць да сябе і спагаду, і спачуванне, раптам не паспрабаваў змагацца за права свайго **індывідуальнага жыццёвага выбару адпаведнымі яго настрою спосабамі** і не стаў некіруемай часткай стыхійнай і бунтоўнай у сваіх памкненнях і дзеяннях грамады, здольнай пайсці на ўсё — на вялікія разбурэнні і крывавыя злачынствы. Ён лічыць, што ў змаганні чалавека за свой індывідуальны выбар і погляд першынстваваць павінна не чорная сіла нянавісці і злосці, не стыхійная бунтоўная энергія, а тая праява яго духоўнасці, галоўнымі прыкметамі якой заўжды былі відушчая, праніклівая, скіраваная на пошук ісціны думка і гуманістычнае пачуццё.

На чалавека, здольнага ў бліжэйшы ці больш аддалены час узнімацца на такую вышыню духоўнасці, Пушкін у асноўным і арыентаваў сваю творчасць. І ў народнай памяці, у памяці наступнікаў, як уяўляецца паэту, ён доўгія гады будзе жыць найперш менавіта таму, што ў свой жорсткі век уславіў свабоду і абуджаў добрыя міласэрныя пачуцці да пакрыўджанага лёсам чалавека.

Гэта гуманістычная традыцыя А. Пушкіна была блізкай і класіку нашай літаратуры Я. Коласу, хоць вузлавыя прыкметы яе выяўляюцца ў яго творах, вядома ж, не ў нейкіх знешніх сюжэтных рэмінісцэнцыях і вучнёўскіх запазычаннях. Усё гэта знаходзіць свой адбітак у больш глыбокіх, унутраных сувязях і датычыцца галоўным чынам блізкасці агульна-метадалагічнага погляду на жыццё і чалавека, на сам падыход да пошуку, раскрыцця і асэнсавання прычынных асноў жыццёвай праўды, наблізіцца да якой ці ўзняцца на вяршыні яе пазнавання можа толькі той, хто духоўна падрыхтаваны крытычна суадносіць свой погляд на рэальнасць, уласны жыццёвы выбар з поглядам, жыццёвым выбарам і ацэнкамі іншых людзей.

У інакшым выпадку бунтоўны пратэст чалавека, паводле меркаванняў Пушкіна і Коласа, часта застаецца ўсяго толькі малаэфектыўнай формай дзеяння, якое нярэдка здольна стаць некантралюемай чорнай сілай і якое ў прынцыпе знаходзіцца ў досыць павярхоўных і слабых кантактах з пошукам ісціны.

А нярэдка такое больш спакойнае ці больш рэзкае і бунтоўнае нежаданне прыслухацца да чужога голасу, ад-

маўленне чужога жыццёвага вопыту, як сведчаць многія іх творы, з'яўляецца досыць дакладным барометрам, паказвае і на нежаданне такіх людзей перанапружваць сябе жыццёвымі клопатамі і ісці насустрач вырашэнню складаных і няпростых пытанняў жыцця.

Нешта падобнае наглядаецца, напрыклад, у алегарычным коласаўскім творы «Чыя праўда» (1921) з цыкла «Казкі жыцця». Вось кароткі яго змест. Стары дуб заклікае сваіх маладзейшых суседзяў быць больш удумлівымі і разважлівымі перад тварам магчымай сур'ёзнай небяспекі. Яны ж з'едліва падсмейваюцца над старым мудрацом ці ў лепшым выпадку спрабуюць адмахнуцца ад яго прапаноў і перасцярог. Аднаму з іх здаецца, што стары дуб схіляе на такія засяроджаныя роздумы, кіруючыся меркаваннямі зайздрасці да маладосці: «Ты стары, сілы ў цябе няма, і табе зайздросна пазіраць на тых, каму весела, хто жыць хоча» [5]. А іншыя наогул лічаць непатрэбным заняткам думаць пра заўтрашні дзень, псаваць сабе настрой: «Ну і натура ў цябе, бацька дуб! От як улёг у адно і тое,— дык мелеш і мелеш, і губа табе ніколі не зачыняецца. З кім не бывае бяды? От мы стаімо тут, а заўтра можа загрымець гром, лясне пярун — і няма нас! Ці мала якія могуць быць выпадкі? Што варажыць аб тым?» [6] Аднак з такой тэорыяй бяздумнага, ружовага аптымізму аўтар не пагаджаецца, хоць палемічная лінія выяўляецца тут у досыць спакойных і ўраўнаважаных танах.

Такая з'ява духоўнай індыферэнтнасці раскрывае сябе ці ў рэшце рэшт даволі гучна нагадвае пра сябе і ў іншых творах гэтага цыкла ў самых разнастайных формах і прыкметах, хоць звычайна і мае адну найбольш характэрную і прынцыповую асаблівасць — імкненне любым спосабам штучна спрасціць шляхі да пошуку ісціны ці нават замкнуць яе мнагалучнасць і мнагамернасць у межах вузкааднамернага бачання і разумення. Купальскія святлякі ў аднайменнай коласаўскай казцы, напісанай у 1925 г., лічаць, напрыклад, што менавіта яны самі — і сонца, і зоры, і месяц, а ўсё іншае — нешта пабочнае, дробязнае і зусім малазначнае: «А нам — цьфу на сонца, на зоры, на месяц, на купальскія агні, што пазапальваны па лесе ў гэтую ноч. Каля іх сялянская дурнота спраў-

[5] Колас Я. Зб. тв. Т. 5. С. 475.
[6] Там жа.

ляе свае танцы. **Мы ж самі — сонца, зоры, месяц»** (выдзелена мною.— *В. Ж.*)[7].

У коласаўскіх «Казках жыцця», дзе вельмі часта такія погляды, меркаванні, пазіцыі, прынцыпы, канцэпцыі і тэорыі спрабуюць паслабіць ці прыглушыць тыя стымулы, якія схіляюць чалавека на няспынную працу душы, звычайна дзейнічае і сіла, якая супрацьстаіць гэтаму імкненню замкнуць вечна рухомы і зменлівы прыродны, грамадскі, псіхалагічны калейдаскоп жыцця ў нейкія застылыя схемы, догмы, формулы і стэрэатыпы. У той жа казцы-алегорыі «Купальскія светлякі», дзе майскія, зіхатлівыя жучкі-аднадзёнкі лічаць сябе і сонцам, і зорамі, і месяцам, а значыць, лічаць і свае погляды, меркаванні і ацэнкі ісцінай у апошняй інстанцыі, мы чуем і іншыя галасы, іншы каментарый саманадзейнай пахвальбы жучкоў-светлякоў: «Ха-ха-ха!— засмяялася ночка.— Мілыя вы жэўжыкі! Усё гэта вельмі пацешна, але самі вы — толькі малюпасенькі адбітак сонца, а вы плюяце на яго. Ну, што ж?.. Ваш час, пазабаўляйцеся, дзеткі. Я зараз сыду з зямлі, і ваш мілы агеньчык пагасне ў бляску дня...»[8]

«Чым цікава жыццё,— казаў адзін дуб,— дык гэта тым, што яно, хоць і ідзе па пэўных законах, але вечна змяняецца і разгортвае новыя старонкі. І колькі б ты не жыў, ніколі не пасягнеш яго мнагалучнасці»[9]. Вось гэта думка алегарычнага персанажа з «Казак жыцця» пра адвечнае чалавечае імкненне спазнаць жыццё ў поўным аб'ёме і немагчымасць спасцігнуць яго складаную мнагалучнасць з'яўляецца досыць выразным паказчыкам аўтарскага светаўспрымання і вельмі важнай, калі не сказаць самай галоўнай, адзнакай метадалагічнага крэда пісьменніка. Ва ўсіх найбольш значных сваіх творах Я. Колас прыкладае максімум старання і выкарыстоўвае самыя разнастайныя стылёва-жанравыя, эпічныя і псіхалагічныя падыходы, каб паказаць чалавечыя характары і асяроддзе, дзе яны нараджаюцца, фармуюцца і складваюцца, у найбольш поўных і закончаных эпічных формах.

Аднак пра мастацкую закончанасць характараў коласаўскіх герояў, нават тых, у псіхалагічны працэс фарма-

---

[7] Колас Я. Зб. тв. Т. 5. С. 510.
[8] Там жа. С. 511.
[9] Там жа. С. 510.

вання якіх ён пільна ўглядаўся на працягу дзесяцігоддзяў, можна гаварыць хіба толькі ўмоўна. І больш дакладным будзе тут, напэўна, слова не «закончанасць», а «завершанасць». Гэтая, дарэчы, адкрытасць коласаўскай думкі насустрач жыццёвай мнагалучнасці новаму, нязведанаму, а часта і таямнічаму, загадкаваму ў жыцці наклала адбітак на сюжэтныя фіналы бадай што ўсіх яго буйных твораў. Фіналы тут па-свойму адкрытыя, а характары — галоўныя рухавікі сюжэтнага дзеяння — таксама шмат у чым застаюцца адкрытай эстэтычнай сістэмай, скіраванай да далейшага развіцця. Такімі з'яўляюцца характары і фіналы сюжэтаў у паэмах «Новая зямля» і «Сымон-музыка», у трылогіі «На ростанях», у аповесці «На прасторах жыцця» і інш.

Вульгарна-сацыялагічная крытыка нярэдка спрабавала трактаваць такую своеасаблівасць мастацкай структуры і характару чалавека ў коласаўскіх творах як нейкую адзнаку агнастыцызму, уласцівую самой аўтарскай свядомасці. Адбітак гэтай з'явы мы знойдзем нават у працах некаторых крытыкаў больш позняга часу, калі ўжо, здавалася, самая высокая хваля вульгарна-сацыялагічнай навалы адкацілася і ў літаратуразнаўстве пакрысе стала ўсталёўвацца цвярозая разважлівасць. Аднак сувязь такой вульгарна-сацыялагічнай тэндэнцыі 40—50-х гадоў з тэндэнцыяй канца 20—30-х гадоў была яшчэ досыць адчувальнай і моцнай.

У 40-я і 50-я гады крытыка ўжо адкрыта на Коласа не нападала. Яго грамадскі і літаратурны аўтарытэт быў падтрыманы і афіцыйнымі ўладамі. Адным словам, нападаць на Коласа так, як крытыкавалі яго «Новую зямлю» Бэндэ і Кучар у 20-я і 30-я гады, было ўжо не прынята.

Але тут адбываліся падчас дзіўныя метамарфозы. Самому пісьменніку як чалавеку і творчай асобе дробнабуржуазныя ўхілы і розныя іншыя ідэалагічныя «грахі» ўжо не інкрымінавалі. Затое пад моцны прэсінг крытыкі трапілі некаторыя героі яго твораў, і ў прыватнасці цэнтральны герой коласаўскай трылогіі «На ростанях» настаўнік Лабановіч.

Так, напрыклад, у вялікім артыкуле Ул. Карпава «Проза і драматургія Якуба Коласа (1947—1950)» крытык, апрача ўсяго іншага, лічыць вялікай хібай у характары маладога настаўніка тое, што ён залішне ўжо апанаваны роздумам аб «таямнічасці і непазнавальнасці чалавечай натуры», аб наяўнасці нейкага свядомага жыцця

ў прыродзе, аб загадкавасці і недасяжнасці далёкіх светаў і «мізэрнасці чалавека і яго жыцця ў параўнанні з сусветам і вечнасцю» [10]. А ўлічваючы тое, што ў дадзеным канкрэтным выпадку герой знаходзіцца ў вельмі блізкім жыццёва-біяграфічным сваяцтве з самім аўтарам твора, то, крытыкуючы героя, Ул. Карпаў крытыкуе мастацкую і метадалагічную пазіцыю самога Я. Коласа, які, можна сказаць, не проста канстатуе, а падкрэслівае, неаднаразова паўтарае і вылучае буйным планам думку пра немагчымасць чалавека заключыць складаную, мнагамерную і поліфанічную шматстайнасць жыцця ў нейкую адну, нават вельмі мудрую, па-свойму нават універсальную формулу.

На думку пісьменніка, самыя мудрыя і універсальныя формулы жыцця абдымаюць толькі частку ісціны. А таму ніхто, ніякі аўтарытэт не мае права сілком навязваць чалавеку сваю волю і сваё бачанне развіцця, пабудовы і перабудовы грамадства: «Навязваць жа людзям сваю волю, вымагаць ад іх, каб яны рабілі іменна так, а не іначай, мы не маем права, бо хто можа паручыцца за тое, што мы не памыляемся? Гэтым і тлумачыцца той факт, што розныя правадыры, якія захоплівалі жарам свайго пераканання людскі натоўп і вялі яго за сабою,— вялі толькі да тае граніцы, ад якой пачыналіся перашкоды. Натоўп не разумеў гэтых перашкод, адольваць іх у яго не было ахвоты. На гэтым пункце вынікалі непаразуменні. Правадыр з гарчэчаю ў сэрцы казаў: «О, сляпы, нікчэмны натоўп, статак жывёлін!» А натоўп крычаў: «Ты — ашуканец! Пабіць цябе каменнямі» [11].

Я. Колас, як можна зразумець, не адмаўляе таго, што думка лідэра, правадыра можа быць больш пранікліваи і ў сваім пошукавым руху больш набліжацца да ісціны, чым пазнавальна-пошукавы інтарэс звычайнага масавага чалавека, які падчас уваходзіць у гэту людскую агульнасць, натоўп як не вельмі свядомая і духоўна дзейсная яе частка. Ды пісьменнік і не мог адмаўляць першараднага значэння і ролі жыццёвага вопыту і прафесіяналізму таго, хто па розных прычынах яўна ўзвышаецца, узнімаецца над сярэдне-звычайным, будзённым узроўнем духоўнасці. Іначай яму давялося б усумніцца ў непахісных аксіяматычных ісцінах грамадскай гісторыі ды

[10] Карпаў Ул. На шляху сталасці. Мн., 1952. С. 74.
[11] Колас Я. Зб. тв. Т. 9. С. 37.

і самой прыроды, якая ў пэўнай ступені закладвае гэтыя асаблівасці лідэрства ў саму генную аснову чалавечай псіхікі. Відаць, ёсць зерне сур'ёзнай, хоць і не бясспрэчнай ісціны ў словах вядомага хірурга і літаратара М. М. Амосава: «Моцных лідэраў сярод людской папуляцыі каля 10—20 працэнтаў, але іменна ім чалавецтва абавязана па меншай меры паловаю свайго прагрэсу»[12].

Вядома, рэальнае жыццё далёка не заўсёды лічыцца з такімі «тэстамі», біяфізіялагічнымі і духоўна-псіхалагічнымі праграмамі і прадвызначэннямі прыроды. І лідэрскае, правадырскае месца на больш ці менш працяглы гістарычны прамежак часу нярэдка захоплівалі і захопліваюць малапрыдатныя для такой высокай місіі людзі. Аднак і ў тым урыўку з трылогіі «На ростанях», дзе, як мы сказалі, аўтар не бярэ пад сумненне ролю правадырскага і лідэрскага дзеяння як рэальнай, заканамернай з'явы і сілы жыцця, ён у той жа час лічыць, што гэта індывідуальная сіла здольна актыўна закрануць развіццё грамадскага працэсу толькі тады, калі яна ў формах непавярхоўных узаемаўплываў і ўзаемадзеянняў судакранаецца з намерамі і жаданнямі іншых людзей і, у прыватнасці, з настроямі і планамі масавага чалавека. Ніякага заблуджэння і самападману, на думку пісьменніка, тут не павінна быць.

На кароткі час, як вынікае з логікі разважанняў Коласа, правадыр, лідэр сапраўды могуць, неўпрыкметку навязваючы людзям сваю волю і пэўным чынам падфарбоўваючы і аптымізуючы рэальны стан рэчаў, павесці іх за сабой. Аднак гэтая воля лідэра, калі яна не стала нейкаю натуральнаю і арганічнаю часткаю волі і імкнення калектыву, грамады ці, як гаворыць аўтар, натоўпу, грунтоўна, прагрэсіўна і па-сапраўднаму дэмакратычна выявіць сябе не здолее. Бо той самы натоўп, што на нейкім этапе горача падтрымліваў свайго лідэра, дружна апладзіраваў яму, пры сустрэчы з першымі сур'ёзнымі жыццёвымі нягодамі звычайна крута пераарыентоўваецца ў сваіх сімпатыях-антыпатыях і не супраць бывае закідаць свайго ранейшага куміра каменнямі. У такім разе, як відаць, і другі бок таксама выяўляе схільнасць пайсці на больш рэзкія захады насуперак тым, хто адмаўляецца слухацца і выконваць загады правадыра. Калі так званы натоўп ад абагаўлення свайго любімца-пра-

[12] Коммунист. 1990. № 7. С. 109.

вадыра так хутка пераходзіць у псіхалагічны стан непадпарадкавання яму, то і сам правадыр у падобных выпадках не вельмі жадае быць цярплівым і далікатным у абыходжанні з натоўпам, называючы яго сляпым і нікчэмным статкам жывёлін.

У падтэксце таго ўрыўка, на якім мы спыняем тут увагу, акрэсліваецца і такая аўтарская думка: свабодная воля чалавека, нават чалавека яркага і таленавітага, адасобіўшыся, адгарадзіўшыся ад волі іншых людзей непрыступнаю сцяною, непазбежна перарастае ў волю прымусовага таталітарнага дзеяння. Справядліва заўважана, што «боязь чужога погляду кладзецца ў фундамент нецярпімасці і спараджае гатоўнасць да насілля»[13]. Такая воля, паводле меркаванняў пісьменніка, звужае і магчымасць пазнання жыцця, бо і думка гэтага чалавека звычайна таксама прэтэндуе на нейкі бязгрэшна-універсальны характар закончанасці.

Ну а на якіх жа шляхах бачыў Я. Колас развіццё свабоднай волі і свабоднай думкі, скіраваных на пошук ісціны і справядлівасці, прымальных не для некага аднаго, а для многіх? Адказы на такія пытанні пісьменнік ніколі не ўкладваў у сваіх творах у аднамерныя формулы-стэрэатыпы. Але пэўная лінія акрэсліваецца тут досыць выразна. Я. Колас лічыць, што ісціна і справядлівасць, якія могуць быць блізкімі і сугучнымі інтарэсам многіх і якія аб'ектыўна пастаўлены ў план вырашэння самім жыццём, намаганнямі многіх, агульнымі намаганнямі грамадства павінны і спасцігацца.

Праграма гэтага прынцыпу даволі яскрава выяўляецца ў самой структуры ўсіх найбольш значных коласаўскіх твораў, хоць кожны раз выступае ў непаўторным мастацкім ракурсе. Узяць хоць бы такія яго буйныя эпічныя творы, як «Сымон-музыка», «Новая зямля» і трылогія «На ростанях». У кожным з іх самую цяжкую і складаную працу па развязванню складаных вузлоў жыцця бярэ на сябе галоўны герой. У пэўным сэнсе такое імкненне героя адчуваецца ўжо з першых старонак кожнага з названых твораў. Але гэта іх імкненне зразумець унутраную ходу жыцця глыбей, чым разумеюць іншыя людзі, ніякім чынам не звязана з імкненнем адасобіцца ад грамады, заклапочанай сваімі вельмі будзённымі справамі.

---

[13] Нестеренко В. Язык нетерпимости и язык доверия // Свободная мысль. 1992. № 2. С. 76.

Няма тут звычайна і памкнення падкрэсліць сваё **універсальнае настаўніцкае права** ў дачыненні да гэтай грамады, калі нават такое права ў той альбо іншай ступені абумоўліваецца і апраўдваецца прафесіяй галоўнага героя, дыктуецца, прадвызначаецца прыродай яго таленту.

У творах Я. Коласа часта наглядаецца нешта зусім адваротнае. Цэнтральны герой трылогіі «На ростанях» настаўнік Лабановіч увогуле добра ўсведамляе, што пасля заканчэння настаўніцкай семінарыі ў першую чаргу яму належыць вучыць сялянскіх дзяцей. Дзеля гэтага ён і сам вучыўся на бацькоўскія медзякі. З такім намерам здзяйснення вялікай, пачэснай і высакароднай настаўніцкай місіі ён і едзе па накіраванні ў глухую па тым часе палескую вёску Цельшына.

Аднак гэтыя намеры і планы высакароднай і важнай грамадскай настаўніцкай місіі, як вынікае з твора, не прыглушаюць у яго таго адчування, што ён па-ранейшаму, хай сабе ў іншых жыццёвых варунках, працягвае заставацца дапытлівым і цікаўным вучнем. І гэта адчуванне героя — адчуванне сябе ў адзін і той жа час настаўнікам і вучнем — чытач успрымае як важную грань аўтарскай задумы з самых першых старонак твора.

Пісьменнік, напрыклад, толькі што пазнаёміў нас з сваім героем. І на першы погляд у таго быццам бы зусім нечакана завязваецца такая вось размова са старожкай школы бабкай Мар'яй, якая таксама толькі што «ўвайшла» ў сюжэтнае дзеянне твора:

— ...Скажы ты мне, бабка, чаго мы на свеце жывем?

Бабка не ведала, які тон ёй узяць, каб не памыліцца, і сказала:

— Гэ, панічок, што вы ўсё так пытаецеся?.. Гляджу я на вас і дзіўлюся: сядзіць сабе, як той манашак, і ўсё ў гэтыя кніжкі пазірае. Паглядзелі б трохі і годзе. А то калі не прыйдзеш, вы ўсё ў кнігі глядзіце. Хіба можна так пільна і доўга пазіраць у іх?— І, памаўчаўшы, дадала:— Сушаць яны і болей нічога.

— Дык ты, бабка, не ведаеш, чаго мы на свеце жывем?

— Не, панічок: не ведаю! Каб вы запыталіся ў дрэва, чаму яно расце, дык хіба ж бы яно вам адказала? Так і я не магу адказаць вам. Жывем, покі жывецца, бо жывы ў зямлю не палезеш, а прыйдзе смерць, тады пахаваюць.

— Так, бабка: ты кажаш праўду. Не ведаем мы, чаго на свеце жывем.

— А навошта, панічыку, і ведаць? Жыве чалавек і жыве, пакуль бог яму прызначае. А прыйдзе час яму памерці — памрэ.

— А дрэнна, бабка, што трэба ўміраць!

— Што вы, панічыку, усё пра смерць гаворыце! Дзіўны вы, панічок, далібог! Вось той паніч, што быў перад вамі, бывала пойдзе куды ці да пана падлоўчага або да Курульчука на будку. Там паненка была, ой, прыгожая паненка! Яе цяпер дома няма, а вось прыедзе, дык пабачыце самі [14].

Лабановіч, безумоўна, не разлічвае і не спадзяецца, што непісьменная паляшучка вось так з ходу заглыблена адкажа на раптоўна і нечакана пастаўленае перад ёю складанае філасофскае пытанне. Але гэта пытанне, якое неўзабаве па меры разгортвання сюжэтнай дзеі ўсё больш і больш адчувальна праясняецца, Лабановіч ставіць перад старой жанчынай далёка не з той мэтай, каб проста пасмяяцца, пажартаваць ці паказаць сваю вышэйшасць. Коласаўскі герой, настаўнік па прафесіі, у пэўнай ступені выступае тут у якасці зацікаўленага вучня, які быццам бы спрабуе схаваць свой сапраўдны і глыбокі інтарэс у крыху жартоўнай форме. У гэтых дзвюх ролях — настаўніка і вучня — Лабановіч застаецца на працягу ўсяго твора, хоць непасрэдна ні ў якой навучальнай установе пад час знаёмства з ім чытача герой не вучыцца. Аднак пасля заканчэння настаўніцкай семінарыі з яшчэ большай стараннасцю і напружаннем духоўных сіл працягваецца яго настойлівая і зацікаўленая вучоба ў школах і універсітэтах самога жыцця. А менавіта гэта ў значнай ступені абумоўлівае і яго глыбока дэмакратычны інтарэс амаль да кожнага чалавека, што сустракаецца на яго жыццёвым шляху. Тут мае месца не проста халодная і сузіральная індыферэнтнасць, а вельмі засяроджаная і, як мы сказалі, цярплівая і глыбокая аналітычная зацікаўленасць.

У гэтым плане цэнтральны герой коласаўскай трылогіі «На ростанях» прыкметна адрозніваецца, напрыклад, ад галоўнага героя рамана Ц. Гартнага «Сокі цаліны» (1914—1929) Рыгора Нязвычнага. Апошні хоць і не з'яўляецца па прафесіі настаўнікам, але настаўніцкія памкненні ў яго, як мы ведаем, выяўляюцца досыць адкрыта і нават з відавочным акцэнтам самаўпэўненасці. Гэтага не

[14] Колас Я. Зб. тв. Т. 9. С. 10—11.

хавае ні сам герой, ні аўтар, які таксама лічыць, што Рыгору Нязвычнаму больш падыходзіць настаўніцкая роля і што яму «патрэбна вучыць, а не вучыцца» [15].

Такая аўтарская мэтаўстаноўка, безумоўна, не магла спрыяць паглыбленаму і шматграннаму раскрыццю псіхалогіі чалавека, бо пісьменнік тут быццам бы наўперад вызваляў свайго героя ад актыўнай і напружанай духоўнай працы над самім сабою, міжвольна ці свядома падкрэсліваў завершанасць і закончанасць яго духоўнай эвалюцыі. А апрача таго, такое адкрытае падкрэсліванне настаўніцкай ролі героя па-свойму быццам бы вызваляла яго і ад заглыбленага псіхалагічнага кантакту з іншымі людзьмі. Ды гэта ў дадзеным выпадку і натуральна. Калі чалавек узвялічвае сваю персону і на поўным сур'ёзе прызнае, што закліканы жыццём толькі «вучыць, а не вучыцца», дык і сапраўды іншыя людзі ў такім разе могуць цікавіць гэтага чалавека па самых розных меркаваннях, але звычайна не з той прычыны, каб самому ў іх павучыцца і пры дапамозе іх удакладніць, скарэкціраваць і паглыбіць свае веды ў пэўнай галіне жыцця.

Вядома, вартасці і недахопы ў кожным літаратурным творы ў першую чаргу абумоўліваюцца эстэтычнымі магчымасцямі самой творчай індывідуальнасці, інакш кажучы, адметнасцю і своеасаблівасцю пісьменніцкага таленту. Аднак пісьменнік падчас можа залішне паддавацца ўплыву бягучага моманту, уздзеянню розных тэорый-міфаў, тэорый-ілюзій, і тады патэнцыяльныя магчымасці яго таленту на поўную сілу не раскрываюцца.

Нам уяўляецца, што пад уздзеяннем іменна такога тэарэтычнага стэрэатыпу ў значнай ступені знаходзіўся і талент Ц. Гартнага. Пісьменніку здавалася (і ў многім ён быў шчыры ў сваіх уяўленнях), што яго Рыгор Нязвычны найлепей выканае сваю ідэйна-мастацкую і ідэалагічна-прапагандысцкую функцыю ў творы і ў жыцці, калі будзе выяўляць сябе як чалавек і грамадзянін у межах вядомай тэорыі пра бясспрэчны авангардна-настаўніцкі прыярытэт рабочага класа ў рэвалюцыйна-перабудовачных працэсах жыцця. У жорсткіх формах бясспрэчнай рацыянальна-арыфметычнай дакладнасці, выверанасці і нецярплівага стаўлення да іншага погляду гэта тэорыя малявала і раскрывала расстаноўку класавых сіл і класавай барацьбы, дзе пралетарыяту амаль

[15] Гартны Ц. Сокі цаліны. Мн., 1957. Т. 1. С. 222.

7. Зак. 675

заўжды і нязменна адводзілася прыярытэтная роля пераўтваральніка жыцця і сур'ёзная «вучыцельская» функцыя.

Ц. Гартнаму як пісьменніку такая тэорыя імпанавала, і ён даволі адкрыта настройваўся ў сваім рамане «Сокі цаліны» на яе неальтэрнатыўны пафас. Аднак мастацкая думка, як мы ведаем, пад уплывам нейкіх важкіх фактаў і сур'ёзных жыццёвых чыннікаў у многіх пісьменнікаў нярэдка і «адмаўлялася» ад той зададзенасці і прадузятасці, што на пэўных этапах свайго развіцця лічыла зусім прымальнай нормай.

Прадпрымае такія спробы вырвацца са схемы і мастацкая думка ў рамане Ц. Гартнага «Сокі цаліны». І тады яна становіцца больш натуральнай, прачулай і нават лірычнай, а галоўны герой быццам бы «дазваляе» сабе ўсумніцца ў тым, што яго звязанасць з пралетарскім класам у кожным выпадку здольна забяспечыць яму дакладнасць і беспамылковасць жыццёвай арыентацыі. Аднак гэта звычайна больш эпізадычны, чым натуральны і ўстойлівы, псіхалагічны стан героя. Праходзіць нейкі непрацяглы час — і герой, нібыта схамянуўшыся, што залішне «расслабіўся», зноў вяртаецца на запраграмаваны аўтарам шлях сюжэтнага дзеяння і, уцягваючы ў арбіту сваіх інтарэсаў іншых людзей, зноў больш схільны некага вучыць і павучаць, чым вучыцца самому.

Я. Колас на прамую палеміку з Ц. Гартным як рамакістам у сваёй трылогіі, напэўна, не выходзіў. Ён быў уважлівы да ўсіх праяў, прыкметных і менш значных заваёў нацыянальнай мастацкай думкі, калі яна садзейнічала ў дапаўненне да ўсяго станаўленню і развіццю адраджэнскіх, асветніцкіх, гуманістычных і рэвалюцыйна-дэмакратычных тэндэнцый у грамадстве. Ды і не мог Я. Колас не ўлічваць і не разумець таго, што шлях першапраходчыка ў літаратуры няпросты і нялёгкі, а Ц. Гартны быў у ганаровых радах такіх першапраходчыкаў, адважыўшыся на напісанне буйнога эпічнага твора, рамана ў прозе, тады, калі гэта жанравая форма знаходзілася яшчэ ў зародкавым стане.

І ўсё ж коласаўская трылогія «На ростанях» у дачыненні да рамана Ц. Гартнага «Сокі цаліны»— з'ява ў значнай ступені палемічная. Палемічная сваім унутраным пафасам і дыскусійнымі адносінамі да тых пісьменнікаў, якія паспешліва і шмат у чым штучна ўзводзілі сваіх герояў на высокі п'едэстал духоўнага развіцця і

ўсёведання, у належнай ступені не падмацаваўшы гэта псіхалагічнай аргументацыяй і паказам самога **працэсу вучнёўства** — працэсу авалодання гэтымі ведамі.

Калі Ц. Гартны атэстуе свайго героя па самай высокай мерцы і катэгарычна заўважае, што яму «патрэбна вучыць, а не вучыцца», дык аўтар трылогіі «На ростанях» мог бы сказаць пра свайго Лабановіча некалькі інакш, а менавіта тое, што ён як настаўнік і сапраўды прыехаў вучыць сялянскіх дзяцей, але зрабіў сваім нязменным абавязкам кожнадзённа вучыцца, думаць пра сваё духоўнае самаўдасканаленне. Гэта лінія вучнёўства, самапазнання і самаўдасканалення ў характары настаўніка Лабановіча з'яўляецца, можна нават сказаць, дамінуючай і ў многім вызначальнай у фарміраванні эпічнай і псіхалагічнай структуры рамана.

Дарэчы, і працэс самапазнання, як можна заўважыць, найбольш інтэнсіўна адбываецца ў Лабановіча якраз тады, калі ён, нібыта той старанны, уважлівы і схільны да аналітычнага роздуму вучань, пераасэнсоўвае нейкі жыццёвы факт, грамадскую з'яву, змест новай ці калісьці прачытанай кнігі. А самае галоўнае, калі абдумвае і пераасэнсоўвае шматлікія сустрэчы з самымі рознымі людзьмі, узаемаадносіны з якімі (нават і вельмі кароткатэрміновыя) неўпрыкмет становяцца набыткам яго ўласнага жыццёвага вопыту, пэўным аргументам у карысць пацверджання нейкіх меркаванняў, а вельмі часта аргументам для іх карэкціроўкі, удакладнення ці проста адмаўлення. Калі (дазволім сабе зноў параўнанне) герой рамана Ц. Гартнага «Сокі цаліны» ў палеміцы з сваімі апанентамі звычайна цвёрда і няўхільна скіраваны на тое, каб некага пераконваць, вучыць, аспрэчваць, пры гэтым амаль поўнасцю выключаючы магчымасць папракнуць у чымсьці самога сябе ці пад націскам фактаў рэзка і крута змяніць сваю пазіцыю, то свядомасць і псіхіка коласаўскага героя ў падобных сітуацыях выяўляюць сябе ў непараўнальна больш пластычных і, што варта падкрэсліць, больш тонкіх і дэмакратычных формах. Лёгка і проста ад сваіх прынцыпаў, поглядаў, ад сваёй галоўнай мэты — пошуку стрыжнявой сэнсавай дамінанты чалавечага жыцця — ён не адступаецца. Аднак герой разам з тым псіхалагічна адкрыты для ўспрымання і аналітычнага засвойвання чужога вопыту, які ў многіх выпадках з'яўляецца важкай падставай і дзейсным стымулам для спрэчкі з самім сабою, а нярэдка і

пакаяння ў тым, што дзесьці вось памыляўся ў сваіх вывадах і што часам быў паспешлівы і несправядлівы ў ацэнцы людзей і іх учынкаў.

Так, напрыклад, айцец Кірыл, да якога Лабановіч завітаў у хату неўзабаве пасля прыезду на працу, на першых пачатках здаўся настаўніку чалавекам нецікавым і нават злосным, варожа настроеным да селяніна. Лабановіч быццам бы і мае рацыю на такое меркаванне пра Кірыла, які ў размове з сваім субяседнікам выказвае па адрасе сялян даволі рэзкія, нават зняважлівыя словы і нібыта на поўным сур'ёзе хоча астудзіць малады запал асветніцкіх імкненняў настаўніка: «Не спяшайцеся,— махнуў рукою а. Кірыл.— Вы думаеце яны, гэта быдлё, зразумеюць, што вы для іх будзеце старацца, вучыць іх? Вы не ведаеце мужыка: зрабі яму дабро — ён адплаціць табе самай чорнай непадзячнасцю. Мужык — гультай, злодзей, п'яніца. Толькі і глядзіць, як абадраць цябе, ашукаць. Ніякай веры няма яму. Ён гатоў цябе ўтапіць, прадаць за чарку гарэлкі. Іх трэба ўзяць — во!— Айцец Кірыл згарнуў кулакі і патрос імі, паказваючы як трэба трымаць мужыка» [16].

Натуральна, што Лабановічу, які сам паходзіў з мужыкоў і які прыехаў у глухую палескую вёску настаўнічаць, маючы на мэце ў першую чаргу дапамагчы сялянскім дзецям авалодаць набыткамі асветы і культуры, было вельмі крыўдна слухаць філіпікі а. Кірыла, і ён рашуча стаў пярэчыць свайму апаненту, не згаджацца з ім, прыводзіць шматлікія довады, каб пераканаць яго ў адваротным. Але а. Кірыл, здаецца, цвёрда стаяў на сваім і «працягваў выліваць сваю злосць». Непрымірымасць да мужыка ў яго тоне нібыта нават узрастала: «Вы папрабуйце купіць у мужыка кусок хлеба ці шклянку малака. Што, ён прадасць вам? Ніколі. Гандляру прадасць, вам — ні за якія грошы!.. Розгамі яго трэба сеч!.. Што б вы мне ні казалі, я буду цвярдзіць сваё: мала білі мужыка!»[17]

Паводле слоў аўтара, «Лабановіч ніяк не спадзяваўся, каб а. Кірыл мог да такой меры не любіць мужыка, і наогул, каб у такім маленькім папку магло змяшчацца столькі нянавісці» [18]. Малады настаўнік пакрысе, праўда,

---

[16] Колас Я. Зб. тв. Т. 9. С. 30.
[17] Там жа. С. 30—31.
[18] Там жа. С. 30.

пачынае сумнявацца, што ў гэтым гнеўным пафасе рэзкія, крыўдныя і зняважлівыя словы адпавядаюць рэальным уяўленням пра селяніна. Але, відаць, настаўнік так да канца і не зразумеў бы гэтага чалавека, каб а. Кірыл сам, сваім, у пэўным сэнсе нязмушаным, эпізадычным жэстам-учынкам не дапамог Лабановічу зразумець сябе і тую асаблівасць свайго характару, што быццам бы зусім адсутнічала ў гэтага чалавека. Пад час дыскусійнай размовы Лабановіча і а. Кірыла ў хату заходзіць селянін Апанас Каваль з просьбаю, каб бацюшка зайшоў да іх дадому «хворую прычасціць». Праз нейкі момант Кірыл вяртаецца, і тэкст твора даносіць да нас такую вось думку:

— Ну, як жа іх, гадаў, не лаяць?— у гневе прамовіў а. Кірыл.— Чорт ведае, чым кормяць хворую, і гаворыш ім, прыказваеш, не — сваё робяць!.. А гразь!.. Свінні, свінні!

Крыху супакоіўшыся, а. Кірыл сказаў да матушкі ціха: «Зашлі ты ёй цераз Параску чаго» [19].

Лабановіч, які не супраць ужо быў, здаецца, падвесці рысу і ахарактарызаваць а. Кірыла даволі негатыўна, наслухаўшыся яго рэзкіх выказванняў па адрасе сялян, пачынае цяпер глыбей усведамляць, што такі яго вывад быў бы паспешлівым і крыўдным, несправядлівым. Пра гэта ён, уражаны і ўзрадаваны сваім новым адкрыццём чалавека, не прамінае тут жа і сказаць: «А ўсё-такі, а. Кірыл, вы многа лепшы за тых, хто пра народ гаворыць высокія словы» [20]. Маладому настаўніку на гэты раз не здаліся ўжо дзіўнымі, нечаканымі, панегірычнымі і такія вось словы жонкі Кірыла пра свайго мужа: «Народ наш, трэба сказаць праўду, грубы, дзікі. Аднаго толькі ўрадніка і баяцца, аднаго яго і паважаюць. А хто ўжо лепш можа дагадзіць ім, як не а. Кірыл?.. І зямлю ім аддаў, і сенакос, і лякарствы дае, і добрым словам памагае. Ніколі ні ў чым ім не адмаўляе» [21].

Такіх прыкладаў, эпізодаў, калі галоўны герой трылогіі аспрэчвае самога сябе і ўносіць больш ці менш сур'ёзныя карэктывы ў свае ацэнкі пра людзей, з якімі яму даводзіцца працаваць ці выпадкова, не на доўгі час сустракацца, у гэтым творы вельмі багата. Яны, гэтыя

---

[19] Колас Я. Зб. тв. Т. 9. С. 33.
[20] Там жа.
[21] Там жа.

эпізоды — надзвычай важнае праблематычнае звяно ў сюжэтным дзеянні твора і ў раскрыцці характару галоўнага героя. А праз такія ацэнкі мы выходзім на больш глыбокае разуменне іншых герояў твора і наогул больш тонкае і паглыбленае разуменне аўтарскай канцэпцыі чалавека.

Даволі часта пісьменнік нібыта «правакуе» маладога настаўніка Лабановіча, выводзячы яго на сустрэчу з чалавекам, што на першы погляд вельмі лёгка і проста і без усякіх сумненняў укладваецца ў аднамерную сістэму ацэнак. Ну якія, здавалася б, могуць быць сумненні ў коласаўскага героя наконт ацэнкі свайго калегі — настаўніка Саханюка, які пры першым жа знаёмстве з Лабановічам спрабуе паказаць малазначнымі і нікому непатрэбнымі яго імкненні падпарадкаваць настаўніцкую працу высокім грамадскім мэтам і настойліва раіць яму жыць па такому вось бестурботна-абыякаваму прынцыпу: «Э, плюньце вы на гэта... Навучылі чытаць, пісаць і задачы развязваць і — шабаш! Вы думаеце медалёў заслужыце? Або свет гэтым перавернеце? Інспектар знойдзе да чаго прычапіцца. Ну, у самым лепшым выпадку падзяку напіша, а дырэкцыя вам дзесяць рублёў вышле. Але сваё здароўе даражэй» [22].

Безумоўна, залішне крытыкаваць Саханюка за тое, што ён не хоча налягаць на працу, якая не вельмі заахвочваецца маральна і матэрыяльна афіцыйнымі коламі грамадства, было б, відаць, несправядліва. Бо праявы разумнага эгаізму — не такая ўжо і дрэнная рыса характару, як гэта некалі раней імкнуліся тлумачыць некаторыя нашы вучоныя-грамадазнаўцы, занадта ўжо акцэнтуючы ўвагу на безадгаворачным падпарадкаванні асобы ва ўсіх сваіх дзеяннях калектыўнаму інтарэсу. Разумны эгаізм — гэта і своеасаблівы абарончы механізм чалавека ад таго, каб яго індывідуальнае «я» не вельмі настройвалася стаць пад уладу чужой волі, якая далёка не заўсёды бывае добрай, мудрай і высакароднай. Адчуваюцца адзнакі такога ўнутранага супрацьдзеяння і ў словах Саханюка. Але прыкметы гэтыя вельмі ўжо слабыя, амаль зусім не заўважаецца, каб гэты чалавек, абараняючы сваё «я», рабіў гэта яшчэ і дзеля нейкай іншай, больш ці менш значнай жыццёвай мэты. З вузкапрагматычных і побытавых межаў рэальнасці Саханюк

---

[22] Колас Я. Зб. тв. Т. 9. С. 92.

так і не выходзіць, ды і не прыкладае намаганняў выйсці.

Аднак для Коласа, як мы ведаем, прынцыпова важным было не абмінуць, не выпусціць з-пад увагі нават маленькую псіхалагічную драбніцу, калі гэта нейкім чынам дапамагала ўнесці ў нашы ранейшыя, нібыта ўжо зусім сфармаваныя, канчатковыя і бясспрэчныя ўяўленні пра чалавека адпаведную, хай сабе і невялікую карэктыву. І тут акрэсліваецца пэўная тэндэнцыя, якая адлюстроўвае вельмі істотную асаблівасць аўтарскай канцэпцыі чалавека. Яго моцна непакоіць, каб і ў паказе чалавека накшталт таго настаўніка Саханюка, увогуле не дужа сімпатычнага і цікавага ў сваіх духоўных праявах, раптам не абмінуць нейкі момант, што высвечвае яго хоць на кароткае імгненне ў крыху лепшым святле, чым характарызаваў ён сам сябе ў размовах і дзеяннях некалькі раней. Той самы, напрыклад, Саханюк, для якога, мяркуючы па яго словах і паводзінах, уласная персона, здавалася б, вышэй за ўсё і даражэй за ўсё і які ні разу не выявіў памкнення за некага сур'ёзна заступіцца, некага абараніць ці хоць бы сказаць пра кагосьці добрае слова, даволі нечакана паварочваецца да нас, хай сабе і ў пабытавай сітуацыі, па-чалавечы прывабнай рыскай: дапамагае Лабановічу не стаць аб'ектам вясковых плётак, прыводзіць яго ў сваю кватэру, калі той аднойчы крыху перабраў меру і быў на добрым падпітку.

Я. Колас разумее, што і свабодная эпічная форма твора патрабуе ашчаднага і эканомнага выкарыстання мастацкіх сродкаў. Майстэрства яго тут як раманіста шмат у чым застаецца ў нашай літаратуры неператўзыдзеным. Спецыяльнай даследчыцкай увагі, на наш погляд, заслугоўвае адметнасць і своеасаблівасць падтэксту ў трылогіі «На ростанях», за кошт чаго мастацкая думка значна паглыбляе (і асабліва ў сферы раскрыцця чалавечых характараў) сваё асацыятыўнае гучанне і стэрэаскапічную малюнкавасць. Аднак у дадзеным выпадку нам хацелася сказаць пра іншае. Нават тады, калі мастацкая задума твора не прадугледжвае паказу чалавека ў такім аб'ёмна-поўным эпічным разгортванні, Я. Колас і ў падобных выпадках лічыць аднамерна-катэгарычны погляд на чалавека непрымальным. Гэта датычыцца як характараў шматмерных і складаных па сваёй унутранай духоўна-псіхалагічнай прыродзе, так і персанажаў зусім эпізадычных. Пры гэтым некаторыя з іх паяўляюцца ў творы на адно кароткае імгненне і быццам бы зусім не імкнуц-

ца вырвацца «з абдымкаў» духоўнай спрошчанасці.

Вось, напрыклад, шырокая эпічная плынь трылогіі захоплівае ў сваё рэчышча такую маленькую драматычна-псіхалагічную ручаінку, як гаротны і нешчаслівы лёс старожкі школы Ганны. Нібыта між іншым, па ходзе размовы, літаральна ў двух-трох сказах успамінаецца і яе муж. «Праўда,— заўважае аўтар,— у Ганны ёсць муж, п'яніца-жабрак. Але яна ўжо некалькі гадоў як кінула яго, бо ён злы, нягодны. Біў яе без усякай прычыны, можа, таму, што на свеце жыць нялёгка» [22]. Пісьменніку, як бачым, важна сказаць не толькі пра тое, што гэты эпізадычны безыменны персанаж абцяжарыў і без таго цяжкое і пакутнае жыццё Ганны, але і аб тым, што і сам гэты чалавек стаў п'яніцам, жабраком, злым і нягодным, «можа, таму, што на свеце жыць нялёгка». Аўтар, як бачым, не настойвае на сцверджанні таго, што ва ўсім вінаваты менавіта вонкавыя абставіны і што менавіта яны кінулі чалавека на сацыяльнае дно жыцця і зрабілі яго злым і нягодным у дачыненні да іншага чалавека. Паставіўшы пытанне, выказаўшы ўласнае меркаванне, пісьменнік апасродкаваным чынам звяртаецца і да чытача, запрашаючы яго падумаць над прычынамі, якія сфармавалі ці маглі садзейнічаць фармаванню характару гэтага нешчаслівуца і гаротніка ў такіх негатыўных абрысах.

Пошук рэальных прычын, што знаходзяцца ў аснове развіцця грамадскіх працэсаў жыцця і ў аснове чалавечых учынкаў, з'яўляецца стрыжнявым адлюстравальна-пазнавальным мастацкім прынцыпам аўтара трылогіі «На ростанях», краевугольным метадалагічным падыходам да жыццёвых з'яў і людскіх узаемаадносін. Адносіны да гэтага прынцыпу, інтарэс або нейтральнасць, незацікаўленасць да авалодання асноўнымі яго тайнамі і сакрэтамі з'яўляюцца ў коласаўскім творы, можна сказаць, найважнейшым крытэрыем ацэнкі чалавека ў яго побытавых і грамадскіх памкненнях.

Праўда, варта ўсё ж будзе заўважыць, што асабліва паслядоўна гэты ацэначны прынцып як ідэйна-мастацкая з'ява выяўляе сябе ў дачыненні да інтэлігенцыі. І невыпадкова. Пісьменнік лічыць, што менавіта інтэлігенцыя, калі яна блізка да сэрца ўспрымае паўсядзённыя клопаты народа, яго грамадскія і нацыянальныя інтарэсы, не можа, не мае маральнага права заставацца ўбаку ад іх

[23] Колас Я. Зб. тв. Т. 9. С. 269.

заглыбленага філасофскага асэнсавання і вырашэння.

Аўтар, як мы ўжо гаварылі, не адасабляе, не адлучае ад вытлумачэння і асэнсавання складанай праблематыкі жыцця і простага, нярэдка зусім непісьменнага чалавека. У межах здаровага сэнсу і практычнага сялянскага розуму, як уяўляецца Лабановічу, рэальны ход жыцця і яго рэальныя падзеі і канфлікты ў многіх выпадках таксама адбіваюцца вельмі дакладна і беспамылкова. Таму галоўны герой твора імкнецца вывяраць свае жыццёвыя планы супастаўляльна-аналітычнай мерай народнага погляду і народнага светаўспрымання. Але поруч з гэтым Я. Колас не робіць ніякага сакрэту з таго, што ёсць такія пытанні і такія праблемы, глыбінную прычынна-выніковую сувязь якіх павінна раскрыць і асэнсаваць інтэлігенцыя і дзейсна паспрыяць таму, каб іх глыбей усвядоміў просты чалавек з народа і стаў меней залежным ад чужога ўплыву, чужых слоў, думак, ілюзій.

Афіцыйныя ідэолагі былой Расійскай імперыі на працягу стагоддзяў сваёй няўхільнай і скіраванай у адпаведным напрамку дзейнасці змаглі, як вынікае з трылогіі «На ростанях», настроіць псіхіку і свядомасць многіх нашых людзей на паслабленне пачуцця нацыянальнай годнасці, гістарычнай памяці і на схематычнае, безаблічна-шаблоннае ўяўленне аб тым краі, які завецца Радзімай, Бацькаўшчынай. Галоўны герой трылогіі з болем гаворыць пра гэта свайму калегу і таварышу Турсевічу. І асабліва крыўдна яму бывае за тое, што беларус-інтэлігент, сацыяльны статус якога абавязвае паклапаціцца пра духоўнае ўзвышэнне народа і адраджэнне яго культуры, часта і сам знаходзіцца ў стане духоўнай дэпрэсіі і анеміі, не прыкладаючы ніякіх намаганняў, каб вырвацца з-пад уплыву чужых слоў, чужой волі і чужых думак-стэрэатыпаў. «Я аднаго не разумею,— сказаў Лабановіч, любоўна агледзеўшы краявід.— У нас столькі прыгоства, столькі багацця форм і фарбаў, і край наш вялікі і разнастайны, а мы не бачым, не хочам гэтага бачыць. Аб нашым краі злажыўся погляд, як аб краі бедным, заняпалым. І нідзе ты ў падручніках геаграфіі не знойдзеш больш-менш сталага апісання Беларусі. Што такое наша Беларусь? А гэта, бачыш, заходняя акраіна Расіі. Чым яна слаўная? Нічым. Вось балоты ёсць, ды яшчэ на ўвесь свет вядомая хвароба — каўтун. І мы з гэтым легкадумна згаджаемся, **мы ўсё гэта прымаем на веру, бо, як ты сказаў праўду, над намі пануе шаблон, шаблон пустых**

**слоў, пустыя выразы, чужыя формы думак і чужы змест іх** (выдзелена мною.— *В. Ж.*). Выходзячы з гэтага, мы адварочваемся ад свайго роднага, не шануем яго, мы стыдаемся яго!— слова «стыдаемся» Лабановіч прамовіў з націскам, пры гэтым выраз яго твару змяніўся, а ў вачах загарэўся агеньчык нейкай злосці. У ім абудзіўся цяпер хутчэй інстынктыўна, чым свядома, пратэст супраць зневажання і прыгнечання правоў народа, і ён, як сын гэтага народа, з якім чуў цесную сувязь, стаў на абарону яго правоў.

— Кожны народ мае свой гонар. Англічанін перад усім светам горда зазначае: я — англічанін! Тое самае скажа француз, немец, аўстрыец, рускі і іншыя прадстаўнікі другіх нацый. А мы, беларусы, не адважваемся прызнацца ў тым, што мы — беларусы. Бо на галаву беларускага народа, як вядома, многа выліта памыяў, годнасць яго прыніжана і мова яго асмеяна, у яго няма імя, няма твару. А з гэтага вынікае, што беларус-інтэлігент адмяжоўваецца не толькі ад свайго народа, але і ад бацькоў сваіх. Мы ведаем такое здарэнне з адным нашым знаёмым настаўнікам, да якога прыехала з дому матка. У яго былі госці. Ён пры гасцях не пасмеў пазнаць свае мацеры: «Ідзі ты, кажа, кабетка, на кухню: там цябе накормяць» [24].

Я. Колас і ў дадзеным выпадку не спяшаецца асудзіць гэтага гора-інтэлігента. Ён спрабуе вуснамі свайго галоўнага героя сказаць нешта ў абарону і такіх людзей, якія, здавалася б, страцілі ўсякае права на самую элементарную маральную падтрымку. І гэта не адбітак аўтарскай усёдаравальнасці, а зноў-такі выяўленне важнай рысы пісьменніцкага метадалагічнага крэда, якое скіравана на глыбокае і шматграннае раскрыццё дыялектыкі сувязей паміж абставінамі і характарамі.

У Коласа, безумоўна, не існуе двух ацэначных поглядаў на паводзіны настаўніка, што пасаромеўся ў прысутнасці гасцей прызнаць сваю матку. Лабановіч, як відаць, цалкам пагаджаецца са сваім сябрам Турсевічам, які дае гэтаму новаспечанаму інтэлігенту бескампрамісна рэзкую і адмоўную характарыстыку: «Гэта — свінства,— адклікнуўся Турсевіч і плюнуў з нейкаю агідаю.— Баяўся мужыком здацца і выявіў сваё поўнае хамства» [25].

---

[24] Колас Я. Зб. тв. Т. 9. С. 79.
[25] Там жа.

Аднак для Лабановіча, як можна заўважыць, такая шчырая эмацыянальная рэакцыя сябра з'яўляецца ўсяго толькі трамплінам, пераходным мосцікам, каб вывесці гутарку на больш заглыблены, універсальна-гістарычны філасофскі падыход да вытлумачэння праблемы «чалавек і абставіны». Ён яшчэ на поўную сілу не ўсвядоміў, але пакрысе пачынае здагадвацца і ўсведамляць, што **пабытавыя праявы рэчаіснасці, як і бытавое выяўленне характару чалавека, паўней і глыбей могуць быць зразуметы тады, калі мы станем намацваць іх кантакты і сувязі з сіламі, прычынамі і ўздзеяннямі, што знаходзяцца за межамі штодзённшчыны** і схаваны ад нашага погляду пад напластаваннем мінуўшчыны, прычым нярэдка той яе плыні, якая была неміласэрнай, недружалюбнай і жорсткай у адносінах да развіцця нашага духоўнага свету і нацыянальнай самасвядомасці.

Коласу заўжды цікава было назіраць за чалавекам у пабытавай сферы. Побыт у яго творах наогул можна лічыць адным з найважнейшых стылёва-жанравых, сацыяльна-псіхалагічных і характарыстычных кампанентаў. У коласаўскім разуменні пабытавая сфера дае пісьменніку вельмі шырокія магчымасці для раскрыцця і самавыяўлення чалавека. Пра гэта ён неаднаразова гаварыў у шэрагу літаратурна-публіцыстычных артыкулаў, а галоўным чынам падмацоўваў такую сваю думку мастацкім словам. Пры гэтым вельмі часта, маючы на мэце звярнуць чытацкую ўвагу на нейкую характэрную, пазітыўную ці негатыўную індывідуальную асаблівасць псіхалогіі героя, пісьменнік звычайна аддае перавагу бытавому эпізоду, дзе пабуджае чалавека раскрыцца выключна важнай, сутнаснай рысай.

Аднак, на думку аўтара, псіхалогія чалавека, як і наогул усякая з'ява, значна паўней раскрывае сваю адметнасць і непаўторнасць усё-такі тады, калі мы нешта істотнае і важнае будзем ведаць і пра вытокі яе зараджэння і фармавання, пра тыя пазітыўныя і негатыўныя ўплывы і ўздзеянні, якія нясе ў сабе гісторыя, глыбока закранаючы сацыяльна-эканамічнае і духоўна-маральнае жыццё людзей у межах бягучай сучаснасці і ў перспектыве яго руху, у арыентаванасці на будучыню. Бо іначай, як уяўляецца аўтару, мы не зможам колькі-небудзь аб'ёмна і тонка зразумець і пабытавую асаблівасць індывідуальнай чалавечай псіхалогіі. Не зможам таму, што ў такім разе па-за ўвагай застаецца дзень учарашні,

гісторыя, тыя вельмі істотныя фактары і стымулы, што ўплывалі на складванне духоўнага свету многіх пакаленняў на працягу вякоў.

Звернемся, напрыклад, да таго эпізоду, у якім галоўны герой трылогіі «На ростанях» Лабановіч у гутарцы са сваім сябрам прыгадвае знаёмага настаўніка, які, баючыся здацца мужыком, пасаромеўся у прысутнасці гасцей «пазнаць сваю маці». Характар гэтага «інтэлігента» і, у прыватнасці, побытавая яго грань праглядваюцца тут досыць выразна. Абапіраючыся на мастацкі тэкст, чытач, відаць, і сам пры жаданні мог бы пэўным чынам пашырыць характарыстыку такога чалавека. Пісьменнік гэта ўлічвае. Аднак выдатна ўсведамляе ён і тое, што як **духоўна-псіхалагічную, сацыяльна-гістарычную і ў пэўным сэнсе нацыянальную з'яву** зразумець яму гэта будзе цяжка. Вось чаму пісьменнік у дадзеным выпадку трымае ў полі зроку не толькі побытавую сферу мікраабставін, дзе чалавек выявіўся ў канкрэтным дзеянні, але прапануе нам і адпаведныя меркаванні наконт таго, што такі яго ўчынак нясе ў сабе і ўплыў макраабставін, павевы гістарычнага часу, у межах якога гэты чалавек рэальна, фізічна і не жыў.

Зыходзячы з гэтага, прататып самога пісьменніка — галоўны герой трылогіі «На ростанях» Лабановіч — і звяртае чытацкую ўвагу на тыя афіцыйныя грамадскія сілы, якія на працягу стагоддзяў стрымлівалі духоўнае развіццё беларускай нацыі, прыніжалі нацыянальную і чалавечую годнасць беларуса, у тым ліку і беларуса-інтэлігента, заклікаючы, запрашаючы, угаворваючы і прымушаючы яго прыняць на веру шаблоны «пустых слоў, пустыя выразы, чужыя формы думак і чужы змест іх». Такі мэтанакіраваны і доўгатэрміновы сацыяльны і нацыянальны прэсінг, на думку аўтара, не мог не пакінуць свайго адбітку на псіхіцы народа і пэўнай часткі яго інтэлігенцыі, якая нярэдка адмяжоўвалася «не толькі ад свайго народа, але і ад сваіх бацькоў». Падобныя з'явы аўтар успрымае і ацэньвае як вялікую драму і народа, і асобнага чалавека, беларуса-інтэлігента, што, не знайшоўшы ў сабе сіл супрацьстаяць афіцыйнаму, ідэалагічнаму стэрэатыпу, свядома ці міжвольна падпадаў пад чужы ўплыў, страчваючы, такім чынам, у сваёй душы і характары нешта надзвычай важнае і значнае як чалавек і грамадзянін.

Рэальная магчымасць такой драмы чалавека-інтэлі-

гента, як вядома, вельмі непакоіла нашу літаратуру ўжо ў дакастрычніцкі час, і па-грамадзянску дзейсна, таленавіта ў поліфаніі іншых галасоў гучала слова Коласа. Цікавыя думкі на гэту тэму знойдзем мы ў вершах, паэмах, вершаваных аповесцях нашага першага прафесіянальнага пісьменніка В. Дуніна-Марцінкевіча. Даволі пэўна выкладае сваё крэда-пазіцыю адносна ролі і месца інтэлігенцыі ў грамадскім працэсе паэт-дэмакрат Ф. Багушэвіч. Больш за ўсё ён непакоіцца, каб просты мужыцкі сын, па збегу нейкіх шчаслівых акалічнасцей выбіўшыся «ў людзі», не ператварыўся раптам у чалавека з жорсткім сэрцам, чэрствай душою і не адасобіўся ад народа:

Можа будзеш калі панам
Ці вялікім капітанам,
Людцоў божых будзеш біці,
Цяжка будзе ў свеце жыці,
Будуць клясці, як ліхога,
Прасіць смертанькі ад бога. [26]

Маці згодна лепш бачыць свайго сына простым чалавекам, селянінам, чым жорсткім бессардэчным інтэлігентам-панам:

Ой, не будзь ты лепей панам,
Ні вялікім капітанам,
Будзь чым матанька радзіла,
Каб у госці не хадзіла,
Каб век з табой векавала,
Гаравала, працавала... [27]

Падобны матыў трывогі за лёс сялянскага дзіцяці неаднаразова ўзнікае і ў купалаўскіх дакастрычніцкіх творах. Гераіня яго верша «Над калыскай» гаворыць-напявае ў сваёй песеньцы пра тое, што ўчуць і пабачыць наяву было б для яе вялікай бядой:

Будзеш пан вялікі з віду
І шэльма душой,
Спатыкаць цябе я выйду,
Ты махнеш рукой.
Чужаком будзеш ты ў хаце,
На роднай зямлі.
Спі, пакуль ты тут пры маці,
Люлі, люлі, спі! [28]

---

[26] Багушэвіч Ф. Творы. Мн., 1967. С. 86.
[27] Там жа. С. 86—87.
[28] Купала Я. Зб. тв.: У 6 т. Мн., 1961. Т. 1. С. 64—65.

Такім, у прыватнасці, чужаком для роднай сям'і і роднага народа зрабіўся герой апавядання З. Бядулі «На каляды к сыну»— хлопец з працоўнай сям'і, якому з панскай ласкі пашэнціла скончыць гімназію, універсітэт, стаць адвакатам. Апатычную, абыякавую да народнага лёсу інтэлігенцыю паказвае, высмейвае і асуджае ў дакастрычніцкіх апавяданнях «Пісаравы імяніны» (1908), «Злавіў!» (1913), «З дneўніка пана Жылака» (1913) Я. Колас. Творчасць Багушэвіча, Купалы, Бядулі, Коласа не была проста голай канстатацыяй негатыўнай сацыяльнай з'явы. Пафас адмаўлення нясе глыбокую ўнутраную ідэю сцвярджэння таго, што інтэлігенцыя наогул, а тым больш інтэлігенцыя, якая выйшла з народных нізоў, павінна быць разам з народам і сумесна з ім змагацца за праўду і справядлівасць, за свой у першую чаргу духоўна-маральны дабрабыт.

Аднак у межах гэтай агульнай, бясспрэчнай і правільнай формулы-праграмы ўзнікала шмат складаных праблем і пытанняў. Добра разумеючы, што інтэлігенцыя павінна быць разам з народам, многія нашы пісьменнікі тонка адчувалі і тое, што з кожным годам жыццё і яго бурны, нарастаючы рэвалюцыйны рух настойліва і патрабавальна клікалі інтэлігенцыю глыбей акрэсліць і канкрэтызаваць сваё ўласнае месца і сваю пазіцыю ў грамадскай гісторыі, паўней выявіць асабістыя, індывідуальныя адносіны да праблем і пытанняў сацыяльнага і нацыянальнага характару, каб прыняць належны ўдзел у іх вырашэнні.

Дарэчы, гэтых складаных, праблемных, балючых пытанняў не паменшала і пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі 1917 года. У пэўным сэнсе іх нават пабольшала, і многія з іх увайшлі ў стадыю яшчэ больш складанага і канфліктнага, чым раней, развіцця.

Гэта датычыцца, напрыклад, шэрагу пытанняў сацыяльна-эканамічнага характару. Бо гаспадарчае жыццё Беларусі, навокал і на тэрыторыі якой некалькі гадоў запар віравала полымя імперыялістычнай і грамадзянскай войнаў, было разбурана і паралізавана. І не так проста было знайсці і прывесці ў дзеянне сілы, якія б актывізавалі гэту галіну паслякастрычніцкай рэчаіснасці.

У надзвычай складаным стане знаходзіліся ў гэты час і пытанні нацыянальнага характару. А вырашэнню і асэнсаванню іх, як вядома, вельмі часта перашкаджалі розныя праграмы і тэорыі, што досыць нецярпіма ставіліся

да іншых поглядаў, выключаючы якія б там ні было альтэрнатыўныя падыходы. За гэтымі праграмамі стаялі рэальныя сілы, якія выступалі ад імя афіцыйнай улады, з'яўляліся самою гэтай уладай і непрымірыма жорстка ставіліся да праяў іншадумства.

Вядома, напрыклад, што ў той час, калі ў беларускім друку сталі з'яўляцца ўрыўкі з коласаўскай аповесці «У палескай глушы»— першай часткі будучай трылогіі «На ростанях», па рашэнні дзеячаў вышэйшай дзяржаўнай і партыйнай улады (са згоды, дарэчы, і самога Леніна) за межы краіны была выслана, а дакладней выгнана, першая вялікая партыя «людзей думкі». Зусім не ворагаў савецкай улады і не контррэвалюцыянераў, а таксама ў чымсьці не згодных з гэтай уладай, і ў прыватнасці з яе нежаданнем ні на крок адыходзіць ад схемы, асноўных прынцыпаў марксісцка-ленінскай тэорыі класавай барацьбы і ставіць складаныя праблемы жыцця ў альтэрнатыўным, філасофска-метадалагічным і гуманістычным ключы вырашэння. Не выпадковым з'яўляецца, безумоўна, тое, што ў гэту першую групу высланых, выкінутых за межы краіны, а фактычна — рэпрэсіраваных трапілі такія вядомыя філосафы, як М. Бярдзяеў, С. Булгакаў, Б. Вышаслаўцаў, С. Франк, Ф. Сцяпун, І. Лапшын, І. Ільін, М. Лоскі і інш.

Справядліва заўважана, што «з высылкай у 1922 годзе вялікай групы філосафаў з Расіі эпоха заклікаў да пошуку філасофскай ісціны закончылася» і наступіў новы і трывожны час іншых трафарэтна-схематычных падыходаў: «Барацьба, барацьба, барацьба... Нічога, апрача барацьбы. Сілы зла, сілы дабра змагаюцца, сілы дабра, зразумела, перамагаюць, але сілы зла, вядома, такія ўпартыя, не здаюцца. І г. д.» [29]

Пры гэтым нярэдка прадпрымаліся актыўныя і, як відаць, разлічаныя на наіўных і залішне даверлівых людзей захады, каб даказаць, што прымусовая высылка лепшай часткі інтэлігенцыі за мяжу — з'ява не толькі неабходная, заканамерная, але **нават гуманная**. Менавіта так гаварыў, прыкідваючыся вялікім дэмакратам і вялікім гуманістам, Л. Троцкі ў інтэрв'ю ад 30 жніўня 1922 г. амерыканскай журналісткі (сяброўцы Джона Рыда) Луізе Брайант: «Тыя элементы, якія мы высылаем і бу-

[29] Санин В. В бой идут одни старики // Вопросы философии. 1990. № 9. С. 68.

дзем высылаць, самі па сабе палітычна нікчэмныя. Але яны патэнцыяльная зброя ў руках нашых магчымых ворагаў. У выпадку новых ваенных ускладненняў,— а яны, нягледзячы на ўсю нашу міралюбнасць, не выключаны,— усе гэтыя непрымірымыя і непапраўныя элементы стануць ваенна-палітычнымі агентамі ворага. Мы вымушаны будзем расстраляць іх паводле законаў вайны. Вось чаму мы палічылі за лепшае цяпер, у спакойны перыяд выслаць іх загадзя. І я спадзяюся, што вы не адмовіцеся прызнаць **нашу прадбачлівую гуманнасць** і возьмеце на сябе яе абарону перад грамадскай думкай»[30].

На авансцэну антыінтэлігенцкай кампаніі ў першай палове 20-х гадоў раз-пораз выходзілі і прадстаўнікі меншага палітычнага «калібру», хоць думкі і меркаванні прадстаўнікоў вышэйшага і іншага палітычнага рангу часта сыходзіліся ці проста змыкаліся. Мы ўжо, напрыклад, крыху раней прыгадвалі імя актыўнага ў свой час публіцыста, ідэолага «зменавехаўства» М. Устралава, які, асмельваючыся іншы раз на даволі вострую палеміку з правадырамі партыі Леніным, Троцкім, Зіноўевым, Сталіным, быў, аднак, упэўнены, што ў дачыненні да інтэлігенцыі, схільнай да заглыбленага крытычна-філасофскага роздуму і альтэрнатыўнага мыслення, жорсткая і падчас рэпрэсіўная пазіцыя з'яўляецца нібыта аб'ектыўна правамернай, неабходнай і апраўданай. У падтрымку такой пазіцыі не так цяжка, паводле яго меркаванняў, знайсці вялікія і важкія, пераканальныя аргументы. На яго думку, знясіленай, разбуранай і зруйнаванай войнамі краіне трэба даць магчымасць заспакоіцца, а для гэтага быццам бы зусім не пашкодзіць, калі «мозг краіны» на этапе «ўзнаўлення арганічных дзяржаўных тканак» прыкметна зменшыць сваю інтэлектуальную актыўнасць і ўстрымаецца ад выканання сваёй непасрэднай функцыі — думкі. У дадзеным выпадку, як лічыць гэты ідэолаг-публіцыст, могуць узмацніцца і некаторыя негатыўныя, непрыемныя для грамадства з'явы, звязаныя, у прыватнасці, з ушчамленнем і абмежаваннем правоў чалавека. Але нібыта і тут няма чаго асабліва трывожыцца, бо сівая мінуўшчына ведала, маўляў, такія прэцэдэнты і чаму б іх у такім разе не паўтарыць. «Атыла,— заўважае М. Устралаў,— не ведаў добрага тону. І пакуль ён быў

[30] Вопросы философии. 1990. № 9. С. 59.

неабходны гісторыі, рымскае права маўчала»[31]. З яго разважанняў вынікае, што не трэба дужа пратэставаць супраць таго, калі рэвалюцыя раптам пакажа свой жорстка-прымусовы нораў, абмяжуе правы чалавека, у тым ліку і правы інтэлігента, на свабоднае і крытычнае выяўленне сваіх думак і поглядаў.

Вось такая была атмасфера ў краіне пад час выхаду ў свет першай часткі трылогіі Я. Коласа «На ростанях»— аповесці «У палескай глушы». Водгулле гэтых трывожных падзей, што адбываліся ў цэнтры тагачаснай Савецкай дзяржавы, безумоўна, даходзіла і да Беларусі. Улоўліваў гэтыя хвалі, вядома, і чуйны слых Я. Коласа. Ды і, нарэшце, у самой Беларусі ўжо на пачатку 20-х гадоў закладваўся «падмурак» вялікіх рэпрэсіўных кампаній, скіраваных супраць так званых кулакоў, падкулачнікаў, а таксама супраць той часткі інтэлігенцыі, якая ў сваёй працы і дзейнасці выходзіла (ці імкнулася выходзіць) за межы афіцыйных ідэалагічных прадпісанняў.

Пройдзе зусім невялікі час пасля з'яўлення ў друку першай і другой частак коласаўскай трылогіі (другая частка была апублікавана ў 1927 г.), як пачне пашыраць свае межы антыпісьменніцкая кампанія, пачнуцца пошукі нацдэмаў і розных нацыянал-ухілістаў сярод гісторыкаў, літаратуразнаўцаў, мовазнаўцаў...

У 1931 г. была распачата, напрыклад, беспрэцэдэнтная па сваёй прадузятасці і неаб'ектыўнасці крытыка, а дакладней кажучы, палітычная экзекуцыя таленавітага беларускага гісторыка і крыштальна чыстага, сумленнага чалавека-грамадзяніна, правадзейнага члена АН БССР і яе першага прэзідэнта У. М. Ігнатоўскага. Трагічны лёс яго вядомы. Трэба меркаваць, што гэту драму глыбока перажываў і Я. Колас. Бо, апрача ўсяго, ён быў у гэты час віцэ-прэзідэнтам АН БССР і добра ведаў Ігнатоўскага. Абодва яны, і гісторык-прэзідэнт, і славуты беларускі пісьменнік віцэ-прэзідэнт Беларускай акадэміі, у прынцыпе рабілі адну і тую ж вялікую справу, скіраваную на ўмацаванне аўтарытэту Беларусі, на адраджэнне і развіццё беларускай культуры і навукі.

Безумоўна, далёка не ўсё тое, што мінула і стала гісторыяй, лёгка і проста ўзнавіць і рэканструяваць у фор-

---

[31] Геллер М. С. Первое предостережение. Удар хлыстом: К истории высылки из Советского Союза деятелей культуры в 1922 г. // Вопросы философии. 1990. № 9. С. 59.

мах аб'ектыўна-праўдзівага малюнка. Гэта датычыцца і людскіх узаемадачыненняў, і бясконцага мноства іншых жыццёвых з'яў. Пад гэту «графу» падпадаюць і многія важныя прычыны і стымулы, якія нараджаюць пісьменніцкія задумы і спрыяюць іх канкрэтна-індывідуальнаму мастацкаму ўвасабленню. Вядома, тут часта дапамагае сваімі ўдакладненнямі і расшыфроўкамі сам пісьменнік. Аднак нярэдка і ў такіх выпадках нешта істотнае можа заставацца ў пісьменніцкім тлумачэнні да канца не раскрытым. І матывы тут бываюць розныя.

На наш погляд, нейкія важныя, нюансавыя моманты сацыяльна-палітычнага і літаратурна-грамадскага жыцця, што нарадзілі і сфармавалі задуму коласаўскай трылогіі «На ростанях», падштурхнулі аўтара менавіта на пачатку 20-х гадоў узяцца за напісанне буйнамаштабнага твора пра інтэлігенцыю, мы таксама ў поўным аб'ёме не ўлічваем. Найбольш у дадзеным выпадку спасылаемся на прадмову аўтара да першай кнігі трылогіі, дзе гаворыцца, што пісьменнік ставіў перад сабою мэту паказаць у сваім творы жыццё «вясковай інтэлігенцыі і галоўным чынам вясковага настаўніцтва». Паводле яго слоў, «жыццё гэта адносіцца к самаму пачатку 20-га веку, да часоў першае рэвалюцыі 1905 г.» і звязана ў асноўным з паказам двух асноўных плыняў у асяроддзі вясковых настаўнікаў: інтэлігенцыі, якая «адарвалася ад жывых крыніц жыцця», амяшчанівалася, «апускалася на дно і зацягвалася балотам» абывацельшчыны ці «заставалася вернай казённым прынцыпам», мала дбаючы пра інтарэсы народа, і той яе найбольш дзейснай і жывой часткі, якая імкнулася зліцца з перадавымі сіламі грамадства, «вобмацкам шукала дарог, каб пазнаць корань рэчаў» [32].

Так, мінулае, недалёкае мінулае, і сапраўды з'яўляецца праблемна-тэматычнай асновай коласаўскай трылогіі. Аднак Колас добра разумеў і тое, што наша мінулае — арганічная частка народнай, нацыянальнай духоўнасці, якая ў галоўных сваіх прыкметах і праявах ніколі не ўкладвалася ў жорсткія хроналагічныя межы часу. І ў аўтара дзесьці ў падтэксце яго ўнутраных імкненняў была, апрача ўзнаўлення гэтага мінулага, відаць, і другая важная задача: скіраваць энергію мінулага ў рэчышча бягучай сучаснасці, зусім яшчэ маладой сацыяльна-

[32] Колас Я. Зб. тв. Т. 9. С. 731.

палітычнай грамадскай явы і, «звярнуўшы» яе ўвагу на неабходнасць узаемадзеяння з ранейшым плённым вопытам, дапамагчы ёй нарэшце глыбей асэнсаваць самую сябе і падказаць ёй, што вельмі важна зберагчы на гэтым пачатковым і таму самым адказным і цяжкім шляху да новага і нязведанага найкаштоўнейшы нацыянальны скарб — духоўна-інтэлектуальную энергію ў асобе людзей, якія імкнуліся і імкнуцца «пазнаць корань рэчаў».

Трылогія Я. Коласа «На ростанях»— твор шырокамаштабнага праблематычнага плана. Адпаведным чынам разгортваецца тут і сюжэт. Адна яго сюжэтная лінія арганічна і натуральна перакрыжоўваецца, судакранаецца і суадносіцца з другой, зліваючыся ў агульнае эпічнае мастацкае рэчышча. Прырода, побыт, інтымныя ўзаемаадносіны герояў, іх роздумы, разважанні аб хлебе надзённым і аб складаных пытаннях грамадскага жыцця — усё гэта знаходзіцца ў коласаўскім творы ў цесным сюжэтна-кампазіцыйным адзінстве. Адасобіць, адарваць ад цэлага пэўную частку як самастойны кампанент (з мэтай, напрыклад, нейкага спецыяльнага даследавання праблемы) можна хіба толькі ўмоўна.

Аднак зусім правамерна сказаць і тое, што ў такім эпічным мастацкім адзінстве, дзе кожная часцінка з'яўляецца важнай, неабходнай і незаменнай, пэўным чынам вылучаецца ўсё-такі сіла, якая ўвесь час ацэньвае, вывучае і асэнсоўвае ўсю гэту разнастайную грамадскую, інтымна-псіхалагічную, прыродна-касмічную плынь жыцця. І гэта сіла — крытычная, абагульняючая, аналітычная думка герояў і ўвасобленая ў адкрытых ці падтэкставых формах аўтарская думка, галоўным чынам скіраваная, як пра гэта гаворыць пісьменнік у сваёй прадмове, на тое, «каб пазнаць корань рэчаў» і раскрыць прычынную сувязь рэальнасці.

Гэты прынцып, як мы ўжо адзначалі, з'яўляецца найважнейшым жыццёвым і маральным ацэначным крэда цэнтральнага героя Лабановіча ў адносінах да самога сябе і да іншых людзей. Таму найбольш цесныя духоўныя і дружалюбныя кантакты ён звычайна падтрымлівае з тымі, хто таксама ў рэальных ці патэнцыяльных памкненнях скіраваны на пошук ісціны, на разгадванне прычын і на нежаданне падпарадкоўвацца шаблону, распаўсюджаным трафарэтным уяўленням.

Лабановічу, напрыклад, вельмі імпануе, калі яго сяб-

ра Турсевіч развівае менавіта такую вось думку: «Мы прывыклі, дружа,— мякка сказаў Турсевіч,— адбаярвацца агульнымі выразамі там, дзе наш розум не можа адолець, пераступіць нейкія парожкі, якія адгароджваюць ад яго тое, чаго мы не ведаем. І ў адных выпадках мы гаворым: «Гэта — нервы». У другіх: «Аб гэтым ужо і закон так кажа, значыцца, тут трэба спыніць свой розум», або — «Гэта злучэнне акалічнасцей», «Пад такою планетаю радзіўся» і многа іншага глупства. І часта які-небудзь незразумелы факт мы тлумачым яшчэ больш незразумелымі злучэннямі слоў і думаем, што сказалі нешта надта разумнае, а другія згаджаюцца з гэтым і здавальняюцца. А між тым усе гэтыя сляпыя агульныя выразы вельмі шкадлівы, бо яны звязваюць унікліўую думку чалавека, заспакойваюць і закалыхваюць яе, як закалыхваюць крыклівае дзіця, і не даюць ёй ходу там, дзе трэба разгарнуць дзейнасць, каб дашукацца прычыны» [33]. Такі лад думак Турсевіча супадае з поглядамі Лабановіча, які з радасцю і задавальненнем адзначае пра сябе, што знаходзіць з боку свайго сябра ўнутраную падтрымку і разуменне.

Аднак гэты сяброўскі кантакт, як можна заўважыць, паўнапраўна жыве толькі да той пары, пакуль адзін з сяброў, а іменна Турсевіч, не напісаў Лабановічу пра свой намер паступіць у настаўніцкі інстытут: «Лабановіч быў дужа рад сустрэцца са сваім даўнім прыяцелем, але ў яго жаданні паступіць у настаўніцкі інстытут адчуў, што іхнія дарогі разыходзяцца...» [34]

Здавалася б, якая магла быць сувязь паміж намерам Турсевіча паступіць у настаўніцкі інстытут і такім даволі рэзкім і бескампрамісным вывадам Лабановіча пра тое, што галоўная скрэпа іх сяброўства дала глыбокую трэшчыну? Аднак сувязь такая ёсць. І вельмі сур'ёзная. Пісьменнік падае гэта досыць адкрытым тэкстам у форме пісьма Лабановіча да Турсевіча: «Я не ведаю,— пісаў паміж іншым Лабановіч,— як паставіцца да твайго намеру паступаць у настаўніцкі інстытут. Мяне асабіста ён не дужа вабіць. Я ўжо сказаў табе аб гэтым: тая ж **заскарузлая схаластыка, тая ж казёншчына** (выдзелена мною.— *В. Ж.*), што і ў настаўніцкай семінарыі. Розніца хіба толькі ў тым, што ў інстытуце большы маштаб для

---

[33] Колас Я. Зб. тв. Т. 9. С. 74.
[34] Там жа. С. 416.

замацавання казённага патрыятызму. За часы інстытуцкага навучання цябе так замарынуюць, што нічога не застанецца ад жывога чалавека. Іншая справа — падрыхтавацца і здаць экзамены на атэстат сталасці для паступлення ва універсітэт. Там непараўнальна болей шырокае поле для ўсебаковага развіцця» [35].

Пішучы гэты ліст, Лабановіч, безумоўна, прыгадваў ранейшага свайго сябра, а менавіта таго Турсевіча, які горача і, здавалася, зусім шчыра гаварыў пра шкоднасць шаблонаў і сляпых агульных выразаў, акцэнтаваў увагу на тым, што толькі дзейсная духоўна-інтэлектуальная сіла, прынцыпова зацікаўленая ў пошуку глыбіннай прычыннай сутнасці жыцця, здольна пераадолець уплыў шаблонаў і стэрэатыпаў. А цяпер, калі той жа Турсевіч, што зусім нядаўна спрабаваў знайсці спосабы змагання з шаблонамі, сляпымі агульнымі выразамі, сам вольна ці міжвольна падпадае пад іх уплыў, ён становіцца для Лабановіча шмат у чым далёкім і чужым чалавекам.

Можа, галоўны герой трылогіі залішне строгі ў сваіх ацэнках і меркаваннях, мажліва, тут адчуваецца і яго празмерны максімалізм. Але ў гэтай бясспрэчна завышанай і максімалісцкай патрабавальнасці выяўляецца рашучае непрыманне такіх разбураючых духоўны свет кампрамісных дзеянняў, калі чалавек нібыта наважваецца, разлічвае і спадзяецца (падчас і зусім шчыра) сумясціць несумяшчальнае, паслужыць на карысць высакароднай грамадскай ідэі і ў той жа час не вельмі канфліктаваць з афіцыйнай грамадскай думкай, якая стрымлівае і тармозіць развіццё і рух гэтай ідэі. Менавіта гэта якраз і адчуў у захадах і намерах Турсевіча Лабановіч. І сапраўды, не так проста, ды, відаць, і немагчыма ў адзін і той жа час сумясціць змаганне з догмамі і шаблонамі жыцця з намерам стаць навучэнцам установы, дзе «тая ж заскарузлая схаластыка, тая ж казёншчына, што і ў настаўніцкай семінарыі», і ў якой пошук адказаў на пытанні: як? чаму? з якой прычыны? і г. д. не вельмі заахвочваўся.

Адносіны чалавека да вытлумачэння прычын і наогул да пытанняў філасофскага зместу з'яўляюцца важным, вызначальным крытэрыем яго духоўных магчымасцей і дамінантным сюжэтным лейтматывам трылогіі «На ростанях». Пад моцны рацыянальна-філасофскі кантроль тут часта падпадае нават такая сфера чалавечага жыц-

---

[35] Колас Я. Зб. тв. Т. 9. С. 416.

ця, як каханне, што, здавалася б, і не вельмі ахвотна ўпускае ў свае прасторы гэтакі вось рацыянальны кантроль. У свой час А. Адамовіч заўважыў: «Лабановіч увесь час сам вывучае сваё каханне, аналізуе, трымае яго пад кантролем розуму. Вось чаму яго адносіны да Ядвісі такія ўскладненыя, няпростыя» [36]. І гэта праўда. Як праўда і тое, што далёка не заўсёды такі «кантроль» ідзе на карысць ягонаму каханню да Ядвісі (як, дарэчы, і Ядвісі да Лабановіча). Але факт застаецца фактам: прысутнасць моцнага рацыянальнага моманту тут — з'ява бясспрэчная і відавочная.

Вядома, кожная адметная і глыбокая тэндэнцыя ў вялікім і таленавітым мастацкім творы звычайна не нараджаецца на голым месцы, а працягвае папярэднюю пошукавую працу самога аўтара і іншых пісьменнікаў. Нельга назваць нечаканым і выпадковым і з'яўленне ў коласаўскай трылогіі моцнай філасофскай плыні, хоць яе дакладней было б, відаць, аднесці да з'яў эстэтычна-філасофскага зместу, бо рацыянальны фактар пры ўсёй сваёй важнасці ў эпічнай структуры коласаўскага твора арганічна, натуральна і нязмушана ўваходзіць у мастацка-вобразную тканку рамана і непрыкметна зліваецца з ёю. Толькі дзе-нідзе голас філасофскага рацыяналізму нібыта спрабуе вылучыцца з мастацка-вобразнай стыхіі, хоць арганічнай сувязі з ёю звычайна не губляе. Але голас гэты, што досыць выразна выяўляе сябе фактычна на ўсіх сюжэтных полюсах трылогіі «На ростанях», мае (зноў-такі варта падкрэсліць) прадгісторыю свайго развіцця як у творчасці Коласа, так і наогул у беларускай літаратуры.

Мы ўжо коратка закраналі, напрыклад, пытанне пра мастацкую прыроду коласаўскіх «Казак жыцця» — таго своеасаблівага і адметнага цыкла сімваліка-алегарычных твораў, якія шмат у чым і сёння застаюцца нераскрытымі, неразгаданымі. Ды, відаць, значны элемент «terra incognito» яны будуць несці ў сабе і надалей, бо мастацкі вобраз сімвала і алегорыі няспынна паглыбляе і пашырае абсягі сваёй навізны, уступаючы ў дыялог з кожным новым часам, з кожнай новай грамадскай і літаратурна-гістарычнай эпохай. Робячы «другі заход» да вывучэння твораў, Л. Семяновіч падкрэслівае: «Глыбо-

---

[36] Адамовіч А. М. Беларускі раман: Станаўленне жанра. Мн., 1961. С. 92.

кая жыццёвая філасофія алегарычных навел «Казак жыцця» ўяўляе значную цікавасць у сэнсе фарміравання светапогляду Я. Коласа і чакае даследчыка-філосафа» [37]. Такое сцверджанне ўспрымаецца тым болей пераканальна, што належыць літаратуразнаўцу, які прысвяціў вывучэнню творчасці Я. Коласа, у тым ліку і яго «Казак жыцця», многія гады. Пры гэтым імкнуўся ў некаторых ранейшых сваіх працах залішне строга суадносіць змест названых твораў з канкрэтнымі і адзінкавымі з'явамі жыцця. З цягам часу літаратуразнаўца мусіў пераканацца, што ў дадзеным выпадку такі падыход не можа прынесці вялікага плёну і, у пэўным сэнсе адмовіўшыся ад самога сябе ранейшага, выказаў меркаванне пра неабходнасць падысці да іх вытлумачэння з больш шырокіх, літаратурна-філасофскіх пазіцый.

З гэтым нельга не пагадзіцца. Бо ў першую чаргу «Казкі жыцця» і скіраваны ўнутраным сваім пафасам на абагульнена-філасофскае асэнсаванне рэчаіснасці ці, гаворачы іншымі словамі, на выяўленне крытычных асноў жыцця. Тут, як нам здаецца, будзе дарэчы спаслацца на Арыстоцеля. «Мы лічым,— пісаў ён,— што больш мудры ва ўсякай навуцы той, хто больш дакладны і больш здольны навучыць выяўленню прычын... Навучыць жа больш пад сілу той навуцы, якая даследуе прычыны, бо навучаюць тыя, хто паказвае на прычыны для кожнай з'явы» [38].

Нешта падобнае пра свой асноўны прынцып мастацкага даследавання жыцця мог бы з поўным правам сказаць і Я. Колас. Да гэтай думкі пісьменнік прыйшоў досыць рана, можна сказаць, на пачатковых этапах творчасці, і гэта думка-ідэя ў яго творах няўхільна эвалюцыянізавала, знаходзячы ўсё новыя і новыя стылёва-жанравыя падыходы да выяўлення прычын і ўмацоўваючы, паглыбляючы гэтым самым пазнавальную, гуманістычную і эпічна-філасофскую тэндэнцыю ў беларускай літаратуры. Аягоныя «Казкі жыцця»— яркі і шмат у чым паказальны ў гэтым сэнсе прыклад, менавіта такая якасна арыгінальная і непаўторная з'ява, якая, маючы бясспрэчна самастойнае літаратурнае значэнне, выконвае ў той жа час і ролю своеасаблівага камертона, на які

---

[37] Семяновіч А. А. Майстар алегарычнага апавядання // Янка Купала і Якуб Колас: Некаторыя аспекты творчасці. Мн., 1982. С. 178.
[38] Мир философии. М., 1991. Ч. 1. С. 12—13.

настройваецца яго ўласнае мастацкае слова ў вызначэнні стратэгічнага кірунку развіцця і пошуку галоўных прычынна-выніковых жыццёвых сувязей і на які пісьменнік апасродкаваным чынам, безумоўна, настройвае і схіляе мастацкае слова сваіх калег і паплечнікаў па літаратурнай працы.

У «Казках жыцця» неаднаразова падкрэсліваецца і вар'іруецца думка пра тое, што «самае маленькае знаходзіцца ў блізкай і цеснай сувязі з самым вялікім» [39]. Такая своеасаблівасць заўважаецца ў казках, напісаных у дарэвалюцыйны перыяд, і асабліва ў сімволіка-алегарычных навелах, што з'явіліся ў паслякастрычніцкі час.

У шэрагу выпадкаў сваё разуменне законаў і прынцыпаў дэтэрмінізму пісьменнік раскрывае ў форме адкрыта публіцыстычнага выказвання: «Кожная з'ява і кожная рэч на свеце знаходзяцца пад уплывамі розных чыннікаў, і чыннікі гэтыя часта бываюць зусім процілежных катэгорый. І бывае такі момант, калі сілы чыннікаў розных уплываў стыкаюцца, як у полі крыжавыя дарогі, перасякаюцца ў якім-небудзь месцы, каб падпарадкаваць сабе гэтую з'яву ці гэтую рэч, каб панесці яе па сваёй пуціне» («Залаты прамень», 1927). Або: «Да кожнай з'явы на свеце трэба падыходзіць са словамі: чаму? і з чаго? Бо гэта ёсць пачатак мудрасці і філасофіі. А гэта філасофія нам кажа: на ўсё ёсць прычыны. Паяснім гэта некаторымі канкрэтнымі прыкладамі. Калі я маю з вамі гутарку, то, значыцца, на гэта ёсць прычына. Калі вы сабраліся тут, то і тут таксама ёсць прычына. Як бачыце, на свеце ёсць на ўсё прычына, і кожная прычына мае сваю прычыну, і ў аснове кожнай прычыны ляжыць таксама прычына» («На ўсё ёсць прычына», 1927) [40].

Такая адкрытая (ці амаль адкрытая) тэарэтычна-публіцыстычная тэндэнцыя да завастрэння і канцэнтравання чытацкай увагі на саміх паняццях **прычыннасці, мудрасці, філасофіі** досыць яскрава і відавочна адлюстроўваецца не толькі ў творах Я. Коласа, хоць, напэўна, менавіта Я. Колас і М. Гарэцкі былі той дзейснай і ўплывовай літаратурнай сілай, якая і ў дадзеным выпадку пэўным чынам уздзейнічала на іншых пісьменнікаў. Гэта тэндэнцыя, да прыкладу, прыкметна выяўляе сябе ў 20-я гады ў творах М. Зарэцкага і К. Чорнага. У пры-

---

[39] Колас Я. Зб. тв. Т. 5. С. 517.
[40] Там жа. С. 532, 538.

ватнасці, на яе настройваецца ўнутраны філасофска-псіхалагічны сюжэтны рух чорнаўскага рамана «Сястра» (1927). Яе недругарадная прысутнасць адчуваецца і заўважаецца ў характарах і канфліктах рамана М. Зарэцкага «Сцежкі-дарожкі» (1927).

Нешта вельмі сугучнае тым думкам і меркаванням, якія выказваюць персанажы сімваліка-алегарычных коласаўскіх «Казак жыцця» альбо героі трылогіі «На ростанях», калі яны, апынуўшыся ў складаных абставінах, апелююць у сваіх самых запаветных памкненнях да пошуку «кораня рэчаў», мы будзем знаходзіць у разважаннях галоўнага героя рамана К. Чорнага «Сястра» Ваці Браніслаўца. Адчуўшы «ў сабе смутак расчаравання» ці моцна сціснуты жыццёвымі абставінамі, ён звычайна кожны раз спрабуе шукаць «паратунку» не ў бяздзеянні і чаканні шчаслівага выпадку, які дапамог бы яму выйсці з гэтага стану, а ў спадзяванні найперш на самога сябе, на свой розум і яго пазнавальна-філасофскія магчымасці.

Чорнаўскі герой не пакутуе хваробай саманадзейнасці і не лічыць сябе Арыстоцелем ці Сакратам. Дзесьці ён, можа, нават сябе недаацэньвае і часта губляецца, калі нечы аднамерны, прасталінейны ці ружова-аптымістычны погляд на жыццё спрабуе атакаваць яго думкі-сумненні, праявы «вострага скептыцызму» і аналітычна-філасофскай настроенасці яго душы. Ваця Браніславец нярэдка і сам даволі сурова крытыкуе сябе за тое, што не заўжды хапала яму планавасці, сістэматычнасці, цвёрдасці, упартасці і дысцыпліны, каб даводзіць распачатую справу да канца. Аднак сталеючы, набіраючыся жыццёвага вопыту, ён пачынае ўсведамляць, што такія паняцці, як **планавасць, сістэматычнасць, дысцыпліна, парадак** і інш., могуць несці ў сабе не толькі пазітыўны сэнс, але нярэдка ўвасабляць і звужаную, аднамерную ідэю нейкай маларухомай, застылай формулы-догмы, якая пры дапамозе стараннуяў і намаганняў пэўных колаў людзей уваходзіць у жыццёвы кантэкст, адпаведным чынам пачынае «працаваць» тут і ніколі не застаецца нейтральнай у адносінах да маральна-духоўных і эканамічных працэсаў грамадства.

Зусім не абавязкова, як лічыць К. Чорны, што такія формулы і стэрэатыпы ў кожным разе навязваюцца чалавеку нейкаю пабочнаю сілаю ці прыўносяцца ў яго светаразуменне абставінамі. Гэтыя шаблоны і формулы,

схемы і стэрэатыпы часта стварае і сам чалавек, нярэдка на доўгі час і не на карысць свайму светаразуменню становячыся іх нявольнікам. І адбываецца гэта, паводле меркаванняў аўтара рамана «Сястра», па розных прычынах. Але не ў апошнюю чаргу і з прычыны духоўнай расслабленасці чалавека.

Галоўны герой гэтага твора Ваця Браніславец найперш вінаваціць, напрыклад, не каго-небудзь староннята, а самога сябе за тое, што даволі працяглы час жыў у свеце звужанага разумення сваёй жыццёвай праграмы і што, «вучачыся ў інстытуце сельскае і лясное гаспадаркі, трымаўся толькі сельскагаспадарчых і лясных навук, на ўсё іншае глядзеў прыжмураным вокам і становішча рэчаў зразумеў так: раз надбудоўка трымаецца на базе, толькі база і ёсць істотнасць і патрэбнасць, надбудоўка ж — створана хіба толькі для таго, каб на базе было чаму трымацца»[41]. Герой, відаць, крыху і залішне на сябе тут «нагаворвае». Але ён, як і коласаўскі Лабановіч, з'яўляецца па натуры максімалістам. І калі нехта іншы ў падобных выпадках паспрабаваў бы свае жыццёвыя недагляды і прамашкі паставіць ва ўзаемасувязь з абставінамі і гэтакім чынам імкнуўся б зменшыць сваю асабістую вінаватасць, то герой Чорнага такіх апраўдальных аргументаў для сябе амаль што не шукае. Хоць падчас не такі ўжо ён і вінаваты, як абвінавачвае сябе сам.

Напрыклад, не так проста было студэнту інстытута сельскае і лясное гаспадаркі адшукаць і зразумець ва ўсіх тонкасцях складаную механіку ўзаемазалежнай сувязі паміж базісам і надбудовай. Ваця Браніславец лічыць, што ён тут недапрацаваў, а значыць, сам і вінаваты. Але многія нюансавыя асновы гэтай складанай праблемы і да сённяшняга дня застаюцца нераскрытымі філосафамі і вучонымі-грамадазнаўцамі. Так што на пачатку 20-х гадоў чорнаўскі герой тым болей мог бы, напэўна, спаслацца на цяжкасць праблемы і на некаторыя іншыя прычыны, якія перашкодзілі яму ўбачыць у пэўным сэнсе самастойныя з'явы жыцця ў арганічнай і дыялектычнай узаемасувязі. Аднак ён на гэта не ідзе. Ваця Браніславец бескампрамісна і проста-такі рэзка «навальваецца» з асуджальнай крытыкай на самога сябе: «Цяпер выразна акрэслілася пазнанне ў Ваці Браніслаўца — не ахапіў ён сабою жыцця і не зрабіўся ў ім істотнаю пат-

[41] Чорны К. Зб. тв.: У 8 т. Мн., 1973. Т. 3. С. 29.

рэбнасцю яго або хоцьназіральнікам яго ўсяго, да апошніх дробязей, ува ўсю шырыню і абхват. І цяпер **асмяяў ён сам сябе за былы нясталы шлях...»** [42] (выдзелена мною.— *В. Ж.*). І найперш, як мы сказалі, ён асуджае і вінаваціць сябе за тое, што, будучы студэнтам інстытута сельскае і лясное гаспадаркі, трымаўся толькі сельскагаспадарчых і лясных навук, **на ўсё іншае глядзеў прыжмураным вокам»** (выдзелена мною.— *В. Ж.*). А таму многае, што магло б быць паўней і глыбей асэнсаваным, засталося па-за яго ўвагай, недаацэненым і шмат у чым не зразуметым.

Праўда, мала чаго каштавала б такое яго крытычна-асуджальнае стаўленне да самога сябе, калі б яно не несла ў сабе стваральна-пазітыўнай ідэі, скіраванай на пошук іншага шляху і іншых спосабаў пазнання, каб паправіць, скарэкціраваць ці палепшыць тое, што адбылося ў ранейшым жыцці. Крытыкуючы і асуджаючы самога сябе, Ваця Браніславец сам жа і шукае выхаду. Унутрана настройваецца ён і на дружалюбна-братэрскі кантакт з іншымі, падчас і не дужа знаёмымі яму людзьмі, разлічваючы на пэўную падтрымку з іх боку ці хоць бы дабрасардэчнае чалавечае ўзаемаразуменне. Але зноў-такі найперш ён пакладаецца на самога сябе, а вонкавая сістэма абставін улічваецца ім пераважна як **«дапаможная сіла».**

Тут, відаць, выяўляецца найбольш моцны і найбольш відавочны ўплыў на Чорнага мастацкай традыцыі Дастаеўскага, уздзеянне на яго той экзістэнцыяльнай тэндэнцыі, якая ацэньвала чалавека як найгалоўнейшае вырашальна-філасофскае звяно ў свеце і як такую духоўную сілу, што здольна выстаяць (ці ў рэшце рэшт даказаць сваю нязломнасць коштам уласнага жыцця) у самых жорсткіх і цяжкіх экстрэмальных абставінах.

Сказаў жа неяк практык і тэарэтык экзістэнцыялізму, вядомы французскі пісьменнік і філосаф Ж.-П. Сартр такія словы: «...Чалавек ёсць толькі тое, што ён сам з сябе робіць» [43]. І неаднаразова падкрэсліваў, што чалавек з'яўляецца вялікай і геніяльнай задумай прыроды, яе актыўнай і разумнай істотай, а «не мохам, плесняй або цвятной капустай», і таму яму варта заўжды памятаць, што «няма іншага заканадаўца, акрамя яго самога, і што

---

[42] Чорны К. Зб. тв. Т. 3. С. 29.
[43] Сартр Ж.-П. Экзистенциализм — это гуманизм. М., 1953. С. 29.

вырашаць свой лёс ён будзе ў поўным адзіноцтве»[44].

Безумоўна, Сартр не быў настолькі наіўным, каб не разумець, што і абставіны ў дачыненні да фармавання чалавечага характару не нейтральныя. Але ў дадзеным выпадку ён, трэба меркаваць, адкрыта палемізаваў з тымі тэорыямі, дзе роля чалавека як творцы і вышэйшага духоўнага феномена на зямлі недаацэньвалася ці прыніжалася. Дарэчы, недаацэньвала гэты момант і тэорыя сацыялістычнага рэалізму, якая, нягледзячы на ўсе яе агаворкі, у «перабудовачных» працэсах чалавечай душы яўна аддавала перавагу знешняй дэтэрмінацыі, вонкавым уплывам, а не фактару самадэтэрмінацыі, не працэсам самааналізу, самаўдасканалення, «самапабудовы» і г. д.

Магчыма дапусціць, што экзістэнцыяльна-псіхалагічны ўплыў мог даходзіць да Чорнага і ўступаць «у супрацоўніцтва», узамадзеянне з яго творчымі задумамі і непасрэдна праз успрыманне замежных пісьменнікаў Кафкі, Джойса, Пруста і інш. Вядома, не трэба пры гэтым змяншаць і непасрэднага ўплыву ў фармаванні такой псіхалагічна-экзістэнцыяльнай лініі ў творчасці К. Чорнага і вельмі дзейснага ўплыву рэальнага жыцця, якое па-рознаму накладваецца на кожную творчую індывідуальнасць і адпаведным чынам трансфармуе яе. Натуральна, што ўсё гэта пакідала свой след і ў індывідуальнай псіхалогіі герояў пісьменніка.

У рамане К. Чорнага «Сястра» такая экзістэнцыяльна-псіхалагічная тэндэнцыя найбольш выразна, адметна і тыпова раскрывае сябе ў імкненнях і намерах герояў (прынамсі, усіх найбольш значных герояў твора) абараніць сваю духоўную суверэннасць, сваё «я» ад падпарадкавання чужой волі і разам з тым выйсці насустрач шырокім і, можна нават сказаць, універсальным кантактам з жыццём і іншымі людзьмі. Аўтар лічыць, што менавіта на такім шляху чалавек і можа знайсці самога сябе як суверэнная асоба, здольная, апрача ўсяго, глыбей пранікаць у жыццё і знаходзіць яго «корань рэчаў», глыбей суадносіць побытавую плынь жыцця з яго быційным філасофскім падтэкстам.

Магчыма зрабіць дапушчэнне, што ў такіх сваіх унутраных арыентацыях на філасофска-аб'ёмнае, універсальнае ўспрыманне рэчаіснасці многія героі чорнаўска-

---

[44] Сартр Ж.-П. Экзистенциализм — это гуманизм. С. 29.

га рамана «Сястра», і найперш Ваця Браніславец, нясуць на сабе адбітак уплыву коласаўскай традыцыі. Шэраг маладых пісьменнікаў у першыя пaслякастрычніцкія гады спрабавалі гэту традыцыю не прызнаваць як дзейсную літаратурную сілу. Але рэальная сіла яе ўплыву ад гэтага не змяншалася. Устрымаемся і мы ад катэгарычных вывадаў і сцверджанняў, пакуль з'ява належным чынам не даследавана. Аднак уяўляецца, што коласаўскі ўплыў не абмінуў К. Чорнага. І гэта асабліва, як нам здаецца, адчуваецца ў ягоным рамане «Сястра».

Галоўны герой трылогіі Я. Коласа «На ростанях» Лабановіч увесь час настройвае і скіроўвае сябе на заглыблены філасофскі роздум аб жыцці не дзеля нейкай абстрактнай мэты, а добра ўсведамляючы, што такі інтарэс цесна звязаны з яго прафесійнай працай настаўніка і з больш дакладным і пэўным вызначэннем свайго месца і ролі ў грамадскай дзейнасці. Вось гэта якраз і не хацелі зразумець тыя крытыкі, якія не толькі папракалі, але падчас і абвінавачвалі коласаўскага героя ў тым, што ён нібыта залішне марнуе час, думаючы пра недасяжныя зоры, загадкавасць, таемнасць і веліч космасу, у параўнанні з якім чалавечае жыццё здаецца маленькай, мізэрнай драбніцай, хоць таксама і складанай, і таемнай, і загадкавай. І гэту складанасць чалавечага жыцця, яго сэнсавую дамінанту можна зразумець, паводле меркаванняў Лабановіча, не іначай як у філасофскай сістэме звязанасці часцінкі і цэлага, штодзённага побытавага і грамадскага інтарэсу з вечнымі філасофскімі праблемамі быцця.

Выразную прыкмету падобнай тэндэнцыі адлюстроўвае і духоўная эвалюцыя галоўнага героя коласаўскай паэмы «Сымон-музыка». Даволі працяглы час яму, напрыклад, уяўляецца, што вольным, незалежным магчыма стаць ужо тады, калі, набраўшыся адвагі і рашучасці, здолееш выйсці з-пад уціску вонкавых побытавых мікраабставін. І на гэта ў яго сапраўды хапае і адвагі, і рашучасці — нават у падлеткавыя гады. Паспрабаваў бацька без сур'ёзнай на тое прычыны пакрыўдзіць яго — і Сымон паказаў свой непакорлівы нораў: пакінуў бацькоўскую хату. Убачыў герой несумленнасць і няшчырасць дзеда-жабрака — без роздуму пакідае і яго. Уведаў, што скнарлівы і хітры шынкар Шлёма падманвае яго і імкнецца дастасаваць яго талент да сваіх карыслівых інтарэсаў,— Сымон прымае бескампраміснае рашэнне разар-

ваць усялякія сувязі і з ім. І ў кожным такім выпадку герой звычайна не прамінае заўважыць, што мусіць разысціся з гэтымі людзьмі таму, што не можа жыць пад прымусам, што хоча «быць вольным», «сам сабе... быць панам», што наважыўся волю «сам узяць» і «ў свет вольны паляцець».

Аднак жаданні і рэальныя магчымасці чалавека далёка не заўсёды натуральна, арганічна і безбалесна трансфармуюцца ў яго дзеяннях. Гэта ўсё глыбей пачынае разумець і коласаўскі герой. Ён сапраўды досыць рашуча і смела пераадольвае бар'еры знадворных, пераважна побытавых акалічнасцей, якія абмяжоўваюць яго волю. Але ў глыбіні душы Сымон адчувае, што тая вышыня і тая праява свабоды, якая патрэбна яму як чалавеку-грамадзяніну і чалавеку-творцу, ім яшчэ не здабыта і не заваявана. І многія вельмі сур'ёзныя бар'еры да гэтых **вышэйшых формаў свабоды**, на думку героя, знаходзяцца не дзесьці збоку і не ў кім-небудзь іншым, а ў **ім самім** — у няведанні ім навуковых, прафесійных асноў творчасці, музыкі, служыць якой кліча яго прыродны талент, і ў недастатковым веданні жыццёвай мудрасці. Яму здаецца вельмі дзіўным, што звужанае, прагматычна-побытавае ўспрыманне асобных людзей знаходзіцца на такой вялікай адлегласці ад разумення яго рэальных духоўных пакут і «прагавітага запалу пасягнуць навукі свет» [45]. Гэта прага-жаданне спасцігнуць прафесійныя навуковыя тайны музычнага майстэрства ў яго часам такое моцнае, што ён гатоў ахвяраваць жыццём усяго толькі за «першае знаццё» нотных законаў музыкі. З неаслабнай увагай слухае Сымон у панскім замку, дзе яму ўпершыню давялося сустрэцца з прафесійным музыкантам, мудрага старога чалавека, дзеда Данілу, які па-народнаму проста, даходліва і ў той жа час заглыблена, па-філасофску мудра вядзе гутарку пра няспынны рух і абнаўленне ў жыцці, прыродзе, пра зладжаную сувязь адной з'явы з іншай і пра шмат у чым «патайны» іх сэнс. Стары і мудры народны філосаф адчувае, што палкае і шчырае жаданне таленавітага сялянскага юнака стаць вольным, свабодным чалавекам яшчэ належным чынам не забяспечана яго **ўнутранай падрыхтаванасцю** здзейсніць такі намер. Іменна з гэтай прычыны стары Даніла і пабуджае Сымона глыбей засяродзіцца на самім сабе, каб

[45] Колас Я. Зб. тв. Т. 6. С. 450.

надворныя абставіны, дзе столькі складанага, нявырашанага, патаемнага і няпростага, раптам не сталі для яго непераадольнай сцяной.

Жаданне быць вольнымі, свабоднымі і незалежнымі як надзвычай важную жыццёвую мэту выношваюць у сваёй душы і многія героі рамана К. Чорнага «Сястра»— Ваця Браніславец, Абрам Ватасон, Казімер Ірмалевіч і інш. Пра гэта яны часта гавораць, думаюць, разважаюць. У адной з размоў доктар-хірург Казімер Ірмалевіч досыць адкрыта, каб у яго слухача-апанента не было на гэты конт ніякіх іншых меркаванняў, фармулюе сваю пазіцыю: «Не паміруся я ніколі з усякім падначаленнем» [46]. І яшчэ неаднойчы ён будзе паўтараць падобную думку.

Але гэтая думка шмат у чым яшчэ недаспелая, інтуітыўная, эмацыянальная, і звязанасць яе з паняццем **індывідуальнай свабоды** досыць крохкая, нямоцная. Вядома, калі чалавек гаворыць пра тое, што ён не збіраецца мірыцца «з усякім падначаленнем», і калі ён дазваляе нам хоць бы адзін-два разы пераканацца, што гаворыць ён шчыра і зацікаўлена, то ў такім разе мы, відаць, маем падставу падумаць пра гэтага чалавека як пра патэнцыяльнага шукальніка рэальнай унутранай свабоды. Аднак аўтар паказвае, што са стану патэнцыяльнага шукальніка волі і праўды не так проста і выйсці. Ды і непажадана спяшацца. Бо тут трэба, паводле яго меркаванняў, каб унутранае «я» чалавека адчувала нязмушаны і глыбокі прычынны ўзаемакантакт не з нейкай вузенькай і павярхоўнай сферай жыцця, а з усім яго універсумам.

На такі роздум і настройвае сябе чорнаўскі Ваця Браніславец. І асабліва з таго часу, калі стаў адчуваць, што прапусціў пад час вучобы ў інстытуце нешта надзвычай важнае, не прыклаў належных захадаў і намаганняў «ахапіць сабою» ўсю глыбіню і шырыню жыцця. «З таго часу,— разважае герой у форме няўласна-простай мовы,— ён і задумваўся стала над тым, што не ўсё ў ім і ён ва ўсім, а ўсё вышэй і шырэй, а ён у маленькім кутку ўсяго, нізкім, цёмным і няважным. І тады акрэслілася ў ім **жаданне знайсці метад аўладання ўсім ці хоць знаёмства з шырынёю ўсяго»** [47] (выдзелена мною.— *В. Ж.*). Праз нейкі час, калі яго душу зноў пачынае агортваць смутак,

---

[46] Чорны К. Зб. тв. Т. 3. С. 79.
[47] Там жа. С. 31.

Ваця Браніславец і на гэты раз шукае трывалы пункт апоры ў філасофскім роздуме аб жыцці, у імкненні звязаць і суаднесці свой побытавы клопат і бягучы інтарэс з адвечнымі і універсальнымі законамі жыцця: «У наступны момант стала так, як бы не было куды ісці назад. І тады несвядомыя сілы загаварылі ў ім. Няведама для яго самога паўстала перад ім, у адчуваннях яго, устанаўленне: усё тое, што робіцца цяпер і вакол, робіцца вечна, варушыцца; **і ён ва ўсім гэтым і ўсё ў ім»** [48] (выдзелена мною.— *В. Ж.*).

Ваця Браніславец, як бачым, не перабольшвае сваіх рэальных магчымасцей у асэнсаванні разнастайнай складанасці жыцця. Пра гэта гаворыць і лексіка твора, гэта пэўным чынам адлюстроўвае і размова героя з самім сабой. Чорнаўскі герой унутрана пакуль што не гатовы, паводле яго ж уласнага прызнання, раскрываць складанасць жыцця і звязваць у адзін тугі вузел усё тое, што «робіцца цяпер і вакол, робіцца вечна», на ўзроўні паглыбленага аналітычна-філасофскага аналізу. Гаворачы словамі героя, многія складаныя «ўстанаўленні» свету ўяўляюцца яму не зусім выразна, найбольш у адчуваннях і ў формах далёка не ўсвядомленых прычынных сувязей, хоць ён у той жа час і разумее, што абавязкова трэба духоўна расці, не даць сваёй душы апынуцца ў палоне інфантыльнай нірваны, трэба няспынна імкнуцца да таго, каб пазнаць «усю шырыню» свету. І герой даволі паслядоўна рыхтуе сябе да такой духоўна-інтэлектуальнай місіі.

Аднак многім, з кім Вацю Браніслаўцу даводзіцца ўзаемадзейнічаць, здаецца, што ён проста дзівак, не дужа практычны і нават «не грамадскі чалавек». Бо замест таго, каб арыентавацца на практычную справу, на дзеянне-ўчынак, ён дарэмна марнуе час, шмат думае, разважае, палемізуе і наогул багата ўвагі аддае пошуку спосабаў, метадаў і прыёмаў **«аўладання ўсім».** Калі, напрыклад, ён распачынае з таварышам па інстытуцкай вучобе размову пра неабходнасць пашыраць гарызонты пазнання і стымуляваць сябе з мэтаю «пазнаць» усю шырыню жыцця, дык той ахалоджвае Вацю такімі вось словамі: «А дзеля чаго пазнаваць?» Гэты герой цвёрда перакананы, што заглыбляцца ў сферу духоўных пошукаў чалавеку асабліва не трэба, каб не пашкодзіць гэтым

---

[48] Чорны К. Зб. тв. Т. 3. С. 86.

самым практычнай справе. «Ён пільна,— гаворыць аўтар,— вывучаў пытанне аб абсалютным хімічным скарыстанні некаторых парод дрэва, меў поспех і збіраўся ехаць пасля інстытута на год пяць у лясную глуш для доследаў лясных парод. І смяяўся над «размахам», як самамэтаю»[49], маючы тут на ўвазе ў першую чаргу духоўна-інтэлектуальныя, філасофскія захапленні і клопаты свайго таварыша.

А нехта іншы, безыменны «член мясцкома і нейкага бюро працаўнікоў ляснога кіраўніцтва», ідзе яшчэ далей і кваліфікуе імкненні Ваці Бранілаўца знайсці галоўныя прычынныя і філасофскія «ўстанаўленні» жыцця, адшукаць універсальны «метад авалодання ўсім» не проста як марную трату часу, нікому не патрэбную гімнастыку розуму, адарваны ад рэальных жыццёвых патрэб занятак, але ў пэўным сэнсе і як з'яву антыграмадскую. «Табе дарэмна дадзена асвета,— катэгарычна і безапеляцыйна павучае Вацю гэты маленькі начальнік.— Я ад цябе патрабую, каб ты быў утварыцелем»[50].

Заглыбляючыся ў падтэкст гэтай павучальна-катэгарычнай сентэнцыі, герой К. Чорнага прачытвае і такі яе злавесна-пагражальны сэнс: у словах «табе дарэмна далі асвету» гучэла іншая думка: «Ты вораг рэвалюцыі»[51]. І Ваця быў, як гэта можна меркаваць, не далёкі ад ісціны ў выяўленні падтэкставага сэнсу выказаных у яго адрас слоў. Ды нешта падобнае яму яшчэ шмат разоў давядзецца пачуць у свой адрас.

Былыя і новыя яго начальнікі (і не толькі начальнікі) нібыта згаварыліся між сабой і прыйшлі да пагаднення аб тым, што без іх кіруючай, начальніцкай волі, без іх настаўніцкіх указанняў, загадаў, прадпісанняў Ваця Браніславец канчаткова нібыта заблытаецца, страціць правільную жыццёвую арыентацыю і ніколі не стане актыўным удзельнікам і «ўтварыцелем» грамадскага працэсу. Так, былы камісар палка, а потым цырульнік Абрам Ватасон, прыгадваючы ранейшае сваё знаёмства з камандзірам падначаленай яму роты Вацем Бранілаўцам, чамусьці лічыць, што такому чалавеку, як Ваця, на кожны дзень патрэбна цвёрдая, моцная і нават жорсткая камандзірская рука: «Дык от Ваця; ён носіць назву лясно-

---

[49] Чорны К. Зб. тв. Т. 3. С. 30.
[50] Там жа. С. 35.
[51] Там жа. С. 91.

га таксатара, патрэбнага і неабходнага работніка; тады ж насіў чырвонаармейскую вінтоўку. І аднак толькі воля чужая над ім патрэбна была, бо ён слабы, як тая славутая трава. Каб не было над ім волі чужое, ці не палажыў бы ён гэтае вінтоўкі там, дзе стаяў, і ці не пайшоў бы туды, да свайго старога бацькі нудзець у чатырох цесных сценах гнілое старасвецкае хаты, праклінаючы, аднак, і хату гэтую і ўсё тое, што адвечнаю пакутаю вісела над ёй... Вацю ж ненавіджу часам, наогул жа, не люблю... За што? За шкодную пасіўнасць. За баязлівасць, за тое, што, носячы ў сабе буры, ён баіцца і не любіць іх, калі яны пакідаюць яго вузкае нутро і робяцца вонкавымі і канкрэтнымі. Над гэтаю сілаю павінна **быць сіла чужое волі»** [52] (выдзелена мною.— *В. Ж.*).

Абрам Ватасон, як няцяжка зразумець, з такой непрыхільнасцю ставіцца да былога свайго знаёмага і падначаленага найперш таму, што Вацяя нібыта выяўляе «шкодную пасіўнасць», асцярогу і «баязлівасць» там, дзе трэба больш смела, актыўна і без асаблівых ваганняў і хістанняў стаць у шэрагі перабудоўшчыкаў жыцця на новы лад. Калі ж уважліва прыслухацца да такой абвінаваўчай (інакш не скажаш) характарыстыкі героя, то нельга не заўважыць, што былы начальнік Ваці таксама вельмі блізкі да таго, каб залічыць яго ў стан людзей, якім марна дадзена асвета і якія быццам бы дарэмна шукаюць нейкі свой, індывідуальны жыццёвы сэнс і не спяшаюцца прызнаць погляды масы, масавыя ўяўленні ці, як доўгі час прынята было гаварыць, калектыўнае меркаванне вышэйшым эталонам праўды і бясспрэчным вызначальным крытэрыем ісціны.

Аднак аўтар, прытрымліваючыся ў рамане «Сястра» пераважна аб'ектыўнай манеры пісьма і адкрыта не выяўляючы свой ацэначны голас, у нюансава-псіхалагічным падтэксце скіроўвае ўвагу чытача на такія малапрыкметныя, але важкія па сваім значэнні моманты, якія паказваюць, што энергію сапраўднай навізны, сапраўднага абнаўлення і сапраўднай перабудовы жыцця нясе ў сабе якраз найперш той, хто ўнутрана падрыхтаваны да духоўнага абнаўлення ці, нарэшце, хоць бы выяўляе схільнасць да перабудовы самога сябе.

Чорнаўскі герой пад час знаёмства з ім чытача не знаходзіць, што прайшоў тую стадыю духоўнай эвалюцыі і

---

[52] Чорны К. Зб. тв. Т. 3. С. 174—175.

духоўнай «самабудовы», каб паглядзець на жыццё універсальна шырокім поглядам і стаць яго сапраўдным «утварыцелем». Ад такой ролі ў грамадскім працэсе Ваця Браніславец у перспектыве не адмаўляецца. І дарэмна яго абвінавачваюць у пасіўнасці і грамадскай індыферэнтнасці. Аднак некаторыя важныя свае намеры пра больш шырокі, асабісты ўдзел у складаных працэсах рэальнасці ён пакідае за сабою на заўтрашні дзень. І робіць гэта не з-за ляноты душы, а якраз наадварот — з прычыны ўсведамлення таго, што весці заглыблены дыялог з жыццём яму яшчэ шмат у чым не пад сілу, як не пад сілу пакуль што дзейсным чынам уплываць на абставіны, каб вызначыць больш дакладны, чалавекалюбны і гуманістычны шлях іх складвання і развіцця.

Раман К. Чорнага «Сястра» досыць холадна, насцярожана і, больш таго, вельмі недружалюбна быў сустрэты крытыкаю пасля свайго выхаду ў свет. Не атрымаў належнай падтрымкі і ў далейшым. На доўгія гады гэты твор трапіў у запаснікі літаратурнай гісторыі. На жаль, нават крытыкі высокай прафесійнай культуры і тонкага грамадзянскага чуцця нярэдка характарызавалі «Сястру» як мастацкую няўдачу пісьменніка. Ці ў лепшым выпадку як з'яву вузкага эксперыментальна-лабараторнага значэння, далёкую ад стрыжнявых працэсаў літаратурнага жыцця.

Пэўны час такога погляду прытрымліваўся, напрыклад, А. М. Адамовіч. У яго яркай і таленавітай кнізе «Беларускі раман», дзе многія творы К. Чорнага разглядаюцца глыбока і ў наватарскім ключы, раману «Сястра» ў гэтым сэнсе не вельмі пашанцавала. Відаць, усе мы ў той або іншай ступені знаходзімся пад уплывам свайго часу. «...Узвышэнец, Чорны, здаралася,— піша А. М. Адамовіч,— не заўважаў, што яго герой з новага чалавека ператвараецца ў «жывога чалавека» і толькі. Такімі выглядаюць персанажы яго першага рамана «Сястра» (1927). Аўтара гэтага рамана як бы зачаравала, яго ўвагу цалкам прыкавала загадка чалавечай псіхалогіі, музыка няўлоўных чалавечых адчуванняў і перажыванняў. Грамадскі ж сэнс і змест перажыванняў чалавека ў першым рамане Чорнага амаль што губляецца. Героі жывуць як бы ў тумане, яны ўвесь час п'яныя ад настолькі ж вострых, наколькі і выпадковых адчуванняў, пачуццяў. Усім сваім творам аўтар як бы падкрэслівае: вось ён «жывы чалавек», вось якая «бура пачуццяў» увесь час

кіпіць у ім! Аўтар выварочвае напаверх усё, што хаваецца ў падсвядомасці яго персанажаў. Атрымліваецца як бы запаволены фільм: героі не могуць хадзіць, рабіць нешта, клапаціцца аб нечым так, як робяць гэта па-сапраўднаму жывыя людзі, бо аўтар не адпускае іх ад сябе ні на крок, корпаецца ў іх нічым не цікавых адчуваннях і саміх герояў прымушае неадрыўна глядзець на свой «псіхалагічны пупок», каб кожную хвіліну думаць: «А што я адчуваю вось цяпер?» У такога «жывога чалавека» не застаецца ні сіл, ні часу на тое, каб жыць, жыць як рэальны чалавек... У рамане «Сястра» пісьменнік паглыбляўся ў псіхалогію ізаляванай чалавечай асобы, анатаміраваў душу рэфлектыўнага героя, не выходзячы ў свет вялікіх грамадскіх праблем. Малады пісьменнік, акрамя ўсяго іншага, як бы правяраў сваю здольнасць адзначыць, зафіксіраваць, прасачыць кожны рух душы чалавека»[53]. Няўдача з раманам «Сястра», паводле слоў А. Адамовіча, калі і мела нейкую карысць для пісьменніка, дык толькі ў тым сэнсе, што «дапамагла яму зразумець, што тую высокую культуру творчасці, да якой ён імкнуўся, здабыць можна толькі з вялікіх глыбінь народнага жыцця: чым глыбей залягае нафтаносны пласт, тым вышэй уздымаецца фантан нафты»[54].

Твор гэты і сапраўды шмат у чым мае прыкметы эксперыментальнай мастацкай працы. Аднак праца гэта з'яўляецца, бясспрэчна, таленавітым эстэтычным набыткам аўтара і наогул значным дасягненнем маладой, паслякастрычніцкай беларускай літаратуры. Недахопы ж, якія маюць тут месца і якія пераважна звязаны з сюжэтна-кампазіцыйнай будовай, не зацямняюць грунтоўнай, фундаментальнай праблематыкі твора, плённага імкнення нацыянальнай мастацкай думкі выйсці **да карэнных першаасноў** тагачаснай рэчаіснасці. А вось гэтага крытыка якраз доўгі час не заўважала ці не хацела заўважаць і, абмінаючы рэальныя хібы рамана, недаацэньвала пазітыўную яго сутнасць або проста няшчадна крытыкавала аўтара за тое, што на добры лад варта было б падтрымаць.

К. Чорны, напрыклад, падкрэслена (і падчас нават падкрэслена тэндэнцыйна) сцвярджае і адстойвае ідэю

---

[53] Адамовіч А. М. Беларускі раман: Станаўленне жанра. С. 174—175.

[54] Там жа. С. 175.

духоўнага суверэнітэту асобы, якая лічыць, што менавіта толькі ў межах духоўнай суверэннасці, самастойнасці, незалежнасці і магчыма глыбока паяднацца з калектывам і выканаць нікім незаменную ролю ў абнаўленні і перабудове жыцця. «Я сам рэвалюцыя», я «сам праз сябе» здабываю «сістэму сваіх духовых паводзін на свеце»[55]— такія і падобныя выказванні і меркаванні галоўнага героя рамана «Сястра» Ваці Браніслаўца якраз і падкрэсліваюць стрыжнявы момант аўтарскага плана-задумы — паказаць чалавека, які шукае вузлавыя пункты апоры гэтаму свайму імкненню паяднацца з калектывам і вызначыць найбольш разумныя і мэтазгодныя шляхі перабудовы грамадства ў першую чаргу не ў вонкавых сілах і знешніх стымулах, а ў самім сабе, рыхтуючы, удасканальваючы дзеля гэтай задачы свой духоўна-інтэлектуальны патэнцыял.

Трэба сказаць, што К. Чорны, настройваючы літаратурную і грамадскую думку на перспектыўны, плённы кірунак развіцця, колькі-небудзь рэальнай падтрымкі ў тагачасным (прынамсі, афіцыйным) літаратурна-грамадскім асяроддзі, як ужо адзначалася, не знаходзіў. У грамадстве і літаратуры ў гэты час пачыналі ўжо верхаводзіць сілы, якія даволі шырокім фронтам сталі разгортваць барацьбу супраць здаровых жыццёвых тэндэнцый, што якраз і неслі ў сабе творы накшталт чорнаўскага рамана «Сястра». А адной з такіх адзнак чалавечай псіхалогіі, да якой афіцыйныя колы ўсё больш адкрыта выяўлялі непрыхільныя і проста рэзка асуджальныя, рэпрэсіўныя адносіны, з'яўлялася імкненне чалавека да самаўдасканалення. Раскрытыкаваць такога чалавека і паказаць у негатыўным святле такую адметнасць духоўнасці многія крытыкі і пісьменнікі лічылі за добры тон. Пры гэтым нярэдка выступалі ў падобнай незайздроснай ролі людзі, якія мелі ў літаратуры аўтарытэтнае імя і да голасу якіх прыслухоўваліся.

Так, напрыклад, М. Горкі яшчэ напярэдадні рэвалюцыі 1917 года ў адным з артыкулаў вядомага цыкла «Несвоечасовыя думкі» (прывядзём больш поўны тэкст яго разважання, на якое мы часткова ўжо спасылаліся) пісаў: «Вы паглядзіце: нідзе ж не займаюцца так многа і ўпарта пытаннямі і спрэчкамі, клопатамі пра асабістае «самаўдасканаленне», як займаюцца гэтай **відавочна бес-**

---

[55] Чорны К. Зб. тв. Т. 3. С. 237, 93.

**сэнсоўнай справай** (выдзелена мною.— *В. Ж.*) у нас. Мне заўсёды здавалася, што іменна гэты род заняткаў стварае асабліва густую і ўдушлівую атмасферу крывадушнасці, маны, ханжаства. Асабліва цяжкай і прыгнятальнай гэта атмасфера была ў гуртках «талстоўцаў», людзей, якія надзвычай заўзята займаюцца «самазгрызотамі»[56]. Горкі, як можна заўважыць, нават слова «самаўдасканаленне» бярэ ў двукоссе і падшуквае да яго адпаведны сінонім — «самазгрызоты», каб як мага больш моцна і рэзка выявіць сваё негатыўнае, сатырычна-асуджальнае і выкрывальнае стаўленне да з'явы, што знаходзіцца нібыта ў ліку «відавочна бессэнсоўных», непатрэбных і абсурдных заняткаў.

Аднак таленавітае мастацкае слова літаратуры, абапіраючыся на рэальныя факты жыцця і логіку яго законаў, падобную практыку адхіляла. Дарэчы, як мастак, а не як публіцыст часта мусіў падпарадкоўвацца зменліваму руху ўздзеянняў палітычнай барацьбы і М. Горкі. І ён мае бясспрэчныя дасягненні ў раскрыцці характару чалавека, стрыжнявая аснова якога абумоўліваецца яго ж уласнымі духоўнымі намаганнямі.

Справядлівасць патрабуе, аднак, сказаць, што найбольш глыбокую і плённую лінію, скіраваную на сцверджанне адвечнага права чалавека ўмацоўваць і бараніць духоўны грунт свайго індывідуальнага суверэнітэту, пракладваў усё-такі не Горкі. Тут трэба будзе назваць іншых пісьменнікаў. І сярод іх у рускай літаратуры паслякастрычніцкага часу асабліва вылучаюцца такія імёны, як Я. Замяцін і А. Платонаў.

У рамане Замяціна «Мы» (1920) на самым раннім этапе новай, паслякастрычніцкай явы было вельмі тонка ўгадана тое, што некалькі пазней звузіла магчымасці выяўлення духоўнай індывідуальнай свабоды чалавека і неправамерна расшырыла над ім уладу безасабовага калектыву, уладу «мы». Гэта ўлада ўяўлялася пісьменніку страшнай, дэфармуючай, нівеліруючай і разбуральнай у дачыненні да індывідуальнага чалавечага «я» сілай, якая здольна забіць у чалавеку самую галоўную яго сутнасць — відавочнае ўжо ў раннім дзяцінстве прыроднае імкненне быць арыгінальным, непаўторным, неардынарным. А героі замяцінскага рамана і, у прыватнасці, тыя

---

[56] Горький М. Несвоевременные мысли и рассуждения о революции и культуре: 1917—1918 гг. М., 1990. С. 40.

з іх, хто збудаваў так званы інтэграл і вынайшаў матэматычна дакладны спосаб уніфікаваць усякую духоўна-інтэлектуальную адметнасць, лічаць, што быць арыгінальным і непаўторным зусім непажадана. Больш таго — нават смешна, архаічна і непрыстойна.

Вось хоць бы такі прыклад. На фоне аднастайнай жыццёвай шэрасці на нейкае імгненне ў натоўпе паяўляецца жанчына, што паспрабавала неяк парушыць гэты сумны побытавы стэрэатып жыцця: «Яна была ў кароткай, старамоднай ярка-жоўтай сукенцы, чорным капялюшыку, чорных панчохах. Сукенка лёгкага шоўку — мне было добра відаць: панчохі вельмі доўгія, значна вышэй каленяў, і адкрытая шыя, цень паміж...» [57] Але вынаходніку інтэграла, з дапамогай якога ўсё можна лёгка і проста падагнаць пад адзін жорсткі, хранаметрычна выверяны ранжыр, гэта «свавольства» жанчыны вельмі не падабаецца, здаецца дзіўным, незразумелым і непажаданым. І ён недвухсэнсоўна яе папярэджвае: «Паслухайце, вы, зразумела, хочаце арыгінальнічаць, але няўжо вы...» [58] Жанчына спрабуе яшчэ нешта даказваць, гаварыць пра тое, што «быць арыгінальным — гэта значыць вылучыцца сярод іншых» [59], быць арыгінальным — гэта значыць не «быць банальным» і г. д., аднак яе аргументы не пераконваюць «вялікага майстра» канонаў і матэматычна-уніфікаваных метадаў.

Яму больш даспадобы іншае. Яго больш захапляе такая вось сцэнка: «Праспект поўны: у такое надвор'е пасляабедзенны асабісты час мы звычайна трацім на дадатковую прагулку. Як заўсёды. Музыкальны завод усімі сваімі трубамі спяваў Марш Адзінай Дзяржавы. Мернымі радамі, па чатыры, урачыста адбіваючы такт, ішлі нумары — сотні, тысячы нумароў, у блакітных юніфах, з залатымі бляхамі на грудзях — дзяржаўны нумар кожнага і кожнай. І я — мы, чацвёра,— адна з незлічоных хваляў у гэтым магутным патоку» [60]. На яго думку, чалавек па-сапраўднаму і можа адчуваць сябе шчаслівым толькі тады, калі цалкам, без астатку сальецца з грамадою і «ўбачыць сябе часткаю вялізнага, магутнага адзінага» [61]. Ён лічыць, што ў поўнай і абсалютнай падпа-

---

[57] Замятин Е. Мы. М., 1989. С. 221.
[58] Там жа.
[59] Там жа. С. 221.
[60] Там жа. С. 206.
[61] Там жа. С. 223.

радкаванасці асобы калектыўнай волі, дзяржаўным патрабаванням і выяўляецца глыбокі сэнс жыцця чалавека, а тыя грамадскія формы, мадэлі, структуры і сістэмы, дзе такая падпарадкаванасць асобы калектыўнай волі і калектыўнаму розуму адсутнічала ці была не вельмі жорсткай, быццам бы з'яўляліся сістэмамі і структурамі ніжэйшай ступені — неарганізаванымі, дзікімі, асіметрычнымі: «Шмат неверагоднага мне даводзілася чытаць і чуць пра тыя часы, калі людзі жылі яшчэ ў свабодным, гэта значыць неарганізаваным, дзікім стане. Але самым неверагодным мне заўжды здавалася іменна гэта: як тагачасная — хай нават зачаткавая — дзяржаўная ўлада магла дапусціць, што людзі жылі без усякага падабенства на нашу Скрыжаль, без абавязковых прагулак, без дакладнага ўрэгулявання тэрміну яды, прачыналіся і клаліся спаць калі ім узбрыдзе ў галаву; некаторыя гісторыкі гавораць нават, што ў тыя часы на вуліцах усю ноч гарэлі агні, усю ноч па вуліцах хадзілі і ездзілі» [62].

Ну а калі некаму такая норма жыцця магла здацца занадта прывабнай і заманлівай, то ім варта тады нібыта нагадаць, што яны глыбока памыляюцца і што іх асабістае шчасце іх індывідуальнай волі не падуладна. Ды і не толькі нагадаць, але залішне непакорлівых «прыструніць», прымусіць паверыць, што па-сапраўднаму шчаслівымі і свабоднымі яны могуць стаць толькі тады, калі добраахвотна адмовяцца ад свайго індывідуальнага «я», прызнаюць над сабой (ужо не людзьмі з канкрэтнымі імёнамі і прозвішчамі, а безыменнымі вінцікамі-нумарамі) бясспрэчную і абсалютную ўладу калектыўнага «мы» на чале з воляю Дабрадзея Адзінай Дзяржавы, якая надзяліла сябе неабмежаваным правам несці падобную мадэль свабоды і шчасця ўсяму Сусвету.

Цікавыя ў гэтым сэнсе першыя абзацы рамана, дзе контурна акрэслена яго галоўная ідэя і вызначана стылёва-жанравая накіраванасць: «Я проста спісваю — слова ў слова — тое, што сёння надрукавана ў Дзяржаўнай Газеце: «Праз 120 дзён заканчваецца пабудова Інтэграла. Набліжаецца вялікі гістарычны час, калі першы Інтэграл узаўецца ў сусветныя прасторы. Тысячы гадоў таму назад нашы гераічныя продкі падпарадкавалі ўладзе Адзінай Дзяржавы ўвесь зямны шар. Вас чакае яшчэ больш слаўны подзвіг: шкляным, электрычным, вогне-

---

[62] Замятин Е. Мы. С. 210.

дышным Інтэгралам праінтэгрыраваць бясконцае ўраўненне Сусвету. Вам трэба будзе дабрачыннай няволі розуму падпарадкаваць невядомыя істоты, што жывуць на іншых планетах — быць можа, яшчэ ў дзікім стане свабоды. Калі яны не зразумеюць, што мы нясём ім **матэматычна беспамылковае шчасце, наш доўг прымусіць іх быць шчаслівымі** (выдзелена мною.— *В. Ж.*). Але раней зброі мы выкарыстаем слова.

Ад імя Дабрадзея аб'яўлена ўсім нумарам Адзінай Дзяржавы: «Усякі, хто адчувае ў сабе сілы, абавязаны складаць трактаты, паэмы, маніфесты, оды ці іншыя сачыненні аб прыгажосці і велічы Адзінай Дзяржавы. Гэта будзе першы цяжар, які панясе Інтэграл. Хай жыве Адзіная Дзяржава, хай жывуць нумары, хай жыве Дабрадзей!» [63]

І ў гэтым урыўку, і ў сюжэтным дзеянні твора наогул за знешнім пафасным тонам захаплення ўсім тым, што быццам бы дапамагае, спрыяе збліжэнню асобы з калектывам і паскарае, дынамізуе працэс зліцця індывідуальна-адметных праяў духоўнасці з агульным «мы», выразна адчуваецца глыбокая падтэкставая сіла іроніі. Па-рознаму спрабавалі трактаваць яе ўнутраны сэнс. Доўгі час лічылася, напрыклад, што аўтар з'едліва высмеяў, акарыкатурыў тут «камуністычны грамадскі ідэал» [64]. Інкрымінацыя такой віны з'явілася асновай вынясення Я. Замяціну смяротнага прысуду, замененага потым (1931 г.) выгнаннем пісьменніка за межы радзімы.

Ідэйна-эстэтычная сутнасць іроніі гэтага выдатнага твора заключае ў сабе, аднак, больш тонкі, аб'ёмны і змястоўны сэнс. Аўтару важна было паказаць, што ніякага карэннага якаснага абнаўлення ў жыцці не можа быць і ніякая шчаслівая і гуманістычная будучыня не можа быць пабудавана пры ўмове зніжэння і паслаблення індывідуальнай духоўнай энергіі асобы. А тым болей тады, калі чалавека вымушаюць адмовіцца ад самога сябе і стаць безыменным нумарам, механічным выканаўцам чужой волі, якая вельмі часта здатна выступаць у ролі безапеляцыйнага знаўцы ісціны, хоць нярэдка нясе ў сабе авантурызм, дагматычную звужанасць і стэрэатыпную метадалогію. Пісьменнік хацеў, як слушна заўважае крытык І. Шайтанаў, ускалыхнуць, растрывожыць

---

[63] Замятин Е. Мы. С. 204.

[64] Литературный энциклопедический словарь. М., 1987.

грамадскую думку, завастрыць увагу на пытаннях грамадзянскай адказнасці **кожнага** за заўтрашні дзень і падкрэсліць, што без вялікіх духоўных намаганняў нічога істотнага і значнага ў жыцці зрабіць нельга, як нельга «сесці ў аэро і прыляцець да шчасця. Нельга таму, што не паляціш ад сябе. Прагрэс ведаў — гэта яшчэ не прагрэс чалавецтва, а будучае будзе такім, якім мы яго сёння рыхтуем» [65].

Многія героі рамана Я. Замяціна «Мы» здзіўляюцца і не разумеюць, як гэта можна, каб багатую, шматгранную, размаітую духоўнасць мільёнаў розных па сваёй унутранай індывідуальнай будове людзей уніфікаваць і знівеліраваць пад прэсам калектыўнай волі ці пад уздзеяннем волі лідэра пэўнага дзяржаўнага калектыву. Ды яшчэ пры гэтым пераконваць чалавека, што менавіта такая страта індывідуальнага «я» якраз і можа быць для яго па-сапраўднаму карыснай і па-сапраўднаму здольна ашчаслівіць яго. Бо імкненне быць залежным, камусьці падначаленым нібыта закладзена ў самой прыродзе чалавечай псіхікі. Ці не пра гэта хоць бы вось такое казуістычнае разважанне аднаго з тых, каму больш даспадобы паслухмяны і падатлівы чалавек-шрубка: «Чаму танец прыгожы? Адказ: таму што гэта несвабодны рух, таму што ўвесь глыбокі сэнс танца менавіта ў абсалютнай эстэтычнай падпарадкаванасці ідэальнай несвабодзе. І калі правільна тое, што нашы продкі аддаваліся танцу ў самыя ўрачыстыя моманты свайго жыцця (рэлігійныя містэрыі, ваенныя парады), то гэта азначае толькі адно: інстынкт несвабоды спрадвеку ўласцівы чалавеку» [66].

Аднак, здзіўляючыся, спрабуючы даказваць сваім апанентам нешта адваротнае, героі замяцінскага рамана ўсё-такі вымушаны (іменна вымушаны) станавіцца ў «агульны строй» і прызнаваць над сабой таталітарную ўладу формул-стэрэатыпаў вынаходніка інтэграла. Праўда, такое падпарадкаванне чужой волі — найчасцей усяго толькі вонкавая згода аддаць сваё «я» пад кантроль «мы» ці ў распараджэнне таго Дабрадзея, што паспеў заўладаць неабмежаваным правам гаварыць ад імя гэтага «мы». Чалавек, як паказвае аўтар, адчуваў наступленне на яго індывідуальную свабоду таго вялікага Страху, носьбітам якога з'яўляліся шматлікія ахоўнікі стро-

[65] Замятин Е. Мы. С. 18.
[66] Там жа. С. 206.

гага і жорсткага парадку і дысцыпліны ўжо на ранніх этапах паслякастрычніцкага жыцця. Але ж нават і ў такіх неспрыяльных умовах знешняй несвабоды чалавек пэўным чынам, у межах магчымага імкнуўся бараніць свой духоўны суверэнітэт.

Здавалася б, усё прадумана, разлічана і матэматычна выверана, каб ніхто не паспрабаваў і не змог вырвацца за межы той формулы-праграмы, якую заклалі ў сваё вынаходніцтва канструктары інтэграла па волі ўладара Адзінай Дзяржавы. Аднак дамагчыся абсалютнага і няўхільнага падпарадкавання асобы ніведіруючай сіле гэтага механізма ім не ўдаецца. То ў адным, то ў другім месцы нехта ўсё ж парушае строгі расклад жыцця. У рамане Я. Замяціна «Мы» адчуваецца нават чаканне адкрытага супраціўлення націску на індывідуальны духоўны свет чалавека.

Так, напрыклад, шматзначны і глыбокі сэнс ў творы набывае эпізод з кароценькай інфармацыяй, якая прамільгнула ў адной з газет: «Паводле дакладных звестак, зноў выяўлены сляды да гэтага часу няўлоўнай арганізацыі, якая ставіць мэту вызвалення з-пад дабратворнага ярма Дзяржавы» [67]. Безумоўна, на пярэдні план і тут выступае мастацкі закон іроніі. Але іроніі своеасаблівай. Іранічная танальнасць мастацкага слова найперш увасабляе вялікую трывогу і заклапочанасць аўтара за заўтрашні дзень паслякастрычніцкай краіны і заўтрашні лёс чалавека. Ужо тады, калі працэс так званага перавыхавання чалавека ў поўнай меры яшчэ не раскрыў усіх сваіх генацыдных праяў і злавесных адзнак насілля над яго індывідуальным «я», пісьменнік глыбока і беспамылкова адчуў, што армія ўсялякіх ахоўнікаў («хранителей»), якая з кожным годам разрасталася, па волі ўладара Вялікай Дзяржавы і па сваёй уласнай волі будзе наўмысна ствараць экстрэмальныя сітуацыі ўяўнай небяспекі краіне і яе кіраўнікам з боку розных «ворагаў народа».

Калі ўлічыць, што пра ўсё гэта Я. Замяцін разважаў у 1920 г., дык становіцца зразумелай прароцкая сіла яго мастацкага слова і празорлівасць аўтарскай інтуіцыі. Зыходзячы з рэальнага стану з'яў бягучай сучаснасці, ён пасылаў сігнал вялікай трывогі ў дзень заўтрашні і, як можна меркаваць, быў блізкі да думкі, што чалавек,

---

[67] Замятин Е. Мы. С. 225.

падпадаючы пад моцны прэсінг вонкавага прымусу, мае, апрача ўсяго, і маральнае права абаперціся на падтрымку арганізацыі ці проста апазіцыйнай сілы, здольнай у выпадку неабходнасці абараніць яго інтарэсы ці дапамагчы яму вызваліцца з-пад такога «дабрачыннага ярма Дзяржавы».

Арыгінальна, ярка і па-грамадзянску мужна раскрываецца гэта нежаданне чалавека стаць бяздумнай марыянеткай, вінцікам у грамадскім працэсе жыцця і ў вядомых творах А. Платонава «Катлаван» (1930) і «Ювенільнае мора» (1934). Героя аповесці «Катлаван» рабочага механічнага завода Вошчава, напрыклад, узмоцнена пераконваюць, што «завод працуе па гатоваму плану трэста» [68] і што яму таксама застаецца быць толькі добрасумленным выканаўцам гэтага гатовага плана. А ён упарціцца, не пагаджаецца і даказвае, што і яго самога ў пазаўрочны час цягне думаць «аб плане жыцця».

І гэта яго жаданне, як можна заўважыць, прычынна абумоўліваецца верай ці ў рэшце рэшт прадчуваннем таго, што універсальна-непарушных і прыдатных на ўсе часы планаў жыцця наогул не бывае, не існуе. Зыходзячы з падобных пазіцый, абапіраючыся ў асноўным на грунт здаровага сэнсу, ён даволі лёгка знаходзіць слабыя мясціны ў доказах сваіх апанентаў-начальнікаў, хоць тыя часта не прымаюць яго ўсур'ёз і імкнуцца, апрача ўсяго, яго павучаць, спрабуюць паказаць сваю перавагу, маніпулюючы такімі паняццямі, як матэрыялізм, дыялектыка і г. д. Яму, у прыватнасці, раяць больш налягаць на працу, «укалваць» і меней думаць аб шчасці ўсіх і кожнага, бо агульнае шчасце нібыта пэўна і канчаткова прадвызначана адпаведнымі тэорыямі. «Шчасце наступіць ад матэрыялізму, таварыш Вошчаў, а не ад сэнсу»,— кажа яму адзін з такіх «знаўцаў» дыялектыкі і матэрыялізму. А каб быць ужо зусім на вяршыні «вучонай» аргументацыі, ён прыводзіць і такія вось, на яго погляд, непахісныя довады: «Табе, Вошчаў, дзяржава дала лішнюю гадзіну на тваю задумлівасць — працаваў восем, цяпер сем, ты б і жыў — маўчаў! **Калі ўсе мы адразу задумаемся, то хто дзейнічаць будзе?»** [69] (выдзелена мною.— *В. Ж.*).

Але гэтая стэрэатыпна-напышлівая тырада ўсёведан-

---

[68] Платонов А. Котлован. Ювенильное море. М., 1987. С. 7.
[69] Там жа. С. 6.

ня таксама досыць лёгка рассыпаецца пад напорам неабвержнай логікі здаровага сэнсу Вошчава: «Я мог выдумаць што-небудзь накшталт шчасця, а ад душэўнага сэнсу палепшылася б вытворчасць... **Без думы людзі дзейнічаюць бессэнсоўна**»[70] (выдзелена мною.— *В. Ж.*). І з асабліва вялікім непакоем ён думае пра тое, каб раптам гэта бессэнсоўнасць не стала шырокамаштабнай і доўгатэрміновай праграмай дзеяння, канцэпцыяй жыцця многіх людзей. Паводле слоў аўтара, Вошчаў хоча працаваць, вельмі перажывае, што з нагоды «задуменнасці сярод агульнага тэмпу працы» яго звальняюць з завода, але «без ісціны» праца ўяўляецца яму непатрэбнай, марнай і на самай справе бессэнсоўнай. Ён ужо «не мог далей працаваць і ступаць па дарозе, не ведаючы дакладна будовы ўсяго свету і таго, куды трэба імкнуцца»[71].

І вось тут мы зноў павінны вярнуцца да рамана К. Чорнага «Сястра» і цяпер ужо з большай падставай сказаць, што твор гэты, несправядліва адсунуты на доўгія гады на абочыну літаратурнай гісторыі, не толькі знаходзіўся ў цэнтры галоўнага напрамку развіцця нацыянальнай мастацкай думкі, але яму шмат у чым належала першапраходчыцкая, першаадкрывальніцкая роля і ва ўсесаюзным літаратурным працэсе. Па сваім унутраным пафасе і, больш таго, асобнымі праявамі сюжэта і характараў чорнаўская «Сястра» перагукваецца і тыпалагічна шмат у чым блізка суадносіцца з аповесцю А. Платонава «Катлаван». Аднак тыя досыць прывычныя ў ранейшыя часы меркаванні, паводле якіх рускаму аўтару ў супастаўленні з пісьменнікам іншай нацыянальнай літаратуры звычайна аддаваўся прыярытэт ідэйна-эстэтычнага ўплыву, у дадзеным выпадку ніякага грунту пад сабою не маюць. Бо раман «Сястра» з'явіўся ў друку трыма гадамі раней, чым аповесць А. Платонава «Катлаван».

Не будзем рабіць на гэтай аснове нейкіх шырокамаштабных вывадаў. Аднак у нас ёсць усё-такі сур'ёзная падстава сказаць, што маладая беларуская літаратура ў асобе сваіх найбольш яркіх і таленавітых пісьменнікаў здольна была не толькі ўбіраць у сябе плённы вопыт іншых літаратур, але валодала магчымасцю самастойна «выпрацоўваць» такі вопыт і чуйна настройвацца на праблематыку, без вырашэння і асэнсавання якой нельга

---

[70] Платонов А. Котлован. Ювенильное море. С. 6.
[71] Там жа. С. 7.

было разлічваць на высокацывілізаваны, духоўна-гуманістычны і сацыяльна-эканамічны прагрэс грамадства. Пераканальны прыклад тут — раман К. Чорнага «Сястра».

Вельмі важнай рысай названага твора было, у прыватнасці, і тое, што аўтар паставіў у цесную прычынную ўзаемазалежную сувязь дзве сферы жыцця — духоўную і эканамічную. На першы погляд можа здацца, што колькі-небудзь істотнай праблемы тут не існавала. Быццам бы і разумнаму простаму селяніну не вельмі трэба было даказваць, што пісьменны, адукаваны, мудры чалавек заўсёды бачыць далей і глыбей, чым чалавек непісьменны, павярхоўны. І ў многіх выпадках менавіта з гэтым разумным і мудрым чалавекам ён звязваў надзеі на перабудову і паляпшэнне свайго жыцця.

Аднак у той час, калі К. Чорны прапаноўваў чытачу свой раман «Сястра», ніжэйшыя, сярэднія і вельмі часта нават вышэйшыя кіраўнічыя ступені ўлады займалі людзі, якія не мелі належнай адукацыі ды нярэдка не вызначаліся і маральнай чысцінёй. Натуральна, што ў такім разе яны не дужа шанавалі навуку, асвету, культуру і філасофію як найважнейшую аснову чалавечай духоўнасці. І гэта іх насцярожанасць і непрыхільнасць да мудрай філасофскай думкі і проста да чалавека пад гальштукам, у капелюшы ці ў акулярах, на жаль, імпанавала пэўным колам грамадства, асобным групам людзей з вузкай, прагматычна-побытавай жыццёвай устаноўкай. Бо ім здавалася, што і без заканчэння «гимназиев» можна дасягнуць хуткіх, крутых і добрых перамен у жыцці, адно толькі трэба дзейнічаць ды не шкадаваць сябе ў фізічнай працы. А розныя мудрацы-інтэлігенты, можа, і на самай справе схільны залішне ўскладняць жыццё, скіроўваючы кожнага на пошукі «кораня рэчаў».

Такая духоўная індыферэнтнасць вельмі непакоіла, як мы ўжо гаварылі, Я. Коласа ў трылогіі «На ростанях». Вялікую грамадскую небяспеку гэтай з'явы таленавіта і мужна раскрылі ў сваіх творах «Катлаван» А. Платонаў, «Мы» Я. Замяцін і іншыя рускія пісьменнікі. Раман К. Чорнага «Сястра» арганічна ўваходзіць у гэты аўтарытэтны літаратурны кантэкст яркіх і таленавітых мастацкіх твораў, хоць паводле выканання і рэалізацыі задумы чорнаўскі раман шмат у чым сапраўды застаецца з'явай эксперыментальнай. Аднак гэта эксперымент высокай мастацкай якасці, глыбокага філасофскага розду-

му над жыццём. Пісьменнік звяртаў увагу свайго, часта настроенага на вельмі хуткае, імгненнае вырашэнне ўсіх складаных пытанняў сучасніка на тое, што як бы ні скіроўвалі яго на ружова-аптымістычны лад і як бы ні прыспешвалі яго працаваць па шаблоне, па формуле, па гатовым плане-клішэ, нічога істотнага з гэтага не атрымаецца і ніякіх рэзкіх змен у сацыяльна-эканамічнай структуры грамадства не адбудзецца да той пары, пакуль чалавек глыбока не пранікнецца ўсведамленнем, што ў агульным плане пабудовы і абнаўлення жыцця павінен знайсці месца, выявіцца і яго ўласны духоўна-інтэлектуальны інтарэс.

Пісьменніка разам з тым вельмі цікавіць і працоўны занятак чалавека. І цікавіць, можна сказаць, не меней, чым яго дзеянне-думка ці дзеянне-пачуццё. Адно другому тут не супрацьпастаўляецца, хоць у сюжэтнай будове твора элемент развагі, пачуцця, перажывання яўна пераважае. Амаль кожнага героя, нават эпізадычнага, аўтар імкнецца (хоць бы ў самым агульным плане) паказаць у працоўнай сферы. Прычым, трэба заўважыць, сімпатыі пісьменніка звычайна аддадзены працаўніку-прафесіяналу. Пра тых, хто робіць сваю справу так, «як мокрае гарыць» [72], пісьменнік гаворыць звычайна з насмешкай. Ды і толькі мімаходзь запыняе ён у рамане «Сястра» на такіх людзях увагу. А вось да чалавека, які з любоўю і стараннасцю выконвае тую або іншую працу, ён звычайна ставіцца з павагай і сімпатыяй.

Праца — наогул вельмі важны элемент у жыццёвай біяграфіі чорнаўскіх герояў. Былы армейскі камісар Ватасон па-свойму захоплены працай цырульніка і, здаецца, не крывіць душой, калі гаворыць, што любіць дзейнічаць. Словы **дзейнасць, дзейнічаць** і г. д. даволі часта сустракаюцца ў гаворцы герояў і ў аўтарскай мове. І ўжываюцца яны найбольш з пазітыўным знакам, а менавіта як выяўленне імкненняў чалавека пераключыць сябе са стану **арыентацыі на справу ў стан яе рэалізацыі**.

Нярэдка і звычайную будзённую працу чалавека пісьменнік падае ў задуменна-філасофскай ці ўзвышана-лірычнай афарбоўцы, звяртаючы нашу ўвагу на тое, што ў пэўным сэнсе **любая** праца дазваляе чалавеку выявіцца як філосафу, творцу і паэту. У арбіту зацікаўленай пісьменніцкай увагі трапляе, напрыклад, такі персанаж, як

---

[72] Чорны К. Зб. тв. Т. 3. С. 167.

Радзівон Цівунчык, што дваццаць гадоў старажуе ў лазні. На першы погляд ён можа здацца вельмі ўжо празаічным і пабытавым чалавекам. Але гэта не так: «Бо, варушачыся на балюча кароткіх днях чалавечага жыцця, слаўны чалавечнасцю, Радзівон Цівунчык, раней ціхманы белатвары хлопец, пасля салдат імперыі, працаўнік па ўсім горадзе на ўсякіх работах, дваццацідвухгодні стораж у лазні і цяперашні насельнік зямлі па прыватных справах — ён лепш жыў, працуючы пры гэтай установе, што прызначана служыць для ачысткі чалавечага цела» [73].

К. Чорны, як можна здагадвацца, хоча звярнуць нашу ўвагу яшчэ і на тое, што кожная праца і кожная справа з'яўляюцца па-свойму незаменнымі і важнымі, а таму рэзка супрацьпастаўляць іх па лініі вартасці і значнасці неправамерна. Зыходзячы менавіта з такіх меркаванняў, аўтар адпаведным чынам будуе і сюжэт твора, паступова ўключаючы ў яго дзеянне людзей розных прафесій і розных працоўных заняткаў. Тут і настаўнік, і доктар, і лясны таксатар, і чыгуначнік, і цырульнік, і інш. Дастаткова каму-небудзь з іх унесці ў гэта, паводле задумы аўтара, раўнапраўе чалавечых, працоўных і прафесійных узаемадачыненняў пэўны дысананс, а тым болей выявіць імкненне навязваць некаму сваю начальніцкую ці настаўніцкую волю, як мастацкая думка ў творы пачынае набываць адкрыты або падтэкставы бунтарскапалемічны характар. Пісьменнік дапускае і ў прынцыпе лічыць нават зусім правамерным тое, што сапраўдны інтэлігент абавязаны ў многім глыбей і шырэй, чым просты, заняты паўсядзённай працай чалавек, бачыць унутраныя, падтэкставыя працэсы жыцця і валодаць філасофскай здольнасцю тлумачыць іх хаду, вызначаць і прадвызначаць стратэгію іх руху. Таму галоўны герой «Сястры» так моцна дакарае сябе за ўпушчэнні і прагалы ў філасофскай падрыхтоўцы, у авалоданні навукамі, якія дазволілі б яму пазнаць «усю шырыню» [74] жыцця. Відаць, адчувае ён сваю вінаватасць і перад самім сабою, і перад некім іншым, што не дасягнуў, не дабраў, вучачыся ў інстытуце, пэўнай духоўна-інтэлектуальнай глыбіні і вышыні.

---

[73] Чорны К. Зб. тв. Т. 3. С. 70.
[74] Там жа. С. 30.

Ваця Браніславец увесь час адчувае на сабе дапытлівы, крытычны і прасякнуты глыбокімі надзеямі погляд людзей, вяскоўцаў, сацыяльна-псіхалагічныя гены якіх ён нясе ў сваім характары і светаўспрыманні. Аднак гэтая воля-жаданне грамады ні ў якіх адзнаках і формах вонкавага націску не выяўляецца, і таму яна не выклікае ў яго нязгоды ці ўнутранага пратэсту. Бо ў рэшце рэшт такая воля, накладваючы на чалавека той або іншы абавязак, не адбірае ад яго правоў на свабодны выбар жыццёвых намераў і спосабаў іх рэалізацыі.

Зусім іншую псіхалагічную рэакцыю заўважаем мы ў пераважнай большасці герояў рамана «Сястра» тады, калі чужая воля безальтэрнатыўнай, аднамерна схематычнай накіраванасці наўперад імкнецца спланаваць, «змадэляваць» іх паводзіны, думкі, настроі. Напрыклад, у словах невялікага прафкомаўскага начальнічка, які любіць павучаць іншых і якому найбольш падабаецца ў дачыненні да гэтых іншых ганарлівая камандзірская поза, можа, часам і сустракаецца зерне ісціны, але яно губляецца ў шалупінні агульшчыны і агрэсіўнага бескампраміснага дагматызму. І такое імкненне маленькага чыноўніка-бюракрата станавіцца ў позу вялікага «настаўніка жыцця», прадпісваць чалавеку правілы і нормы побытавых і грамадскіх паводзін выклікае ў герояў чорнаўскага рамана пэўныя і акрэсленыя негатыўныя адносіны.

Гэта адчуваецца, дарэчы, і ў самім аўтарскім тоне. Своеасаблівым крытэрыем пісьменніцкіх адносін да гэтага чалавека з'яўляецца тое, што ён прысутнічае тут як персанаж безыменны. Бо выяўляе сябе гэты чалавек у асноўным як аднамерна-бясколерная схема. Ніякіх кольκі-небудзь выразных прыкмет індывідуальнасці і непаўторнасці ў яго словах і паводзінах мы не заўважым, хоць ён і пнецца вылучыцца на пярэдні план і амаль прымушае, загадвае звярнуць увагу на сваю персону. У яго лексіконе часта мільгаюць словы і выразы, якія могуць здацца абсалютна правільнымі і напышлівы пафас якіх можа нават захапіць, падкупіць і прывабіць. Ну хоць бы, напрыклад, такая яго заклікальна-пафасная прамова ў коле былых таварышаў па інстытуце: «...Ты думаеш, калі ты пасядзіш шэсць гадзін за сталом, а вечарам паглядзіш балет у музычнай камедыі і пагаворыш аб прагрэсе чалавецтва, дык ты і ўтварыцель самога прагрэсу? Ты ўтварыцель жыцця? А пакуль ты не станеш сам утва-

рыцелем, датуль ты не паднімешся над вялікай нізасцю, што напаўняе нас з глыбіні вякоў...»[75]

Усё тут правільна, да таго ж падобныя меркаванні гэты чалавек выказвае неаднойчы. Аднак аўтар настройвае чытача не паддавацца ўплыву гучных шумавых эфектаў, пабуджае яго глыбей задумацца над тым, што ў такіх слоўных схемах-тырадах, у такой правільнасці выразаў вельмі ж мала асабістай, шчырай аналітычнай заклапочанасці справамі. Гэты «член мясцкома і нейкага бюро працаўнікоў ляснога кіраўніцтва», як лічыць пісьменнік, гаворыць не пра нешта глыбока перажытае, запаветнае, асабістае, выпакутаванае, а механічна паўтарае запазычанае, узятае напракат з таго ж канцылярска-бюракратычнага лексікону «сыноў свайго веку з партфелямі раённага маштабу, што стараюцца расцягнуць да сталічных памераў»[76]. Вось такім чынам аўтар выяўляе сваё негатыўна-іранічнае стаўленне да чалавека, у якога на кожны складаны выпадак жыцця наўперад прыгатавана схема-рэкамендацыя, формула-парада і стэрэатыпныя заклікі імкнуцца да лепшай будучыні, хоць аптымальныя спосабы яе пабудовы і рэальныя шляхі набліжэння да яе сам ён бадай што і не ўяўляе. Ды і не прыкладае намаганняў уявіць. Бо схематычна-стэрэатыпнае мысленне звычайна вызваляе сябе ад такой напружанай духоўна-інтэлектуальнай працы. Яно заўсёды лепш пачувае ў аднамернай **неальтэрнатыўнай прасторы, у межах цвёрдых, жорсткіх, рашучых і бескампрамісных «правільных» рашэнняў**.

Аднак, як паказвае К. Чорны, на гэтым шляху, што на пэўны момант прываблівае сваёй уяўнай прастатой (ну каму дужа хочацца ісці да мэты кружнымі дарогамі), краіну і грамадства могуць напаткаць складаныя і цяжкія выпрабаванні. І ён настойліва шукае ў рамане «Сястра» такія сілы, якія б дазвалялі чалавеку не быць паслухмянай, наіўна-даверлівай марыянеткай «сляпой волі» і засцерагалі б яго ад некрытычных адносін да дагматычных і схематычных думак і тэорый. І гэтыя засцерагальныя сілы, лічыць аўтар, знаходзяцца не дзесьці за трыдзевяць земель, увасоблены не ў добрых ці дрэнных намерах і пажаданнях вялікага ці малога начальніка, а ў самім чалавеку, і менавіта яму самому належыць давесці

---

[75] Чорны К. Зб. тв. Т. 3. С. 35.
[76] Там жа. С. 35.

іх да ладу, сфармаваць, напоўніць глыбокім сэнсам і скіраваць іх дзеянне на працу, на справу.

К. Чорны, як мы ўжо адзначалі, вельмі ўважліва і добразычліва паставіўся ў рамане «Сястра» да чалавека працы. Пра гэта сведчаць і будова фразы, і яе танальнасць, і стылёвая афарбоўка. З прыязнай і спагадлівай усмешкай апавядае ён, напрыклад, пра радавога «насельніка зямлі» стоража лазні Радзівона Цівунчыка, што добра і жыццярадасна пачуваў сябе, «працуючы пры гэтай установе, што прызначана для ачысткі чалавечага цела». На некалькі іншую, рамантычна-прыўзнятую танальнасць настройваецца мастацкае слова аўтара, калі яно адлюстроўвае працу машыніста поезда Панкрата Малюжыча: «Панкрат Малюжыч уяўляўся яму вясёлым удзельнікам працэсу жыцця ў яго найгалоўнейшых накіраваннях, удзельнікам, які сам гэта і адчувае сябе добра тут, бо нічога іншага няма, што магло б параўняцца з важнасцю гэтага працэсу. Нават нешта падобнае чуў і ў Панкратавай гаворцы пра ўсё штодзённае... Ганяючы паязды па бясконцых сваім размахам дарогах, Панкрат Малюжыч творыць працэс жыцця» [77].

Пісьменніку цікава слухаць сваіх герояў, калі яны гавораць пра сваё жаданне працаваць, дзейнічаць, тварыць працэс жыцця. Так, цырульнік Абрам Ватасон з гонарам заўважае, што любіць «дзейнасць», і дзейнічае «сярод усяго»... Не толькі жадае, а прагне дзейнасці і настаўніца Маня Ірмалевіч. «І не толькі работа прымусіла мяне сюды ехаць,— дзейнасці хачу... Работу магла я і там знайсці»,— гаворыць яна свайму стрыечнаму брату Казіміру, таксама апанаванаму жаданнем дзейнічаць і «тварыць працэс».

Аднак не так проста далучыцца да складанай справы адраджэння, абнаўлення, перабудовы жыцця і стаць, як заўважае пісьменнік, «утварыцелем». Тварыць сапраўдны працэс жыцця, на яго погляд, нельга, не падрыхтаваўшы сябе духоўна, не настроіўшыся тварыць дабро. Прытым пісьменнік выступае тут як максіміліст. Ён уважлівы да любых праяў чалавечай дабрыні, але перакананы, што ў прынцыпе толькі той можа грунтоўна і дзейсна паўплываць на дынаміку грамадскага развіцця і глыбока адгукнуцца ў сэрцы іншых людзей, хто здольны і ў дачыненні да малазнаёмага чалавека добраахвотна,

---

[77] Чорны К. Зб. тв. Т. 3. С. 181.

не за грошы і без прынукі выявіць свае братэрскія, бескарыслівыя і гуманістычныя адносіны.

Ваця Браніславец, напрыклад, ні ў сяброўскіх, ні ў сваяцкіх сувязях з вартаўніком лазні Радзівонам Цівунчыкам не знаходзіцца. Проста ведае яго як адзінокага чалавека, жыццярадаснага, працавітага, схільнага крыху паразважаць, пафіласофстваваць «аб устанаўленнях свету». І гэтага для чуйнага сэрца Ваці Браніслаўца было дастаткова, каб пры выпадку напісаць старому і адзінокаму чалавеку ліст, парадаваць яго кароткатэрміновым наведваннем, прыемна здзівіць. «Я такі адразу ўбачыў,— разважае Цівунчык, атрымаўшы ад Ваці нечаканае пісьмо,— што гэты Браніславец людскі чалавек. Адразу ўбачыў, як адно паглядзеў на яго. Ну што яму я! Як той казаў, дзяцей разам не хрысцілі, кантрактаў разам ніякіх не рабілі, а от бачыш ты — узяў ды напісаў. Успомніў. Ну, дзе ж гэтакі чалавек ёсць? От-бо ёсць людзі на свеце. Цяпер гэтакія зводзяцца. От-бо чалавек, от-бо чалавек! І адрасу не напісаў. Або забыўся, або так здураваў. Каб быў адрас, я адпісаў бы яму адразу. Ну, некалі будзем, добра кажа, жывы-здаровы, дык убачымся. А-яй, як жа гэта здураваць ды адрасу не напісаць! Гэта ж трэба! Забыўся, мусіць... А можа, і наročна; але чаму? Раз ён мне пісаў, дык павінен быў адрас свой даць. Што гэта і чаму гэта, дык хто яго ведае. От-бо чалавек»[78]. І далей: «З гэтакім чалавекам і пажыць разам добра. А то часам пападзецца такі, што ты дня з ім не ўбудзеш. На добрага чалавека ты мала дзе трапіш. Ён жа табе ўсякі **будзе добрым, калі ведае, што ў цябе грошы ёсць. А ты вазьмі, ды так мне будзь добрым. Без грошай. Тады я скажу, што ты сапраўды добры. Праўда ці не? А гэты чалавек, калі ён мяне ўспомніў...**»[79] (выдзелена мною.— *В. Ж.*).

Напэўна, небагата давялося Радзівону Цівунчыку сустрэць на сваім жыццёвым шляху людзей чуйных і бескарыслівых. А можа, калісьці нехта моцна пакрыўдзіў яго ці ашукаў. Вось чаму меркаванне героя здаецца крыху катэгарычным. Але справа тут, відаць, нават не ў гэтым. Пісьменнік не проста занатоўвае эпізадычную, пабытавую праяву гуманістычнага дзеяння, у дадзеным выпадку яго цікавіць нешта больш істотнае. Не забудзем,

---

[78] Чорны К. Зб. тв. Т. 3. С. 255.

[79] Там жа. С. 257—258.

што раман «Сястра» стварауся ў той час, калі ўжо закладваўся «трывалы» падмурак класавага падыходу да ацэнкі чалавека, што К. Чорнага (і не аднаго яго) вельмі непакоіла. І гэта трывога апасродкаваным чынам прагучала ў вуснах яго героя — звычайнага, простага чалавека, які, аднак, не развучыўся думаць і для якога здаровы сэнс і агульналюдскія маральныя законы з'яўляюцца важнай вызначальна-ацэначнай мерай духоўнага жыцця.

Да такой думкі ўнутрана далучаецца, як можна адчуць, і аўтар. Ён хацеў бы, каб ва ўзаемаадносінах паміж людзьмі панаваў не аднамерны закон класавых вызначэнняў, а прынцып бескарыслівага гуманістычнага братэрства. Але пад уздзеяннем розных тэорый нешта ўжо, напэўна, тут сур'ёзна зрушылася. І зрушылася не ў лепшы бок нават у звычайных, побытавых абставінах, дзе дабрыня і прыязнасць паміж людзьмі спрадвеку выяўлялі сябе ў найбольш бескарыслівых і ўстойлівых формах. Раскрываючы ўласную зацікаўленасць і занепакоенасць, пісьменнік спыняе такім чынам нашу ўвагу на тых, быццам бы радавых, падкрэслена побытавых жыццёвых эпізодах, дзе дабрыня і чалавечнасць выяўляюць сябе ў формах нязмушанага эмацыянальнага водгуку душы на сігнал бяды, трывогі і імгненнага, шмат у чым незалежнага ад рацыянальных уплываў і ўздзеянняў парывання чалавека прыйсці на дапамогу іншаму чалавеку, які да цябе, можа, за такою дапамогаю не звяртаўся і з якім ты, магчыма, не вельмі знаёмы ці нават зусім не знаёмы.

Праўда, падчас аўтар у падобных выпадках нібыта аспрэчвае самога сябе і адхіляе тое, што сказаў крыху раней. Так, напрыклад, адзін з яго герояў (якому, дарэчы, аўтар таксама сімпатызуе) заўважае: «Дык от жа. А ты павінен ведаць. Настроямі жыць нельга, калі яны адны толькі і ёсць. Гэта называецца — ануча, туман...» [80] Але аб'ектыўна і ў дадзеным выпадку пісьменнік не адмаўляе свайго ранейшага слова аб тым, што першае эмацыянальнае парыванне чалавека зусім не другасная рыса яго характару і яго духоўнасці.

К. Чорны і на гэта пытанне імкнецца глядзець па-філасофску шырока. Яму нязменна падабаецца чалавек шчодры, адкрыты, эмацыянальны, у пэўнай ступені нават імпульсіўны ў сваіх міласэрных і альтруістычных памк-

---

[80] Чорны К. Зб. тв. Т. 3. С. 234.

неннях. І ў той жа час ён хоча сказаць свайму чытачу пра тое, што альтруізм і міласэрнасць становяцца па-сапраўднаму жыццядзейнай стваральна-гуманістычнай сілай толькі ў тым выпадку, калі чуйнаму сэрцу і працавітым рукам дапамагае праніклівы розум ці ў рэшце рэшт хоць бы тая больш ці менш відочная патэнцыяльная магчымасць духоўнасці, якая настройвае чалавека ўбачыць уласнае жыццё, жыццё іншых людзей і жыццё наогул у філасофскім ракурсе.

Менавіта такую рысу заўважаем мы ў характары Радзівона Цівунчыка, які меў унутраную патрэбу «пагаварыць з якім-небудзь стрэлачнікам аб людзях, устанаўленнях і ўстановах свету»[81]. Вядома, яму, чалавеку старому і малапісьменнаму, авалодаць усёй глыбінёй і складанасцю гэтых «установ і ўстанаўленняў свету» цяжка ды і, відаць, ужо не давядзецца. Але аўтару важна падкрэсліць думку пра тое, што яго героя і на старасці гадоў цягне на філасофскія разважанні.

Імкненне Радзівона Цівунчыка пагаварыць «аб устанаўленнях і ўстановах свету», як можна здагадацца, менш за ўсё матывавана жаданнем адзінокага чалавека «скоротать» час. Тут адчуваецца нешта больш значнае: ён пабойваецца таго, каб не стаць сыравінай гісторыі, малазначным і падатлівым для чужой волі механічным вінцікам. Герой, безумоўна, не разумее ўсіх тонкасцей філасофіі і філасофскай навукі. Ды і самі такія паняцці з'яўляюцца для яго малазнаёмымі словамі. Але ён адчувае, перакладаючы гэтыя малазнаёмыя яму словы на сваю мову, што шматвяковая людская мудрасць здольна дапамагчы чалавеку пэўным чынам з'арыентавацца ў складаным, няпростым свеце супярэчнасцей і, гаворачы словамі А. Лосева, хоць бы часткова засцерагчы яго «ад вонкавага прымусу», не даць падпасці пад уплыў «усіх падманлівых чужых багоў»[82].

Трэба мець на ўвазе, што гэта рацыяналістычная тэндэнцыя ў беларускай літаратуры не спыняла гуманістычна-пошукавы рух і ва ўмовах, яўна неспрыяльных для яе развіцця, хоць часам і мусіла звужаць сваю пазнавальна-эстэтычную функцыю. Больш таго, неспрыяльныя абставіны, як сведчаць творы асобных пісьменнікаў, у нейкай меры нават спараджалі тэндэнцыю абвостранага рацыя-

[81] Чорны К. Зб. тв. Т. 3. С. 67.
[82] Лосев А. Вл. Соловьев и его время. М., 1990. С. 139—140.

налізму і падтрымлівалі яе адпаведны мастацкі тонус. У дадзеным выпадку небескарысна зноў будзе звярнуцца да творчага вопыту Я. Коласа і К. Чорнага, паспрабаваць яшчэ раз зірнуць на добра вядомыя беларускаму чытачу аповесці «Адшчапенец» і «Лявон Бушмар».

У нашым літаратуразнаўстве пра аповесці «Адшчапенец» Я. Коласа і «Лявон Бушмар» К. Чорнага выказана багата слушных і праніклівых думак. Аднак менавіта той іх сэнсавы пласт, дзе мастацкая думка аднаго і другога пісьменніка настойліва і зацікаўлена шукае сілу, якая магла б унесці ў жыццё па-сапраўднаму дзейсны і праўдзівы гуманістычны струмень духоўнага і сацыяльнага абнаўлення, яшчэ пакідае для крытыка і літаратуразнаўца шмат пытанняў.

Гэтыя ў многім, безумоўна, супярэчлівыя творы няроўныя і ў мастацкіх адносінах. У вонкавым сюжэтным дзеянні тут нібыта падтрымліваецца афіцыйная лінія, скіраваная на калектывізацыю аднаасобніцкіх гаспадарак. Пераважна на гэту знешнюю і, трэба сказаць, найбольш слабую ў мастацкім сэнсе праяву пісьменніцкага слова наша крытыка доўгі час і звяртала сваю ўвагу. Адразу скажам, што дзеля аб'ектыўнай ацэнкі ні ў якім разе нельга абмінаць гэту досыць шырокую плынь сюжэта. Усяму, урэшце, можна знайсці тлумачэнне. Пры гэтым нашы выдатныя майстры слова Я. Колас і К. Чорны і ў дадзеным выпадку, як нам здаецца, не маюць абсалютна ніякай патрэбы ў штучным выгароджванні і апраўданні.

Час сапраўды паклаў свой адбітак на аповесці «Адшчапенец» і «Лявон Бушмар». Рэальны драматызм жыцця і рэальныя канфлікты рэчаіснасці падчас тут яўна згладжваюцца. Аднак ёсць у гэтых творах звонку малапрыкметная, так званая падводная частка айсберга — унутраны сюжэт, сатканы з дэталяў, падрабязнасцей, з глыбокім і шматзначным падтэкстам эпізодаў, як бы паміж іншым сказаных слоў, заўваг і г. д., што амаль не заўважалася крытыкамі. Хоць менавіта тут, як нам здаецца, выяўляецца глыбокі аўтарскі боль і клопатнае імкненне дапамагчы селяніну выстаяць, не зламацца ў той нялёгкі час, калі паспешліва і нярэдка з жорсткай асалодай разбураліся і руйнаваліся векавечныя асновы яго жыцця. Міжвольна напрошваецца вывад: як бы, відаць, ні ціснулі на сумленнага і таленавітага пісьменніка неспрыяльныя абставіны і як бы ні настройвалі яго на згод-

ніцтва і канфармізм, ён усё роўна паспрабуе не падпасці пад іх поўны ўплыў.

Разглядаючы аповесці «Адшчапенец» і «Лявон Бушмар», мы ў любым выпадку не павінны залішне адрывацца ад галоўнай стрыжнявой праблемы гэтых твораў: селянін і зямля, чалавек і калектывізацыя. Але ва ўсякім таленавітым мастацкім творы пэўная і канкрэтная праблема звычайна выходзіць сваёй змястоўнасцю з вузкага сюжэтна-фабульнага поля на больш шырокую эпічнауніверсальную ўзаемасувязь з іншымі жыццёвымі пытаннямі.

Энергію такой змястоўнасці нясуць у сабе аповесці «Адшчапенец» і «Лявон Бушмар». Апрача той лейтматыўнай праблемы, пра якую мы гаварылі, абодвух пісьменнікаў цікавіць яшчэ і заглыблены паварот яе да такіх пытанняў, як выяўленне ўнутранай падрыхтаванасці (ці непадрыхтаванасці) чалавека думаць, дзейнічаць і прымаць самастойныя рашэнні ў складаных і па-свойму, можа, нават экстрэмальных побытавых і гістарычных абставінах, шмат у чым нязвыклых для яго варунках жыцця.

Імкненне пісьменніцкай думкі выйсці на такі шлях даследавання рэчаіснасці не было выпадковым і з'яўлялася вострай, злабадзённай патрэбай часу. Гэта быў не толькі водгук на падзеі калектывізацыі.

Найбольш артадаксальнае адгаліненне ў беларускай (і не толькі ў беларускай) літаратуры настройвалася, як вядома, на хвалю панегірычных гімнаў абставінам і ўсякай іншай вонкавай рэвалюцыйна-валявой сіле, якая нібыта за кароткі прамежак часу здольна была карэнным чынам перарабіць, пераўтварыць рэчаіснасць і на якасна новую ступень духоўнасці ўзняць самога чалавека.

Сілу такога «перавыхаваўчага» ўздзеяння, паводле розных тэорый і асабліва паводле так званай тэорыі класавай барацьбы, найперш трэба было скіраваць на селяніна, у душы і псіхалогіі якога нібыта моцна засеў дробнабуржуазны інстынкт індывідуаліста-ўласніка. А гэта быццам натуральна дапускала ў дачыненні да яго амаль абавязковае ўздзеянне нейкай строгай выхаваўчай і перавыхаваўчай сілы. Не супраць былі падтрымаць гэту ідэю і многія пісьменнікі.

Разам з тым, як паказаў час, менавіта тая ідэйнапраблематычная лінія ў беларускай літаратуры, што адстойвала права селяніна на самастойны ўчынак, сама-

стойную думку, самастойны выбар жыццёвых шляхоў, бараніла яго ад розных самазваных настаўнікаў, найбольш поўна адлюстроўвала і глыбокі драматызм самой грамадскай з'явы — калектывізацыі і найбольш дакладна настройвалася на праўдзівае раскрыццё ўнутранага свету чалавека.

Гэтага погляду прынцыпова і паслядоўна прытрымліваюцца Я. Колас і К. Чорны ў аповесцях «Адшчапенец» і «Лявон Бушмар», хоць кожны з іх ідзе асобным шляхам у раскрыцці характараў і мастацкім асэнсаванні найскладанейшай жыццёвай праблемы.

Я. Колас, напрыклад, з розных бакоў падыходзіць да свайго галоўнага героя Пракопа Дубягі, каб паўней даследаваць індывідуальна-псіхалагічную прыроду яго характару. Але галоўным чынам пісьменніка цікавіць, як можна заўважыць, выяўленне рэальных і патэнцыяльных магчымасцей героя **думаць, разважаць, прымаць самастойныя рашэнні**. У першую чаргу думка, клопатна-трывожная думка пра самога сябе і лёс сваёй сям'і, заснаваная на цвярозым успрыманні рэчаіснасці, прымушае яго стаць на пэўны час «самавыгнаннікам», адшчапенцам, які паставіў перад сабою мэту «шырэй і глыбей» убачыць і параўнаць жыццё аднаасобніцкае і калектыўныя яго формы.

Пракоп Дубяга, паводле слоў аўтара, распачынае сваё вандроўніцтва з думкай «замацавацца ў жыцці на сваіх старых поглядах і на старым грунце»[83]. І шмат у чым ён мае тут рацыю. Бо многія і многія палітыкі, шукаючы для сябе падтрымку на шляху да ўлады, звычайна абяцалі селяніну «залатыя горы», але часта падманвалі яго і вельмі хутка забывалі пра свае абяцанні. Само жыццё вучыла селяніна быць насцярожаным да розных цацанак-абяцанак, настройвала яго на крытычны падыход, каб неяк засцерагчы сябе ад вялікай і малой бяды. Праўда, Пракоп Дубяга ўмее і адступацца ад раней прынятых рашэнняў, ацэнак і намераў, калі, думаючы, разважаючы, параўноўваючы, ён пераконваецца, што ранейшыя яго ўяўленні і меркаванні пра пэўную жыццёвую з'яву не вытрымліваюць праверкі логікай жыцця.

Само паняцце «думка», выяўляючыся ў розных сэнсавых значэннях, з'яўляецца ў коласаўскай аповесці своеасаблівай характэрнай прыкметай лексічна-стылёвай

---

[83] Колас Я. Зб. тв. Т. 7. С. 115.

пісьменніцкай манеры і асабліва тых сюжэтных адгаліненняў твора, дзе ў цэнтр аўтарскай увагі трапляе галоўны герой. Вось толькі некаторыя прыклады, узятыя з адной, 116-й, старонкі аповесці: «Пракоп цэлымі гадзінамі не спаў і разважаў, прапускаючы праз сіта самакрытыкі свае паводзіны, няяснасць і неакрэсленасць свайго стану. А да гэтага далучаліся і думкі аб пакінутай гаспадарцы, аб сям'і і доме... А Пракопавы думкі ідуць ды ідуць, нанізваючыся адна на другую, покі, нарэшце, незаметна для Пракопа адна з іх не запыніла на сабе яго ўвагі на адным з такіх яго начлегаў. І сапраўды, гэта не кепская думка! Пракоп прыцішана трубіць носам і пачынае развіваць яе далей. Як запраўскі філасаф, мяняючы сваю ранейшую сістэму светапогляду, прапускае яе праз няўмольную крытыку... Вось тая шчаслівая думка, што запыніла на сабе Пракопаву ўвагу. Але як да яе прыступіцца?» і г. д.

Думка коласаўскага героя раскрывае сябе ў досыць шырокім сацыяльна-псіхалагічным дыяпазоне, хоць у асноўным і занята параўнаннем калгаснага і аднаасобніцкага жыцця. Яна па-свойму кампрамісная, заглыблена-філасофская і цярплівая, гуманістычная. Душа і сэрца Пракопа адкрыты, каб прыкмячаць, заўважаць у жыцці добрае і пашыраць, узбагачаць такім чынам уласны жыццёвы вопыт.

Не абмінае яго засяроджаны аналітычны позірк і тое, што ідзе насуперак здароваму сэнсу. Яму, напрыклад, здаецца алагічным, што людзі накшталт Кандрата Казея, у якіх «рукі да работы не здатны, але язык ходзіць спрытна» [84], выношваюць намер заняць у калгасе начальніцкія крэслы. Коласаўскага героя вельмі непакоіць у жыцці калгаснай вёскі і магчымасць ухіліцца ад працы гультаяватаму і нядобрасумленнаму чалавеку. Пракоп Дубяга, напрыклад, добра бачыць, што «Марыніч — хітры, гультаяваты чалавек, толькі від паказвае, што робіць, а сам пасмейваецца з Пракопа» [85]. Непрыемна здзіўляе Пракопа і тое, што калгаснікі не дужа ірвуцца на працу. Пры гэтым з такой з'явай ён сустракаецца быццам бы ва ўзорным для свайго часу калгасе «Хваля рэвалюцыі». «Аднак жа калгаснікі не надта спяшаюцца ўставаць,— крытычна заўважае ён сам сабе, бо пачынала развід-

---

[84] Колас Я. Зб. тв. Т. 7. С. 100.
[85] Там жа. С. 109.

няцца, а на калгасным двары было яшчэ ціха»[86].

Аднак болей за ўсё коласаўскага героя трывожаць праявы валявога і катэгарычнага націску на індывідуальную самабытнасць чалавека, на яго духоўную «самасць». І гэта трывога небеспадстаўная. Ён адчувае і нават добра разумее, што чалавек, пазбаўлены індывідуальнай адметнасці, «самасці»,— слабы набытак для любога калектыву. Больш таго, у такой духоўнай безаблічнасці чалавека, як гэта ўяўляецца герою (а найбольш, вядома, самому аўтару), закладзена вялікая небяспека для самога гэтага чалавека і асабліва для тых, з кім ён знаходзіцца ў жыццёвых узаемакантактах.

Мастацкі тэкст і падтэкставая плынь аповесці «Адшчапенец» даволі актыўна «працуюць» на паказ таго, што нежаданне ці няўменне дакопвацца да прычынных асноў жыцця немінуча настройвае чалавека на кан'юнктурна-прыстасавальніцкі лад мыслення і адпаведныя такому яго спрошчанаму дыялогу з рэчаіснасцю дзеянні.

Характэрны хоць бы такі эпізод. У калгасе «Хваля рэвалюцыі» адбываецца агульны сход, на якім разглядаецца так званая справа сумленнага і разумнага чалавека, Лапка, які асмеліўся выйсці за межы афіцыйных і начальніцкіх прадпісанняў: даў з агульных запасаў сваім жа калгаснікам, што мелі кароў, некалькі мяшкоў сечкі. А ў дадатак да ўсяго не адмовіў заможнаму селянінухутаранцу, а па тагачасным вызначэнні — кулаку Цімоху Бабуру паправіць печ.

Адным з першых на гэтым сходзе выяўляе жаданне выступіць вечна «хмуры» і «сярдзіты» Сымон Таркевіч. Але меней за ўсё яго цікавіць лёс рэальнага чалавека, аднавяскоўца. Галоўная турбота Сымона Таркевіча — дагадзіць мясцоваму начальству і настроіцца на кан'юнктурна-прыстасавальніцкую хвалю: «Як тут выказацца? — сярдзіта запытаў Таркевіч:— трэба наўперад ведаць, што гэта за сход: ці гэта чыстка, ці суд? А то не ведаю, як прыступіць... Ці гэта парадак?..»[87]

Аднак паняцце «парадак» уяўляецца Таркевічу, на жаль, вельмі звужана. Яму, у прыватнасці, здаецца, што асноўную дысгармонію ў парадак і дысцыпліну ўносіць чалавечая дабрата, а таму яна заслугоўвае суровага асуджэння. Выходзячы з такіх звужаных і спрошчаных

---

[86] Колас Я. Зб. тв. Т. 7. С. 132.
[87] Там жа. С. 168.

меркаванняў, ён і дае поўную волю крытычнаму запалу ў адносінах да свайго суседа-аднавяскоўца Лапка: «Мы цяпер бачым, куды можа павесці чалавека дабрата,— старшыня давёў гэта ясна. Ці ж гэта парадак?.. Такую дабрату вытручваць трэба!» [88]

Слова «дабрата» ў выступленні Сымона Таркевіча (і не аднаго яго) ужываецца не толькі са знакам мінус, але і ў падкрэслена іранічным значэнні. І гэты момант мае ў творы глыбокі падтэкст. Я. Колас спыняе нашу ўвагу на з'явах, якія выразна сведчылі, што ў краіне набірае сілу антыгуманістычная грамадская тэндэнцыя, нецярпіма настроеная да чуйнай, клопатнай, разважлівай думкі чалавека і яго незалежнага самастойнага дзеяння.

На якую жыццёвую дарогу стане гэты чалавек пасля такога гвалтоўнага ўмяшання ў яго духоўны свет? Адвольна пашыраць межы аўтарскага падтэксту, вядома, зусім непажадана. Аднак магчыма, відаць, зрабіць і такое дапушчэнне, як гэта ўяўляецца Ф. Іскандэру, калі ён пачынае разважаць пра падобныя з'явы. «Гвалтоўнае ўмяшанне ў душу чалавека і небяспечна, і бескарысна. Чалавек, у душу якога гвалтоўна ўварваліся, разбураецца сам і ў якасці помсты разбурае ўсё навокал» [89].

У гэтым сэнсе цікавай і па-новаму шмат у чым яшчэ не прачытанай мастацкай старонкай у нашай літаратуры з'яўляецца аповесць К. Чорнага «Лявон Бушмар». Гэты твор, як нам уяўляецца, у больш адкрытых праявах тэксту развівае тую сюжэтную лінію, якую Колас у адпаведнасці з задумай акрэслівае вельмі пункцірна, найбольш у заглыблена-падтэкставай форме, а менавіта лінію, якая звязана з выяўленнем духоўна-псіхалагічнай дэфармацыі чалавека, калі на яго няспынна і жорстка ціснуць вонкавыя абставіны.

Разглядаючы аповесць К. Чорнага «Лявон Бушмар» і спыняючы ўвагу на раскрыцці характару яе галоўнага героя, наша крытыка доўгі час канцэнтравала асноўную ўвагу на паверхневай плыні сатырычнай тэндэнцыі гэтага твора. І тут яе вялікая памылка. Выкрывальна-сатырычны пафас у аповесці «Лявон Бушмар» сапраўды вельмі моцны, а падчас набывае нават гратэскава-завостраныя формы. Аднак калі глыбей учытацца ў твор, то нельга не

---

[88] Колас Я. Зб. тв. Т. 7. С. 170.
[89] Лит. газ. 1992. 2 сент.

заўважыць, што крытыкуе і выкрывае аўтар свайго героя ў асноўным усё-такі не за тое, што ён уласнік, гаспадар, заможны хутаранін, які змагаецца за свой хутар і не хоча ўступаць у калгас. Тут іншыя прычыны. І галоўная з іх тая, што чалавек гэты прынцыпова не настроены, гаворачы словамі аўтара і некаторых герояў твора, духоўна «з'іначыцца» і не хоча, не жадае ды і не ўмее (усё тут узаемазвязана) колькі-небудзь сур'ёзна задумацца над складанымі паваротамі жыцця, калі яно нават вельмі балюча закранае яго асабістыя інтарэсы і інтарэсы блізкіх яму людзей. Мы часцей за ўсё бачым яго ў імклівых, нервовых рухах, у дзеянні-працы, але, як заўважае аўтар, «без думак аб прычынах», бо «думак у яго было мала, думаць ён не прывык» [90].

Ну а які ж Лявон Бушмар працаўнік і гаспадар на сваёй хутаранскай зямлі? З гэтага боку, як кажуць, у аўтара няма да героя ніякіх нараканняў. Лявон любіць зямлю і ўмее на ёй працаваць. І нярэдка аўтар не без захаплення паказвае гэта. Нават тады, калі хата і гаспадарка Лявона застаюцца на нейкі момант без жаночага нагляду і паяўляецца «вялікі непарадак», сляды гэтага непарадку, паводле слоў аўтара, заўважаюцца толькі «ва ўсім тым, што не належала да зямлі і жывёлы» [91].

Глыбокую спачувальную танальнасць аўтарскай характарыстыкі героя, які падпарадкаваў сваё жыццё ўпартаму «змаганню з зямлёю» [92], мы адчуем і ў многіх іншых эпізодах твора. Пісьменніку, напрыклад, да болю шкада гэтага чалавека, хутар якога абкладзены і акружаны, бы нейкая непрыступная варожая крэпасць. Вялікай бядой яго з'яўляецца і тое, што ён зусім непісьменны і што яму цяжка сфармуляваць самую простую думку. І тут важна не прамінуць аўтарскую заўвагу аб тым, што «гаспадарскі клопат — адны яго мужчынскія рукі ў хаце — забіваў у ім увесь час» [93]. Не было ў Лявона, напэўна, магчымасці авалодаць азамі пісьменнасці.

І ўсё ж К. Чорны, як можна зразумець, супраць таго, каб усё спісваць на абставіны. Бо ў такім разе і сапраўды вельмі проста і лёгка было б знайсці апраўданне, як гэта неаднаразова падкрэсліваў Дастаеўскі, і чалавечай под-

---

[90] Чорны К. Зб. тв. Т. 4. С. 39.
[91] Там жа. С. 48.
[92] Там жа. С. 38.
[93] Там жа. С. 61.

ласці, і бадай што любым злачынствам чалавека. К. Чорны таксама гэта ўлічвае.

Абставіны Лявону Бушмару не спрыяюць. І мала хто па-сапраўднаму клапоціцца, каб зразумець яго, а тым болей дапамагчы. Дакладней кажучы, валявая і каманд-на-бюракратычная сіла абставін выяўляе ў дачыненні да хутараніна Лявона Бушмара адкрыта варожае стаўленне. Аднак аўтар лічыць, што і ў той час, калі навокал чалавека крута, па-новаму з'інанчваецца свет (і з'інанчваецца не заўсёды ў лепшы бок), чалавек не павінен, не мае права сур'ёзна не задумацца над гэтым і сам духоўна не з'інанчвацца. Бездухоўнасць, спрошчана-аднамернае мысленне тоіць у сабе, як гэта можна зразумець, праяву антыгуманнага і нярэдка жорсткага і агрэсіўнага дзеяння.

І ў такіх выпадках слова пісьменніка становіцца наступальным, набывае сатырычнае і разам з тым абагульнена-аналітычнае, з арыентацыяй на недагаворанасць і падтэкст гучанне. Дазволім сабе спыніць увагу хоць бы на такім вось урыўку: «Бушмар нагадваў штосьці бязлітаснае і цяжкае, што ўсё крышыць дашчэнту пад нагамі сваімі, сцірае ўсё з твару зямлі, не заўважаючы гэтага, у імя сваіх адчуванняў свету для сябе аднаго. Малыя і слабейшыя істоты ратуюцца, уцякаюць з-пад гэтага страшнага ходу. Але іх ніхто не заўважае. Тут толькі дзікасць і выпадковасць. Што і хто пападзецца пад бот?! Хто і што будзе растаптана насмерць?! Хто і што застогне пад ботам, развітваючыся з жыццём?» [94]

Аднак пры сатырычнай завостранасці і публіцыстычнай адкрытасці гэтага тэксту не ўсё тут знаходзіцца на паверхні. Многія крытыкі і літаратуразнаўцы неаднойчы прыводзілі гэтыя і ў чымсьці блізкія па сэнсе іншыя пісьменніцкія меркаванні, каб лішні раз засведчыць: вось, маўляў, як выкрывае і ненавідзіць аўтар уласніцтва і хутараніна-ўласніка Лявона Бушмара.

Ну а што ж на самай справе адбываецца ў глыбінях аўтарскага тэксту і, у прыватнасці, у тэксце і падтэксце таго ўрыўка, на які мы толькі што спасламіся? Сапраўды, аўтар цвёрда перакананы ў тым, што інфантыльная, аднамерна-схематычная думка і паслабленае, адасобленае ад глыбокага роздуму і перажывання пачуццё і ў побытавай сферы, у бытавых абставінах з'яўляюцца сур'ёзнай патэнцыяльнай перадумовай антыгуманнага і жорсткага

[94] Чорны К. Зб. тв. Т. 4. С. 57.

дзеяння. Глыбокі пісьменнік-аналітык і тонкі псіхолаг, К. Чорны, відаць, разумеў, што пад час пашырэння ў жыцці такога агрэсіўнага і антыгуманнага дзеяння пластычны і псіхалагічны мастацкі малюнак можа некалькі пацясніцца і ў літаратуры, аддаючы большае месца востраму сатырычнаму слову. І Лявон Бушмар як падкрэслена «побытавы чалавек» мусіць прыняць гэты сатырычны аўтарскі гнеў на сябе. Але, як нам уяўляецца, толькі частку. Бо мы ні на хвіліну не павінны выпускаць з поля зроку тое, што аўтар усё-такі глыбока спачувае свайму герою, які дзень і ноч жыве гаспадарскімі клопатамі і, гаворачы словамі самога пісьменніка, упарта змагаецца з зямлёю.

Тут важна мець на ўвазе і яшчэ адзін, як нам здаецца, важны момант. А хіба мог селянін-хутаранін Лявон Бушмар, калі б нават і дужа хацеў, «у імя сваіх адчуванняў свету для сябе аднаго», як гэта мы чытаем у Чорнага, «сцерці ўсё з твару зямлі» і «насмерць растаптаць кожнага, хто і што пападзецца яму пад бот». Наогул цяжка ўявіць, што такое шырокае, з падкрэслена негатыўным і ў нейкай меры нават памфлетна-сатырычным ухілам абагульненне аўтар звязвае з асобай аднаго чалавека, а менавіта з асобай селяніна-хутараніна Лявона Бушмара.

На наш погляд, К. Чорны выразна бачыць ужо на гарызонце паяўленне іншай сілы, якая і сапраўды «ў імя сваіх адчуванняў» і дагматычна-спрошчаных уяўленняў здольна была пайсці на самае вялікае злачынства і растаптаць «насмерць» «кожнага, хто трапіць ёй пад бот». Рэальнае дзеянне гэтай сілы вынесена ў чорнаўскай аповесці «Лявон Бушмар» (ды і ў аповесці Я. Коласа «Адшчапенец») у глыбокі падтэкст. Але ўдумліваму і пранікліваму чытачу 30-х гадоў (абодва творы з'явіліся ў 1929—1930 гг.) дадатковыя тлумачэнні былі тут і не патрэбны.

## ЗМЕСТ

Уводзіны . . . . . . . . . . . . . . . . 3

Дыялог паміж «я» і «мы» ў працэсе пошуку ісціны . . . 9

Відушчая сіла сумнення . . . . . . . . . . . . 80

Навуковае выданне

**ЖУРАЎЛЁЎ ВАСІЛЬ ПРАКОПАВІЧ**

**На шляху духоўнага самасцвярджэння**

Загадчык рэдакцыі *Л. І. Пятрова*
Рэдактар *Н. А. Дашкевіч*
Мастак *Вікт. В. Саўчанка*
Мастацкі рэдактар *В. В. Саўчанка*
Тэхнічны рэдактар *С. А. Курган*
Карэктар *Я. У. Марціновіч*

Здадзена ў набор 12.07.94. Падпісана ў друк 12.10.94. Фармат 84×108 1/32. Папера газетная. Гарнітура літаратурная. Высокі друк. Ум. друк. арк. 8,40. Ум. фарб.-адб. 8,72. Ул.-выд. арк. 8,83. Тыраж 4600 экз. Зак. № 675.

Выдавецтва «Навука і тэхніка» Акадэміі навук Беларусі і Міністэрства культуры і друку Рэспублікі Беларусь. 220141. Мінск, Жодзінская, 18. ЛВ № 437.
Друкарня імя Францыска Скарыны выдавецтва «Навука і тэхніка». 220141. Мінск, Жодзінская, 18.

1500